Яланта Грыгарук

РОДНАЯ ЛІТАРАТУРА

2 КЛАС АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАГА ЛІЦЭЯ

РОДНАЯ ЛІТАРАТУРА

Яланта Грыгарук

РОДНАЯ ЛІТАРАТУРА

ПАДРУЧНІК

па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі

для вучняў **2 КЛАСА** агульнаадукацыйнага ліцэя

BIAŁYSTOK 2016

RODNAJA LITARATURA
LITERATURA OJCZYSTA
Podręcznik do kształcenia literackiego i kulturowego z języka białoruskiego
dla klasy II liceum ogólnokształcącego

Opracowała: Jolanta Grygoruk

Projekt graficzny i skład: Anna Miszczuk-Stankiewicz

Redaktor: Anna Radziukiewicz

Korekta: Aleksander Wierzbicki

Ilustracja na pierwszej stronie okładki na podstawie „Беларусы. Атлас", Мінск 1996
Na ostatniej stronie okładki fragment gobelinu Raisy Halavataj „Жняя", 1982

Podręcznik jest dopuszczony do użytku szkolnego przez ministra właściwego do spraw oświaty i wychowania i wpisany do wykazu podręczników przeznaczonych do kształcenia ogólnego dla mniejszości narodowych i etnicznych oraz społeczności posługującej się językiem regionalnym. Podręcznik jest przeznaczony do kształcenia ogólnego dla białoruskiej mniejszości narodowej do nauczania języka białoruskiego, kształcenie w zakresie rozszerzonym na IV etapie edukacyjnym – szkoły ponadgimnazjalne, na podstawie opinii rzeczoznawców: dr Jadwigi Głuszkowskiej-Babickiej i dr Teresy Jasińskiej-Sochy. Rok dopuszczenia 2016.

Numer ewidencyjny w wykazie: 661/2/16

Podręcznik finansowany przez Ministerstwo Edukacji Narodowej.

ISBN 978-83-937510-6-8

© Copyright by Fundacja im. Księcia Konstantego Ostrogskiego
Białystok, 2016

Elektroniczna wersja podręcznika zamieszczona jest na portalu Scholaris.

FUNDACJA IM. KSIĘCIA KONSTANTEGO OSTROGSKIEGO

Fundacja im. Księcia Konstantego Ostrogskiego
15-399 Białystok, ul. Składowa 9
www.ostrogski.pl

Wydanie pierwsze
Druk i oprawa: Orthdruk, Białystok

Змест

Абраднасць

Дарафей Фіёнік – Жыта як жыццё 12
Дарафей Фіёнік – Калядаванне на Ражджаство Хрыстовае і не толькі 15
Дарафей Фіёнік – Агулькі – вясновая радасць 19
Дарафей Фіёнік – Пісанкі 23

Славутыя людзі нашай зямлі

Аляксандр Вярбіцкі – Ігнат Анацэвіч – пачатак гістарычнага руху 28
Дарафей Фіёнік – Міхал Баброўскі – падляшскі пачынальнік славяназнаўства 30
Дарафей Фіёнік – Ігнат Даніловіч – прафесар з Грыневіч-Вялікіх 32
Дарафей Фіёнік – Іосіф Ярашэвіч 33
Дарафей Фіёнік – Антон Сасноўскі – асветнік з Кляшчэль 36
Дарафей Фіёнік – Кастыцэвічы – асветнікі з Пасынак 37
Дарафей Фіёнік – У Старым Корніне 39
Дарафей Фіёнік – Хлябцэвічы – асветнікі з Кленік 41
Аляксандр Вярбіцкі – Аляксандр Гершун – фізік 43
Аляксандр Вярбіцкі – Іосіф Лангбард – архітэктар 44
Дарафей Фіёнік – Нестар Перавой 48
Дарафей Фіёнік – Шчытоўскі цэнтр асветы і сельскагаспадарчага прагрэсу 52

Літаратура XIX стагоддзя

Працы фалькларыстаў і ананімная літаратура ў XIX ст. – *паводле Васіля Старычонка, Максіма Гарэцкага і Энцыклапедыі гісторыі Беларусі* 58
Канстанцін Вераніцын 59
Канстанцін Вераніцын – Тарас на Парнасе 59
Вясна, голад, перапала... 69

Адраджэнне беларускай літаратуры ў XIX стагоддзі – *паводле Васіля Старычонка* 70
Ян Чачот 72
Ян Чачот – * * * А мая ж ты кветачка... 72
Ян Чачот – * * * Поле, поле шырокае... 73
Ян Баршчэўскі 74
Ян Баршчэўскі – Бунт хлопаў 75
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч 77
Змест твора «Гапон» Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча 77
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – Гапон (Фрагмент) 79
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – Прадмова перакладчыка 81
Адам Міцкевіч – Пан Тадэвуш (Фрагмент) – *Пераклаў Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч* 82
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – Пінская шляхта 84
Кастусь Каліноўскі 96
Кастусь Каліноўскі – Пісьмы з-пад шыбеніцы, * * * Браты мае, мужыкі родныя... 96
Францішак Багушэвіч 97
Францішак Багушэвіч – Прадмова да «Дудкі беларускай» 99
Францішак Багушэвіч – Кепска будзе (Фрагмент) 102
Янка Лучына 104
Янка Лучына – Роднай старонцы 104

Літаратура XX стагоддзя (літаратура «нашаніўскага перыяду» і 20-х гадоў савецкага перыяду)

Агульная характарыстыка літаратуры пачатку XX стагоддзя – *паводле Васіля Старычонка* 108
Дарафей Фіёнік – Бежанства 110
Аляксандр Вярбіцкі – Усевалад Ігнатоўскі 114
Беларусізацыя 117
Культура і літаратура ў БССР у дваццатыя і трыццатыя гады XX стагоддзя – *паводле Васіля Старычонка* 119
Ядвігін Ш. 121
Ядвігін Ш. – Пазыка 122
Ядвігін Ш. – Васількі 123
Цётка 124
Цётка – Вясковым кабетам 126
Янка Купала 127
Янка Купала – Явар і каліна 130
Янка Купала – Курган 132

Янка Купала – Паўлінка (Скарочана) 140
Янка Купала – Незалежнасць 147
Якуб Колас 151
Якуб Колас – Родныя вобразы 154
Якуб Колас – Адзінокае дрэва 156
Аналіз паэмы «Новая зямля» Якуба Коласа – *паводле Васіля Старычонка* 159
Таіса Грамчанка – Змест «Новай зямлі» Якуба Коласа 162
Якуб Колас – Новая зямля (Фрагмент) 171
Якуб Колас – У палескай глушы (Скарочана) 175
Максім Багдановіч 187
Максім Багдановіч – Санет 188
Максім Багдановіч – Слуцкія ткачыхі 190
Максім Багдановіч – Кніга 191
Максім Багдановіч – * * * Па-над белым пухам вішняў... 191
Максім Багдановіч – Завіруха 193
Максім Багдановіч – Пагоня 193
Максім Багдановіч – * * * Больш за ўсё на свеце жадаю я... 195
Максім Багдановіч – * * * Даўно ўжо целам я хварэю... 196
Максім Багдановіч – Апокрыф 197
Максім Багдановіч – Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI сталецця (Фрагмент) 199
Максім Багдановіч – Хто мы такія? 200
Максім Багдановіч – За сто лет 202
Змітрок Бядуля 204
Змітрок Бядуля – На каляды к сыну 205
Змітрок Бядуля – Пяць лыжак заціркі 210
Алесь Гарун 212
Алесь Гарун – Матчын дар 212
Развіццё беларускага тэатру – *паводле артыкулаў з Энцыклапедыі гісторыі Беларусі* 213

Літаратура Заходняй Беларусі

Літаратура Заходняй Беларусі – *паводле Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя* 218
Казімір Сваяк 220
Казімір Сваяк – Гімн роднай зямлі 221
Наталля Арсеннева 221
Наталля Арсеннева – Восень у Вільні 223
Наталля Арсеннева – Завея 223

Максім Танк 224
Максім Танк – * * * Калі няма на свеце маёй мовы... 225
Максім Танк – * * * Ураклі, матуля, сына твайго людзі... 226
Яўген Мірановіч – Чаму ўзнікла Грамада? 227

Голас страчанага пакалення

Янка Купала – І прыйдзе 234
Масавае вынішчэнне беларускае інтэлігенцыі – *паводле Леаніда Маракова* 235
Сяргей Дубінскі 236
Уладзіслаў Галубок 238
Францішак Аляхновіч 239
Францішак Аляхновіч – У кіпцюрах ГПУ. Абмен 239
Браніслаў Тарашкевіч 241
Адам Міцкевіч – Пан Тадэвуш (Фрагмент) – *Пераклаў Браніслаў Тарашкевіч* 242
Бронюсь, куды ты ідзеш? – *паводле А. Валахановіч і У. Міхнюк* 243
Закатаваны, але не прыніжаны... – *паводле Георгія Чыгіра* 244
Максім Гарэцкі 245
Максім Гарэцкі – Рускі 247
Максім Гарэцкі – Фантазія 251
Максім Гарэцкі – Стары прафесар 253
Уладзімір Дубоўка 258
Уладзімір Дубоўка – За ўсе краі, за ўсе народы свету 259
Кузьма Чорны 261
Кузьма Чорны – Макаркавых Волька 262
Кузьма Чорны – Дзённік 270
Тодар Кляшторны 271
Тодар Кляшторны – Восень 273
Алесь Дудар 275
Алесь Дудар – Пасеклі Край наш 275
Сяргей Грахоўскі 276
Сяргей Грахоўскі – Слова да споведзі 279
Тодар Лебяда 280
Тодар Лебяда – Ліст першы 281
Тодар Лебяда – * * * Калі стомленае сонца па-над дахам... 283

Літаратура 285

Добры дзень!

Вы, ужо другі год з'яўляецеся вучнямі ліцэя. Перад Вамі чарговыя выпрабаванні і многа працы. Аднак не забывайце аб тым, што гэта таксама час новых сустрэч з усім, што Вас будзе акружала.

Многа радасных дзён і шчаслівага пераходу ў дарослaсць! Няхай гэты навучальны год узбагаціць не толькі Вашыя веды, але і Ваш свет пачуццяў.

Калі аднак прыйдзе цяжэйшая хвіліна, то не забывайце, што кожная, нават самая цёмная хмара, толькі на хвіліну засланяе сонца і пасля дажджу зноў будзе цёпла і светла.

Аўтарка

АБРАДНАСЦЬ

Абычай пасеваў жыта ў Студзіводах на св. Юрыя, 6 мая

Дарафей Фіёнік

Жыта як жыццё

Ідучы 1 верасня ў школу не кожны з вучняў ці настаўнікаў задумваецца, што якраз у гэты дзень, паводле старога стылю календара, пачынаецца царкоўны год. Першым вялікім святам царкоўнага года ёсць Нараджэнне Прасвятой Дзевы Марыі. У рымска-каталіцкай традыцыі гэты дзень называецца святам Маці Божай Сеўнай. Бо менавіта ў палове верасня выпадае найлепшы час на сяўбу жыта – збожжа, з якога маем хлеб.

Жыта – збожжа пакрысе таямнічае. Яго жыццё падзеленае на два перыяды. Восенню жыта ўзыходзіць і ўзрастае – спачатку адною сцяблінкай, а пасля ідзе ў корч. Калі прыходзяць маразы і снягі, гэты корч засынае амаль на паўгода. Напрадвесні, калі толькі зямля паабсыхае і прагрэецца, жыта абуджаецца да жыцця. Да пачатку мая яно бывае ўжо высокае па калена. Гаспадар ведае, што збожжу трэба дапамагчы добра ўзрастаць, неабходна за яго памаліцца.

І тут наступае дзень памяці св. Георгія Пераможцы, якога славяне называюць св. Юрыем. У грэчаскай мове імя Георгіос абазначае проста земляроба. І да яго 6 мая, у дзень памяці святога, кіруюцца малітвы нашых земляробаў.

Раніцай, у дзень св. Юрыя, гаспадар выганяе першы раз на пашу сваіх кароў. Па дарозе на выган іх трэба пасвяціць – пасцёбаць пасвячанай на Вербніцу галінкай вярбы. Пасля гаспадар ідзе на поле, паглядзець як расце жыта. Калі ў яго малыя дзеці – ён рассыпае па жыце цукеркі.

Але найважнейшы момант свята наступае пасля поўдня, калі ўсе вяртаюцца з царквы. Раней спечаны круглы каравай гаспадыня ўскладае з ручніком на рукі гаспадару. Сама бярэ рэшткі з велікоднага стала – пасху, шкарлупіны яек, костачкі, а таксама кошык з пачастункам. З гэтым уся сям'я падаецца на жытнёвае поле, каб споўніць спрадвечны абрад.

Абысці кругом поле, з караваем на руках, трэба тры разы. На ўсіх вуглах поля закопваюцца рэшткі з велікоднага стала, а жыта акрапляецца святою вадою. Дзеці бегаюць па жыце ў пошуках рассыпаных бацькам цукеркаў. Калі закончыцца абход поля, пачынаецца другая частка абраду – качанне каравая па дарожцы з ручніка. Ад таго, як каравай далёка закоціцца, мае залежаць ураджай. Мераецца ім таксама жыта – калі каравай у збожжы хаваецца – будзе добры ўраджай. А каб жыта не вылягала, гаспадыня закопвае ў ім вялікую костку з пасвячанага кумпяка.

Абрад канчаецца супольным пачастункам. Дзеці цешацца, бо могуць яшчэ пакачацца па жыце. Дарослыя жадаюць добрага плёну і спяваюць песні, якія кіруюць да св. Юрыя. У Дабрывадзе каля Кляшчэль спяваюць:

Святы Юрэ-Рыгорэ пуйды до Бога по ключы,
І одомкні зымліцу, і выпусть-выпусть травіцю,
Прыкрый зымліцу травою, а дэрэво лісточком...

Калісьці палеткі з жытам былі ва ўсіх гаспадароў па-суседску. Таму ўсе святкавалі грамадою, а песні – агулькі, несліся па маёвай расе – доўга і далёка.

Абуджанае на Юрыя жыта пачынае хутка расці. Праз пару тыдняў страляе ў колас, пасля рунее, квітнее і пачынае даспяваць. Напрыканцы Пятроўкі (Пятровага посту) прыходзіць час жніва. Зажынаць жыта выходзілі звычайна перад святам апосталаў Пятра і Паўла.

Абычай пасеваў жыта ў Студзіводах на св. Юрыя, 6 мая

Працу абавязкова пачынае малітва. Першы нажаты сноп не звязваецца, а кладзецца накрыж. Жнеі перавязваюцца жытнімі перавясламі – каб спіна ў час жніў не балела. Калі нажнуць-накосяць з капу (60 снапоў), усе ідуць да гаспадара, адзначаць абедам зажынкі. Першы нажаты сноп прыносіцца ў гаспадарку – ён мае быць перахаваны да Ражджаства Хрыстовага. Тады будзе прынесены дадому, стане ў кутку пад іконамі і будзе называцца *колядою* або *госцем*.

Жніва ідуць тыдзень або два, у залежнасці ад багацця гаспадара. Жніўныя песні дапамагаюць адагнаць стому:

Ой, чыя то волока, така довга, шырока.
На юй жэнчыкі жалі, сэрпікі поломалі.
Сэрпікі сталёвые, жэнчыкі молодые.
Наша пані домуе, нам вэчэру готуе.
Нам вэчэра нэ міла, постопянка втомілась.

Постопянкою на Бельшчыне называлі жнею, якая была найбольш спраўная і жала першай.

І прыходзіць дзень дажынак. Пад сам канец працы трэба памятаць пра перапеліцу. Гэта не птушка, а апошняя жменя незжатага збожжа, якую ўпрыгожваецца палявымі кветкамі. А пад ёю – на белай хустачцы кладзецца хлеб для зайчыка. А яшчэ кругом перапеліцы трэба перацягнуць гаспадара (абараць перапеліцу).

Каласоў з перапеліцы не пакідаюць на полі, а абрэзваюць і нясуць дахаты. Праз некалькі тыдняў, 28 жніўня наступае свята Успення Прасвятой Багародзіцы. Пад свята кожны гаспадар павінен падрыхтаваць *кветку* – узяць жытнія каласы з перапеліцы, дадаць пшанічных, аўсяных і ячменных, а таксама палын і іншае зелле. І такую кветку нясецца пасвяціць у царкву. Пасвячанае тады жыта засяваем у верасні на полі.

І так пачынаецца абнаўленне жыцця. Вечнасць жыта падобная на вечнасць нашага жыцця.

1 Адшукай у тэксце фрагмент, у якім гаворыцца, калі пачынаецца царкоўны год?

2 Што спалучае Нараджэнне Прасвятой Дзевы Марыі і пасевы жыта?

3 Якія земляробчыя абрады былі звязаны са св. Юрыем?

4 Апішы абрады звязаныя з зажынкамі і дажынкамі.

5 Што абазначае перапеліца? Апішы звычаі, звязаныя з ёю.

Дарафей Фіёнік

Калядаванне на Ражджаство Хрыстовае і не толькі

Каляднікі ў Войшках, 20 студзеня 2013 г.

У святочным календары ёсць дні, у якія па даўняй традыцыі трэба выходзіць на вуліцы, заходзіць на панадворкі ды ў хаты і дзяліцца радасцю з іншымі. Бо толькі ў супольнасці з іншымі можам адчуць радасць Ражджаства, Уваскрасення Хрыстовага ці дня Святой Тройцы. І гэты пераказ іншым святочнай радасці можна менавіта назваць словам – калядаванне.

На Ражджаство Хрыстовае

Калядаванне, у залежнасці ад свята, мае розныя формы і розныя атрыбуты. Пачнем ад калядавання на свята Ражджаства Хрыстовага, бо яно дасюль найбольш жывое.

Кожнае калядаванне патрабуе падрыхтоўкі; так як і да самога свята рыхтуемся, перш за ўсё духоўна. Да зімовага калядавання рыхтуе нас саракадзённы пост, які з-за таго, што пачынаецца ў дзень св. апостала Філіпа, называецца Піліпаўкай. Час спявання і навукі калядак пачынае свята Увядзення ў храм Прасвятой Багародзіцы. У гэты дзень спраўляцца павінна першая каляда. Час Піліпаўкі прысвечаны таксама падрыхтоўцы каляднай зоркі (гвязды). У розных ваколіцах яны вылучаліся формай, асабліва рагоў. У Відаве каля Бельска рогі вузкія і вельмі доўгія. У Рыбалах рогі выгнуты ў каблук дапераду. У Махнатым можна яшчэ сёння пабачыць вялікую калядную канструкцыю, складзеную з чатырох зорак з фанарамі (лямпіёнамі).

Сярэдзіна традыцыйнай зоркі, якая называецца «ліцом» або «грудзьмі», абклеена папяровай выцінанкай-выразанкай. Тут выразаныя сонца, зоркі, месяц, птушкі, зверыкі – словам, паказаны створаны Богам свет. Малыя выцінанкі наклейваюцца таксама на рагах зоркі.

Майстэрства падляшскай, беларускай выцінанкі праяўлялася менавіта найбольш у калядных зорках. Выдатныя майстры выцінанкі жылі ў Галадах і іншых мясцовасцях каля Бельска і Гайнаўкі. Асабліва вылучалася ў гэтым вёска Крывятычы каля Орлі. Тут выконваннем гвяздаў і выцінанак да іх займаўся Якуб Багацэвіч. Цяпер гэтае мастацтва пераняў ягоны сын Пётр з сям'ёю.

Сапраўдная падрыхтоўка каляднай зоркі суправаджаецца малітвай. Бо спяванне калядак і з'яўляецца малітвай. Трэба падрыхтаваць як мага больш песень і каб іх тэксты былі поўныя і правільныя. У рукапісных падляшскіх «Багагласніках» можам знайсці дзясяткі старых калядак-кантаў з XVII-XVIII стст., якіх тэксты на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах. Найбольш вядомы з такіх «Багагласнікаў» стварыў Якуб Садоўскі з Тыневіч-Вялікіх. У ім знойдзем прыгожую старабеларускую калядку, якой першы куплет гучыць:

Воскликните Ангелы
На небесех согласно
Вы людие на земли
Пойте песни прыкрасно...

Традыцыйнае калядаванне не можа абмежавацца толькі калядкамі пра нараджэнне Хрыстовае. Трэба таксама павіншаваць гаспадара добрым словам, а калі ёсць для таго нагода – заспяваць віншавальную калядку. Такой нагодай можа быць нараджэнне дзіцяці, замужаства ці адпраўленне ў войска. І так, калі у доме была пара, якая нядаўна павянчалася, на Бельшчыне ёй каляднікі спявалі:

Ой, ясна-красна в лузі каліна.
Ой дай Боже в лузі каліна.
А шчэ й красніейша Іванова жена.
По дворцю ходіт, як міесэць сходіт.
До хаты зашла, як зора взышла...

Калядаванне на Новы Год

Вечар перад Новым Годам паводле юліянскага календара на Падляшшы называюць па рознаму – *Шчодры вечар*, *Богаты вэчур* або *Гоготуха*. Пад гэты вечар кожная гаспадыня павінна спячы бульбяную кішку і накрыць багаты стол. Моладзь тым часам мела свае заняткі. Яна рыхтавалася да калядавання, якое называецца шчадраваннем. У розных рэгіёнах Падляшша і Палесся яно мела свае асаблівасці. На беларускім Палессі распаўсюджаны яшчэ сёння звычай пераапранання ў розныя постаці са свету жывёл – мядзведзя, казу,

бусла і іншых. У Давыд-Гарадку на Палессі яшчэ пераапранаюцца ў «конікі» (накшталт кракаўскага ляйконіка).

Навагодняе калядаванне ў ваколіцах Белавежскай пушчы называецца *Гоготанем*. Галоўная роля каляднікаў – пажадаць гаспадарам шчодрага, добрага ўраджаю. Таму ў найбольш папулярнай каляднай шчадроўцы тут спяваецца:

Роді Божэ жыто на новое ліето,
Корч корчысты, стэб стэбэлісты,
Колос з колосочка, будэ жыта бочка,
Стэлісь стэбэліця, будэ міска пшэніці,
В клуні молуотно, в діежці зыхуодно...

На Шчодры вечар, апрача калядавання, дзяўчаты праводзілі час на варажбовых гульнях. Хацелі так даведацца калі выйдуць замуж і адкуль прыйдзе жаніх. А кавалеры тым часам не спалі – яны рабілі розныя няшкодныя фокусы – хавалі брамкі, зацягвалі вазы на саломай пакрытыя клуні. Гэта мела найчасцей звярнуць увагу дзяўчат на іх. Колькі наступнага дня было па вёсцы смеху.

У многіх цэрквах калісьці быў звычай на Новы год служыць уначы багаслужбы. У сам дзень свята Васілія Вялікага таксама хадзілі калядаваць. Але тады ўжо без пераапранання. Найчасцей спявалі старабеларускую калядку:

Новое лето зачынае, новый Цар цара низлагае
Убого ся народил, богатого засмутил Ирода...

Калядаванне з хрыстком

Калядаванне з хрыстком спалучаецца са святам Хрышчэння Гасподняга – Вадохрышчам. Звычай невядомы цяпер у большасці куткоў Падляшша.

Найважнейшым атрыбутам гэтага калядавання з'яўляецца хрысток. Як ён выглядаў у Арэшкаве? Сцяпан Копа піша: «На Вадохрышча ў Арэшкаве хадзілі з г.зв. хрыстком – букетам зробленым з лісткоў дуба (падрыхтаваным восенню), якія мацаваліся да кіёчка, а пасля ўпрыгожваліся каляровымі стужкамі з карбаванай паперы. У час калядавання дзяўчаты ўручалі хрысток кожнаму гаспадару. Яны спявалі:

Панна Марыя
На прыстолі стояла,
Два крыжы трымала,
А трэтім хрысціла (каділа).
Хрыстіетэся (кадіетэся) людэ
Хто в цэркві будэ,

Абрад хрыстка ў Грабаўцы. «Абрад хрыстка», рыс. Міраслаў Здрайкоўскі

А хто нэ будэ
Богу свіечку ставтэ,
А нам піруог дайтэ.
Клё-клё-клё,
Одчыняй пане окно,
На тобіе хрыстка,
Дай нам піружка.»

Памяць пра абрад калядавання з хрыстком збераглася на Падляшшы ў прыпушчанскім Арэшкаве.

Тое, што рэліктнае на Падляшшы, у братоў сербаў з'яўляецца да сёння галоўнай каляднай традыцыяй. Толькі тут з бадняком (нашым хрыстком) калядуюць на каляду Ражджаства Хрыстовага, 6 студзеня. Удзельнічае ў гэтым галоўным чынам старэйшая моладзь і мужчыны.

Раней, да свята, зрэзваецца малады дубочак з засушанымі лісткамі, вышынёю ў 2-4 метры. Яго прыбіраюць стужкамі, ставяць на воз або кузаў машыны і так возяць па сяле ці мястэчку, ад хаты да хаты. Заязджаючы да гаспадара, адбываецца цырымонія пажаданняў, за што каляднікі атрымліваюць пачастунак. Так можа калядаваць па некалькі групаў у сяле. Калі ўжо ўсе двары абыйдуць, групы з'язджаюцца пад Божы храм. Служыцца вячэрня, пасля якой, у прысутнасці свяшчэнніка, усе баднякі пры царкве спальваюцца.

На Ражджаство баднякі таксама павінны знаходзіцца ў сербскім доме. Упрыгожаныя дубовыя галінкі займаюць цэнтральнае месца, побач іконаў. У гарадах іх можна купіць перад святам на рынку.

Сербскі бадняк, з аднаго боку ёсць адпаведнікам нашага хрыстка, але таксама і падляшскай каляды або госця – снапа немалочанага жыта, які ў хату прыносіцца перад каляднай вячэрай. Ён стаіць на покуце пад іконамі менавіта да вадзяной каляды. Тады абрэзанымі каласамі пасвячаецца свянцонай вадою

дамы і гаспадаркі. Ведаем ужо, што хрысток у Парцаве прывязвалі да гэтых калоссяў.

Сімвалічнае значэнне хрыстка і жытніх каласоў з каляды аднолькавае. Збожжа гэта сімвал вечнасці, бесперапыннага аднаўлення жыцця. Тое ж самае абазначае калядная куцця. Такім сімвалам вечнасці з'яўляецца і хрысток – галінка дуба, дрэва вечнага ў параўнанні з жыццём паасобнага чалавека, а нават цэлых пакаленняў. Хрыстком можа быць толькі дуб, які не скідае лісткоў на зіму. Гэтыя лісткі цяжка адарваць ад галінкі нават пасля некалькіх гадоў.

Гэта зусім не так, як з елкай. Яна зрэзаная, калі не паставім яе ў ваду, хутка абсыплецца. Таму елку нашыя продкі не лічылі дрэвам вечна жывым і яна не прысутнічала ў каляднай абраднасці. Адзіным момантам, дзе яловыя галінкі ўжываліся гэта былі провады пакойніка. Пасечаную яліну рассыпвалі па дарозе з дому пакойніка да вывадных крыжоў.

Калядаванне с хрыстком апошнімі гадамі адраджаецца стараннем студыі фальклора Жэмэрва.

1 Як выглядае калядаванне на Ражджаство Хрыстовае і як да яго рыхтаваліся?

2 Як сустракалі Новы Год і як святкавалі ў гэты час у розных мясцінах нашага рэгіёну?

3 Як называлі вечар перад Новым Годам паводле юліянскага календара?

4 Якія былі тыпы калядных зорак?

5 Як праводзілі Шчодры вечар?

Дарафей Фіёнік

Агулькі – вясновая радасць

Адным з найпрыгажэйшых перыядаў года з'яўляецца велікодны тыдзень – Светлая сядміца. Калі глядзім на свет з шырока адкрытымі, па-дзіцячаму, вачыма і ўспрымаем блізкіх, знаёмых і незнаёмых нам людзей з чыстай душою, тады гэты час стане для нас сапраўды благаслаўлёным. І захочам бесперапынна спяваць – пра Хрыста і свет Ім створаны. А пра гэты свет няма прыгажэйшых песень за агулькі.

Вясновыя песні – агулькі або рагулькі спяваюцца на Падляшшы толькі ў велікодны тыдзень. Першыя запісы тых песень дайшлі да нас дзякуючы

Маёвыя карагоды ў Рагачах, 2013 год

праф. Юзафу Ярашэвічу. У адным з артыкулаў прыводзіць ён тэксты з вёскі Дабрывада. Абрад рагулькі спраўляўся моладдзю выключна на велікодным тыдні. Збіраліся дзесьці на канцы сяла. З дзяўчат выбіралі адну, якую называлі рагулькою. Бралі яе ў круг, які называўся гародам. І пачыналі хадзіць наўкола, спяваючы: *Моя міла рагулько... встань барзо ранюлько...* Рагулька брала адну з дзяўчат з гарода і танцавала. Цэлы час спявалі рагулькі...

У недалёкіх ад Дабрывады Рагачах на велікодным тыдні таксама спявалі рагулькі. Пачыналі ўжо пасля пасхальнай вячэрні. Моладзь выходзіла з царквы і за яе агароджаю рабіла гарод, значыць вадзіла карагоды, спяваючы рагулькі:

Ой, хто, хто ж по саду ходіт,
Ой, хто, хто ж каліну ломіт,
Каліна зэлёная, чырвона, обшчыкана
Ранэнько...

У памяці Ніны Такаюк з Мікуліч, што каля Рагачоў, захаваўся цікавы завяршальны момант, звязаны з рагулькамі. У правадны панядзелак рабілі з саломы чучала, ішлі з ім на мост, падпальвалі і кідалі ў ваду. Тое чучала называлі рагулькаю.

У расказах пра рагулькі-агулькі паўтараецца тое, што іх спявалі ў найпрыгажэйшых месцах – на грудку, на краю сяла, на высокім беразе ракі, на лясной паляне. На завяршэнне такой абрадавай сустрэчы абавязкова спявалі агульку *Положу кладку вэрбову...*

Назва рагулькі або агулькі, як акрэсленне вясновых песень, распаўсюджана амаль на цэлым бельска-гайнаўскім Падляшшы. Возьмем такое сяло Арэшкава, на паўднёва-заходнім краю Белавежскай пушчы. Вось фрагмент агулькі адтуль:

Там за ліесом, за бором
За сынэнькім езёром
Там слонэчко іграло
З міесэцём розмовляло…

Іншая агулька з тымі ж матывамі запісана ў Малінніках:

Ой, сэлом, сэлом
Сэлом Малінніцкім
Каліна-маліна,
Шчэй чэрвона рожа
Ой, зышло, зышло
Тры міесяцы ясны,
Тры зоронькі красны…
Пэрша місэчок молоды Іванко
А ёго зоронька молодая Маня…

Тэма падляшскіх агулькаў заключаецца перад усім у суадносінах паміж хлопцам і дзяўчынай ды іх бацькамі. Расказваюць пра нараджэнне любові, усялякія ў ёй перашкоды, перажыванні дзвюх старон. У тэкстах практычна ўсё адбываецца на прыродзе. У агульках апісаны свет ідэальны, вельмі прыгожы, райскі, у які чалавеку хочацца ўвайсці і які заварожвае. Усё падкрэслівае музыка.

Веснавыя забавы дзяцей на вуліцы ў Храбалах

Большасць агулькаў у дадзенай ваколіцы спяваецца звычайна на адну мелодыю. Часам, як ў Дабрывадзе, маем і другую мелодыю, якая прыпісана да рагулькаў тыпова карагодных. У ваколіцах Лядскай пушчы ёсць дзве тыпова агулькавыя мелодыі. На адну спяваюцца агулькі любоўнага зместу, на другую агулькі карагоднага, жартоўнага характару. У Лісоўчычах і Апацы на Камянеччыне спяваюць вельмі прыгожую рагульку – *Чэрэз нашэ сэльце всэ вэзут дэрэвцэ*, з матывам зары і месяца. Троіцкая песня з тымі ж матывамі бытуе ў беларусаў Латгаліі (Латвія): *Ляцела дзярэўца цераз наша сельца*...

Асаблівым рэгіёнам, дзе бытуюць агулькі, ёсць ваколіца мястэчка Нараўка каля Белавежскай пушчы. Тут напевы арыгінальныя, бліжэйшыя хіба да Панямоння. Далей на ўсход ці поўнач агулькі ўжо не выступаюць.

Адной з найпрыгажэйшых веснавых песняў з Падляшша ёсць *Там по маёвуй росі*. Тыповымі для яе асобамі з'яўляюцца Ясь і Кася. Ясь наогул мае праблемы – а то ў святліцу-цямніцу яго садзяць на год-чатыры, а то лічаць бацькам чужога дзіцяці і мусіць ён выцяць ліпку на калыбку...

Варта згадаць таксама пра іншыя веснавыя песні, якія называюцца *бородайкамі*. Пра іх толькі згадваюць у вёсцы Плёскі над Нарваю. А спяваюць іх яшчэ ў ваколіцах палескага Драгічына. Тэмы барадаек падобныя да падляшскіх агулькаў.

Агулькі гэта вельмі старыя песні, пра што сведчыць іх змест. Ён пераносіць нас у калінавыя лясы, па якіх праходжваюцца павы. Бачым там дзяўчыну, якая беліць і вышывае ручнікі на вясельныя падаркі ды сее руту на шлюбны вянок:

Там коло мліна росцвіла каліна
Млода Олечка подаркі біліла.
Вона біліла, гором вышывала,
Свого Іванка штодэнь дожыдала.

У іншай песні прыезджыя госці п'юць віно, а салаў'і ў гэты час звіваюць гняздзечка. Часам пачуем нараканне дзяўчыны і маладой жонкі або дражнілкі хлопцаў з дзяўчатамі. Агулькі гэта своеасаблівы эпас падляшскага, беларускага люду. У сімвалах, запісаных у гэтых песнях, зафіксаваны ягоныя традыцыі, мудрасць і душа.

1 У які час спявалі агулькі?

2 Якія асноўныя матывы выступаюць у вясновых песнях?

3 Дай сінонімы да слова агулькі.

4 Якое значэнне мела спяванне гэтых песняў і як яно ўплывапа на адносіны паміж жыхарамі вёскі?

Пісанкі Марыі Юркевіч з Мацькавіч гм. Мельнік, пісанкі піша Ірэна Грыцюк з Машчоны Панскай гм. Нурэц Станцыя, пісанкі з Турны Вялікай гм. Семяцічы

Дарафей Фіёнік

Пісанкі

Калі набліжалася свята Вербніцы, усе гаспадыні ў бельскіх вёсках рыхтавалі пісанкі. Трэба было напісаць столькі яек, каб хапіла пакласці ў кошык са свянцонкай, даць святару ды раздаць хросніцам, хроснікам і сваякам. Да таго ж – занесці на магілы сваіх блізкіх. Некалькі пісанак трэба было захоўваць цэлы год. Пакладзеныя на зіму паміж падвойнымі вокнамі мелі захоўваць хату перад няшчасцямі.

Гэтак жа рабілі гаспадыні каля Сямятыч, Мельніка і Грабаркі. Што радніла пісанкі з Пабужжа з бельскімі? Тут і там пісалі іх аднолькавай прыладай – лейкай, якую называлі таксама стугаўкай. У традыцыйных пісанак з гэтай тэрыторыі падобныя ўзоры і сімволіка. Да таго ж, так каля Бельска, як і Мельніка ці Сямятыч, стваранне пісанак займаліся пераважна праваслаўныя беларусы.

Калі ў XII стагоддзі па Бугу плылі гандлёвыя судны, пісанкі былі важным атрыбутам мясцовага духовага жыцця. Яны выконвалі інфармацыйную функцыю, бо напісаныя лейкай сімвалы неслі ў сабе інфармацыйны змест. Але, галоўным чынам, былі важныя для замагільнага жыцця чалавека – з пісанкай яго адпраўлялі ў патойбаковы свет. А пасля, штогадова, ягоныя нашчадкі абнаўлялі тое адпраўленне. Гэта захавалася і да нашых дзён, калі паслявелікодную нядзелю і паслявелікодны панядзелак, на Провады ці ў іншы дзень тае пары, ідзем на могілкі ўспамінаць продкаў. І нясем пісанкі.

Калісьці пісанкі закопвалі ў магілу нябожчыка. Не заўсёды было гэта сапраўднае яйка, бывала, што рабілі яго з гліны або каменя, каб даўжэй захоўвалася. Прыклады такіх пісанак, найчасцей з арнаментамі дрэва жыцця і клямар, захаваліся, па сутнасці, па ўсёй заходняй і ўсходняй Славяншчыне. Першыя вядомыя пісанкі з Падляшша паходзяць з Данілова каля Суража (XI/XII стст.), а з пабужных зямель – з могільніка каля Чорнай-Вялікай (XI-XIII стст.). Нашыя пісанкі прадаўжаюць колішнія традыцыі.

Сёння гэтую традыцыю захавала толькі адна група насельніцтва – з усходнеславянскімі каранямі. Абшар выконвання пісанак з дапамогай лейкавага баціка ды пісанак у агульнасці можа быць паказальнікам этнічнай прыналежнасці насельніцтва. Гэта адносіцца не толькі да пабужных ці падбельскіх мясцовасцей, але і Ліпска на Бобры, у даўняй Гарадзенскай зямлі. Там пісанкі, тэхнікай іголкавага баціку, выконваюць людзі беларускага радаводу.

Для пісанкі найлепш падыходзіць белае яйка. Белізна добра кантрастуе з колерам фону. Яна мае і сімвалічнае значэнне – гэта чысціня, беззаганнасць. Калісь фон быў найчасцей чырвоны або цыбульнікавы, а пісанкі былі ў прынцыпе двухколерныя. Узор быў тады толькі белы. Цяпер жа пішуць пісанкі двух-, трох- або чатырохколерныя. Для апошніх падбіраюць колеры белы-жоўты-зялёны-чырвоны, белы-жоўты-зялёны-карычневы, белы-жоўты-чырвоны-сіні, белы-жоўты-чырвоны-зялёны. Здараецца, хаця рэдка, што некаторыя пісальніцы рыхтуюць пяціколерныя пісанкі: бела-жоўта-зялёна-чырвона-сінія (карычневыя). Чорнага фону пазбягаюць.

Узоры пісанак, выведзеных лейкай, захоўваюць традыцыйную сімволіку. Часам толькі мастацкае ўяўленне творцы ўскладняе яе расшыфроўку. Прынцыпова мясцовыя пісанкі маюць сіметрычна падзеленае поле на чатыры, восем, шаснаццаць або дваццаць чатыры часткі. На скрыжаваннях гэтых падзелаў пішуцца ўзоры. Некаторыя з іх маюць свае назвы: ветракі, грабелькі, драбінкі, палачкі, вяночкі, вербачкі або елачкі. Сустракаюцца таксама разеты, кропкі, хвалістыя лініі і закрутасы. Вось сімвалічнае значэнне некаторых узораў:

Елачка, калі з аднаго ствала вырастаюць галінкі аднолькавай даўжыні, сімвалізуе чалавека. Елачка, калі з аднаго ствала вырастаюць галінкі рознай даўжыні, абазначае дрэва жыцця. Васьміпялёсткавая кветка або разета абазначае жыццё або сонца. Закрутасы сімвалізуюць ваду. Кропкі абазначаюць зерне або кроплі дажджу.

Так склалася, што найбагацейшыя пісанкавыя традыцыі захаваліся да нашага часу ў даўніх млынавых пасяленнях уздоўж ракі Машчонай. Па яе цячэнні, ужо ў сярэдневякоўі, дзейнічалі млыны, падпарадкаваныя мельніцкаму замку. Ад прозвішчаў млынароў Сыча, Вакуловіча, Аксютыча, Паўлавіча, Гомата, Кудэліча, Альховіча, Станковіча і Мацьковіча былі названы ўзніклыя побач млыноў мясцовасці.

Паказальнае, што найбольш дзейныя пісальніцкія традыцыі захаваліся пры крыніцах і ўпадзенні рэчкі Машчонай – у Машчонай-Панскай ды Мацьковічах і Станковічах. Цікава таксама, што пісальніцтвам займаліся там таксама мужчыны, а іх улюбёным узорам былі млынкі. Магчыма, што менавіта млынары калісь пісалі пісанкі.

Таксама іншы важны асяродак пісальніцтва – Турна-Вялікая – была калісьці млынарскай вёскай. Яшчэ не так даўно былі там на рэчцы Каменцы два млыны. А прысутнае там прозвішча Млынарчук выразна сведчыць пра гэтую традыцыю.

Пабужныя пісальніцы апісваюць на сваіх пісанках сваю Малую Бацькаўшчыну. Перадаюць нам ейны спрадвечны код, якога мы з'яўляемся пераймальнікамі. То тут калісьці праслаўлялі ікону Спаса Ізбаўніка ў Мельніку (XIII ст.), а ў наш час ікону Багародзіцы Аранты, таксама з Мельніка, ды ікону Іверскай Багародзіцы са Святой Гары Грабаркі. Пісанкі, хаця нескладаныя па форме, сваімі колерамі, узорамі і сімваламі ўпісваюцца ў багатую духова-культурную традыцыю нашай прыгожай пабужнай зямлі.

1 Колькі пісанак трэба было падрыхтаваць і каму іх дарылі?

2 Апішы сімвалічнае значэнне некаторых узораў, якія выступалі на пісанках.

3 Якія былі традыцыйныя колеры пісанак і як яны размяшчаліся?

4 Што ў гэтай сферы памянялася?

СЛАВУТЫЯ ЛЮДЗІ НАШАЙ ЗЯМЛІ

Ігнат Анацэвіч – пачатак гістарычнага руху

Ігнат Анацэвіч нарадзіўся ў 1780 годзе ў сям'і ўніяцкага святара ў Малой Бераставіцы, што ў дзесяці кіламетрах на ўсход ад Крынак. Пачатковую адукацыю атрымаў ён у Ваўкавыску і Гродне, а пасля вучыўся ў Беластоцкай гімназіі. Нейкі час ён настаўнічаў на Аўгустоўшчыне, а затым паступіў на настаўніцкія курсы ў Элку, якія закончыў з пахвальнай граматай. У той час землі цяперашняй Беласточчыны, у выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, апынуліся ў складзе Прусіі. Па рэкамендацыі міністра Шрэтэра, які раней вучыў Анацэвіча ў Элку, прускі кароль у 1802 годзе назначыў нашага бераставіцкага земляка на далейшую вучобу за дзяржаўны кошт у Кёнігсбергскі ўніверсітэт, заснаваны ў 1544 годзе з мэтай павышэння культуры краіны, падрыхтоўкі тэолагаў, урачоў, юрыстаў. На пачатку XIX ст. яго інтэлектуальны ўплыў адчуваўся далёка за межамі Прусіі. Стараннасцю, узорнымі паводзінамі і праўдзівасцю Ігнат Анацэвіч набыў папулярнасць сярод нямецкіх вучоных. Не дзіўна, што пасля заканчэння ўніверсітэта ён атрымаў пасаду выкладчыка польскай мовы, пачаткаў рускай мовы, а пазней і афіцыйнага перакладчыка прускага караля. У час напалеонаўскага нашэсця на Прусію ў 1807 годзе Анацэвіч хадайнічаў перад французскай знаццю за тамашнімі расейцамі, чым звярнуў на сябе ўвагу графа Мікалая Румянцава, уплывовага любіцеля гісторыі і археалогіі. Румянцаў запрасіў Анацэвіча ў свой маёнтак каля Гомеля, дзе была багатая бібліятэка і многа даўніх рукапісаў; гэтыя фонды выклікалі вялікую цікавасць у маладога даследчыка.

У 1809 годзе Анацэвіч паступае ў Віленскі ўніверсітэт, які завяршае са ступенню магістра філасофіі і астаецца там выкладчыкам агульнай гісторыі. У 1813-1818 гадах Анацэвіч працуе выкладчыкам у Беластоцкай гімназіі, пасля часова пераходзіць на пасаду прафесара гісторыі і статыстыкі ў Віленскі ўніверсітэт. У 1821 годзе пасаду загадчыка кафедры гісторыі займае Іаахім Лялевель і Анацэвіч падае просьбу перавесці яго на працу ў Віленскую гімназію, але тадышні міністр адукацыі князь Галіцын запрапанаваў яму кафедру рускай статыстыкі і дыпламатыі, на што Анацэвіч згадзіўся. У 1828 годзе ў выніку рознагалоссяў з кіраўніцтвам універсітэта, якое ён абвінавачваў у злоўжываннях, а кіраўніцтва яго ў паланафільстве і вальнадумстве, Анацэвіч быў вызвалены з універсітэта і сасланы на Гродзеншчыну. Неўзабаве, аднак, за заступніцтвам Румянцава, Анацэвіч пераходзіць у Пецярбург, дзе працаваў у Румянцаўскім музеі і Археаграфічнай камісіі. Свой даследчыцкі запал Анацэвіч накіраваў на вывучэнне гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, сабраў ён безліч матэрыялаў, аднак не ўдалося яму іх апублікаваць. Шмат матэрыялаў па гісторыі ВКЛ перадаў ён выдатнаму польскаму пісьменніку Юзафу Крашэўскаму, род якога выводзіўся з Пружанскага павета. Анацэвіч штогадова ладзіў экспедыцыі па мясцовасцях былога ВКЛ, дзе рупліва

вывучаў матэрыялы па даўніне. Ён перапісваўся са шматлікімі еўрапейскімі карыфеямі гістарычных навук.

Памёр Ігнат Анацэвіч у 1845 годзе ў Пецярбургу.

Адзін з даведнікаў так характарызуе дзейнасць Ігната Анацэвіча і ягоных паслядоўнікаў: Існуе небеспадстаўная думка, што ўласна беларускую нацыянальную ідэю стварылі не шляхецкія паэты і рэвалюцыянеры, а гістарычна адукаваныя спакойныя паповічы: сыны ўніяцкіх святароў Міхал Баброўскі, Ігнат Даніловіч, Ігнат Анацэвіч, Іосіф Ярашэвіч і інш., якія яшчэ напачатку XIX ст. здолелі нацыянальна вызначыць Беларусь. Яны склалі славутую кагорту прафесараў Віленскага ўніверсітэта 1820-х гадоў, якая, разам з Іаахімам Лялевелем, зрабіла «рэвалюцыю на карысць духа з уронам для матэрыі».

Сваёй дзейнасцю ва ўніверсітэце, дзе да таго квітнелі толькі матэматыка ды біялогія, яны вывелі грамадскія навукі на першараднае месца і паклалі пачатак гіганцкаму гістарычнаму руху. Баброўскі, Даніловіч, Анацэвіч, Ярашэвіч, а таксама Тэадор Нарбут былі першымі беларускімі прафесійнымі гісторыкамі, якія заклалі падмурак нацыянальнай канцэпцыі гісторыі сваёй Бацькаўшчыны. Сваімі даследамі і самаахвярнасцю яны стварылі рэальную навуковую базу, на якой грунтаваўся і якую выкарыстоўваў пазнейшы беларускі нацыянальны рух.

1 Як выглядаў адукацыйны шлях Ігната Анацэвіча?

2 З кім супрацоўнічаў Ігнат Анацэвіч у сваёй навуковай дзейнасці?

3 У чым заключаецца, паводле цябе, самая вялікая заслуга гісторыка з Малой Бераставіцы?

Вільня, касцёлы св. Анны (злева) і свсв. Францішка і Бернарда

Міхал Баброўскі. Вулька-Выганоўская. Помнік Анны Баброўскай з Крупіцкіх – маці Міхала Баброўскага і царква ў Вульцы-Выганоўскай

Дарафей Фіёнік

Міхал Баброўскі – падляшскі пачынальнік славяназнаўства

Міхал Баброўскі нарадзіўся ў 1784 г. ў сям'і настаяцеля царквы ў Вульцы-Выганоўскай а. Кірыла Баброўскага і Анны з Крупіцкіх. Спачатку вучыўся ў Драгічыне, а пасля ў гімназіі ў Беластоку, дзе пазнаёміўся з Ігнатам Даніловічам з Грыневіч. Вучобу прадаўжаў у Галоўнай семінарыі ў Вільні, дзе вучыўся багаслоўя, заканадаўства і філасофіі.

Пасля рукапалажэння ў свяшчэннікі ў 1815 г., са званнем магістра філасофіі і дацэнта Віленскага ўніверсітэта, а. Міхал у 1817 годзе падаўся

ў навуковае падарожжа па Еўропе. Наведаў Францыю, Італію, Германію ды Балканы. Асаблівы плён прынёс яму там кантакт з праф. Іосіфам Добраўскім. Навукоўцаў спалучала зацікаўленне славянскай бібліяграфіяй і гісторыяй славянскага друку. Айцец Міхал Баброўскі вёў ужо тады доследы старажытных славянскіх рукапісаў і першых друкаў. Ён жа напісаў першае даследаванне пра дзейнасць XVI-вечных друкароў Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца.

Аднак, як звяртае ўвагу а. Плакід Янкоўскі, галоўным зацікаўленнем Баброўскага была, вядома, біблейская археалогія і герменеўтыка. Асновай доследу Святога Пісання а. Баброўскі лічыў добрае веданне моў арыгінала – яўрэйскай і грэчаскай. Сам ведаў іх дасканала; надта валодаў амаль усімі тагачаснымі еўрапейскімі мовамі.

У 1822 г. а. Міхал Баброўскі пачаў працу ў Віленскім універсітэце на кафедры Св. Пісання. Адсюль выязджаў у навуковыя экспедыцыі, м.інш. у бібліятэку Супрасількага манастыра. Тут жа адшукаў і выявіў навуковаму свету найстарэйшы славянскі рукапіс XI ст. – «Мінею-Чэццю». У Супраслі праф. Баброўскі дапамагаў праф. Ігнату Даніловічу ў расшыфроўцы старых рукапісаў па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.

Пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта а. праф. Міхал Баброўскі перасяліўся ў Шарашова Пружанскага павету, дзе стаў настаяцелем праваслаўнага прыхода. Тут памёр у 1848 г. Магіла прафесара знаходзіцца і сёння на шарашоўскім могільніку.

Першы біёграф а. Міхала Баброўскага, а. Плакід Янкоўскі напісаў: «Баброўскі лёгка мог паказацца звышпатрабавальным і цяжкім чалавекам. А нейкія антычна-суровыя рысы твару і як бы да іх дабраная інтанацыя голасу, у сваю чаргу не паказвалі зусім у карысць непасрэднасці. Між тым, пад гэтай абалонкай хавалася – не ў глыбіні, але тут жа звонку – столькі цёплага пачуцця, дабрыні і сардэчнай прастаты...».

На бацькаўшчыне а. Міхала Баброўскага захавалася толькі адна памятка пасля славутага земляка – каля царквы ў Вульцы-Выганоўскай стаіць помнік на магіле яго маці Анны з Крупіцкіх.

Айцец Міхал Баброўскі меў у сям'і годнага прадаўжальніка сваіх зацікаўленняў. Ягоны братанак Павел Баброўскі даследаваў гісторыю і культуру грамадства Гродзенскай губерні. Плёнам ягонай працы стаў двухтомны твор «Материалы для географии и статистики Росии. Гродненская губерня» (С.Пецярбург, 1863). Даследчык змясціў тут м.інш. гістарычныя манаграфіі падляшскіх гарадоў.

1 Якія краіны наведаў і якія мовы вывучыў Міхал Баброўскі?

2 Чым займаўся ў сваім жыцці Міхал Баброўскі і што яго цікавіла?

3 Як апісаў даследчыка і праваслаўнага свяшчэнніка айцец Плакід Янкоўскі?

Дарафей Фіёнік

Ігнат Даніловіч – прафесар з Грыневіч-Вялікіх

Ігнат Даніловіч, сярод пачынальнікаў беларускага адраджэння XIX і пачатку XX стагоддзя – гэта адна з самых яркіх індывідуальнасцей. Нарадзіўся будучы прафесар у 1788 годзе ў сяле Грыневічы-Вялікія каля Бельска. У гэтай старажытнай вёсцы ўжо ў эпоху сярэднявечча жылі праваслаўныя баяры Грыневіцкія, якіх заданнем была ахова бельскага замка. Баяры былі фундатарамі царквы св. Прарока Іліі. У II палавіне XVIII стагоддзя яе настаяцелем быў а. Мікалай Даніловіч, бацька Ігната.

Спачатку Ігнат Даніловіч вучыўся ў Драгічыне, пасля ў гімназіі ў Беластоку. На канікулы прыязджаў у родныя Грыневічы, дзе ўслухоўваўся ў мілыя гукі мясцовай беларускай мовы. Пасля, калі пачне вывучаць старабеларускія рукапісы, гэта дапаможа яму добра разумець іх змест.

У 1810 г. Ігнат Даніловіч паступіў на юрыдычны факультэт Віленскага ўніверсітэта, пасля заканчэння якога ў 1814 г. пачаў выкладаць тут цывільнае літоўскае (беларускае) права. Пераломным у яго навуковай працы быў 1819 год, калі ён увайшоў у цесны кантакт з праф. а. Міхалам Баброўскім і праф. Іосіфам Ярашэвічам. Прафесар Баброўскі звярнуў яго ўвагу на старажытныя рукапісы, якія захоўваліся ў Супрасльскім манастыры.

У 1823 г. Ігнат Даніловіч стаў звычайным прафесарам Віленскага ўніверсітэта. Адначасова быў членам Камісіі для падрыхтоўкі выдання Літоўскага Статута 1588 года. Пасля выкрыцця ўладамі ў Віленскім універсітэце патаемных гурткоў, у 1824 г. некаторыя прафесары ўніверсітэта былі пазбаўлены працы. Ненадзейным палічылі таксама Даніловіча. Яго звольнілі з працы на кафедры і загадалі выехаць з радзімы без права вяртання. У 1825-1829 гадах быў ён прафесарам права Харкаўскага ўніверсітэта.

У 1830 г. быў запрошаны ў Пецярбург для працы над Зводам законаў для заходніх губерняў Расіі. Але яго выдання не ўдалося ажыццявіць, паколькі ў 1840 г. Літоўскі Статут для земляў Беларусі і Літвы спыніў сваю заканадаўчую моц.

У 1835 г. Ігнат Даніловіч стаў першым дэканам юрыдычнага факультэта Універсітэта св. Уладзіміра ў Кіеве. Там ён працягваў свае даследаванні ў галіне старабеларускага права. Праводзіў таксама археалагічныя раскопкі. Пасля закрыцця Кіеўскага ўніверсітэта, у 1839 г. праф. Даніловіч пераехаў у Маскву, дзе выкладаў права ва ўніверсітэце. Памёр за мяжой 12 ліпеня 1843 г.

Прафесар Ігнат Даніловіч усю сваю навуковую дзейнасць прысвяціў вывучэнню матэрыялаў па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Ён адшукаў і даследваў «Хроніку Быхаўца», беларускі летапіс XVI стагоддзя. Вывучаў рукапіс 1519 г. з арыгінальным летапісам XV ст., знойдзеным у Супраслькім манастыры. Тэкст летапісу ўвайшоў у ягоную кнігу „Latopisiec Litwy i Kronika ruska", выдадзеную ў Вільні ў 1827 г.

У час пабыўкі ў Харкаве знайшоў каштоўнае выданне Літоўскага статута 1529 г. У гэты час апублікаваў працу «Гістарычны агляд літоўскага заканадаўства». Плёнам навуковай працы Даніловіча сталі таксама іншыя выданні, м.інш.: „O medalach Radziwiłłowskich" (1830), «О литовских летописях» (1840), «Исторический взгляд на древнее образование славянских городов» (1841), «Книга посольская метрики Великого княжества литовского» (2 тамы, 1843).

Але, несумненна, найбольшае дасягненне ў навуковай дзейнасці прафесара – гэта пасмяротна выдадзены друкам у гадах 1860-1862 двухтомны „Skarbiec dyplomatów papieskich, cesarskich, królewskich, książęcych...". Гэта збор амаль 2400 дакументаў, якія тычацца гісторыі Беларусі, Літвы і Польшчы. Тут можам знайсці таксама шмат дакументаў па гісторыі Падляшша. Гэтае фундаментальнае выданне ўжо паўтара стагоддзя з'яўляецца неацэнным матэрыялам для даследвання мінулага Беларусі, Польшчы і Літвы.

1 Прадстаў галоўныя этапы жыцця Ігната Даніловіча.

2 Што зрабіў, як гісторык і юрыст, Ігнат Даніловіч у галіне старабеларускага права?

3 Якія навуковыя працы з'яўляюцца доказам высокай прафесійнай падрыхтоўкі прафесара Ігната Даніловіча?

Дарафей Фіёнік

Іосіф Ярашэвіч

Іосіф Ярашэвіч быў магістрам права, прафесарам Віленскага ўніверсітэта на кафедры літоўска-польскага права, дыпламатыі і статыстыкі, выдатным гісторыкам Падляшша, Літвы, Беларусі і Украіны. Нарадзіўся ён у 1793 годзе ў Бельску-Падляшскім у сям'і гарадскога пісара Бенедыкта Ярашэвіча. Іосіф Ярашэвіч стаў цікавіцца гісторыяй роднага горада і навакольных мясцовасцей. Гэтаму спрыяла праца бацькі і доступ да архіваў бельскай ратушы.

Пачатковую і сярэднюю адукацыю Іосіф Ярашэвіч атрымаў на Падляшшы. Тут цікавіўся звычаямі і абраднасцю мясцовага насельніцтва, прыслухоўваўся мове, знаёміўся з народнай творчасцю. Адукацыю прадаўжаў у Віленскім універсітэце. Працаваў у Крамянецкім ліцэі на Валыні, дзе выкладаў рымскае і літоўска-польскае права.

У 1826 годзе Іосіф Ярашэвіч пачаў працу на юрыдычным факультэце Віленскага ўніверсітэта, два гады пазней атрымаў там званне звычайнага прафесара. На ягоных лекцыях прысутнічаў Юльюш Славацкі, які нейкі час наймаў кватэру ў Ярашэвічаў. У Вільні Іосіф Ярашэвіч трымаў шчыльны кантакт з іншымі вучонымі, што выводзіліся з Падляшша: Міхалам Баброўскім і Ігнатам Даніловічам.

Пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта ў 1831 годзе, Ярашэвіч дзейнічаў у Часовым школьным камітэце ў Вільні. Неўзабаве саракагадовы прафесар рашыў вярнуцца ў родны Бельск. Тут, насупраць пакармеліцкага касцёла, надалей стаялі два яго абшырныя дамы.

У Бельску Іосіф Ярашэвіч стаў займацца гісторыяй Падляшша, Літвы і Беларусі. Свае даследаванні, навуковыя працы і артыкулы, палемікі і карэспандэнцыі пасылаў у, м.інш., „Znicz", „Biruta", „Athenaeum", „Biblioteka Warszawska", „Przyjaciel Ludu", „Kwartalnik Naukowy", „Gazeta Warszawska", „Przyjaciel Domowy", „Гродненские Губернские Ведомости".

Пісаў пра Бельск таксама ў кантэксце мінулага Літвы, пра Бельскую зямлю і яе даўніну ды пра іншыя падляшскія паселішчы і гарады. У сваіх працах значную ўвагу адводзіў археалогіі, этнаграфіі і фальклору, улічваючы падляшскія напластаванні славянскіх традыцый.

Іосіф Ярашэвіч памёр 1 лютага 1860 года ў Бельску-Падляшскім, пра што была запіска ў актах сконаў Фарнага касцёла.

Ніводзін гісторык, фалькларыст ці этнограф, якога цікавіць Падляшша, не можа ставіцца абыякава да апрацовак Ярашэвіча. Іх вынікі аб'ектыўныя і сумленныя, свае заключэнні вучоны пацвярджаў шматлікімі фактамі. Даводзіў, што Падляшша ў дахрысціянскую эпоху падлягала ўплывам і панаванню яцвягаў. З імі змагаліся кіеўскія, мазавецкія і літоўскія князі.

Распаўсюджанне рускіх і польскіх уплываў на Падляшша пачынаецца даволі рана, ужо ў эпоху Уладзіміра Вялікага і Баляслава Храбрага. Ярашэвіч лічыў, што больш магутныя былі рускія ўплывы, вынікаючыя з апанавання Падляшша кіеўскімі і галіцкімі князямі.

Шмат прац Іосіф Ярашэвіч прысвяціў гісторыі Літвы, Беларусі і Украіны. Яны напісаны са знаўствам. Аўтар быў чалавекам усебаковай эрудыцыі, да таго ж вельмі працавітым.

Асаблівае значэнне для гісторыі Літвы, Падляшша, Беларусі і Украіны мае ягоная манаграфія „Obraz Litwy pod względem jej oświaty i cywilizacji od czasów najdawniejszych do końca XVIII wieku" (Вільня, 1845-46 гг.), у якой грунтоўна паказаў стан дахрысціянскай Літвы і яе гісторыю пасля ўвядзення хрысціянства. Гэта вельмі цікавая навуковая праца, якая дала аўтару высо-



OBRAZ LITWY
POD WZGLĘDEM JÉJ CYWILIZACYI,
OD
CZASOW NAJDAWNIEJSZYCH
DO KOŃCA WIEKU XVIII.
PRZEZ
J. JAROSZEWICZA
Professora prawa krajowego w b. Uniwersytecie Wileńskim.

CZĘŚĆ I.
LITWA POGAŃSKA.

WILNO.
NAKŁADEM RUBENA RAFAŁOWICZA KSIĘGARZA WILEŃSKIEGO.
W Drukarni M. Romma.
1844.

Гістарычны цэнтр Вільні. Побач „Obraz Litwy...” Іосіфа Ярашэвіча

кае прызнанне. Калі ўлічым час яе напісання, стан тадышняй гістарычнай навукі і веданне гістарычных крыніц, тады наватарства і крытычнасць ягоных поглядаў справядліва захапляюць. У гэтай працы аўтар піша пра паходжанне літоўскіх плямён, характар літоўцаў, узровень іх першабытнай цывілізацыі, гаспадарчае развіццё, культуру, абраднасць ды хрысціянскія абычаі. Ён пераканаўча даказаў, што літургія на царкоўнаславянскай мове ды старарускія мова і культура мелі неаспрэчны ўплыў на жыццё і прагрэс літоўскіх плямён. Асаблівае значэнне мела праваслаўнае веравызнанне, якое дабравольна прымалі літоўскія князі, асабліва наследнікі Міндоўга – Гедзімін, Альгерд і Кейстут.

1 З чаго пачаў сваю працу будучы прафесар Віленскага ўніверсітэта?

2 З якімі часопісамі супрацоўнічаў Іосіф Ярашэвіч?

3 Чым займаўся І. Ярашэвіч і якія тэмы яго цікавілі?

4 Якія веды, погляды і навуковыя даследаванні змясціў прафесар у сваёй манаграфіі „Obraz Litwy pod względem jej oświaty i cywilizacji od czasów najdawniejszych do końca XVIII wieku”?

Антон Сасноўскі – асветнік з Кляшчэль

У царкве св. Мікалая ў Кляшчэлях, якія гарадскі прывілей атрымалі ў 1523 г. ад караля Жыгімонта Старога, з 1799 года служыў свяшчэннікам а. Антон Сасноўскі. Быў ён сынам мясцовага свяшчэнніка а. Юрыя Сасноўскага, які стварыў у Кляшчэлях вядомую школу царкоўнікаў. Яна прычынілася да павышэння ўзроўню кадраў уніяцкай Царквы.

Айцец Антон Сасноўскі прадаўжаў асветную дзейнасць бацькі. Арганізаваў школы ў прадмесцях Кляшчэль: Кузаве, Дашах, Дабрывадзе і Чаромсе; асноўным прадметам навучання была тут царкоўнаславянская мова. У 1820 г. у школах гэтых вучыліся 102 вучні. У саміх Кляшчэлях дзейнічала прыхадская школа, дзе вучылася 90 дзяцей. Вучыліся тут царкоўнаславянскай, польскай і рускай моў, матэматыкі і царкоўнага спеву. Сам а. Антон Сасноўскі вучыў практычнага агародніцтва. Кляшчэлеўская школа была вядомая сваім хорам, які вёў Ян Янкоўскі. Паводле праф. Міхала Каяловіча, царкоўны спеў у Кляшчэлях меў даўнюю традыцыю, а яго навука перадавалася з пакалення ў пакаленне.

Працу настаяцеля ў Кляшчэлях а. Антон Сасноўскі спалучаў з адказнымі царкоўнымі пасадамі. Быў канонікам Берасцейскай капітулы, настаяцелем царквы св. Мікалая ў Вільні, адным з бліжэйшых супрацоўнікаў мітрапаліта Ігнація Булгака. Айцец Антон вельмі перажываў за матэрыяльны стан уніяцкай царквы. Бачыў беднасць і неадукаванасць прыхадскога духавенства. Адначасова хвалявалі яго злоўжыванні ўніяцкага ордэну базіліянаў. Бачыў пагрозу паступаючай латынізацыі і паланізацыі ўніяцкай Царквы ды стараўся гэтаму процідзейнічаць. І гэта яму часткова ўдалося.

Айцец Антон Сасноўскі меў шырокія гістарычныя, філалагічныя і этнаграфічныя зацікаўленні. Вывучаў і апрацоўваў дакументы і старыя рукапісы, м.інш. «Киевскую псалтырь» з бібліятэкі Супрасількага манастыра.

На тэрыторыі свайго прыхода запісваў абрадавыя песні і народныя традыцыі. Супрацоўнічаў з праф. Іосіфам Ярашэвічам, які апублікаваў яго запісы веснавых песень з вёскі Дабрывада.

Айцец Антон Сасноўскі памёр у 1852 г. і быў пахаваны, побач сям'і, на праваслаўных могілках у Кляшчэлях. Захаваўся да сёння помнік на ягонай магіле.

1. Апішы, якія навуковыя зацікаўленні меў айцец Антон Сасноўскі?
2. Чаму Антона Сасноўскага можна назваць асветнікам? Дакажы на аснове фактаў, прадстаўленых у тэксце Дарафея Фіёніка.
3. Чаму Антона Сасноўскага непакоіла будучыня ўніяцкай Царквы?

Дарафей Фіёнік

Кастыцэвічы – асветнікі з Пасынак

Сям'я Кастыцэвічаў у Бельску, 1912 г. Злева: Ігар, Усеслаў, а. Васілій, Вячаслаў, м. Сафія, ... і Яраслаў

Для беларускай асветы на Падляшшы вельмі заслужаны род Кастыцэвічаў. У XIX і пачатку XX стагоддзя быў ён звязаны з праваслаўным прыходам у Пасынках.

Першым быў айцец Адам Кастыцэвіч, які з'явіўся ў Пасынкі ў 1826 годзе. У Пасынкі ён прыбыў з матушкай Іааннай і пяцёркай народжаных у Дубічах дзяцей. Навесну 1831 года на тэрыторыі Беластоцкай акругі выбухла пошасць халеры. Айцец Адам намагаўся несці прыхаджанам духовую і матэрыяльную дапамогу.

Пасля адступлення халеры ўключыўся ён у працэс злучання Уніяцкай і Праваслаўнай цэркваў. Гэта ў той час былі заменены ранейшыя літургічныя кнігі праваслаўнымі, выдалены арганы і ўстаноўлены іканастасы.

Айцец Адам адышоў у вечнасць 13 мая 1849 года. Прыход прыняў ягоны сын Андрэй, выпускнік Літоўскай духоўнай семінарыі, настаўнік грэчаскай мовы ў духоўнай школе ў Жыровічах. Андрэй Кастыцэвіч паказаўся добрым пастырам, настаўнікам, гаспадаром ды лекарам. Сваёй усебаковасцю прыдбаў любоў у прыхаджан ды пашану ў духоўных і свецкіх улад.

Новы настаяцель энергічна ўзяўся за парадкаванне земляробчых спраў. Любіў сваю гаспадарку і ва ўзорным гаспадаранні бачыў крыніцу прыбыткаў і метад павышэння сельскагаспадарчай культуры прыхаджан. На прыхадскім пляцы быў узведзены шэраг гаспадарчых будынкаў, а ранейшыя былі адрамантаваны. Быў закладзены сад са шляхетнымі пародамі фруктовых дрэў. На яго аснове большасць гаспадароў заклала ўласныя сады.

Айцец Андрэй паказаўся таксама добрым лекарам. У тагачаснай беднай вёсцы туга было знайсці медыцынскую параду. Асабліва цяжка было бацькам малых дзяцей, якія часта хварэлі дыфтэрыяй. Святар умеў спраўляцца з гэтай небяспечнай хваробай і гэта прыцягвала ў Пасынкі людзей з мясцовасцей адлеглых нават за дваццаць кіламетраў. У 1855 годзе ўключыўся ў ратаванне прыхаджан ад паўторнай пошасці халеры. На Падляшшы паглынула яна тады тысячы ахвяр. У суседнім Чыжоўскім прыходзе памерла тады ад халеры каля трохсот асоб.

Кастыцэвічы (злева направа): айцец Андрэй, айцец Васіль і Яраслаў

Андрэй Кастыцэвіч прагнуў сваім прыхаджанам палёгкі не толькі лекаваннем. Ён лічыў, што трыманне ў прыгоне сялян чалавеку і хрысціяніну недастойнае. Дзеля добрага прыкладу ён дабравольна, яшчэ перад афіцыйным скасаваннем прыгону ў 1861 годзе, вызваліў чатырох прыхадскіх падданых.

Айцец Андрэй меў на Бельшчыне высокі аўтарытэт. Ягоны светлы розум і шырокія знаёмствы памагалі вырашаць мясцовыя праблемы. Святар быў выдатным рытарам, меў добры голас і ўмеў іграць на музычных інструментах. Меў дараванне расказчыка пра вядомыя яму постаці перыяду яднання цэркваў. Літургію служыў ён амаль штодзённа. У 1852 годзе пабудаваў на могілках царкву св. Ганны.

У 1887 годзе абавязкі а. Андрэя пераняў ягоны сын Васіль. У Пасынкі прыехаў ён з Варшавы, дзе пасля завяршэння філалагічнага факультэта на Варшаўскім універсітэце працаваў настаўнікам у гімназіі. Тут быў ужо не толькі добра ўладжаны прыход, але і элементарнае царкоўнае школьніцтва. Пасля прыбыцця ў Пасынкі ён шмат здзейсніў для далейшага развіцця царкоўна-прыхадской асветы ва ўсёй епархіі. У 1906 годзе стаў ён загадчыкам царкоўна-настаўніцкай школы ў Трасцянцы.

У сераду перад Вялікаднем 1889 года прыхадская царква ў Пасынках згарэла; навесну 1890 года была распачата будова новага храма. Годам пазней памёр а. Андрэй Кастыцэвіч.

У Пасынках у сям'і Васіля Кастыцэвіча з'явілася на свет пецярых сыноў. Адным з іх быў народжаны ў 1896 годзе Яраслаў Кастыцэвіч, заснавальнік беларускага школьніцтва на Бельшчыне.

1 Пра якіх прадстаўнікоў роду Кастыцэвічаў напісана ў артыкуле?

2 Чым славіліся Пасынкі ў XIX стагоддзі?

3 Што вядома пра Андрэя Кастыцэвіча?

У Старым Корніне

Праваслаўны прыход у Старым Корніне, распаложаны на акраіне Белавежскай пушчы, лічыцца адным з найважнейшых месцаў культу Багародзіцы на Падляшшы. Цудоўная ікона Багародзіцы паказалася там у пачатку XVIII стагоддзя і адразу праславілася сотнямі цудаў.

У палове XIX стагоддзя ў Старым Корніне служыў а. Келесцін Брэн, адзін з выдатнейшых святароў Літоўскай епархіі. Ён шчыльна супрацоўнічаў з архіепіскапам Іосіфам Сямашкам у справе з'яднання ўніятаў з Праваслаўнай царквой. Прыхаджане любілі яго, называлі яго «святым Брэнам». Айцец Келесцін праславіўся як аўтар выдатнага этнаграфічнага апісання Бельскага павета.

Ягоная праца «Местное этнографическое описание Бельского уезда...» паўстала ў палове XIX стагоддзя. Знаёміць яна з вясковай архітэктурай, мовай, асаблівасцямі грамадскага побыту, умельствам сялян, іх маральнымі прыметамі і адукацыяй ды народнымі паданнямі і легендамі. Аўтар запісаў 38 песень ды звыш сарака загадак, пагаворак і казак. Асабліва вартасныя рысункі, паказваючыя вопратку, рыбалоўныя прылады ды будынкі; апісанне будынкаў вельмі скрупулёзнае.

У працы таксама шмат моўных цікавінак. Апісваючы падляшукоў «рускага племені» (беларусаў) а. Келесцін засяроджваецца на матэрыялах са Старога Корніна і яго найбліжэйшага наваколля. Праца мае фундаментальны характар.

Сын а. Келесціна, Яраслаў, вучыўся ў Літоўскай духоўнай семінарыі і Духоўнай акадэміі ў Пецярбургу, якую закончыў у 1867 годзе.

Айцец Яраслаў Брэн служыў і працаваў у Коўне. У 1879 годзе ўдзельнічаў у міжнародным статыстычным кангрэсе ў Пецярбургу. За выдатныя дасягненні ў галіне статыстыкі і этнаграфіі Імперскае таварыства любіцеляў прыродазнаўства ўзнагародзіла яго залатым медалём.

У 1885 годзе вярнуўся ён у родны кут – у Стары Корнін, дзе стаў настаяцелем царквы. Прадаўжаючы справу бацькі пачаў збіраць матэрыялы пра культуру і традыцыі мясцовых прыхаджан. У 1899 годзе выйшла з друку ягоная праца «Особенности религиозного быта крестьян Бельского уезда Гродненской губерни». Аўтар сцвярджаў, што сяляне Бельскага павета былі вельмі набожнымі людзьмі. Па святах усе хадзілі ў царкву маліцца – маладыя і старыя. Не знеахвочвалі іх доўгія службы, некаторыя ўвесь час кленчылі. Шмат сялян паломнічала ў святыя месцы – Пачаеў, Кіеў, Бельск, Стары Корнін, Кляшчэлі, Пухлы, урочышча Медна (Крыначку), Райск, Гадышэва і Боцькі. Неадлучным элементам кожнага свята былі тады жабракі, якія сядзелі ў доўгіх шарэнгах уздоўж дарогі ў храм. Беручы міласціну спявалі набожныя песні ды гаварылі малітвы, найчасцей літаніі за памерлых. Адну з такіх жабрацкіх малітваў запісаў а. Яраслаў: «Помяни Господи душечки померлых наших дедов, наших батьков, наших братков, наших сестричек, наших деточек. Помяни

Господи которые в морах, которые в лесах, которые в песках. Помяни Господи и тых, которые нискуль жадного ратунку не мают».

Сяляне спалучалі час палявых работ з царкоўнымі святамі. Адлюстроўвалі гэта адмысловыя прыказкі: «Колі на Громніці певень коло дому нап'ецця водіці, то на Георгія вол на полі ужэ наесцця травіці», «Од Іліі бэрыся до ролі, а од Борыса і добрэ бэрыся», «Сей на Лупа, то будэ жыта купа», «До Прэчыстой поле чысто», «За Зэленэць хлебові кунэць». Паводле асенніх святаў меркавалі пра выдачу дзеўкі замуж: «Од Покрова діеўка готова», «На Лукаша діеўка наша», «До Дмітра діеўка хітра...»

У сваёй працы а. Брэн шмат месца адвёў вяселлю. Яшчэ ў другой палове XIX стагоддзя ў Старым Корніне жывы быў звычай выпечкі каравая. У вясельную суботу ў хаце маладухі збіраліся жанчыны і пеклі абрадавы пірог. Перад прыездам маладога на заручыны спявалі песні, якія пачыналіся са слоў: «Летіт соколік над садочком, в садочок заглядае, дэ ж тут зозуля в рабом пер'ечку, по садочку літае». Пасля спеваў адбываліся заручыны.

Нядзельнай раніцай у хаце маладухі адбывалася цырымонія развітання з сям'ёй і г.зв. *вспомоганіе*, па якім маладая ў картэжы ад'язджала на шлюб у царкву. Падобны абрад перад выездам у царкву адбываўся і ў хаце маладога. Малады да шлюбу ехаў не ў возе, як маладуха, але вярхом, а побач яго, таксама на конях, ехалі дружбанты.

Пасля вянчання маладыя раз'язджаліся да сваіх хат. У хаце маладухі пачыналася застолле і танцы, а ў хаце маладога пеклі каравай. Раніцай у панядзелак малады са сваёй світай ехаў на кані да дому маладухі. Ейная маці мусіла вынесці дзяжу, на якую саскокваў з каня малады і кіраваўся ў камору. Там вітала яго маладая і запрашала ў хату; маршалак саджаў іх за стол.

Вечарам адбывалася *перапіванне* маладой. У той час маршалак дзяліў каравай. Неўзабаве маладыя ад'язджалі ў хату маладога. Першую ноч маладажоны мусілі правесці ў стадоле, нават у найбольш лютыя маразы.

У аўторак з хаты маладой прыязджаў картэж з *прыданым* – пасагам, які, пад спевы, трэба было выкупіць. Пасля гэтага маладой знімалі чубы – вясельны галаўны ўбор і вешалі ў кут пад іконамі. Валасы маладой накручвалі на пасмы лёну і завязвалі вакол галавы. Тады надзявалі чапец, які маладая павінна была скінуць.

Айцец Яраслаў Брэн шмат разоў падкрэсліваў вялікую рэлігійнасць і высокую мараль сялян. Будучы навукоўцам ухіляецца ад каментарыяў. Усё апісвае скрупулёзна. Таму ягоная праца лічыцца каштоўнай крыніцай доследу жыцця дзевятнаццацівечных беларусаў з наваколля Белавежскай пушчы.

1 Што вядома пра жыццё жыхароў Старога Корніна ў XIX стагоддзі?

2 Чым займаліся свяшчэннікі ў Старым Корніне акрамя рэлігійнай дзейнасці?

3 Раскажы, як вясельныя абрады прадстаўляе айцец Брэн?



Яўген Хлябцэвіч. Бібліятэка і крама ў Кленіках у пачатку XX ст.

Дарафей Фіёнік

Хлябцэвічы – асветнікі з Кленік

Вялікая вёска Кленікі распаложаная на старажытным літоўскім тракце, які спалучаў Кракаў і Вільню. Тракт праходзіў праз Бельск і Нарву, а ў Кленіках падарожнікі маглі падсілкавацца і накарміць коней. Тут жа можна было і памаліцца ва Узнясенскай царкве. Першая звестка пра яе паходзіць з 1560 г.

У II палавіне XIX ст. Кленікі былі адным з найбольшых сёл Бельскага павета, налічваючым звыш тысячы жыхароў. Знаходзілася тут сядзіба гміны і народная школа. У 1883 г. пабудавалі новую царкву, архітэктурай падобную на храмы ў Пасынках і Нарве. З 1897 г. служыў тут а. Іаан Хлябцэвіч, выпускнік Духоўнай акадэміі ў Пецярбургу, выкладчык арыфметыкі і матэматыкі духоўнай школы ў Жыровічах. Сваю настаўніцкую і душпастырскую працу спалучаў з навуковай дзейнасцю. Цікавіўся гісторыяй Царквы на заходнебеларускіх землях. Быў м.інш. аўтарам нарыса пра епіскапа Іасафата Жарскага. Але хіба найбольш каштоўная, напісаная ім рэч – гэта ўспаміны з бежанства 1915-1917 г., выдадзеныя ў расійскім Сызрані.

У сваім прыходзе айцец Іаан Хлябцэвіч падтрымліваў культурна-асветныя ініцыятывы. У 1907 г. у Кленіках узнікла Народная бібліятэка-чытальня ім. Ф. Паўленкава. Была гэта другая такога тыпу ўстанова на Бельшчыне, пасля Шчытоў. Неўзабаве ў Кленіках заснавалі Крэдытнае таварыства ды Кааператыў спажыўцоў, які вёў сваю краму. Душою ўсіх гэтых ініцыятыў быў Яўген Хлябцэвіч (1884-1953), старэйшы сын настаяцеля. Пасля заканчэння ў 1906 г. Віленскай духоўнай семінарыі вярнуўся ў Кленікі, каб актывізаваць грамадскую дзейнасць.

У гадах 1907-1915 Яўген Хлябцэвіч, ужо як студэнт Юр'еўскага, а затым Пецярбургскага ўніверсітэта, быў актыўным карэспандэнтам беларускай газеты «Наша Ніва». Матэрыялы друкаваў пад псеўданімам *Халімон с-пад Пушчы*.

Як студэнт, удзельнічаў таксама ў арганізацыі і рабоце гуртка па вывучэнню Гродзенскай губерні, быў арганізатарам знакамітага Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Пецярбургскага ўніверсітэта.

Асаблівае зацікаўленне ў Яўгена Хлябцэвіча праяўлялася да кнігі, бібліятэчнай справы ды бібліяграфіі. У 1911 г. удзельнічаў у працах Усерасійскага з'езда па бібліятэчнай справе. Год пазней студэнцкі гурток выдаў у Коўне яго брашуру «Бібліятэка і кааперацыя», якая з'явілася адной з першых прац па тэорыі і арганізацыі бібліятэчнай справы.

Пасля I сусветнай вайны пражываў у Маскве, дзе надалей займаўся бібліятэчнай справай. Выкладаў у Маскоўскім бібліятэчным інстытуце.

Яўген Хлябцэвіч быў добра асабіста знаёмы з такімі постацямі беларускай літаратуры як Янка Купала, Якуб Колас, Алаіза Пашкевіч (Цётка) і інш. Шмат каштоўных звестак пра іх пакінуў у сваіх успамінах. Пісаў таксама пра Ф. Багушэвіча, Я. Баршчэўскага. З'яўляецца аўтарам фундаментальнай працы: «Адраджэнне беларускай народніцкай літаратуры».

Малодшы брат Яўгена Хлябцэвіча – Уладзімір (1894-1917) таксама вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце. Цікавіўся этнаграфіяй, вывучаў побыт жыхароў роднага сяла. Вынікам гэтых доследаў стала праца: «Село Кленики перед беженством – во время мировой войны». Прывядзем некалькі сказаў з нарысу ў перакладзе на беларускую мову: *Кленікі складаліся з адной простай вуліцы, але з боку па дарозе да Шчытоў знаходзіўся дом, які належаў Міхаілу Карпінскаму. Хаця ён сам займаўся гаспадаркай, але лічыў сябе прадстаўніком сялянскай інтэлігенцыі. Паводле адзежы ён толькі тым адрозніваўся ад сялян, што хадзіў у чорным, як мяшчане каля гарадоў...*

Апісаны ў нарысе Міхаіл Карпінскі гэта прадзед Аляксандра Лося, вядомага беларускага мастака, іканапісца і музыка.

Вельмі цікава Уладзімір Хлябцэвіч у сваёй працы разважае пра моўную і нацыянальную адметнасць жыхароў Кленік: *Паводле мовы іх можна адносіць да Беларусаў, але паводле выгляду яны на Беларусаў не зусім падобныя. Гэта можа былі патомкі яцвягаў, якія жылі на левым беразе Нарвы, а можа і іншых народаў. Можна сказаць, што гэта прамежкавая ступеня з перавагай першага элементу. Мова ў істоце больш беларуская насычана нейкімі астаткамі царкоўна-славяншчыны, таксама невялікім уплывам польскай мовы.*

Уладзімір Хлябцэвіч мог бы яшчэ шмат карыснага даць беларускай навуцы. Але заўчасна загінуў, у час рэвалюцыі 1917 г.

1 Якія інфармацыі пра вёску Кленікі можна знайсці ў прыведзеным тэксце?

2 Што вядома пра сям'ю Хлябцэвічаў?

3 Якая гістарычная падзея спыніла дзейнасць Уладзіміра Хлябцэвіча?

Аляксандр Гершун – фізік

Фізік Аляксандр Гершун нарадзіўся ў 1868 годзе ў сям'і лекара ў Саколцы. Пасля ягоная сям'я пераехала ў Вільню. Там вучыўся Аляксандр ў Віленскай гімназіі, у 1886 годзе паступіў ў Пецярбургскі ўніверсітэт. Яшчэ ў час штудыяў Аляксандр Гершун праяўляў шырокае зацікаўленне прыродазнаўчымі і тэхнічнымі ведамі і за адну са сваіх студэнцкіх прац ён быў узнагароджаны залатым медалём. Пасля завяршэння ўніверсітэта ён астаецца на фізіка-матэматычным факультэце вучэльні навуковым супрацоўнікам, паралельна навучаючы на Вышэйшых жаночых курсах і ў Электратэхнічным інстытуце. У 1902 годзе пераходзіць на пасаду прафесара ў Артылерыйскае вучылішча ў Кранштаце. Ён чытае таксама папулярныя лекцыі па пытаннях навейшых дасягненняў фізікі і тэхнікі.

У 1908 годзе Гершун пераязджае ў Пецярбург, у Абухаўскі завод, дзе ладзіцца вытворчасць аптычных прыбораў. Адначасна становіцца загадчыкам кафедры фізікі тамашняга Жаночага педагагічнага інстытута, дзе свае наватарскія лекцыі суправаджае дэманстрацыямі практычных эксперыментаў. Да таго ж ён ладзіў студэнткам наведванні аптычнай майстэрні Абухаўскага завода. Гэта была наватарская на той час форма прамысловай практыкі, якая пазней укаранілася ў навучальным працэсе.

У 1909 годзе Гершун становіцца загадчыкам аптычнай майстэрні Абухаўскага завода. Ён упершыню ў Расіі ладзіць там серыйную вытворчасць аптычных прыбораў вайсковага прызначэння. Пад яго кіраўніцтвам завод пачынае выпускаць прыцэльныя сістэмы, біноклі рознай кратнасці павелічэння, прыборы для наводкі артылерыйскай стральбы, падзорныя трубы, перыскапы, дальнамеры. У 1914 годзе пад наглядам Аляксандра Гершуна быў пабудаваны ў Пецярбургу завод, які стаў вырабляць аптычныя прыборы выключна ваеннага прызначэння.

Аляксандр Гершун першым у Расіі наладзіў варку аптычнага шкла, якое да таго часу завозілася з замежжа. Ды займаўся ён не толькі оптыкай. Ён аналізаваў свойствы электратока, уласцівасці рэнтгенаўскага прамянявання ды даследаваў фізічныя ўласцівасці Зямлі. Займаўся крышталяграфіяй, прыкладной фатаграфіяй, астраноміяй. Напісаў шмат публікацый на розныя навукова-тэхнічныя тэмы.

Памёр Аляксандр Гершун у 1915 годзе ў Пецярбургу.

1 Якія навуковыя дзеянні з'яўляюцца доказам высокай прафесійнай падрыхтоўкі Аляксандра Гершуна?

2 Якія галіны навук цікавілі Аляксандра Гершуна і чым ён займаўся?

Дом урада ў Мінску на паштоўцы з міжваеннага перыяду

Аляксандр Вярбіцкі

Іосіф Лангбард – архітэктар

Архітэктар Іосіф Лангбард нарадзіўся ў 1882 годзе ў Бельску-Падляшскім у сям'і камерсанта. З маленства захапляўся мастацтвам і пасля завяршэння мясцовай школы спярша, у 1901 годзе, паступае на архітэктурнае аддзяленне Адэскага мастацкага вучылішча, пасля якога ў 1907 годзе пераходзіць у Пецярбург, у Вышэйшае мастацкае вучылішча пры Імперскай акадэміі мастацтваў, таксама на архітэктурнае аддзяленне. У час вучобы працуе памочнікам архітэктара на розных будовах Пецярбурга; навуку завяршае ў 1914 годзе. У час Першай сусветнай вайны Іосіф Лангбард працуе для фронту ў складзе інжынерных войск, працуючы адначасна творча па-за фронтам, праектуючы будынкі грамадскага прызначэння. Ён праектуе будынкі зямской управы ў Кастраме ды сельскагаспадарчага музея і аднаго з тэатраў у Петраградзе. Пасля Першай сусветнай вайны Іосіф Лангбард працаваў у Ленінградзе, выконваючы праекты тамашніх і маскоўскіх архітэктурных комплексаў. У 1929 годзе ён выйграў усесаюзны конкурс на пабудову Дома ўрада ў Мінску. Годам пазней ён пераязджае ў беларускую сталіцу, дзе праектуе забудову сталічнага цэнтра. Янка Купала, пабачыўшы макет забудовы цэнтра сталіцы, усклікнуў:

«А летуценны хлопец гэты Лангбард!» Спярша, аднак, паводле ягонай задумы былі пабудаваны сорак драўляных павільёнаў Агульнабеларускай сельскагаспадарчай і прамысловай выставы ў Мінску. У 1930-1934 вырастае згаданы ўжо Дом урада, які лічыцца не толькі найбольшым творчым дасягненнем Лангбарда, але таксама архітэктурным эталонам тагачаснай эпохі. З 1933 года Лангбард распрацоўвае праекты Тэатра оперы і балета ды Дома афіцэраў у Мінску. Крыху пазней праектуе Дом саветаў у Магілёве, куды савецкія ўлады планавалі перанесці сталіцу Беларусі. Паралельна перарабляе ранейшы праект галоўнага корпуса Акадэміі навук Беларусі ў Мінску. Яго аўтарства таксама кінатэатр у Оршы, будынак Міністэрства замежных спраў Украіны ў Кіеве ды некалькі будынкаў у Пецярбургу, асобныя аб'екты ў Харкаве і іншых гарадах Савецкага Саюза. У 1935 годзе ён вяртаецца ў Ленінград на пасаду прафесара ў тамашняй Акадэміі мастацтваў. У час Другой сусветнай вайны Лангбард спачатку пражываў у Ленінградзе, працуючы над маскіроўкай тамашніх будынкаў. У 1942 годзе разам з групай выкладчыкаў Акадэміі эвакуіруецца ў Яраслаўскую вобласць. У 1944 годзе, зараз пасля вызвалення, вяртаецца ў разбураную беларускую сталіцу і працуе над рэканструкцыяй Мінска. Апрача агульных планаў адбудовы горада ён асабіста наглядае за рэканструкцыяй будынкаў, пабудаваных да вайны паводле ягоных праектаў. Іосіф Лангбард памёр у 1951 годзе.

Дом урада ў Мінску, сучасны выгляд

Дом афіцэраў ў Мінску. На наступнай старонцы: Нацыянальны акадэмічны вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь

У сваёй творчасці Іосіф Лангбард быў стаpоннікам вертыкальных архітэктурных акцэнтаў: «Гарызантальная форма – сцвярджаў ён, – здаецца быць пазіцыяй спячага або мёртвага, што дзейнічае прыгнятальна, затое вертыкальная пазіцыя выражае жыццё, бадзёрасць і сілу, яна супрацьстаіць пастаяннаму прыгнятанню да зямлі.» Ставіўся ён станоўча да крытычнага засваення і выкарыстання здабыткаў мінуўшчыны. Ён цаніў архітэктурную дысцыпліну і парадак, лічыў, што лепш не ведаць як аздобіць будынак, чым уносіць у яго непатрэбнае. Лангбард стварыў каля ста праектаў, з якіх былі зрэалізаваны пятнаццаць, у іх ліку восем у Беларусі: кінатэатр у Оршы, Дом урада, Дом афіцэраў, тэатр оперы і драмы, тэатр імя Янкі Купалы, тэатр «Перамога», помнік Леніну ды галоўны корпус АН БССР у Мінску, будынак Міністэрства замежных спраў у Кіеве, помнік Тарасу Шаўчэнку ў Харкаве.

- камерсант - чалавек які займаецца гандлем

1 Назаві, якія праекты стварыў Іосіф Лангбард.

2 Як склалася жыццё чалавека, які стаў вядомым архітэктарам? Перадай у вуснай форме кароткую біяграфію Іосіфа Лангбарда.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ
ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

Нестар Перавой (сёмы злева ў сярэднім радку) на пасвячэнні дому свайго брата Феадосія ў вёсцы Чало ў Белавежскай пушчы, 1932 г. У цэнтры сядзіць а. Дзмітрый Стэмпкоўскі, настаяцель царквы ў Ціхаволі

Дарафей Фіёнік

Нестар Перавой

У падбельскай вёсцы Кнаразы з другой паловы XIX стагоддзя пражываў род Перавояў. Прадстаўнік гэтага роду, Нестар Перавой (1887-1974) належаў да таго пакалення падляшскай беларускай моладзі, якое навучалася ў таленавітых настаўнікаў царкоўна-прыхадскіх школ. Навучаў яго ўраджэнец Пасынак Сяргей Манаховіч, пазнейшы настаяцель Малешаўскага прыхода, аўтар школьных падручнікаў. Пасля завяршэння народнага вучылішча Нестар Перавой стаў на працу ў школе ў Альшаніцы, што між Бельскам і Страбляй. Пасля навучаў у Саках каля Бельска-Падляшскага і ў Сільвонках, што між Лосіцамі і Міжрэчам-Падляшскім. Адтуль малады настаўнік трапіў у Варшаву, дзе атрымаў атэстат настаўніка элементарных школ. У Варшаве прабыў



Геаграфічнае палажэнне Кнаразоў

Вёска Кнаразы знаходзіцца на поў-
нач ад Бельска, на адлегласці 8 вёрст
па простай лініі праз раку Арлянку.
Сяляне больш ездзілі праз вёску Соботка.
Тут лічылі 10 вёрст. А калі вясною або
ўвосень было вялікае бездарожжа, то
ездзілі аж на Гасьцінец праз Храбалы,
каля вёскі Гацукі і далей праз Проневічы
да Бельска. Адлегласць тут была 14 вёрст.
Гасьцінцам называлі дарогу, якая лучыла
Бельск з Беластокам праз мястэчка Заблудаў,
а было тут 50 вёрст. Да першай сусветнай
вайны тут саўсім не было шасэ і трапляліся
такія калдобіны і вязкія балоты, што цяжка
было выцягнуць пусты воз. Асабліва
цяжка было прабрацца праз вёску Проневічы.
Цяпер тутака вельмі добрае пашыраннае
асфальтовае шасэ, па якім безперапынку
курсуюць цяжкароўкі, такароўкі і вялікія,

Рукапіс «Залатой кнігі пра веску Кнаразы», аўтарства Нестара Перавоя

больш дзясяткаў гадоў, працуючы памочнікам бібліятэкара ў II Жаночай гімназіі.

У 1908 годзе Нестара Перавоя прызываюць у войска. Тут таксама заўважаюць ягоную адукаванасць і прызначаюць пісарам у штабе Варшаўскай ваеннай акругі.

У пачатку лета 1915 года эвакуіруецца разам з сям'ёй у Маскву. Сузіраючы цяжкае становішча сваіх землякоў-бежанцаў, уключаецца ў працу дабратворных арганізацый дзеля матэрыяльнай ім дапамогі ды кансалідацыі беларускіх бежанцаў, якіх амаль два мільёны было рассеяных па ўсёй Расійскай Імперыі. Пытанне гэта наспела асабліва пасля Лютаўскай рэвалюцыі запар з выяўленнем ідэі самастанаўлення народаў. Група сабранай у Маскве беларускай інтэлігенцыі ў маі 1917 года заснавала Беларускую народную грамаду: яе члены былі прыхільнікамі аўтаноміі Беларусі ў межах Расіі, узаконенага раўнапраўя грамадзян, свабоднага карыстання ўсімі народамі Расіі роднай мовай, у тым ліку ў школе, суда-

водстве і мясцовым самакіраванні, раздзелу Царквы ад дзяржавы ды свабоды сумлення, слова і друку. Інтэлігенцыя з БНГ лічыла, што сярод бежанцаў трэба весці культурна-асветную дзейнасць. Таму ў планах арганізацыі было ладжанне дакладаў, засноўванне музеяў, бібліятэк ды дабратворных устаноў.

Нестар Перавой

У дзейнасць Грамады Нестар Перавой уключыўся з моманту яе заснавання, уваходзячы ў лік яе лідараў побач адваката Аляксандра Цвікевіча, археолага Іосіфа Васілевіча і педагога Фёдара Турука. Нестару Перавою была даручана функцыя сакратара арганізацыі. У дакументах БНГ яго прозвішча выступае вельмі часта, м.інш. у пратаколах Першага беларускага з'езда, які адбыўся ў Маскве 24-27 верасня 1917 года.

Чарговы беларускі з'езд быў скліканы Грамадой на 19-21 лістапада 1917 года. Ён адбыўся ўжо ў зусім іншых абставінах. У Маскве кіпела – з аднаго боку правілі бальшавікі, з другога праваслаўныя вернікі былі на ўздыме з прычыны адраджэння патрыярхату. Беларускія дзеячы хацелі паказаць сябе рэальнай грамадска-палітычнай сілай. Ад новых улад патрабавалі правоў беларускаму народу. Яны імкнуліся да самавызначэння ў рамках Расійскай Федэральнай Рэспублікі. У гэтую дзейнасць, як сакратар БНГ, уключыўся Нестар Перавой. Удзельнічаў ён ва Усебеларускім кангрэсе, які адбываўся ў Мінску ў палове снежня 1917 года. Там ён пазнаёміўся з беларускімі песнярамі Янкам Купалам (Янам Луцэвічам) ды Якубам Коласам (Канстанцінам Міцкевічам).

Мінскі кангрэс брутальна разагналі бальшавікі, якія не жадалі беларускай незалежнасці. У час мірных перагавораў з Германіяй у Берасці, пра інтарэсы беларускага народа мовы не было. Неўзабаве пачаўся наступ нямецкай арміі і бальшавікі пакінулі Мінск. Беларускія дзеячы ўзнавілі працу Рады Усебеларускага з'езду. Вынікам гэтых дзеянняў было абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 года.

У той час Нестар Перавой прабываў у Маскве. У красавіку 1918 года займаўся арганізацыяй Беларускай чыгуначнай грамады, ачольваючы яе праўленне. Газета «Дзянніца» (н-р 9 ад 24 красавіка 1918 г.) апублікавала ягоны артыкул-заклік «Таварышы чыгуначнікі Беларусі». Вось яго ўрывак: «Нашу бацькаўшчыну Беларусь наведалі небывалыя катаклізмы – вайна, бежанства мільёнаў нашых братоў, голад і холад у прыфрантавой паласе, пажары ды разбураныя вёскі і гарады. Нашы палі зніштожылі ваюючыя арміі, залілі іх крывёю, засыпалі бомбамі, узрылі глыбокімі равамі. Гарады, сёлы і вёскі спалены. Дабытак і запас зерня праедзены або вывезены. Нашы жанчыны сталі ахвярамі ашалелых людзей. Чакае нас складаная праца па вяртанні бежанцаў у родныя мясціны, адбудоўванне знішчаных вайною мясцовасцей ды жыцця на Беларусі...»

Нестар Перавой быў перакананы, што беларускія бежанцы павінны вяртацца ў свае родныя гнёзды. У Расіі ішла грамадзянская вайна і панаваў голад. У час з'езду беларускіх бежанцаў, які адбыўся ў Маскве ў ліпені 1918 года, Нестар Перавой сказаў знамянальныя словы: «Самі будзем ведаць, як вярнуўшыся ўладкавацца і жыць. Тут усё такое дарагое, што ўжо жыць немагчыма. У Беларусі, у крайнім выпадку, можна знайсці бясплатную магілу.» Перавой рашуча супраціўляўся бальшавіцкім ідэям, якія крытычна ставіліся да захадаў за вяртанне беларускіх бежанцаў на радзіму – у зону ўплываў Беларускай Народнай Рэспублікі.

Быў 1921 год. На захад цягнуліся масы бежанцаў, у іх ліку Нестар Перавой з сямейнікамі. Людзі, што вярнуліся з бежанства, пабачылі сваю вёску Кнаразы ў жаласным стане. «Калі каму было наканавана вярнуцца, чакала іх найчасцей пустая хата, без акон і дзвярэй. Не было запасаў ежы, зерня, сельскагаспадарчых прылад. Толькі ластаўкі ў некаторых хатах звілі гнёзды каб прывітаць гаспадароў вясёлым спевам. Людзі часта галадалі; елі шчаўе, лебяду, раслінныя плады. За кілаграм збожжа працавалі цэлы дзень у тых гаспадароў, якія нікуды не выязджалі.» Так Нестар Перавой характарызаваў сваю вёску пасля вяртання.

У адроджанай Польшчы Нестар Перавой стаў інспектарам школьнага нагляду ў Пасынскай гміне. Быў настаўнікам Пачатковай школы ў Зубаве. Пакінуў па сабе вялікі гісторыка-культуралагічны нарыс «Залатая кніга аб вёсцы Кнаразы Бельскага павета», апублікаваны ў 2012-2013 гг. у часопісе «Бельскі Гостінэць». Праца ахоплівае тапаграфію, гісторыю і этнаграфію Кнаразоў, змяшчае гаспадарчыя парады і роздумы аўтара пра праблемы сучаснасці. Знаёміць з усімі тамашнімі сем'ямі, з прывядзеннем вясковых мянушак гаспадароў.

Нестар Перавой прадбачыў, што будучае пакаленне «з вялікім зацікаўленнем будзе чытаць гэтыя радкі пра колішняе жыццё». Сапраўды, сёння бачым, якую выдатную рэч пакінуў нашчадкам наш зямляк – беларус Нестар Перавой з Кнаразоў. Кожную хвіліну ягонага жыцця суправаджала ахвярная праца ў карысць людзей, якіх любіў і з любасцю пра іх пісаў.

1 Якім чалавекам быў Нестар Перавой? Адшукай у тэксце не менш як 5 прыметнікаў, якія прадстаўляюць рысы характару і паводзін гэтага чалавека.

2 Што рабіў Нестар Перавой, каб дапамагчы сваім суайчыннікам у час, калі бежанцы знайшліся ў розных кутках царскай імперыі і пасля таго, як бальшавікі пераймалі ўладу?

3 Дакажы, што Нестар Перавой сваім усім жыццём даваў сведчанне сапраўднага патрыятызму, любві да роднага.

Дарафей Фіёнік

Шчытоўскі цэнтр асветы і сельскагаспадарчага прагрэсу

На пераломе XIX і XX стагоддзяў настаяцелем праваслаўнага прыхода ў Шчытах, што ў Арлянскай гміне Бельскага павета, быў айцец Леў Гаворскі. Цягам некалькіх дзясяткаў гадоў сваёй службы мацаваў ён рэлігійнасць вернікаў, арганізаваў прыхадское школьніцтва. У айца Льва Гаворскага і матушкі Юсціны з Краскоўскіх у 1881 годзе нарадзіўся сын Павел. Калі хлопцу споўнілася дзевяць гадоў, паслалі яго вучыцца ў духоўную школу ў Жыровічах, пазней у Літоўскую духоўную семінарыю і Юрыдычны ліцэй у Яраслаўлі. Штудзіраваў таксама права на Лейпцыгскім універсітэце.

Пасля вяртання ў родную старонку Павел Гаворскі працаваў юрыстам і настаўнікам мужчынскай прагімназіі ў Бельску. Уключыўся ён у арганічную працу ў карысць шчытоўскіх прыхаджан. І такім чынам у 1907 годзе а. Леў Гаворскі сумесна з сынам Паўлам заснаваў у Шчытах бібліятэку-чытальню імя Фларэнція Паўленкава, першую ў Бельскім павеце; была яна адной з лепш экіпіраваных у павятовым маштабе. Апрача багатых кніжных фондаў былі ў ёй таксама дыяпазітывы. Ён унёс таксама ўклад у паўстанне Гарадской публічнай бібліятэкі ў Бельску ў той жа сам год.

У 1909 годзе па ініцыятыве Паўла Гаворскага ўзніклі ў Шчытах чарговыя ўстановы прагрэсіўнай накіраванасці: крэдытнае таварыства, згуртаванне спажыўцоў і сельскагаспадарчае таварыства. Яшчэ ў 1908 годзе ўзнікла ў Шчытах суполка з дваццаці гаспадароў, якой мэтай было арганізаванне перасяленняў на хутары і прамоцыя сельскагаспадарчага прагрэсу; цэнтр суполкі дзейнічаў у шчытоўскай бібліятэцы. Яе дзейнасць стала завязкай будучых арганізацый узаемадапамогі, якія ўсялілі ў сялян веру ва ўласныя сілы і спынілі міграцыю «за зямлёй». Выязджалі тады ў Сібір ды на парцаляваныя маёнткі ў Гродзенскай губерні і ў Каралеўстве Польскім.

У пачатку мая 1909 года карэспандэнт «Нашай Нівы», які падпісваўся псеўданімам «Шчытавец», пісаў: «У нас аткрываецца сельскі банчок, крэдытнае таварыства. Можна будзе мужыкам класьці туды грошы і даставаць пазычкі. Банчок будзе для Шчытоў, в. Голады і в. Крывой. Гасударственны банк пазычае тысячу рублёў». Месяцам пазней тая ж газета пісала пра куплю

Жыхары шчытоўскага прыхода і госці на адкрыцці крэдытнага таварыства ў Шчытах, май 1909 г.

Курсы рукадзелля ў Шчытах, 1912 г. Злева сядзіць Павел Гаворскі

Сям'я Гаворскіх каля прыхадскога дому ў Шчытах; злева: Наталля, м. Юсцінія, Таццяна, Аляксей, а. Леў Гаворскі з унучкай, Павел, зяць а. Льва, 1905 г.

будынка пад бібліятэку-чытальню, кааператыўны магазін ды краму па продажы насення і сельскагаспадарчых прылад. Паведамлялася таксама пра планаванае адкрыццё Шчытоўскага крэдытнага таварыства, якое збылося 17 мая 1909 года.

Гэтае таварыства было адным з першых у Гродзенскай губерні і першым у Бельскім павеце. Сябры таварыства, якіх у верасні 1909 года было ўжо 87, пачалі адчуваць першыя карысці вынікаючыя з гэтай арганізацыі. Пазыкі скарыстоўваліся на будову або рамонты дамоў, куплю ўгнаенняў, сельскагаспадарчых прылад, коней і пагашанне даўгоў. Таварыства заказвала мінеральныя ўгнаенні, дапамагала ў атрыманні будаўнічай драўніны, вяло эксперыментальныя палеткі ды магазін з матэрыяламі і прыладамі для сельскагаспадарчай вытворчасці.

Зацікаўленне шчытоўскімі ініцыятывамі было аграмаднае і ў выніку ўправа таварыства рашыла пашырыць дыяпазон дзеяння на ўсю Пасынкаўскую гміну ды суседнія з ёю вёскі Кленіцкай, Новаберазоўскай і Арлянскай гмін. Шчытоўскія ініцыятывы распаўсюдзіліся па значнай частцы Бельскага павета.

Перад 1915 годам крэдытныя таварыствы паўсталі ў Кленіках, Вульцы-Выганоўскай, Трасцянцы, Нарве, Пасынках, Рыбалах, Боцьках, Бельску, Кляшчэлях, Браньску і Мельніку. Усе яны працавалі паводле шчытоўскага прыкладу.

У 1910 годзе ў Шчытах паўстала згуртаванне спажыўцоў. На арганізацыйным сходзе прыгожую прамову сказаў яго ініцыятар Павел Гаворскі: «Кожны чалавек хоча жыць лепш. Асабліва часта скаргі на лёс можна пачуць ад тых, каторыя амаль увесь свой прыбытак укладаюць на ўтрыманне сям'і, у якіх не хапае грошай на паляпшэнне гаспадарання. Наракаюць амаль усе. Але пра паляпшэнне сваёй долі думаюць нямногія. Таму часта наша жыццё траціць сэнс. Судзімся ўзаемна з-за дробязей. На суды расходуем шмат грошай, пры тым сумленне сваё заліваем гарэлкай. Калі ў гаспадарстве нечага нам не хапае, многія бесцырымонна крадуць патрэбнае ў сваіх суседзяў. І гэтаму вучацца дзеці. І таму цягам усяго жыцця спадарожнічаюць нам сумненні і злосць. Нельга такога жыцця перадаваць тым, якія будуць жыць пасля нас – яны не ўспомняць нас добрым словам. Пара ўжо сабе сказаць: трэба зрабіць усё дзеля паляпшэння нашага жыцця.»

У чым заключалася тайна поспеху шчытоўскіх арганізацый узаемадапамогі? Галоўным чынам у вялікім аўтарытэце а. Льва Гаворскага. Кожнае яго слова, просьба ці напамін не аставаліся без водгуку. Да сваіх праектаў умеў пераканаць мясцовых дваран Вевяроўскіх, большасць якіх, так як і сяляне, былі праваслаўнымі. Сталі яны пайшчыкамі Крэдытнага таварыства. У працу арганізацыі ўключыліся таксама настаўнікі.

Найбольшую ролю ў закладцы і дзейнасці арганізацый узаемадапамогі адыграў аднак Павел Гаворскі, вечны грамадскі актывіст. Пра гэта сведчыць вытрымка з ягонай прамовы, сказанай у міжваенны перыяд на сходзе кааператыўнай касы ў Шчытах: «Усе грамадскія арганізацыі, якія былі папулярныя ў Шчытах да сусветнай вайны, узніклі па маёй ініцыятыве і працавалі пад маім наглядам. Ніводнага дня я не займаў казённай пасады, хаця ў мяне вышэйшая адукацыя, бо я кіраваўся перакананнем, што ніводная грамадская праца не можа спалучацца з казённай пасадай.»

1 Чым вылучаліся Шчыты ў пачатку XX стагоддзя?

2 Кім быў і чым займаўся Павел Гаворскі?

3 Што, паводле цябе, ёсць самым важным у гісторыі Шчытоў?

Цэнтр адукацыі і прамоцыі беларускай культуры ў Шчытах змяшчаецца ў будынку даўняй школы, пабудаванай у 1938 г.

ЛІТАРАТУРА XIX СТАГОДДЗЯ

ПРАЦЫ ФАЛЬКЛАРЫСТАЎ І АНАНІМНАЯ ЛІТАРАТУРА Ў XIX СТ.

Актывізацыі працэсу беларускага адраджэння ў другой палове XIX ст. спрыялі працы этнографаў і фалькларыстаў Івана Насовіча, Паўла Шэйна, Еўдакіма Раманава, Мікалая Нікіфароўскага. Імі былі выдадзены дзясяткі тамоў беларускага фальклору (казак, песень, легенд, паданняў, прыказак і прымавак), якія расказвалі пра глыбока самабытную нацыянальную беларускую культуру, пра беларускі народ і яго духоўную сілу. [...] Ва ўмовах зняволення фальклор заставаўся амаль адзіным сродкам выяўлення духоўнага жыцця нацыі.

паводле Васіля Старычонка

Да ананімнай літаратуры належаць творы, якія распаўсюджваліся пераважна ў рукапісах, без пазначэння імя аўтара. Прычыны з'яўлення ананімнай літаратуры былі розныя. У Сярэднявеччы пытанне аўтарства не было істотным. Большасць пісьменнай творчасці была ананімнай (жыціі, летапісы). Падпісваліся толькі творы, што належалі знатнай асобе, вядомаму палітыку або рэлігійнаму дзеячу.

У XIX ст. пачалося паступовае адраджэнне беларускай культуры. Першыя спробы станаўлення новай беларускай літаратуры спаткаліся аднак з непрыхільнасцю, а нават варожасцю царскіх улад і рэакцыйных колаў грамадства. Варожасць правячых колаў і нястача беларускага друку прычыніліся да звядзення яе ў паўлегальнае становішча. Беларускамоўныя творы паяўляліся спарадычна, распаўсюджваліся ў рукапіснай форме сярод прыяцеляў і знаёмых. На працягу гадоў гублялася аўтарскае імя, але твор існаваў, жыў у народзе як ананімны. Цікавасць да пытання аб аўтарстве абуджалася паступова па меры росту нацыянальна-культурнай свядомасці стваральнікаў. Паявілася таксама цікавасць адносна асобы аўтара твораў, якія дагэтуль пашыраліся ў ананімным відзе. Даследчыкі зрабілі спробы выяснення аўтарства канкрэтных твораў. У многіх выпадках (*Вясна гола перапала, Гутарка Данілы са Сцяпанам, Вось цяпер які люд стаў*) аказалася гэта немагчымым, але здараліся ўдачы. Так, дзякуючы беларускім гісторыкам літаратуры ўдалося ўстанавіць імёны аўтараў паэм *Энеіда навыварат* і *Тарас на Парнасе*.

Беларускія ананімныя творы XIX ст. мелі антыпрыгонніцкі і антыцарскі характар, раскрывалі і крытыкавалі сутнасць самадзяржаўя, заклікалі народ да барацьбы з сацыяльна-нацыянальным прыгнётам. Аўтары такіх твораў утойвалі сваё дачыненне да іх напісання, баючыся праследавання з боку афіцыйных улад.

паводле Максіма Гарэцкага і Энцыклапедыі гісторыі Беларусі

1 Якая была сітуацыя беларускай культуры ў XIX ст.?

2 Якія палітычныя і грамадскія працэсы спрыялі яе адраджэнню?

3 Якія творы называюцца ананімнымі? Чаму?

Канстанцін Вераніцын (1834-1904)

Сапр. прозвішча Васільеў, аўтар гумарыстычных паэм *Тарас на Парнасе* і *Два д'яблы*. Нарадзіўся на Віцебшчыне ў сям'і прыгоннага селяніна, здабыў адукацыю і кваліфікацыі агранома (1859). Працаваў пачаткова на Беларусі (аканомам і выкладчыкам Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі). Выехаў у Пецярбург, дзе служыў у розных установах і ў Міністэрстве шляхоў зносін.

Тарас па Парнасе – паэма, якая стаяла ля вытокаў новай беларускай літаратуры, закладвала яе падмурак і была першай з цаглін у гэтым напрамку.

Міхаіл Лазарук

Канстанцін Вераніцын

Тарас на Парнасе *

I

Ці знаў хто, братцы, з вас Тараса,
У палясоўшчыка што быў?
На Пуцявішчы, у Панаса,
Ён там ля лазні блізка жыў.
Што ж? Чалавек ён быў рахманы,
Гарэлкі ў губу ён не браў!
За тое ж ў ласцы быў у пана, –
Яго пан дужа шанаваў.
Любіла тож Тараса й паня,
І войт ні разу не збрахаў,
За тое ж ён балота з рання
Да цёмнай ночы пільнаваў.

---

* Тэкст падаецца паводле кніжкі: *Родная літаратура. Хрэстаматыя для IX класа*, С. Х. Александровіч, А. Р. Навіцкі, Мінск 1994

Чуць золак – стрэльбу ён за плечы,
Заткне сякеру за паяс, –
Заўсёды ходзіць бор сцярэгчы
І птушак біць з ружжа Тарас.
Хадзіў ці доўга ён, ці мала,
Ды толькі нешта адзін раз
Бяда ў бары яго спаткала...
Во як казаў нам сам Тарас.

II

«На самага Кузьму-Дзям'яна
Пайшоў я біць цецерукоў.
Устаў я нешта дужа рана, –
Здаецца, з першых петухоў.
Іду сабе я панямногу,
Але на пень крыху прысеў,
Аж тут – лоп-лоп! – цераз дарогу
Як быццам цецярук зляцеў.
Злажыўся стрэльбай – кляпсь! – не паліць,
Крамзель з другога! – не пякець!
Гляджу – аж вось з-за елі валіць
Як ёсць хароміна-мядзведзь!
Хоць не труслівы я дзяціна,
Але затросся, як асіна,
Зубом, як цюцька, лепячу.
Гляджу – аж зломлена лясіна,
І ўздумаў: дай-ка ўскачу!

III

Скакнуў – не трапіў, паслізнуўся
І ў яму старчаком лячу!
Ляцеў, ляцеў – як разануўся, –
Аж стала зелена ўваччу!
Ляцеў ці доўга я, ці мала,
Таго ніяк не ўцямлю,
Але ўжо ладна рассвітала,
Як я зваліўся на зямлю.

Устаў з зямлі, абкалаціўся, –
Бо быў у гразі, як свіння,
І дужа, дужа я дзівіўся –
Дзе апынуўся гэта я?
Рукой паскробшы каля вуха,
Дабыў з табакай рагавень
І храпы напіхаў цяртухай, –
Бо ўжо не нюхаў цэлы дзень!
Як прасвятлелі мае вочы,
Мядзведзя ўжо я не шукаў.
Закінуў стрэльбу я за плечы
І па баках глядзець пачаў.



«Лес у Сляпянцы», 1950. Уладзімір Кудрэвіч

IV

Авохці мне! Як там прыгожа!
Як быццам хто намаляваў!
Чырвоны краскі, мак і рожа, –
Ну, як сукенку хто паслаў!
І птушкі ёсць там, дужа стройна
Пяюць, палепш за салаўя!
Авохці мне, а-а-а-вой я!
Куды патрапіў гэта я?
Стаяў я доўга і дзівіўся,
Разявіў зяпу і глядзеў,
Аж вось адкулечка з'явіўся –
Ці то прышоў, ці прыляцеў –
Хлапчына нейкі круглалікі,
Увесь кудравы, як баран,
І за плячыма ў яго вялікі
Прычэплен лук быў і калчан.
– Адкуль, куды дарога гэта? –
Спытаў я ў хлопчыка той час.
– Дарога гэта з таго света,
І проста йдзе аж на Парнас! –
Сказаўшы, хлопчык таго часу
На крыллях шпарка паляцеў
Дарогу ж паказаць Тарасу,
Не меўшы часу, не хацеў.

V

Падумаў я тады нямнога:
Што за шайтан Парнас такі?
Пусціўся проста той дарогай,
Узяўшы ў рукі добры кій.
Прайшоў вёрст дзевяць той дарогай,
Аж бачу я – гара стаіць,
А пад гарой народу многа,
Як бы кірмаш які кішыць.
Прыйшоў я бліжэй, што за ліха:
Народ не просты, ўсё паны.
Хто дужа шпарка, хто паціху,
Усе лезуць на гару яны
І, як у школе, галасуюць,
Гатоў адзін другога з'есць,
Бо кожны морду ўперад суець,
Каб першым на гару узлезць.
(…)

VIII

Узлез. Гляджу – будынак новы
Стаіць, зазвычай панскі двор,
Кругом абнесен тын яловы:
Нябойсь, сюды не ўлезе вор!
А на дварэ тым свінні ходзяць,
Каровы, козы, бараны...
Знаць, і багі хазяйства водзяць,
Калі свіней дзяржаць яны.
На грошы ў тронкі тут гуляюць
Парнаскі хлопцы-дзецюкі,
А хто капейкі з іх не маець,
Той лупіць толькі на шчаўчкі,
Улез к багам тады я ў хату...
Авохці мне! Ні даць, ні ўзяць,
Як у казарме там салдатаў –
Багоў – не можна сашчытаць!»

IX

Тарасу ліха што здаецца, –
Ну, як бы ў рандзе ён сядзіць:
Хто піпку курыць, хто смяецца,
А іншы песню бурудзіць.
Глядзіць ён, аж на лаўцы шыюць
Шаўцы багіням хадакі,
Багіні ж у начоўках мыюць
Багам кашулі і парткі.
Сатурн там, лыкі размачыўшы,
Падвіркай лапці падплятаў;
Па свеце добра пахадзіўшы,
Лапцей ён многа патаптаў.
Няптун на лаўцы чыніць сеці
І восці садзіць на шасты,
Пры ім жа, мусіць, яго дзеці
Дзіравы ладзяць нераты.

X

Вось б'юцца Марс ды з Геркулесам,
А Геркулес, як той мядзведзь, –
Каб цешыць старага Зевеса,
Хахол ён Марсу добра мнець.
Зевес жа наўзніч лёг на печы,
Сярмягу ў голавы паклаў...
Ён грэў на печы стары плечы
І нешта ў барадзе шукаў.
Во перад люстрам задам меліць
І маслам мажа валасы
Ды нечым белым твар свой беліць
Вянера, знаць, дзеля красы.
Амур жа з дзеўкамі жартуе,
Ну, проста смех ажно бярэ!
То ён знянацку пацалуе,
То хустку з галавы здзярэ;
То на гармоніку зайграе,
То німфам песню запяе,
То адным вокам заміргае,
Як быццам бы каго заве.

XI

Вось затраслася ўся гара:
Зевес на печы зварухнуўся
Зяўнуў і дужа пацягнуўся
Ды кажа: «Есці ўжо пара!»
Тады праворна дзеўка Геба
Гарэлкі ў чаркі наліла
І, як жарон, букатку хлеба,
Прынёсшы, – бразь! – сярод стала!
Яна ў наймітки ў неба ўзята,
Каб есць варыць і плацці мыць.
Нябось, не дарам яе плата –
Ці ж лёгка столькіх накарміць?!
Во, з усяго сабраліс неба!
Як тараканы каля хлеба,
Багі паселі ўкруг стала,
І стравы смачны з печы Геба
Насіць да столу пачала.

XII

Наперш дала яна капусту,
Тады са скваркамі кулеш,
На малацэ крупеню густу
Дае ўволю, толькі еш.
І з пастаялкай жур сцюдзёны,
А з кашы сала аж цякло,
Ды і гусяціны смажонай
Уволю ўсім багам было.
Як унясла ж на стол каўбасы,
Бліны аўсяны ў рашаце,
Аж слінкі пацяклі ў Тараса
І забурчала ў жываце.
Багі гарэлку піць пачалі,
З насадкі ў чаркі так і льюць!
Падпіўшы, песні запяялі
Ну, як у рандзе, ўсе пяюць.
Бах сп’яну пеў такі прыпеўкі,
Што аж неможна гаварыць,
Аж засароміліся дзеўкі,
Так стаў ён брыдка развадзіць.

А Зеўс тым часам насцябаўся,
Што носам чуць зямлю не рыў, –
Ён вочы плюшчыў і ківаўся
Ды быццам нешта гаварыў.
Хоць не маё то, праўда, дзела,
Не след мне можа і казаць,
Любіў ён цешыць грэшна цела
Ды часам лоўка падгуляць.

XIII

Але багі такі ўсталі,
Як ўсё паелі, папілі.
Во... разам у дуду зайгралі,
Скакаць багіні пачалі.
Узяўшы хустачку, Вянера
Пайшла «мяцеліцу» скакаць.
Прыгожа, стройна цераз меру,
Пяром ня можна апісаць.
Чырвона, тоўста, круглаліца
І вочы, як на калясе,
Як жар, гарыць яе спадніца,
Істужкі ўплецены ў касе.
Хапіўшы келішак гарэлкі,
Амур яшчэ павесялеў –
Іграць пачаў ён на жалейцы
І дзеўкам стройна песні пеў.
Няптун з прыгожанькай наядай
Пайшоў упрысядку «казака»;
Нябось, і ў старога гада
Кроў грае, як і ў дзецюка,
А во й сам Юпітар з Вестай, –
Пусціўся, стары хрэн, у пляс,
Як бы жаніх перад нявестай,
Заткнуў ён рукі за паяс.
А во й Марс у новых ботах;
Ён, мусіць, ботаў не жалеў,
Бо з німфамі скакаў да поту,
Гуляў у жмуркі і шалеў.
І кожны бог так разгуляўся,
Што аж ня можна ўдзяржаць.
А хто гарэлкі насцябаўся,
Таго пад лаўку клалі спаць.

XIV

Калі зайграў дудар «скакуху»,
Ніяк Тарас наш не ўцярпеў,
І ад парога, што ёсць духу,
Скакаць на хату паляцеў.
Як стаў прытаптываць атопкам,
Аж рот разявілі багі:
То ён прысвісне, то прытопне,
То шпарка пойдзе ў кругі.
Глядзеў Юпітар і дзівіўся,
І пад дуду ў далоні біў,
У канцы к Тарасу прыбліжыўся
І так яго перапыніў:
«А ты адкулечка, прыяцель?
Зачым прыйшоў ты на Парнас?
Ты хто такі? Ты не пісацель?»
«Не, мой панок! – сказаў Тарас, –
Я палясоўшчык з Пуцявішча,
Чуць золак сёння са двара,
Прыйшоў сюды я да паўдня шчэ,
Ды ўжо й дадому мне пара.
Ці не была б, паночак, ласка
Адсюль дамоў мяне завесці?
Хадзіўшы па гары Парнаскай
Мне дужа захацелась есці...»

XV

Кіўнуў Зевес – і мігам Геба
Крупені ў міску наліла
І добрую краюху хлеба,
Сказаўшы: «Еш», – мне падала.
Крупені смачнай пахлябаўшы,
Усіх падзякаваў багоў;
Кашэль за плечы прывязаўшы,
Сабраўся ўжо ісці дамоў.
Але зэфіры падхапілі,
Хто за руку, хто за паяс,
І, як бы птушкі, паташчылі
Яны мяне цераз Парнас.

Няслі на крыллях, быццам вецер,
І проста прыняслі ў наш лес.
Гляжу я: мусіць, ужо вечар,
Бо маладзік на неба ўзлез...»
З тых пор Тарас ужо не ходзіць
Так дужа рана па лясах,
А дзеля гэтага не шкодзіць
Бярвенне красці па начах.
Дык вось што бачыў наш Тарас,
К багам узлезшы на Парнас.
Ён гэта мне апавядаў,
А я ў паперку запісаў.

- Геба – грэчаская багіня маладосці
- Кузьмы і Дзям'яна – рэлігійнае свята ў лістападзе
- рагавень – табакерка з валовага рога для нюхальнай табакі
- шайтан – чорт, нячыстая сіла
- Нептун – у рымскай міфалогіі, бог вады, мора
- Марс – у рымскай міфалогіі, бог вайны
- Геркулес – у грэчаскай міфалогіі, герой, які валодаў незвычайнай сілай
- Зевес – у грэчаскай міфалогіі, бог багоў, галоўны бог
- німфы – у грэчаскай міфалогіі, багіні рэк, крыніц, увасобленыя ў вобразах прыгожых дзяўчат
- Бах – у рымскай міфалогіі, бог урадлівасці, віна і весялосці
- Венера – рымская багіня прыгажосці і кахання
- Амур – у рымскай міфалогіі, бог кахання
- наяды – у грэчаскай міфалогіі, німфы, багінкі крыніц, рэк і азёр
- «Северная пчела» – рэакцыйная газета, якая выходзіла ў Пецярбургу ў гадах 1825-1864. Да 1859 г. выдаўцамі газеты былі Ф. Булгарын і М. Грэч
- Сатурн – у рымскай міфалогіі, бог пасеваў і ўрадлівасці

1. Адшукай у тэксце радкі, у якіх апісваецца, дзе збіраліся багі і самыя выдатныя пісьменнікі?
2. Чаму аўтар паэмы ўвёў на гару непісьменнага селяніна – Тараса?
3. Параўнай прадстаўленых у паэме багоў з тымі, якіх ведаеш з грэчаскай і рымскай міфалогіі? З якой мэтай уведзены змены?
4. Якія элементы народнага беларускага быту XIX ст. выступаюць у творы, а што з'яўляецца выдумкай аўтара?

5 Што ў паэме выклікае смех (паводзіны герояў, мова...)?

6 Якія рысы рамантычнага светапогляду выступаюць у паэме?

7 Раскажы на аснове паэмы *Тарас на Парнасе* пра адносіны аўтара да літаратуры і грамадскага жыцця.

❖ Галоўны герой паэмы *Тарас на Парнасе* – палясоўшчык Тарас. Гэта чалавек дасціпны, кемлівы, сумленны ў адносінах да сваёй працы.

Аднойчы, стомлены нялёгкай працай, Тарас прысеў адпачыць і заснуў. У сне з ім здарыліся неверагодныя прыгоды: уцякаючы ад мядзведзя, Тарас трапіў у яму і аказаўся на тым свеце, пры дарозе, што вяла на гару Парнас. Падымаючыся на гару, ён сустракаецца з вядомымі рускімі пісьменнікамі Пушкіным, Лермантавым, Жукоўскім, Гогалем, якія выступалі за дэмакратызацыю літаратуры, яе народнасць і гуманізм. Тут жа, ля падножжа гары, Тарас бачыць рэакцыйных пісьменнікаў Грэча і Булгарына, да якіх адносіцца з іроніяй і сарказмам. [...]

З багамі Тарас трымае сябе ўпэўнена, з пачуццём уласнай годнасці. [...] Калі пачынае танцаваць, то захапляе ўсіх.

Калі нават багі захапіліся танцам селяніна, то, мусіць, неабходна звярнуць увагу на народнае мастацтва, на таленавітасць простага чалавека. Беларус, лічыць аўтар, мае поўнае права заняць месца сярод багоў і пісьменнікаў. Аўтар твора, як рамантык, лічыць, што беларускі фальклор вартасны, лепшы нават за «літаратуру».

Паэма *Тарас на Парнасе* спалучае ў сабе два планы: рэальна-жыццёвы і ўмоўна-казачны. Такая кампазіцыя твора, дзе пераплятаецца рэальнае і казачнае, дазволіла аўтару выявіць свае адносіны да пісьменнікаў, літаратуры і фальклору.

паводле Васіля Старычонка

❖ [...] Ананімны верш *Вясна, голад, перапала* у некаторых выданнях выступае як *Вясна гола перапала*. Паўстаў прыблізна ў саракавыя гады XIX ст. [...]

Напісаны напярэдадні рэформы 1861, выяўляе настроі, якія панавалі ў асяроддзі беларускага сялянства перад адменай прыгону. У пачатку верша гаворыцца пра беднае галоднае жыццё селяніна, потым герой твора, паверыўшы чуткам пра свабоду, выказвае радасць, спадзяванне на вялікія перамены. Аднак у яго думках дамінуе помслівае пачуццё нянавісці да паноў. Верш прасякнуты пафасам крытыкі прыгонніцтва, панства, разам з тым у ім выразна відаць абмежаванасць сялянскіх уяўленняў аб справядлівасці і свабодзе, якія быццам можна атрымаць ад цара.

Твор кампазіцыйна зладжаны, просты, матывамі блізкі да народнай паэзіі. Аб гэтым сведчыць і яго мова, багатая фразеалагізмамі. Напісаны 4-стопным харэем, ён гучыць лёгка, свабодна, што з'яўляецца несумненнай адзнакай таленавітасці аўтара.

паводле Міхаіла Лазарука

Вясна, голад, перапала...

Вясна, голад, перапала –
Ані солі, ані круп;
І скаціне корму мала,
І самому – ані ў зуб.

На палацях пухнуць дзеці,
Жонка тры дні здуру п'ець,
І даўно парожна ў клеці,
І парожняя асець.

Каліта ляжыць пад лаўкай,
А пры ёй парожні гляк:
Ад каляд мы з кумам Саўкай
Пацяралі ў губе смак.

Але гора – ўжо спаўгора;
Цыц, нябога, трошкі цыц!
Вось нам вольнасць дадуць скора
І як птушкі будзем жыць.

К чорту жонка, ласа баба!
Бяры, чорт, і каліту,
А папусці вожкі слаба
І дай волю хамуту.

Будзем роўныя з панамі,
Самі будзем мы паны –
І гарэлку піць збанамі
І гуляць так, як яны.

Перастануць нашым братам,
Як скацінай, таргаваць, –
Напускацца ліхім матам,
Скуру з ног да карку драць.

Хоць халодна, хоць галодна,
Холад, голад ніпачом!
Эх! Каб толькі нам свабодна!
На свабодзе аджывём.

Вось панам не дужа лоўка
Самім трэба працаваць!
Пабаліць не раз галоўка,
Калі прыйдзецца араць.

Не адзін то папацеець
І заскачаць драпака.
Бо сам толькі есць умеець
Ды драць скуру з мужыка.

Як бы быў якой скацінай
Або горшы ад яго:
Білі пугай ды дубінай,
А цяпер, брат, ого-го!

Мужык будзець не скацінай;
Не раз скажаць пан з паноў:
Пане Грышка, пане Міна
Як жа васпан? ці здароў?

- асець – будынак для прасушвання снапоў перад малацьбой
- каліта – торба
- пуга – бізун
- дубіна – тут у значэнні: розга, кій

1 Пра які гістарычны факт успамінае аўтар твора?

2 Якое значэнне меў ён для простага народа?

3 Верш напісаны ад імя простага селяніна. Раскажы, як ён уяўляе волю.

4 Якімі фарбамі аўтар намаляваў сялянскае жыццё?

АДРАДЖЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў XIX СТАГОДДЗІ

Паступовая паланізацыя беларускай шляхты ў XVII і XVIII стагоддзях, давяла да таго, што яе прадстаўнікі гаварылі на іншай мове чымсьці акружаючыя іх сяляне. Беларуская мова, якая з'яўлялася дзяржаўнай у часы незалежнасці Вялікага княства Літоўскага, была паступова выцеснена з афіцыйнага ўжытку і пісьменства. Яе месца заняла польская мова. На ёй вялося справаводства, друкаваліся кнігі і газеты. Беларуская мова засталася жыць толькі ў сялянскіх хатах ды ў асяроддзі беднага мяшчанства і дробнапамеснай шляхты.

У XIX ст. з Захаду надышло зацікаўленне творчасцю народа, тым забытым і, як выдавалася, непатрэбным нікому беларускім фальклорам. Прыйшоў Рамантызм. Рамантыкі былі першымі, хто звярнуў увагу на прыгажосць роднага краю (у пераказе новага і самабытнага). Гэтая літаратурная плынь дала новае жыццё беларускай мове і заняпаўшай літаратуры. Жыццё беларускай літаратуры, у галоўным, далі тыя, якія беларускай мовай у паўсядзённых кантактах не карысталіся. Адраджэнне беларускай літаратуры ў XIX стагоддзі ішло ў двух сустрэчных напрамках: з аднаго боку, у сялянскім асяроддзі, якое зберагала фальклор і мову продкаў, з'яўляліся паэты і літаратурныя творы, а з другога – польскамоўныя аўтары, ураджэнцы Беларусі, сягаючы да фальклорных крыніц і ўздымаючы праблемы народнага жыцця, імкнуліся, каб іх творы распаўсюджваліся ў сялянскім асяроддзі.

Таленавітыя польскамоўныя паэты адчулі ўнутраную патрэбу тварыць і на беларускай мове. Беларускамоўныя творы працягвалі іх мастацкія пошукі. Паяўлялася двухмоўнасць, якая не была раздвоенасцю літаратурнага працэсу і творчасці асобных паэтаў. Ян Баршчэўскі, Ян Чачот, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Уладзіслаў Сыракомля, і інш., прыйшоўшы да ўключэння беларускай мовы ў сферу мастацкай творчасці, не пераставалі пісаць па-польску.

Раўнавага пераходнага часу, пры якім беларускае мастацкае слова суіснавала з польскамоўнай творчасцю, зрабіла натуральным беларуска-польскае моўна-літаратурнае сужыццё пад вокладкамі аднаго выдання, найперш, у кнігах Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, а таксама ў межах аднаго твора, галоўным чынам

у макаранічных вершах. Білінгвістычныя творы ўводзілі беларускае гутарковае слова ў пісьмовую сферу, фіксавалі яго мастацкую жыццяздольнасць і перспектыўнасць.

У XIX стагоддзі ўсе пісьменнікі, якія жылі на беларускіх землях, незалежна ад мовы, якой карысталіся ў сваіх творах, зыходзілі з аднае рэчаіснасці, заглыбляліся ў адных фальклорных крыніцах. Пераходная літаратурная сітуацыя на Беларусі ў пачатку XIX стагоддзя захоўвала прыярытэт польскамоўнай творчасці і, адначасна, выяўляла недастатковасць выказвання мясцовых аўтараў на адной толькі запазычанай у суседзяў мове.

У ліпені 1819 года Ян Чачот згадваў пра свае першыя балады ў лісце да Адама Міцкевіча, які таксама цікавіўся беларускімі казачнымі і паданневымі сюжэтамі. Адам Міцкевіч з глыбокай павагай ставіўся да народных уяўленняў, казачныя і легендарныя сюжэты, звязаныя з возерам Свіцязь, узнаўляў у сваіх баладах (*Свіцязянка, Свіцязь, Рыбка*) на ўзроўні індывідуальнай інтэрпрэтацыі. Яго кніга *Балады і рамансы*, выдадзеная ў Вільні ў 1822 годзе, літаральна ўскалыхнула мясцовае літаратурнае жыццё, раскрыла псіхалагічна-мастацкія магчымасці рамантычнага жанру, паэтычна блізкага да народнай творчасці. Менавіта з таго часу і найперш у коле студэнцкіх сяброў Адама Міцкевіча паглыблялася цікавасць да тае таямнічасці свету, якую не заўсёды можна растлумачыць бытавою логікай. Адкрылася патрэба пранікнення ў свет неспазнаных паняццяў праз мастацкае асэнсаванне вуснай творчасці насельнікаў тутэйшай зямлі.

І калі фальклор адухаўляў прыроду, то паэтычныя творы, заснаваныя на беларускім фальклоры, служылі яе гуманізацыі. Дзівосны свет, паўстаўшы ў легендах і паданнях як праява язычніцкага веравання, трапляў у рамантычныя балады не дзеля нагнятання змрочных жахаў і цёмных сіл, а дзеля іх нейтралізацыі ў паказе адносін паміж людзьмі і чалавечых паводзін згодных з хрысціянскаю мараллю.

Патрэбен быў час і пэўныя гістарычныя падзеі (паўстанне 1863 года ды дзейнасць Кастуся Каліноўскага), каб адраджэнскія тэндэнцыі ператварыліся ў адраджэнскі патэнцыял беларускай літаратуры, каб творы на беларускай мове адрасаваліся ўжо не толькі мужыку, як у Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, а ўсяму народу, як у Францішка Багушэвіча. Выданне Багушэвічавай *Дудкі беларускай* (Кракаў, 1891) засведчыла, што беларуская літаратура выйшла на самастойны шлях.

паводле Васіля Старычонка

1 Якую ролю ў развіцці беларускай літаратуры XIX ст. адыграў фальклор?

2 У некалькіх сказах раскажы пра значэнне польска-беларускіх пісьменнікаў для адраджэння беларускай літаратуры.



Ян Чачот (1796-1847)

Беларускі і польскі паэт, фалькларыст. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў тайнага студэнцкага Таварыства філаматаў. Пісаў беларускія і польскія песні і вершы на сходы таварыства. Пасля выкрыцця царскім урадам тайных арганізацый віленскіх студэнтаў (1823) быў арыштаваны і сасланы на Урал. На радзіму вярнуўся ў 1833 г. Пісаць пачаў у філамацкі перыяд. З'яўляецца аўтарам польскамоўных балад заснаваных на беларускім фальклорным матэрыяле. На фальклорным матэрыяле заснаваны таксама шматлікія яго вершы і песні (многія напісаны па-беларуску: *Што мы вашэці скажам, Да пакіньце горла драць, На прыезд Адама Міцкевіча, Яжовыя імяніны, ***Як то добра, калі мужык...,***Калі ў зямлю зерне кінеш..., ***А мая ж ты кветачка..., ***Поле, поле шырокае...* і інш.). Збіраў і вывучаў беларускі фальклор. Выдаў 6-томны зборнік беларускіх народных песень *Сялянскія песні...* (Вільня, 1837-1846).

У беларускай фалькларыстыцы Ян Чачот – постаць, можна сказаць, першай велічыні. [...] Сваімі публікацыямі ён паказаў свету, якія неацэнныя культурныя скарбы мае беларускі народ.

Кастусь Цвірка

Ян Чачот

* * *

А мая ж ты кветачка,
А мая ж ты птушачка,
А мая ты зоранька,
А мая ты дзеванька,
Што ж мне, беднаму, рабіць,
Што б з табою век свой жыць?
Калі будзеш гараваць,
Айца, матку шанаваць,
У свята да цэрквы хадзіць,
Па карчомках не блудзіць,
Мяне верненька любіць,
Век свой будзем разам жыць.

Сакольшчына

Ян Чачот

* * *

Поле, поле шырокае,
Неба, неба глыбокае!
Божа, Ты наш вечны пане!
Прымі ад нас павітанне!
Уся зямля слонцам ззяе,
З ясным небам размаўляе,
Што ўсё гэта Тваім дарам,
Што Ты света гаспадарам.
З ясным небам і зямлёю,
Чолам мы перад Табою!
З чыстым сэрцам і душою,
Чолам мы перад Табою!
Благаславі Твае дзеткі,
Працу нашу і палеткі,
Благаславі ўсе людзі,
Няхай усім добра будзе!

1 Звярні ўвагу на мову верша ****А мая ж ты кветачка...* Абазнач моўныя элементы характэрныя беларускаму песеннаму фальклору.

2 Напішы кароткае сачыненне на тэму: Роля Яна Чачота ў развіцці беларускай літаратуры і фалькларыстыкі.

Рамантызм – напрамак у літаратуры і мастацтве канца XVIII – першай чвэрці XIX ст., прыхільнікі якога адкідалі прынцыпы класіцызму, выстаўляючы на першы план інтарэсы чалавека, яго душэўнасць, сілу і ідэалы, адклікаліся да народных крыніц, пашыралі гістарычныя і народна-паэтычныя тэмы. Першыя рамантычныя творы на беларускай зямлі пісалі Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.

Ян Баршчэўскі (1794-1851)

Беларускі і польскі пісьменнік, выдавец, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры. Ён нарадзіўся ў вёсцы Мурагі, што на Полаччыне, паходзіў з беднай шляхты. Вучыўся Ян Баршчэўскі ў Полацкай езуіцкай калегіі. Праз доўгі час жыў і працаваў у Пецярбургу. Арганізаваў літаратурны гурток, які аб'ядноўваў выхадцаў з Беларусі. Выдаваў альманах «Незабудка» (1840-1844). Сваю літаратурную творчасць пачаў яшчэ ў Полацкай калегіі польскімі класіцыстычнымі паэмамі *Пояс Венеры* і *Псіхея* (1809), якія не захаваліся. Вядомыя яго польскія балады і вершы *Дзве бярозы, Курганы, Зарослае возера, Русалка-зводніца, Дзявочая крыніца, Пачаноўская гара на Русі* і паэма *Жыццё сіраты*. Друкаваўся ён у польскіх часопісах «Рубон», «Атэнэум» і інш. На беларускай мове напісаў дыдактычныя вершы *Дзеванька і Гарэліца*. Падзеям 1812 г. прысвяціў беларускі твор *Рабункі мужыкоў*. Найцікавейшым творам Яна Баршчэўскага з'яўляецца празаічны зборнік *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях* (1844-1846), дзе аўтар шырока выкарыстаў беларускія казкі і паданні. Змест твора такі: аўтар жыў у свайго дзядзькі, беларускага шляхціца Завальні, спатыкаў там розных людзей: і шляхту, і сялян. Ён пазнаў беларускае жыццё, беларускую душу, народную гутарку, песні і арыгінальны беларускі гумар. Свой твор Ян Баршчэўскі запоўніў чараўнікамі, нячысцікамі, забабонамі, у вялікую сілу якіх верыў просты народ.

❖ Пры жыцці Яна Баршчэўскага твор *Бунт хлопаў* часткова друкаваўся ў кнізе Аляксандра Рыпінскага Беларусь (Парыж, 1840) і ў прадмове Рамуальда Падбярэскага да *Шляхціца Завальні* (Пецярбург, 1844). Своеасаблівы пачатак гэтага твора ў запісе Аляксандра Семянтоўскага з'явіўся ў «Памятной книге Витебской губ. за 1864 год». Ёсць дзве назвы гэтага твора: *Рабункі мужыкоў* (Рамуальд

Падбярэскі) і *Бунт хлопаў супраць аканома* (Аляксандр Рыпінскі). Другая назва больш адпавядае ідэйнаму гучанню твора. У свой час ён быў шырока вядомы на Беларусі, яго знайшла паліцыя ў Паўлюка Багрыма і канфіскавала. Тэкст, што хадзіў па руках, у яшчэ больш рэзкай форме выяўляў антыпрыгонніцкія настроі. Доказам гэтага з'яўлаецца ўрывак з *Размовы хлопаў*, так называўся варыянт твора, канфіскаваны ў Паўлюка Багрыма:

Дзецюкі! Худа нам жыць!
Пакіньма прыгон служыць!
Зробім вольнасць і урэч
Нас ураднік не будзе сеч!
Ці мы людзі не такія,
Што нам угрозы ўсякія?...

Ян Баршчэўскі

Бунт хлопаў

(…)

Першы Мінка сеў за стол,
У куты глядзіць, як сакол
На крэсле, дзе сядзеў пан –
Пуза, як барабан.

А ногі як разапнець,
Хоць з калёсамі праедзь.

«Помню я тыя векі,
Як жылі паноў прэдкі:
Нас у рэкруты не бралі.
Ах, што за паны бывалі!

Хоць на лбе валос і нет,
Ды ўжо ж вусы на ўвесь свет!
Два рукавы мелі красных
І яшчэ два ззаду запасных.

З адной палы ў тых паноў
Семера б пашыў штаноў!
А гэтыя і нас паелі,
І самі ўжо згалелі.

Полы сабе паабразалі,
Хвасты ззаду паадсякалі,
І цяпер ужо ўсякай
Кусай ззаду…

Прыйдзеш у двор, баішся,
Пакуль к пану збліжышся,
Доўга галаву скрабеш.
(…)

Яшчэ гэта не канец:
Палажы ж на стол яец.
І тут яшчэ страх бярэць
Ждаць, што пан запяець…

Калі прапусціш хоць дзень,
Дадуць – як у берасцень!..
Хай мне хоць праб'юць штаны,
Ды ўжо ж не будуць паны!..

Гэй, каб нам быць весялей!
Гэй, каб нам быць пасмялей!
Пойдзем, братцы, ў кабачок,
Вып'ем гарэлкі кручок.

Водка крэпка, мера спора,
Будзем піць, забудзем гора,
Братцы, як у добры год,
Завядзём тут карагод.

Пойдзем ад хаты да хаты,
Ці галыш хто, ці багаты;
Калі будзе весяло,
К нам збярэцца ўсё сяло…

Пілі бацькі і дзяды,
І мы ступім у іх сляды:
Яны гора не знавалі,
Гарэлку добра сцябалі.

Чалом, Грышка! Чалом, Дзёма!
Чалом, Кузьма! Заві Пахома!
Чаго яшчэ будзем чакаць?
Пара гарэлку піць, скакаць.

Памаўчы лепш, не сварыся,
З намі йдзі скакаць, Марыся!
Замаўчы й ты, Селівон!
Не замоўчыш, пойдзеш вон!»

Дзядзька сядзіць, піпку курыць,
П'е гарэлку, вачмі жмурыць,
А дзядзіна не ўважае,
Цалком чарачкі глытае.

Саўка скача, піша, пыша,
Умарыўся, ледзьве дыша.
Барыс – строгі целялёг,
Упіўшыся, пад лаўку лёг.

На ліха вось тут аканом
Уляцеў, награнуў з бізуном...
Рассыпаліс нашы розна,
Куды папала, куды можна.

Адзін схаваўся быў пад стол,
Яго аконам – за хахол.

Відзіць Мінка, што тут худа!
Абярнуўся туды-сюды,
Бедны, наўцёкі дзярэ:
А куды відзіць – туды бярэ.

1 Прачытай дакладна твор і знайдзі фрагменты, у якіх сяляне гавораць пра волю.

2 Раскажы, як сяляне ўяўлялі сваю волю.

3 Якія адносіны да сялян выявіў аўтар твора?

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч
(1808-1884)

Паэт, драматург, класік беларускай літаратуры XIX ст. У саракавыя гады пачаў ён займацца літаратурнай творчасцю. Першымі творамі былі лібрэта аперэт, між іншым *Ідылія* (паны ў ёй гавораць па-польску, сяляне па-беларуску), *Рэкруцкі яўрэйскі набор*, *Спаборніцтва музыкаў, Чарадзейная вада*, вершаваныя аповесці і апавяданні *Гапон, Купала, Халімон на каранацыі* і *Шчароўскія дажынкі*, п'есы *Пінская шляхта, Залёты*, вершы. У 1859 г., як першы, пераклаў паэму Адама Міцкевіча *Пан Тадэвуш* на беларускую мову. Некаторыя яго творы былі выдадзены ў друку пры жыцці, іншыя захаваліся ў рукапісах. Арганізаваў тэатральную трупу – першы беларускі тэатр, які наладжваў спектаклі ў Люцынцы, маёнтку паэта, а таксама Мінску, Бабруйску і іншых месцах. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч быў першым беларускамоўным пісьменнікам, які ўвёў у беларускую літаратуру новыя жанры і формы.

Змест твора «Гапон» Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча

Песня 1

У карчме весяліцца вясковы люд, п'юць гарэлку, танцуюць, спяваюць. З'яўляюцца войт з аканомам, вяселле спынілася, усіх апанаваў страх. Не спалохаўся толькі Гапон. Ён закрычаў, каб маладыя ўцякалі з хаты, бо ходзяць чуткі, «што некрутаў будуць браць». Хоць Гапон адчайна супраціўляўся, «яго, беднага, звязалі дый у калодкі скавалі».

Песня 2

У вялікім сяле стаялі хаціны дзвюх удоў, Усцінні і Грыпіны. У першай з іх быў сын Гапон, «горды,



«Месца пахавання В. Дуніна-Марцінкевіча», 1971
Вячаслаў Рускевіч

смелы, зух дзяціна», прыгожы і нават пісьменны. У другой – дачка Кацярына. І маткі, і дзеці думалі пра вяселле, ды ўмяшаўся аканом. Ён пачаў заляцацца да дзяўчыны, тая ж прыгразіла, што паскардзіцца Гапону.

Аканому даклаў карчмар, што Гапон збіраецца ажаніцца з Кацярынай. Ён страшэнна раззлаваўся. Калі войт прывёў хлопца, то кінуўся да яго з кулакамі, каб не думаў нават, «без двара ў сваты слаць». Гапон абразы не стрымаў і пан аканом вымушаны быў ратавацца ўцёкамі.

Помсцячы, ён абылгаў Гапона перад пані і хлапца аддалі ў салдаты. Кацярыну «зазваў у двор», паставіўшы за мэту дабіцца ўзаемнасці. Дзяўчына не бачыць выйсця, плача і просіць Бога, «штоб акончыў цяжкі мукі».

Выпадкова пачула галашэнні сіраты пані. Пачала пытацца, хто яе так пакрыўдзіў, і даведаўшыся праўды, прагнала аканома, а Кацярыну ўзяла «пакаёвай дзяўчынай».«Пані яе палюбіла, чытаць, пісаць навучыла».

Песня 3

Пайшоў пяты год, «Гапон на вайне як служыць, Кацярына па ім тужыць».

У горадзе Магілёве ідзе набор у войска. Поруч з «ясным маршалкам», строгім панам з крыжамі на грудзях, «пузатым, быццам, мядзведзь, такім касматым», доктарам і тоненькім, хітрым пракурорам сядзіць малады прыгожы афіцэр, Першым перад камісіяй апынуўся былы аканом, які к гэтаму часу стаў аднадворным (набыў уласную гаспадарку). Доктар, агледзеўшы аканома, знайшоў ганьбу («Відна, з сабой яны зналісь, пярвей, відна, пастаралісь», – адзначаецца ў творы). Аканом усяляк жаліцца на сваё здароўе.

Малады афіцэр кінуўся да аканома. Загадаў здаць яго ў саддаты, адправіўшы спачатку ў лазарэт і праверыўшы яго хваробу. Перапалоханы аканом у афіцэры пазнаў Гапона.

ГАПОН,
Powieść, w języku białoruskiego ludu napisana.
Ozdobiona 4 Rycinami.
PRZEZ
Wincentego Dunin Marcinkiewicza.
MIŃSK.
NAKŁADEM KSIĘGARZY MIŃSKICH, BRACI BEJLINÓW.
1855.

Песня 4

Кацярына ў пакоях пані знешне вельмі змянілася – «панску гаворку сумела і сукеначку надзела». Але яна не здрадзіла вясковаму жыццю, тужыць па ім, як і па каханаму. Аднойчы вечарам у двор з'явіўся афіцэр. Ён кінуўся пані ў ногі з просьбай злучыць яго з каханай дзяўчынай. Кацярына, пазнаўшы Гапона, таксама прыпала да ног сваёй заступніцы.

Гапон, хоць «чыноў дажыўся», вырашыў «простым звычаем, мужыцкім абычаем» гуляць вяселле. Ён пасылае сватоў да Агрыпіны. Пасля сватання (запоін), жаніх едзе да хаты нявесты, потым, разам з Кацярынкай – да пані, запрасіць на вяселле. Пані прыгожы пасаг дала, Радасну слёзку ўраніла, Маладым благаславіла, Сама к вянцу павяла.

Гапон

Беларуская аповесць
(Фрагмент)

Песня 1

Шум, крык, гоман у карчме,
Кіпіць сельская дружына,
Піва, мёд, гарэлку п'е,
Ажны курыцца чупрына.

Гаспадары за сталом
Громка гутарку вядуць,
А ляндарка з лендаром
Мёд, гарэлку раздаюць

Хлопцы, дзеўкі, маладзіцы
Ля парога гаманяць,
А старыя чараўніцы
Цішком ля печы сядзяць.

Ананя на скрыпцы іграець
«Лявоніху», то «Бычка»,
Гапон жару паддаваець:
„Зыграй, крычыць, «казачка»!"

Аж юкнула Кацярынка,
Так задаў ёй кулаком,
«Хадзі, мая ты малінка!» –
Дый затупаў хадаром.

«Ананя, рэж вясёлы!» –
Крычыць громка наш Гапон
Дый, сабраўшы ў світцы полы,
Мэрам хохлік! мэрам ён!..

То ўпрысядкі выкідаець,
Ажны стогнець пад ім пол,
То галубца падбіваець,
Ажны трасецца хахол.

«Ах! ух! давай жару,
Давай болі, давай пару!» –
Крычыць Гапон дый гуляець,
Пад скрыпачку падпяваець.

«Эй, чух, Кацярынка!
Чабоцікі красны;
Каму блішчаць, каго любяць
Твае вочкі ясны?

Эй, чух, Кацярынка!
Твае кудры ўюцца,
Скачыць, пляшыць мая міла,
Аж шчочкі трасуцца».

Трэйчы Гапон прамахнуў,
Бражджаць ножны з вагнівом,
Стаў на месцы – падпрыгнуў
Дый затупаў хадаром.

Кацярынка ж успляснула,
На міленькага зіркнула,
Хвіць! спаднічку распусціла,
Трэйчы запяткам падбіла,

Дробны ножкі выкідаець,
Чаравічкі скрыпяць,
А із вочак аж сіяець,
Быццам іскры ляцяць.

Русы коскі падлятаюць,
Каснікі, як жар, гараць;
А вось вышай як заграюць,
Так і возьме прыпяваць:

Музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку

«Мілы Хартон, мілы Саўка,
Да мілейшы ж мой Гапон,
Хахол ясны, пояс красны,
А галасок! кабы звон.

Не хачу Саўкі, Хартона, –
Мне жыцця з імі не быць,
Валей маяго Гапона,
З ім не буду я тужыць».
[...]

❖ Паэма *Гапон* была напісана ў 1854 годзе на беларускай мове ў духу сентыменталізму, літаратурнага напрамку, які характарызаваўся ідэалізаваным адлюстраваннем жыцця вёскі, пільнай увагай да душэўных перажыванняў герояў, заклікам да чалавечнасці, стварэннем вобразаў добрых памешчыкаў.

1 Якая сітуацыя прадстаўлена ў творы і ў які час адбываюцца падзеі?

2 Якімі якасцямі надзяляе Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч Кацярыну і Гапона?

3 Апішы, як выглядала сялянская гульня.

❖ Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч адзін з першых пераклаў на беларускую мову паэму *Пан Тадэвуш* Адама Міцкевіча. Пераклад паэмы, а дакладней, дзвюх першых «быліц» паэмы, быў выдадзены ў Вільні ў 1859 г. Надрукаваны быў лацінкай («польскім шрыфтам»). Кніжку канфіскавалі. Уцалела ўсяго некалькі экземпляраў.

Паэма А. Міцкевіча *Пан Тадэвуш* у пазнейшых гадах была перакладзена поўнасцю ці часткова між іншым: Аляксандрам Ельскім, Браніславам Тарашкевічам, Пятром Бітэлем, Язэпам Семяжонам, Наталляй Арсенневай, Максімам Танкам.

• быліца – кніга, раздзел, частка

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч

Прадмова перакладчыка

Аповесць Адама Міцкевіча пад назвай *Пан Тадэвуш*, якая так выдатна малюе характар, норавы і звычаі нашых літоўскіх гаспадароў у напалеонаўскія часы, ужо цяпер перакладаецца на рускую мову. Чаму б простаму народу, злучанаму сяброўскімі сувязямі з землеўласнікамі, чаму б тая наша засцянковая шляхта, бацькоў якой памёршы прарок намаляваў у такой высакароднай форме, а якая, жывучы дзесьці ў лясным зацішшы і не валодаючы магчымасцямі для асветы, найчасцей выказваецца ў хатнім ужытку народнай гаворкай, чаму б, кажу, яна не магла азнаёміцца са звычаямі сваіх бацькоў? – Уласна гэтая заўвага натхніла мяне думкай перакласці *Пана Тадэвуша* на беларускую гаворку.

Мае творы на гэтым дыялекце, якія маюць на мэце заахвочванне нашага селяніна, а таксама беднай літоўскай і беларускай шляхты да навучання, не знайшлі дасюль, апрача некалькіх асоб, прыхільнікаў у гэтых заможных колах нашага грамадства, якія паводле Бога і сумлення найбольш павінны былі б далучыцца да асветы непісьменных суайчыннікаў. – Таму сёння *Пана Тадэвуша*, апранутага мной у мужыцкую сярмягу, ахвярую панам і простаму народу з-над Дняпра, Дзвіны, Беразіны, Свіслачы, Віліі і часткова Нёмана. Можа, таксама народ гэты, набліжаны прастатой звычаяў да маткі прыроды, з больш гарачым сэрцам прыме падарунак свайго дудара, што вырашыў апошнія хвіліны свайго існавання прысвяціць толькі працы, якая мае на мэце яго духоўную патрэбу.

• «Ужо цяпер перакладаецца на рускую мову» – маецца на ўвазе зроблены Міхаілам Бергам рускі пераклад *Пана Тадэвуша*, які выйшаў у 1875 г.

Нёман у Лаўрышаве на Навагрудчыне

Адам Міцкевіч

Пан Тадэвуш

Быліца першая

ГАСПАДАРКА

Што стаіць у быліцы

Паніч варочаецца дамоў. – Першая стрэча ў святліцы, другая пры стале. – Важная навука суддзі аб грэчносці. – Падкаморага разумная гаворка аб модах. – Пачатак спірання аб Кусага і Сакала. – Пасьледні возны трыбунала. – Узгляд на тагдашняе быццё Літвы і Еўропы.

Літва! – родна зямейка! Ты, маўляў, здароўе, –
Той цябе ашанцуе, каму безгалоўе!
Хто жыў калісь на ніўцы тваёй, як у раі,
І вось крывавы роніць слёзкі ў чужым краі!

Цяпер-то, як ты красна, я чую, я бачу
І апішу, бо горка ўсцяж па табе плачу!
Ты, Панна! што сцеражэш яснай Чанстаховы,
Што свеціш у Вострай Браме, што горад замковы
Навагродскі бароніш, яго народ жылы,
Як мяне Ты падняла, маўляў із магілы
(Вось Цябе бедна маці ў вачах са слязінай
Маліла, штоб апеку мела над дзяцінай, –
І з немачы падняўся, – і пайшоў у дарогу,
Што б у Твоіх касцёлах падзякаваць Богу),
Так нас дзівам павернеш у зямельку родну.
Пакуль жа блісне шчасце, хоць душу нягодну
Звярні да гор лясістых, шырокіх пракосаў,
Што дыванам пры Немне свецяць з-пад нябёсаў,
Да ніў родных, калоссем ярка маляваных,
Залочаных пшаніцай, жытам пасрабраных,
Гдзе жоўтая свірэпка, гдзе грэчка бяленька,
Гдзе дзяцеліна гарыць, вось красна паненка;
А ўсё мяжой прыбіта, бачыцца устужкай,
Там-сям быццам к адзежцы прышпілена грушкай.

Меж такімі палямі, намесь, пры ручаі,
На узгорку невялікім, ў бярозавым гаі
Свяціў шляхецкі хорам, кругом дзеравяны
Да на падмураванні, увесь пабяляны;
Тым бялейшы, што тапольспераду і збоку
Сцерагла ад сіверу у восень глыбоку.
Дом жылы невялікі, чысты на прыглядку!
[...]

Пераклаў Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч

1 Чым кіраваўся Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч пры перакладзе *Пана Тадэвуша* на беларускую мову?

2 Каму перакладчык адрасаваў сваю працу?

3 Што аўтар перакладу гаворыць пра сваю творчасць? Адшукай у *Прадмове...* фрагменты, у якіх успамінае пра яе.

4 Прачытай адпаведны фрагмент твора *Пан Тадэвуш* на польскай мове, параўнай яго з перакладам.

Пінская шляхта

Фарс-вадэвіль у адной дзеі

Асобы:
К р у ч к о ў – станавы прыстаў.
П і с у л ь к і н – яго пісарчук.
Ц і х о н П р а т а с а в і ц к і.
К у л і н а – яго жонка.
М а р ы с я – іх дачка.
І в а н Ц ю х а й - Л і п с к і.
Г р ы ш к а – яго сын.
Ц і м о х А л ь п е н с к і.
Б а з ы л ь С т а т к е в і ч.
Х а р ы т о н К у т о р г а.
Дзесяць іншых асоб.
Дзесяцкі.

Дзея адбываецца ў ваколіцы О.... паміж балотаў, у глушы Пінскага павета. Сцэна паказвае шляхецкую ваколіцу. Гаспадарскія будынкі раздзелены садамі з боку сцэны – хата заможнага гаспадара, пры ёй – лаўка.

З'ява I

М а р ы с я (*седзячы на лаўцы, прадзе і прыпявае*). (...) Няхай ганіць бацька, няхай лае маці, а я люблю Грышку і любіць яго век буду. Ой, бедныя ж нашы галованькі!.. Што гэта за дур напаў на бацькоў? П'яныя завяліся ды пабіліся з сабою за шляхецтва, а мы з Грышкам праз тое гаруем і ныем. Яго бацька падаў на майго ў суд скаргу, і сягоння прыедзе ў ваколіцу найяснейшая карона на прасоку. У ім цэлае наша спасенне. Як прыедзе, дык мы з Грышкам паклонімся яму ў пояс ды будзем прасіць ды маліць, каб ён пагодзіў нашых бацькоў ды каб яны дазволілі нам пажаніцца. А ён такі сярдзіты, не дапускай ты госпад! Як наставіць адзін вус угору, а другі ўніз ды крыкне: па найяснейшаму ўказу! – то бацькі спалохаюцца ды зладзяць нам вяселле... Ды што гэта зрабілася Грышку? (*Грышка паціху паказваецца з-за дзерава, крадучыся да Марысі*). Баюся, каб не паўставалі бацькі, – нельга было б пабачыцца з ім. (*Устаўшы, пахаджваючы па сцэне, гаворыць.*) Ой, Грышка, Грышка! Ты штось цяпер зрабіўся вельмі лянівы. Табе, пэўна, сэрца цяпер так ужо не ные па мне... Як прыйдзе, дык пакажуся перад ім сярдзітаю і хоць будзе прасіць і маліць, каб пацалавала, дык не пацалую. Дальбог, што не пацалую!

З'ява II

Грышка і Марыся

Г р ы ш к а. Дык я ж і прасіць не буду, сам цябе пацалую. (*Цалуе яе.*)

М а р ы с я. Ах, Грышка, нядобры! Як ты спалохаў мяне, гневаюся не жартам!..

Г р ы ш к а. Гневаешся? Няпраўда! А чаму ж ты на мяне так міленька пазіраеш?

М а р ы с я. Так, са злосці!.. Нягодны, дзе ты забаўляўся? Гэта ж зараз прыйдуць бацькі, а мы так многа маем з табою перагаварыць.

Г р ы ш к а. Выбачай, мілая Марыся, – чуць золак, я з'ездзіў ужо да места, кінуўся ў ногі асэсару і прасіў, каб ён узяў нас пад сваю апеку.

М а р ы с я. Трэба было завезці які гасцінчык.

Г р ы ш к а. Дык я ж завёз яму двух зайцоў, тры пары цецерукоў ды кадобчык мёду. Ён усё прыняў ласкава і сказаў, што сёння ж прыедзе на разборку справы майго бацькі з тваім. Ой, наварылі бацькі сабе кашы, будзе што есці! Ён вельмі сярдзіты, – бо адзін вус калом угору стаў. Будзе вазня!

М а р ы с я. Дай Бог, каб гэта каша нам зубоў не папрышчыла!

Г р ы ш к а. Ён дакляраваў зрабіць нам вяселле. На Богу ды на ім – уся наша надзея.

(...)

З'ява III

Тыя самыя. Ціхон Пратасавіцкі і яго жонка Куліна

Ц і х о н. Хрэн табе ў вочы, – жонка, а жонка! Хадзі да паўзірайся, як дачка твая з Грышкам Цюхайчыкам галубіцца!

К у л і н а (*за сцэнай*). Хто? Дачка? Бойся Бога, ды яна ж яшчэ малая. (*Уваходзіць.*)

Ц і х о н. Які чорт малая! Хрэн табе ў вочы, – хадзі палюбуйся!

М а р ы с я. Якая ж я малая, калі мне на Спаса скончыцца семнаццаць год?!

К у л і н а. Маўчы ты, хітрая лісіца! Бачыш ты, як яна скора палічыла гады!

Ц і х о н. Ах ты, чортаў сыну, – хрэн табе ў вочы! Не годзе таго, што бацька да жывога мяне пакрыўдзіў, назваўшы не шляхціцам, дык яшчэ сынок дачку нам баламуціць.

Г р ы ш к а. Ды я ж яе люблю і хачу з ёю жаніцца...

Ц і х о н. Ось я цябе так пажаню, як твайго бацьку! Жонка, а жонка! Дай мятлу, – хрэн табе ў вочы!

Г р ы ш к а. Што хочаце, тое рабіце, а ўсё-такі Марыся будзе мая! (*Да Марысі.*) Бывай здарова! (*Выходзячы, спатыкаецца з Куторгам і збівае таго з ног, Марыся ўцякае ў хату.*)

З'ява IV

Тыя ж і Куторга

К у т о р г а. Ах, ты, паганец! (*Устаючы*) Татарын ты нехрышчоны! Вот збіў мяне, як шведаў Хадкевіч пад Кіргольмам. Пачакай жа, я ж табе не дарую гэтай штукі, – не цяпер, то ў чацвер. (*Вітаецца*) Дзень добры, пане Пратасавіцкі! Здарова, пані Пратасавіцкая! (*Цалуе яе ў руку*) Відна, відна, – дзякуй богу! Здаровы, як рыжкі баровы... А я к вам з вялікаю навіною. Не ведаеце? Толькі што пан асэсар прыехаў, а такі сярдзіты, не дапускай госпад! Як ліхі татарын. Як толькі ўехаў у ваколіцу ды стаў каля Бэркі, дык зараз і закрычаў – дзесяцкіх, соцкіх! Сабраць усю шляхту да Ціхона Пратасавіцкага, ды каб Іван Цюхай-Ліпскі прыйшоў з сынам туды ж.

Ц і х о н. Хрэн яму ў вочы, – будзе бяда, будзе! Гэты сабака Ліпскі падаў на мяне ў суд, што я яго адлупцаваў, дык вот і асэсара прыслалі. Ну, абдзярэ, як ліпку!

К у т о р г а. Вот дзіва, – на тое ён і асэсар! Заўваж толькі – у яго і рукі даўжэй, як у другіх людзей. Ты ведаеш яго прыпавесць: чырвонае – белае ўсё перадзелае.

(...)

Ц і х о н. Хрэн табе ў вочы! Добра табе прастарэкаваць, калі няма на шыі бяды. Ось скажы лепш, што рабіць? Пане Куторга, ты ж такі пісьменны чалавек, – можаш падаць разумную раду.

К у т о р г а. А прымеце ж чэсна маіх сватоў да вашай Марысі?

К у л і н а. Бойся Бога, пане Куторга, – яна ж яшчэ маладзенькая! Гэта ж дзіця горкае.

Ц і х о н. Які чорт дзіця, калі з хлопцамі цалуецца!

К у т о р г а. Дык чаго ж чакаць! Гэта, кажуць, кепскі тавар: мый ды чашы, потым спяшы, – заплаці каму, каб вывез з даму.

Ц і х о н. Добра, пане Куторга, – бяры сабе дачку, і пасаг дам, толькі зрабі ласку: выцягні з бяды.

К у т о р г а. Як чорта з балота.

К у л і н а. Парадзь, пане Куторга, – ты ж такі чалавек бывалы і па судах цягаўся.

К у т о р г а. Ну, я гатоў вам удружыць, толькі як ваша дачка захімерычыцца ды адцураецца ад мяне, то што тады? Вы ж ведаеце прыпавесць: даганяючы не нацалавацца.

Ц і х о н. Ратуй, ратуй, пане Куторга! Марысю ты ладам угамоніш, – чалавек ты разумны. Як падпусціш лёстачак, як падплывеш селезнем, дык яна і расплывецца.

К у т о р г а. То ведаеце што, пане Пратасавіцкі? Як прыйдзе к вам асэсар, то стаўляйце мяне ў сведкі; хоць я і не бачыў, але буду сведчыць, што ён цябе біў, а ты толькі бараніўся. Не жаль для Марысі скрывіць душою. Толькі ж, пані Пратасавіцкая, прышліце сюды Марысю, каб я мог з ёю па-

гаварыць ды ўгаманіць дурную, бач, каб не цуралася разумнага чалавека.

К у л і н а. Памагайце толькі майму Ціхону, а ўжо Марыся будзе ваша; я ёй сама ладам напілую вушы... Пойдзем, Ціхон, прыгатуемся, каб па-гаспадарску прыняць найяснейшую карону. А ты, пане Куторга, пачакай, – зараз прышлю Марысю. (*Выходзіць з Ціхонам.*)

З'ява V

Куторга (адзін)

К у т о р г а. Ну, хвала Богу, бацькоў удалося атуманіць! Цяпер трэба пайсці ў галаву па розум, каб дзеўку амарочыць. Прынадны, бач, кусочак. (*Цалуе пальцы, як бы смакуючы.*) Тварык – як сонейка яснае, шчочкі – як малінкі красныя, губкі – моў тыя каралі, а як засмяецца срэбным галасочкам ды вышчарыць зубкі – то, здаецца, бачыш два перлавыя шнурочкі. Ды і пасаг мае гаспадарскі: адна ў бацькоў, а стары грошы асьмінаю мерыць; у гумне поўна, у хаце дастатак, і абора багата. Добра гутарка кажа: калі абора цячэ, – гаспадыня бліны пячэ, а калі гумно цячэ, – гаспадар з хаты ўцячэ. Дык няхай жа дзень у дзень блінамі гасцей прымае. Праўда, век не схожы: я ўжо шосты дзесятак дажываю, а яна – семнаццаты гадок. Будзе клопату нямала, – о-ёй! Не раз пачашу патыліцу, – моладзь, як пчолы ў вуллі, будуць аблягаць маю хату; прыяцеляў копамі лічыць буду. Дык што ж рабіць? Не я першы, не я апошні, – дурных дзядоў нямала на Божым свеце. Каб сарваць такую прыгожую і багатую кветачку, не шкода і ў балоце пакачацца.

(...)

Так, так! У цяперашнім разумным веку хочаш спакойна жыць? Будзь філосафам: бачыш – не бачыш, чуеш – не чуеш, – ба, ба, бы! Ды вось і Марыся ідзе сюды. Якая красачка! Гледзячы на яе, аж слінка па губах цячэ. Ану, Куторга, падпусці ёй лёстачкі...

З'ява VI

Марыся і Куторга

К у т о р г а (*салодка пасміхаючыся, заляцаецца*). Дабрыдзень, панна Мар'яна!

М а р ы с я (*сарамліва*). Дабрыдзень, пан Куторга!

К у т о р г а. А як панна Мар'яна прыгожа выглядае, які свежы тварык, моў ружачка толькі што з пучка! З якой нецярпячкай я ждаў шчаслівага моманту, каб пацалаваць беленькую ручку панны. (*Падыходзіць з камічнай зграбнасцю і цалуе руку Марысі. Тая, адступіўшы назад, абцірае руку фартушком.*) Панна Мар'яна! Вы не чуеце, вы не ведаеце, як я вас крэпка люблю, як па вас нью.

(...)

М а р ы с я (*перабіваючы*). А ведаеце ад чаго гэта, пане Куторга? – Ад старасці! Ды ты ўжо нямала пажыў, – пара аб дзяўчатах перастаць думаць, а маліцца Богу, каб даў спасенне.

К у т о р г а. Стары, стары!! (*У гневе.*)

(...)

Уваходзяць станавы з Пісулькіным і хаваюцца па баках, каб падслухаць іх размову

К у т о р г а. Бач, сабака Грышка! Ён клешчам упіўся табе ў сэрца, ды нічога з таго не будзе. Бацька твой дакляраваў мне тваю руку за тое, што я буду сведкай проціў Цюхая-Ліпскага. Найяснейшая карона прыехаў на прасоку па жалобе Цюхая на твайго бацьку, што ён яго пабіў; і калі ты пойдзеш за мяне, дык я гатоў і душою пакрывіць, ды даказаць на следстве, што бацька твой не біў Цюхая; а калі маё не ў лад, то я з сваім назад. Заспрачайся толькі, дык я зараз буду сведкай проціў твайго бацькі. Уехаў твой родны ў нерат – ні ўзад, ні ўперад. Папаўся юрысту ў кіпці, – выссе ён яго, як упыр непамысную дзяўчыну. А калі б яму і ўдалося перапрасіць найяснейшую карону, то не канец яшчэ бядзе. Ведаеш, што кажуць людзі: чорт бяду перабудзе – адна згіне, дзесяць будзе. Справа ў суд як пойдзе, дык так дапякуць юрысты, моў баравіка на вуголлях, – адцураецца і сваіх.

М а р ы с я. Дарма ты мяне палохаеш! Мы з Грышкам паклонімся ў пояс найяснейшай кароне, дык ён пагодзіць нашых бацькоў, а табе за крывое паказанне дасць харошую гонку.

К у т о р г а. Што?! Ты думаеш, я баюся асэсара? Ды я такой задам яму пары, што ён не згадае, дзе ўюны зімуюць. Я чалавек бывалы, маю розум і патраплю ладам яго вывесці ў поле, як зайчыка пад хартоў.

З'ява VII

Тыя самыя, Кручкоў і Пісулькін, Кручкоў падыходзіць ціха к Куторгу ды б'е яго па плячы; Пісулькін жа з камічнаю ўхваткаю падыходзіць да Марысі, каторая сарамліва і баючыся кланяецца.

К р у ч к о ў. Дык ты мяне думаеш вывесці ў поле? Хочаш павучыць, дзе ўюны зімуюць? Пачакай жа, галубчык! Я ж цябе навучу, куды няправых сведкаў садзяць. Гэй, дзесяцкі!

К у т о р г а (*зляканы*). Ваша благароднае сіяцельства! Найяснейша карона! Ды я ж толькі сабе жартаваў, – вот страшыў дурное дзяўчатка, каб яна прызволіла пайсці за мяне замуж. Бацькі благаслаўляюць, а яна казырыцца, – дык я вось так здуру сказаў ёй.

К р у ч к о ў. Здуру хочаш крыва прысягнуць? А знаеш, чым гэта пахне? Па ўказу ўсеміласцівейшага цара Пятра Вялікага, 1779 года, аўгуста 10-га і па Статуту літоўскаму раздзела 3-га, параграфа 375-га гэта ўгалоўнае прэступленне, Сібірам пахне. Сібір, Сібір, галубчык! Гэй, дзесяцкі! (*Дзесяцкі*

ўваходзіць.) Пасадзі гэтага моладца ў асобую святліцу ды глядзі, каб ён не бачыўся ні з кім, а барані Божа, з гаспадаром не згаварыўся.

К у т о р г а (*выходзячы з дзесяцкім*). Найяснейшая карона! Бойцеся Бога, не губіце беднага чалавека! Мала што язык малоў, – добра прыказка кажа: млын меле – мука будзе, язык меле – бяда будзе. Выбачайце майму дуру!

К р у ч к о ў. Якому дуру? Ты ж чалавек бывалы і нядаўна хваліўся сваім розумам.

К у т о р г а (*з бакавых дзвярэй*). Які тут у чорта розум, калі так неасцярожна папаўся ў бяду, бы швед пад Палтавай! (*Выходзіць з дзесяцкім.*)

З'ява VIII

Тыя самыя, апрача Куторгі

К р у ч к о ў. Ну, пане Пісулькін, пакінь ваша заляцанне, а бярыся за дзела. Тут, брат, нам харошае жніво!.. Гэй, дзесяцкі! (*Той уваходзіць.*) Пастаў тут пасярэдзіне стол ды накрый яго судовым сукном. (*Дзесяцкі выпаўняе прыказанне.*) Харошая пагода, можна і на дварэ папрацаваць. Садзіся, пане Пісулькін, ды прыбяры бумагі. (*Пісулькін важна садзіцца, вымае корак з чарніліцы, разбірае паперы і іншыя падае станавому, каторы садзіцца таксама пры стале, задам да Пісулькіна, а потым гаворыць да Марысі.*) Ну, Марыся, хадзі сюды, пабліжэ, дык кажы мне шчырую праўду, – ты ж бачыш, што ў мяне вусы не натапыраны, дык я не сярдзіты, – кажы: любіш ты Грышку Ліпскага?

М а р ы с я (*саромячыся і перабіраючы фартушок*). Ну, дык што?..

К р у ч к о ў. За што ж ты яго палюбіла?

М а р ы с я. Сама не ведаю, – вот так штось прыпаў к сэрцу. Ды як жа яго не любіць, калі ён малады, прыгожы хлопец, а сэрца ў яго залатое.

К р у ч к о ў. Дык хош за яго замуж выйсці?

М а р ы с я (*з сарамлівасцю*). Але, хочу... калі за яго не пайду, то ўжо век мне, беднай, гараваці дзеўкай. Найяснейшая карона! Злітуйцеся над намі ды сатварыце наша шчасце! (*Кланяецца яму.*)

К р у ч к о ў. Чаго ж ты хочаш ад мяне?

М а р ы с я. Найяснейшая карона! Скончыце дзела няшчаснае між нашымі бацькамі не па-судоваму, а па хрысціянскаму абычаю: пагадзіце іх з сабою, – няхай больш не індычацца, ды прымусьце, каб яны нас з Грышкам злучылі. Найяснейшая карона! (*Кланяецца яшчэ ніжэй і жаласліва кажа далей.*) Ты ж такі, хоць чалавек судовы, чыноўны, ды, пэўна, верыш у Бога, – дык дзеля ласкі Божай сатвары ты нам ласку, зладзь нашае шчасце, а мы век будзем за цябе, тваіх дзетак і ўнучкаў Бога прасіць.

К р у ч к о ў. Но, но, мілая, будзь спакойна! Я хоць чалавек, як кажаш, судовы, але ўсё зраблю па-хрысціянску ды яшчэ на тваім вяселлі паскачу... Гэй, дзесяцкі! (*Той уваходзіць.*) А чы сабралася шляхта з ваколіцы?

Д з е с я ц к і. Усе сабраліся, хто з курыцаю, хто з кадобчыкам мёду, а хто з сушонай рыбай. Чакаюць, што ваша міласць ім прыкажа.

К р у ч к о ў. Добра! Няхай усе аддадуць хурману, ды спакуйце там харашэнька ў возе... Ты пакліч сюды Ціхона Пратасавіцкага з кабетаю. А Цюхай-Ліпскі з сынам ёсць?

Д з е с я ц к і. Цюхай, апроч мёду і рыбы, прыцяг дзесяць вянкоў сушаных баравікоў, а сын яго – капу ражынкаў-уюноў.

К р у ч к о ў. Добра, добра! Усё ўпакаваць асцярожна! Ды кліч усіх сюды!

Дзесяцкі выходзіць. Кручкоў строіць сур'ёзную фізіяномію: адзін вус ставіць угору, другі ўніз. З глыбіні сцэны выходзіць шляхта, баіцца, кланяецца нізка і хаваючыся адзін за другога. З бакавых дзвярэй выходзіць Ціхон Пратасавіцкі з жонкаю. Марыся зыходзіцца ў глыбіні сцэны з Грышкам і ціха шэпчуцца паміж сабою.

З'ява IX

Тыя самыя і Ціхон Пратасавіцкі, яго жонка, Цюхай-Ліпскі, яго сын Грышка, Цімох Альпенскі і іншая шляхта

Ц і х о н. Жонка, а жонка! Будзе бяда! Паглядзі, як у найяснейшай кароны вус адзін уніз, а другі ўгору задраўся. Ідзі ты наперад ды пакланіся яму, хрэн яму ў вочы.

К у л і н а. Што ты мяне пасылаеш! Ты сам наварыў піва, сам і папівай здароў, я баюся.

Ц і х о н. Ты – кабета, хрэн табе ў вочы, – ён жа цябе не з'есць! Вазьмі гэтыя грошы, – тут іх пяць дзесятак, – пакланіся ў ногі ды палажы на стол; ён жа юрыста, не адцураецца грошай, – тады і дзела пойдзе, як па салу.

К у л і н а. Ну, што рабіць, – папытаю. (*Яна боязна падыходзіць, кладзе грошы на стол, пасля нізка кланяецца станавому.*) Найяснейшая карона...

К р у ч к о ў. Цішэ! (*Куліна са страху адыходзіць ад стала ды хаваецца за мужа; Кручкоў, трымаючы паперу, устаў ды, не пазіраючы на шляхту, гаворыць.*) Па ўказу Пінскага земскага суда от 23-го мая сего года за н-р 2312 прыбыл я в околіцу для расследованія уголовного дзела о побоях, нанесенных Ціхоном Протосавіцкім Івану Цюхаю-Ліпскому... Ліпскі, маеш сведкаў?

Л і п с к і. Маю, найяснейшая карона.

К р у ч к о ў. Пусць выступят вперед! (*Трое шляхтаў выходзяць наперад.*) Пратасавіцкі, за што ты яго біў?

Ц і х о н. Дык ён жа назваў мяне мужыком, – хрэн яму ў вочы.

К р у ч к о ў. Маеш сведкаў?

Ц і х о н. Маю, Куторгу.

К р у ч к о ў. Яго няможна ставіць, – ён пад судом. (*Абярнуўшыся да сведкаў Ліпскага.*) Вы бачылі, як Пратасавіцкі біў Ліпскага?

Т р ы с в е д к і (*боязна кланяючыся*). Бачылі, найяснейшая карона.

К р у ч к о ў (*абярнуўшыся да іншай шляхты*). А вы бачылі?

У с е і н ш ы я . Не, не бачылі, найяснейшая карона!

К р у ч к о ў. Ну, дык добра! Следства кончана, цяпер будзе суд, а наўперад: па указу всеміласцівейшай гасударыні Елісаветы Петровны 49-га апреля 1893-га года і всеміласцівейшай Екацярыны Вялікай от 23-го сенцябра 1903-га года, а равномерно в смысле Статута літоўскаго раздзела 8-га, параграфа 193-га, коім назначается в пользу суда от цяжушчыхся грывны. Обжалованный Протосавіцкі імеет зараз жа ўплаціць пошлін 20, прогонных 16 і на канцэлярыю 10 рублёў. Жалуюшчыйся Ліпскі ў палавіне того; сведкі, каторыя бачылі драку, а не баранілі, – па 9-ці рублёў, а вся прочая шляхта, што не бачыла дракі, за тое, што не бачыла, – па 3 рублі. Плаціце!

(...)

Шляхта збірае грошы, пасля, зложаныя ў адзін мяшок, аддаюць Грышку, падпіхаючы яго да станавога і ўгаворваючы, каб ён асмеліўся аддаць іх Кручкову і прасіць даравацъ ім.

Л і п с к і. Ідзі ты, сынку, – палажы на стол ды прасі і малі, каб ён памілаваў нашу шкуру ды скасаваў строгі свой дэкрэт.

Г р ы ш к а. Бачыце, бацька, як нядобра, што вы зводзіцеся з суседзямі. Добра, я асмелюся падысці, толькі каб вы пагадзіліся з Ціхонам ды каб паслалі ад мяне сватоў к яго дачцэ Марысі.

Л і п с к і. Д'ябал яго бяры! Няхай толькі ўладзіцца дзела, а я не адкажуся. Ідзі, прасі!

Грышка з аднаго, а Пратасавіцкі з другога боку баязліва падыходзяць да стала, пры каторым Кручкоў, нібыта ўглыблены ў чытанне папераў, ды кладуць мяшок з грашыма; Грышка, моцна кашлянуўшы, кланяецца нізка станавому ды гаворыць

Г р ы ш к а. Найяснейшая карона! Мы – адвеку пінская шляхта і ты шляхціц. Не глумі ж, не пэцкай у балоце шляхецкай, братняе табе, крыві! Скасуй строгі твой дэкрэт, на сорам нашай ваколіцы пісаны, – паміры майго бацьку з Ціхонам, ствары мае і Марысі шчасце, а мы ўсе, цэлаю ваколіцай, век за цябе будзем Бога прасіць і век табе дзякаваць!

П і с у л ь к і н. І я вас прашу, ваша благародзіе, – пусць подадут міровую і канцы в воду.

К р у ч к о ў (*да Пісулькіна, але моцна*). Харашо! Для вас это здзелаю, прыму грэх і ответ на себя... Ціхон Пратасавіцкі і Цюхай-Ліпскі! Падыдзіце сюды бліжэй. (*Тыя падыходзяць, за імі Грышка і Марыся.*) Абніміцеся і пацалуйцеся на згоду, – ну, што ж? (*Марыся свайго бацьку, а Грышка свайго папіхаюцъ, каторыя потым абнімаюцца і цалуюцца з сабою.*) Ціхон! На згоду каб быў крупнік.

Ц і х о н. Гатовы, найяснейшая карона! Схадзіце, жонка і Марыся, ды прынясіце, – хрэн вам у вочы. (*Куліна і Марыся ідуць у хату.*)

К р у ч к о ў. Вы думаеце, што мне міла паняверыць кроў шляхецкую? Я ж сам шляхціц, вам родны, але што ж рабіць? Служба – не дружба. Законы, міленькія, законы! Годзячы вас, бяду на сябе бяру; толькі пад такою

кандыдацыяй, каб Ціхон з Ліпскім навек з сабою памірыліся ды каб я з-за вас не ўлез у нерат. Канечна трэбую, каб тут жа, пры мне, дзетак сваіх заручылі, а там і павянчалі. (*Тут Куліна і Марыся ўносяць дзве міскі гарачага крупніку ды ставяць на стол з кубкамі.*) Ну, што, Ціхон, – аддасі за Грышку сваю Марысю?

К у л і н а (*ставячы міску*). Гарачая, ой, гарачая, найяснейшая карона!

К р у ч к о ў. Адкуль жа ты ведаеш?

К у л і н а. Дык я ж сама яе зладзіла...

К р у ч к о ў. Што?

К у л і н а. Да гарэлку. Толькі што перагарэла, шафрану і розных прыпраў насуліла многа, мёду ж цэлы кадобчык укінула.

К р у ч к о ў. А... ты талкуеш аб крупніку!

Ц і х о н. Хрэн табе ў вочы! Чуеш, што найяснейшая карона кажа?

К у л і н а. А як жа, аб прыправе...

Ц і х о н. Аб якой прыправе? Хрэн табе ў вочы, – аб Марысі! Ці аддасі яе за Грышку Ліпскага...

К у л і н а. А што будзе з Куторгаю?

Ц і х о н. Хрэн яму ў вочы! Твой Куторга толькі хваліцца ўмее, а як прыйшло да дзела, дык чуць у бяду з сабою разам і мяне не ўцяг.

К р у ч к о ў. Вот я тут зараз цэлую справу кончу. Налівайце кубкі! (*Куліна з Ціхонам наліваюць, падаюць Кручкову, Пісулькіну і ўсім іншым.*) Грышка, любіш ты Марысю? Хочаш з ёю да шлюбу?

Г р ы ш к а. Ой, хачу, вельмі хачу! Найяснейшая карона! Бог мяне пакарай, калі я не дам ёй шчасця адружыўшыся.

К р у ч к о ў. А ты, Марыся, любіш Грышку? Хочаш з ім век дзяліць шчасце і гора? (*Марыся, засаромеўшыся, паварочваецца тварам да сцяны ды дзёрпае яе пальцам.*) Ну, што? Чаго маўчыш?

М а р ы с я. А ўжо ж, калі маўчу...

К р у ч к о ў. Дык – хачу? Ладна! Любіш ты Грышку?

М а р ы с я (*сарамліва*). Але...

(...)

К р у ч к о ў. Ну, калі так крэпка яго мілуеш, дык ужо няма чаго раздумваць. Панове бацькі! Трэба іх злучыць, а то новае ўгалоўнае дзела зваліцца на вашы галавы. Пане Ліпскі, чы прымаеш, вашэ, мяне за свата для свайго сына?

Л і п с к і. Ды ўжо ж, найяснейшая карона! Задумалі дзела, то і канчайце яго з Богам, – я рад буду благаславіць.

К р у ч к о ў. Дайце сюды ручнік! (*Падаюць, і ён закідае яго сабе на плячо*) Ну, вот я і сват! Што, панове Пратасавіцкія, – аддаеце вашу дачку за Грышку?

Ц і х о н. Такога свата трудна не ўважыць. Хадзі, жонка, хадзі, пане Ліпскі, – хрэн табе ў вочы! Паблагаславім дзяцей, а там потым адгуляем вяселле. На пасаг дам два гарцы грошай і шляхецкую худобу, а па смерці ж нашай і самі ўсё забяруць.

К у л і н а. Ды і на выправу не пашкадуем, – яна ж у нас ядыначка: што

маем, тое ўсё яе, каб толькі Бог даў ім шчасную долю. (*Бацькі сходзяцца і злучаюць маладым рукі.*)

К р у ч к о ў. Вот так, добра! Цяпер, панове бацькі, падпішыце міравую і злажыце міравых пошлін па тры капейкі. (*Тыя падпісваюцца трыма крыжыкамі. Пісулькін за іх распісваецца.*)

А л ь п е н с к і (*убок*). Не быў бы судовы чалавек! Пабраў рублі ды яшчэ па капейкі сягае. У іх ужо такая натура: без капеек і чвэрцяў, як без солі ў страву, ніяк не абойдуцца: капейкі і чвэрці – да скарбу, а рублі – сабе.

К р у ч к о ў. Дзесяцкі! (*Той уваходзіць.*) Прывядзі сюды Куторгу! (*Дзесяцкі выходзіць.*) Ну, што ж, – налівайце зноў кубкі ды вып'ем за здароўе маладой пары.

У с е (*падымаючы ўгору кубкі*). Будзьце здаровы, маладыя! Дай Бог вам век з сабою шчасліва пражываць!

З'ява апошняя

Тыя самыя і Куторга

К у т о р г а (*кланяецца ўсім*). Дзякуй, дзякуй, панове грамада! Буду старацца ўшчаслівіць Марысю.

К р у ч к о ў. Маўчы, стары хрэн, не аб табе тут ідзе дзела! Бяры кубак ды выпі за здароўе маладых, Грышкі Ліпскага з Марысяю, і падзякуй Богу, што так лёгка вырабіўся ад суда.

К у т о р г а. Дык гэта не я – малады? Не за мае пілі здароўе?

К р у ч к о ў. Пакінь, стары хрыч, думаць аб жаніцьбе, а заматай сабе на вус, каб крэпка дзяржаць язык за зубамі.

К у т о р г а. Ой, найяснейшая карона! Буду сабе часта браць на розум філасофскую прыпавесць: на тое Бог даў людзям язык, каб умець маўчаць. (*П'е з кубка.*)

К р у ч к о ў. Дзесяцкі! (*Той уваходзіць.*) Коні гатовы?

Д з е с я ц к і. Запрагаюць, найяснейшая карона! (*Выходзіць.*)

К р у ч к о ў. Ну, панове шляхта-брацця! Я вам родны, я вам брат, дык на прашчанне вып'ем яшчэ па кубку крупніку, заспяваем нашу родную песню ды паскачам на заручынах. Пане Куторга, у цябе яшчэ не вельмі курыцца чупрына, – ты вядзі пункты, а мы пакруцімся, прыпяваючы.

У с е. Віват наш брат, найяснейшая карона!

(...)

Чуваць звонікі. Шляхта, ап'янелая, хістаецца па сцэне без парадку; гутарка агульная без сэнсу; Куторга пасярэдзіне сцэны выпускае з рук кубак і засынае; Кручкоў бярэ ўбок Альпенскага і кажа яму

К р у ч к о ў. Ведаеш, што на цябе казаў Статкевіч?

А л ь п е н с к і. А што?

К р у ч к о ў. Ён казаў, што ты не шляхціц.

А л ь п е н с к і. Што? Ён мяне так зневажае? Вось я ж яму пакажу маё шляхецтва!

К р у ч к о ў. Не пры мне, – як паеду, тады з ім расправішся! (*Адыходзіцца, бярэ ўбок Статкевіча.*) Знаеш? Цябе Альпенскі аблаяў мужыком.

С т а т к е в і ч. Ён смеў назваць мяне мужыком? Мне сам Юры Кабылінскі падпісаў грамату, – дык я ж на шкуры яго выпішу сваё шляхецтва! (*Шугаецца да Альпенскага і пачынаюць біцца.*)

Л і п с к і. Найяснейшая карона! Шляхта напілася і завялася біцца. Бойцеся Бога, раздыміце, а то і з вас штраф будзе належыць!

К р у ч к о ў. Не ка мне, не ка мне, – няхай у суд падаюць, тады прыеду на следства! Бывайце здаровы! (*Выходзіць з Пісулькіным.*)

Ц і х о н. Віват, найяснейшая карона!

У с е (*апрача тых, што б'юцца*). Віват, найяснейшая карона! (*Заслона апускаецца, пакідаючы наперадзе сцэны Куторгу; той прачынаецца.*)

К у т о р г а. Што? Ужо разышліся? А там чутна і бойка! Добра прыпавесць кажа: пінска шляхта як нап'ецца, то напэўна падзярэцца. (*Да публікі.*) Ды вы ўжо, найяснейшыя панове, спаць хочаце? А што? Няпраўда? Дык:

Найяснейшая публіка!
Прашу цябе, не дзівіся,
Бяда гэта невяліка,
Што мы крыху папіліся.
Няхай шчасная развязка
Пінскай шляхце ад вас будзе, –
Дайце брава, калі ласка,
Ды і з Богам, добры людзі!

- крупнік – пітво, прыгатаванае на агні з гарэлкі і патакі з рознымі прыправамі
- найяснейшая карона – пінская шляхта велічала найяснейшай каронай асэсараў, засядацеляў і станавых прыставаў, таму што першыя выбіраліся падчас шляхецкіх выбараў, а другія назначаліся ўрадам

1 У чым асаблівасць мовы Ціхона Пратасавіцкага, яго жонкі Куліны, Куторгі і Кручкова?

2 Знайдзі прыклады камічнага прадстаўлення падзей у камедыі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

3 Прачытай ніжэйпададзены тэкст. Скажы, чаму Васіль Старычонак сцэну судовага пасяджэння назваў «вострай пародыяй на царскі суд»?

❖ Камедыя *Пінская шляхта* напісана ў 1866 г., а з'явілася ў друку толькі ў 1918 г. Яна рэзка адрозніваецца ад ранейшых твораў аўтара. Задума п'есы паявілася ў час турэмнага зняволення пісьменніка (быў падазраваны ў сувязях са Студзеньскім паўстаннем). У закончанай пасля турмы п'есе Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч змяніў свае погляды на шляхту, змяніў падыход да прадстаўнікоў царскай улады: паліцэйскіх, судовых чыноўнікаў, следчых.

Дзеянне ў камедыі адбываецца ў адным з глухіх засценкаў Пінскага павета, дзе ўсе лічаць сябе шляхціцамі дваровымі. Двое «шляхцічаў» пасварыліся і нават пабіліся з-за таго, што адзін абазваў другога мужыком. Абражаны Ліпскі падае Пратасавіцкага ў суд. На разгляд справы прыязджае станавы прыстаў. Каб больш яскрава паказаць тыповыя рысы «судовых людзей», Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч уводзіць у п'есу сцэну судовага пасяджэння, якая ўспрымаецца як вострая пародыя на царскі суд.

паводле Васіля Старычонка

Афарызм – выслоўе, у якім у трапнай, лаканічнай і звычайна вобразнай форме выказана арыгінальная думка.

Прыказка – устойлівае трапнае народна-паэтычнае выслоўе павучальнага характару, якое ўвасабляе мудрасць і шматвяковы вопыт людзей. Вызначаецца яна завершанасцю і лаканічнасцю формы, метафарычнасцю і рытмічнасцю мовы.

Прымаўка – агульнавядомае вобразнае выслоўе, якое адрозніваецца ад прыказкі тым, што не з'яўляецца закончаным суджэннем і звычайна не мае павучальнага зместу.

Кастусь Каліноўскі (1838-1864)

Кастусь Каліноўскі (**Канстанцін Вінцэнт Каліноўскі**) змагар за разняволенне, роўнасць, нацыянальнае адраджэнне Беларусі, адзін з кіраўнікоў Студзеньскага паўстання, публіцыст. Аўтар сямі нумароў газеты «Мужыцкая праўда», шэрагу інструкцый і заклікаў, некалькіх лістоў, развітальнага слова *Пісьмы з-пад шыбеніцы*. Газета «Мужыцкая праўда» па фармаце нагадвала лістоўку-заклік, у якой на адным ці двух баках папяровага ліста лацінскімі літарамі друкаваўся тэкст. Упершыню на роднай мове ў ёй апавядалася аб праўдзе, якой чакалі падданыя царскай імперыі.

Кастусь Каліноўскі

Пісьмы з-пад шыбеніцы

* * *

Браты мае, мужыкі родныя. З-пад шыбеніцы маскоўскай прыходзіць мне да вас пісаці, і можа раз астатні. Горка пакінуць зямельку радную і цябе, дарагі мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, – но не жаль згінуць за тваю праўду.

Прыймі, народзе, па шчырасці маё слова прадсмертнае, бо яно як з таго света толька для дабра твайго напісана.

Нямаш, браткі, большага шчасця на гэтым свеце, як калі чалавек у галаве мае розум і науку. Тагды ён толька магчыме жыці ў багацтве, па праўдзе, тагды ён толька, памаліўшысь Богу, заслужыць неба, калі збагаціць наукай розум, разаўе сэрца і радню цэлу сэрцам палюбіць.

Но як дзень з ноччу не ходзіць разам, так не ідзе разам наука праўдзіва з няволяй маскоўскай. Дапокуль яна ў нас будзе, у нас нічога не будзе, не будзе праўды, багацтва і ніякай наукі, – адно намі, як скацінай, варочаць будуць не для дабра, но на пагібель нашу.

Для таго, Народзе, як толька калі пачуеш, што браты твае з-пад Варшавы б'юцца за праўду й свабоду, тагды і ты не аставайся ззаду, но ўхапіўшы за што зможаш, за касу, сакеру, цэлай грамадой ідзі ваяваці за сваё чалавечае і народнае права, за сваю зямлю радную.

Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу, Народзе, што тагды толька зажывеш шчасліва, калі над табою Маскаля ўжэ не будзе.

Твой слуга Яська-гаспадар з-пад Вільні

❖ Паўстанне пачалося ў студзені 1863 г. Спачатку Кастусь Каліноўскі ўзначальваў Літоўскі правінцыйны камітэт, а затым быў кіраўніком Віленскага паўстанцкага

цэнтра. На Беларусь для падаўлення паўстання прыслана 200 тысяч войска генерала-вешальніка Мураўёва. Тады паступова пачало яно заціхаць. Уначы 10 лютага 1864 г. пад імем Ігната Вітажэнца быў арыштаваны Кастусь Каліноўскі.

Ваенна-палявым судом ён быў асуджаны і публічна павешаны на гандлёвай плошчы Лукішкі ў Вільні. Перад смерцю Кастусь Каліноўскі здолеў пераслаць з-за турэмных кратаў «Пісьмы з-пад шыбеніцы» – сваё развітальнае слова беларускаму народу, свой хвалюючы запавет.

Царскі ўрад жорстка расправіўся і з іншымі ўдзельнікамі паўстання, баявымі сябрамі Кастуся Каліноўскага: 128 чалавек было асуджана на смяротную кару, больш за дзве з паловай тысячы паўстанцаў было саслана на катаргу, паселены ў аддалёныя месцы Сібіры, каля 9 тысяч было аддадзена пад суд.

паводле Васіля Старычонка

Сімвал – адзін з відаў паэтычнага іншасказання, умоўнае абазначэнне сутнасці нейкай з'явы, паняцця пэўным прадметам ці слоўна-вобразным знакам. Характарызуецца шматзначнасцю і можа быць адрасаваны да розных з'яў рэчаіснасці.

1 Які запавет пакінуў Кастусь Каліноўскі беларускаму народу?

Францішак Багушэвіч (1840-1900)

Паэт, празаік, публіцыст з'яўляецца адным з пачынальнікаў крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры. Нарадзіўся ён у фальварку Свіраны пад Вільняй у сям'і дробнага шляхціца. Скончыўшы Віленскую гімназію ў 1861 г., паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта, аднак за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў выключаны з яго. Працаваў настаўнікам. Удзельнічаў у Студзеньскім паўстанні і ў адным з баёў быў паранены. Ф. Багушэвіч быў вымушаны на дваццаць гадоў пакінуць родную сядзібу. Ратуючыся ад рэпрэсій, пераехаў на Украіну, толькі ў 1884 г. вярнуўся ў Вільню.

Першыя свае вершы *Новы 1886 год*, *Прывід надзеі* Францішак Багушэвіч напісаў на польскай мове. З гэтых часоў пачалося сяброўства з вучоным мецэнатам Янам Карловічам, які хваліў яго паэтычныя спробы і падтрымаў паэта матэрыяльна. За сем гадоў польскі часопіс «Край» змясціў звыш паўсотні артыкулаў і нататак Ф. Багушэвіча. У 1891 г. у Кракаве выйшаў першы зборнік паэта *Дудка беларуская*. Праз тры гады ў Познані быў выдадзены другі зборнік *Смык беларускі*, а ў 1892 надрукавана апавяданне *Тралялёначка*. Зборнікі сваіх вершаў папярэдзіў аўтар прадмовамі. Творы свае выдаваў пад псеўданімамі Мацей Бурачок і Сымон Рэўка з-пад Барысава.

Пры жыцці яго творы былі забаронены ў царскай Расіі, яны выдадзены асобнымі лістоўкамі і кнігамі ў 1905-1907 гг.

У прадмове да зборніка *Дудка беларуская* заяўляў: „Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маёй! Вам афяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, ды і не толькі мы, а ўсе людзі цёмныя «мужыцкай» завуць, а завецца яна «беларускай»". Аўтар прадмовы, якую можна назваць беларускім маніфестам, заклікаў да пашаны роднай мовы, бо яна – аснова беларускай нацыі, бараніў яе ад славы «мужыцкай» і выясняў, што беларуская мова «такая ж людская і панская, як французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая». Зборнік гэты адкрывае верш *Мая дудка*, у якім аўтар разважае пра ролю паэзіі і паэта. На яго погляд мастацтва павінна выражаць сапраўдныя пачуцці, прадстаўляць гістарычную праўду і лёс народа, а таксама паказваць шлях да лепшай долі, лепшага жыцця. Гэтую думку працягвае паэт таксама ў вершы *Смык*, які адкрывае другі паэтычны зборнік *Смык беларускі*. Асноўнай тэмай творчасці Францішка Багушэвіча з'яўляецца беларускі селянін, яго жыццё, праца, погляды і адчуванні.

Сялянскі герой вершаў *Не цурайся*, *Калыханка*, *Ахвяра* бачыць сацыяльную няроўнасць і кантрасты, адчувае несправядлівасць і драматызм свайго становішча, хоча быць чалавекам, жыць сумленна і годна з працы сваіх рук. Быць чалавекам – значыць не быць панам, бо пан, у іх разуменні, увасабляе ўсё адмоўнае, ліхое.

Беднасць працоўнага народа, бяздушнасць і бяспраўе царскіх чыноўнікаў у адносінах да сацыяльных нізоў паказаў Багушэвіч у творах *Як праўду шукаюць*, *Праўда*, *У астрозе*, а таксама ў паэме *Кепска будзе*.

Галоўны герой паэмы – Аліндарка, нарадзіўся ў сакавіку, нешчаслівым паводле народных вераванняў месяцы. Нешчаслівы, бо ў гэтую пару канчаліся сціплыя запасы ежы і ў сялянскія хаты заглядаў голад. Быў гэта «кепскі час» і для бацькоў, і для нованароджанага дзіцяці. У жыцці Аліндарку сустракаюць многія няшчасці (смерць маці, разарэнне гаспадаркі, п'янства, а пасля смерць бацькі) і калі здавалася, што хлопцу пашчаслівіла – знайшоў прытулак і цяпло ў добрага чалавека, абвінавацілі яго ў дэзерцірстве і пасадзілі ў астрог. І Аліндарка, і айчым пачаткова не разумеюць, не ведаюць прычыны свайго няшчасця, але не пакідаюць шукаць праўды.

У сваіх творах Францішак Багушэвіч паказваў рэальнае жыццё беларускага народа, стварыў яркія вобразы працавітага, свабодалюбівага героя і выкрыў бесчалавечнасць і несправядлівасць царскай адміністрацыі і суда. Свае творы прысвячаў пісьменнік беларускаму селяніну, таму стараўся пісаць даступна, пад эстэтычны густ простага чалавека. Стараўся прадстаўляць свет так, як бачыць яго мужык, гаварыць аб справах так, як зрабіў бы гэта мужык. Багушэвіч любіў прабываць сярод сялян, слухаў і запісваў народныя апавяданні, песні, выказванні і г.д., якія выкарыстоўваў у сваёй творчасці.

паводле Таццяны Алейчык

Францішак Багушэвіч

Прадмова да «Дудкі беларускай»

Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маей! Вам афяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, да і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя «мужыцкай» завуць, а завецца яна «беларускай». Я сам калісь думаў, што мова наша – «мужыцкая» мова, і толькі таго! Але, паздароў Божа добрых людцоў, як навучылі мяне чытаць-пісаць, з той пары я шмат гдзе быў, шмат чаго відзеў і чытаў: і праканаўся, што мова нашая ёсць такая ж людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая. Чытаў я ці мала старых папераў, па дзвесце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі і пісаных вялікімі панамі а нашай мовай чысцюсенькай, як бы вот цяпер пісалася. Увідзеўшы гэта, я часта думаў: Божа ж мой, Божа! Што ж мы за такія бяздольныя? Якаясь маленькая Булгарыя – са жменяй таго народу, – якіясьці Харваты, Чэхі, Маларосы і другія пабратымцы нашыя і ружны чужы зброд, жыды маюць па-свайму пісаныя і друкованыя ксёнжачкі і газэты, і набожныя, і смешныя, і слёзныя, і гісторыйкі, і баячкі; і дзеткі іх чытаюць так, як і гавораць, а ў нас як бы захацеў цыдулку ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык, можа б, і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што «піша па-мужыцку», і як дурня абсмяялі б! А можа, і спраўды наша мова такая, што ёю нічога добрага ні сказаць, ні напісаць не можна? Ой, не! Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная, як і другім добрым людцам, і гаворым жа мы ёю шмат і добрага, але так ужо мы самі пусцілі яе на здзек, не раўнуючы, як і паны вялікія ахотней гавораць па-французску, як па-свойму. Нас жа не жменька, а з шэсць мільёнаў – больш і шмат больш, не раўнуючы, як жыдоў, напрыклад, або татар, ці армян, а пакажы ж, ваша, хоць адну ксёнжачку ці аб гаспадарцы, ці так аб жыцці нашым, каб па-нашаму?

Ці ж ужо нам канечне толькі на чужой мове чытаць і пісаць можна? Яно добра, а навет і трэба знаць суседзкую мову, але наперш трэба знаць сваю.

«Вечар у Мінскай губерні», 1870-я гады. Апалінарый Гараўскі

Перадумаўшы ўсё гэта, я, братцы, адважыўся напісаць для вас сякія-такія вершыкі: хто іх спадабае, таму дзякуй! А хто падумае лепш і больш напісаць, таму чэсць вечная і ад жывых людзей, і ад бацькавых касцей! А пісаць ёсць шмат чаго!

Спрадвеку, як наша зямелька з Літвой злучылася, як і з Польшчай з'ядналася дабравольна, дык усе яе «Бяларусяй» звалі, і недарма ж гэта! Не вялікая, не малая, не чырвоная, не чорная яна была, а белая, чыстая; нікога не біла, не падбівала, толькі баранілася.

Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы.

Ужо больш як пяцьсот гадоў таму, да панавання князя Вітэнэса на Літве, Беларусія разам з Літвой баранілася ад крыжацкіх напасці, і шмат местаў, як Полацк, прызнавалі над сабой панаванне князёў Літоўскіх, а после Вітэнэса

Літоўскі князь Гядымін злучыў зусім Беларусію з Літвой у адно сільнае каралеўства і адваяваў шмат зямлі ад крыжакоў і ад другіх суседаў. Літва пяцьсот дваццаць гадоў таму назад ужо была ад Балтыцкага мора ўдоўжкі аж да Чорнага, ад Дняпра і Днястра-ракі да Нёмна; ад Каменьца места аж да Вязьмы – у сярэдзіне Вялікаросіі; ад Дынабурга і за Крамяньчук, а ў сярэдзіне Літвы, як тое зярно ў гарэху, была наша зямліца – Беларусь!

Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільні да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак...

Мацей Бурачок

1 Скажы, чаму прадмову называюць мастацкім маніфестам нацыянальнага адраджэння?

2 Калі паўстаў твор і які, паводле цябе, меў уплыў на беларускае адраджэнне ў пачатку XX ст.?

3 З якім іншым творам можна параўнаць прадмову Ф. Багушэвіча?

❖ Зборнік «Дудка беларуская» адкрываецца «Прадмовай», якая па сваёму патрыятычнаму пафасу нагадвае артыкулы Кастуся Каліноўскага ў паўстанцкай газеце «Мужыцкая праўда». У яе аснове праблема гістарычнага лёсу беларускага народа, развіцця яго мовы і культуры. На думку Багушэвіча, сапраўдным носьбітам нацыянальнага духу з'яўляецца народ. У «Прадмове» Францішак Багушэвіч настойліва пераконвае сваіх адрасатаў (народ), што яны – беларусы, што іх радзіма – Беларусь, каб заўсёды і перад усімі кожны годна нёс прыналежнасць да яе, каб адчуваў сябе сынам свайго народа. Імкненне давесці чытачам, што яны менавіта беларусы, што так павінны сябе адчуваць і называць, падкрэсліваецца назваю зборніка. Пісьменнік звяртаецца да сваіх сучаснікаў, а праз стагоддзі і да нас з заклікам-маленнем: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!»

❖ У вершы Ф. Багушэвіча *Ахвяра* выказваецца ідэя справядлівасці, роўнасці ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі. Лірычны герой верша звяртаецца да бабулі з просьбай памаліцца за яго:

Маліся ж, бабулька, да Бога,
Каб я панам ніколі не быў:
Не жадаў бы ніколі чужога,
Сваё дзела як трэба рабіў.

Ён не хоча быць панам, бо з панствам у яго асацыюецца ўсё самае адмоўнае: амаральнасць, разбэшчанасць, фанабэрыстасць, прага да нажывы, пагарда да слабейшых. Усё жыццё герой хоча быць толькі мужыком, бо ён ва ўсіх адносінах вышэйшы за паноў, з'яўляецца чалавекам у самым шырокім і прывабным значэнні гэтага слова. Жыве ён сваёй працай, сам арэ сваю зямлю, любіць сваю радзіму і ёй адданы, не квапіцца на чужое, паважае іншыя народы, прызнае людзей за братоў, ён маральна чысты, не гультай і не злодзей, не здраднік і не п'яніца.

❖ У вершы *Хмаркі* выказваўся глыбокі, асабісты боль Францішка Багушэвіча за лёс талентаў роднай зямлі. Памяншальна-ласкальныя суфіксы ў назоўніках зрабілі тон верша мяккім, народным, выяўляючы асаблівасці народнага светаўспрымання, народнага стаўлення да любых з'яў прыроды. Хмаркі – увасабленне «тутэйшых» творчых сіл народа, якія, не маючы «зямлі родненькай», аддаюць сябе іншым, служаць культурам другіх народаў.

паводле Алега Лойкі

Францішак Багушэвіч

Кепска будзе
(Фрагмент)

«Восень», 1982. Юзаф Пучынскі.

Як я толькі нарадзіўся –
Бацька сказаў: «Кепска будзе!»
Ну дык жа ж не памыліўся:
Здзекаваліс Бог і людзе.
А чым кепска? – бо на марцы
Я радзіўся (пост праўдзівы,
Цяжкі месяц гаспадарцы.
Як пражыў хто, – будзе жывы).
Пераеўся хлеб да крышкі,
Бульбы толькі як пасеяць,
І прыварку ані лыжкі,
І скаціна – хоць развеяць;
Ні саломкі, ні то сена,
Хоць бы на раз для скаціны;
А тут дроў ані палена,
А тут яшчэ нарадзіны!
Трэба ж бабе бохан хлеба,
І гарэлкі ж трэба пляшку,
Яшчэ ж хрысціць хлопца трэба.
Вот і думай, як сярмяжку
Нясці жыду пад заставу,
Ці прадаць каня, кароўку?
«Сеў, – казаў ён, – я на лаву,
Узяўшыся за галоўку,
І заплакаў, аж заліўся,
Так, як бацьку пахаваўшы...
Кепска зрабіў, што радзіўся,
Кепска будзе, свет пазнаўшы!»

Ці то слова йшло урокам,
Што сказаў у кепскім часе,
Ці хто кінуў такім вокам?...
Ну і доля ж удалася!
І збылося ж бацькі слова!
Вот у тыдзень вязуць гэта
Хрысціць мяне да Макрова
Кумоў двое і кабета.
У Аборках мост сарвала,
А я ж быў – чуць жывы, слабы,
Рада ў раду, на тым стала,
Што ахрысцяць з вады бабы.
З Беразіны жменяй вады,
Кума сама зачарпнула,
Паматала сюды-туды,
Трэйчы на мяне лінула.
«Вот і хрэст увесь тут, – кажа,
– І ксёндз хрысце гэтаксама,
Толькі яшчэ чымсць памажа,
А хлопцу ўсё роўна – яма!
Хоць бы жывым хоць давезці,
Каб дарогай не сканала,
Скажуць – кепска везла гдзесьці
Або туга спавівала!..»
Гэтак мяне пахрысціўшы,
Вязуць назад ўжо да маткі,
Вочы добра пазаліўшы,
Ледзьве уняслі да хаткі і квіта:
Баба ўзяла бохан хлеба,
Пляшку водкі, торбу жыта;
Разышліся і паснулі.
Матка ж мяне калыхае:
«Люлі, – шэпча, – сынок, люлі...»
А як зваць? – сама не знае.
Вот назаўтра спазарання
Бяжыць матка да кумошкі
Ды пытае: як празванне
Далі сыну? Лёну трошкі
Тут прынесла пры здарэнню,
Трошкі сала, круп са жменю.
А кума ж была праворна:
Хоць што збрэша – не запнецца;
Круце сабе ў сенях жорна,
Трэба ж салгаць! Куды ж дзецца?
«Імя, – кажа, – твайму сыну
Ксёндз хацеў даць па кантычцы,
Думаў ён можа з гадзіну,
Узяў ксёнжку, як стаў рыцца,
Дык даў потым з каліндарка».
Матка прандзей з хаты ў сені,
Як бы цівун гнаў па карку,
Усё шэпча то іменне:
«Аліндарку, Аліндарку!»
Прыляцеўшы так дадому,
За калыску узялася
І зрадзела, як святому,
Што аж слязьмі залілася.
І калыша, і галосе:
Надта імя спадабала,
Надта добрае здалося,
Што такога і не знала!
Вот і клікаць мяне сталі,
Скаліндаркай, Аліндаркай.
Ну, як зналі, так і звалі.
[…]

1 Прачытай прыведзены вышэй фрагмент паэмы Францішка Багушэвіча. Раскрый сэнс загалоўка твора *Кепска будзе*.

2 Прадстаў вобраз сацыяльнага становішча беларускіх сялян у XIX ст.

3 Ад імя каго вядзецца ў творы апавяданне і як гэта ўплывае на мову паэмы?

4 У чым праяўляецца рэалізм паэмы *Кепска будзе*?

Янка Лучына (1851-1897)

Янка Лучына (сапр. **Іван Неслухоўскі**), паэт, перакладчык, нарадзіўся ў Мінску ў сям'і адваката. Вучыўся ён у Мінскай гімназіі, потым паступіў на матэматычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта, адкуль перавёўся на механічнае аддзяленне Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. Скончыў яго ў 1876 годзе.

Працаваў ён у Тыфлісе і Мінску на чыгуначных службах. Адначасова пісаў вершы на беларускай, польскай і рускай мовах, займаўся перакладчыцкай дзейнасцю. У апошнія гады жыцця паэт цяжка хварэў, быў паралізаваны. Пісаць пачаў рана, але першы яго верш на рускай мове паявіўся ў друку ў 1886 годзе. У гэтым жа годзе паэт апублікаваў і польскамоўныя творы. Па-беларуску выступіў Лучына з нагоды прыезду ў Беларусь украінскіх артыстаў (*Усей трупе дабрадзея Старыцкага беларускае слова*). Але і гэты верш, і адначасна верш *Дабрадзею артысту Манько* не былі апублікаваны. Як беларускі паэт дэбютаваў ён у 1889 годзе вершам *Вясновай парой*.

У паэтычнай спадчыне Лучыны беларускіх твораў не надта многа. Сярод іх на асаблівую ўвагу заслугоўвае верш *Што думае Янка, везучы дровы ў горад*. Твор гэты прысвяціў паэт сялянскай праблематыцы, раскрыццю ўнутранага стану беларускага селяніна Янкі, які ў калядныя маразы вязе на продаж дровы.

Нараканні на сялянскі лёс гучаць таксама ў алегарычных вершах *Сівер* і *Вясна*. Пад постаццю марознага ветру і снегу ўвасабляе паэт непрыхільныя людзям з'явы рэчаіснасці, якія перашкаджаюць шчасліва жыць. Вялікай любоўю да Прынямонскага краю і шчырай спагадаю да працоўнага беларускага народа прасякнуты лірычны верш *Роднай старонцы*.

Пры жыцці паэту не ўдалося выдаць паэтычнага зборніка. Толькі праз шэсць гадоў пасля яго смерці беларускім студэнтам удалося атрымаць згоду цэнзара на друк невялічкага зборніка *Вязанка*. Змест зборніка, выдадзенага ў Пецярбургу ў 1903 годзе, складаюць беларускія вершы паэта, ягоныя даследаванні і пераклады лірыкі Уладзіслава Сыракомлі.

Янка Лучына

Роднай старонцы

Ты параскінулась лесам, балотамі,
Выдмай пясчанай, неўраджайнаю,
Маці-зямліца, і ўмалотамі
Хлеба нам мерку не даш звычайную.

А сын твой, беднаю адзет сярмягаю.
З лыка пляцёныя лапці абуўшы,
Едзе драбінамі ці калымагаю,
Конем, што цягне, як бы заснуўшы...

Усё ў табе бедна. Часта заплача
Мужык араты дзеля злой долі,
Цяжка працуючы. Ён жа, аднача,
З табою расстацца не жджэ ніколі.

І непрыглядную хату з пажыткамі,
І поле скупое, выган без пашы
Мы, апрануўшыся старымі світкамі,
Любім і цэнім – бо яны нашы.

Дасць Бог крывавым потам аратаму
Здабрыць пясчану зямліцу здарыцца,
Быць добра сытаму, хоць не багатаму,
А дзеля празніка і чарка нам зварыцца.

Сонца навукі скрозь хмары цёмныя
Прагляне ясна над нашай ніваю,
І будуць жыці дзеткі патомныя
Добраю доляй – доляй шчасліваю!..

1 Верш *Роднай старонцы* паказвае вобраз той Беларусі, якая была ў сэрцы аўтара. Ці ты згаджаешся з гэтымі словамі? Абгрунтуй свой адказ.

2 Да якога жанру лірыкі належыць верш *Роднай старонцы*? Чым характарызуецца гэты жанр?

3 Знайдзі ў вершы элементы пазітывісцкага светапогляду аўтара.

Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Год трэци | Вильня 7 (20) наября 1908 г. | № 23.

Цэна з перэсылдою и дастаукою ка хаты: на 1 г.— 3 р., на 6 мес.— 1 р. 50 кап., на 3 м.—75 к., на 1 мес.—25 к. Без дастаукн и перэсылки: на 1 г.— 2 р. 40 к., на 6 м.— 1 р. 20 к., на 3 мес.—60 к., на 1 мес.—20 к. За границаю: на 1 г.— 4 р., на 6 мес.— 2 р., на 3 мес.— 1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

Наша Нива

Першая Беларуская Газэта з Рысункамн

Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами

Падписка прынимаецца и прадаюцца атдзельные нумэры газэты 1) У Кант. „Нашай Нивы“ — Виленская вулица дом № 20. 2) У Книгарни „Знание“— Георгиески проспэкт дом № 4. 3) У Книгарни Литоускоп М. Пясэцкой — Шлапэлис, Доминиканская вулица дом № 13.

Адрэс рэдакции и администрации: Вильня, Виленская вулица, дом № 20.

Объявленя прынимаюцца на наследней страницы по 20 кап. за линейку малыми литэрами. Рукописы и корэспондэнции, присланные у рэдакцию, мусяць быць чытатэльна написаны з праудзивою фамильею и адрэсом таго, хто не прысылае. Можна такжэ падписаць прозвищэ разом з фамильею, хто незахочэ, каб была надрукована праудзивая фамилия. Адрэс и фамилия тольки для ведала рэдакции.

Хто хочэ мець даход, прадаючы „Нашу Ниву“ у вёсках, мястэчках и гарадох, нехай напишэ аб гэтым на аткрытцэ у Кантору нашай газэты.

Ужо днее...

Пасьвячаю усим супрацоуником, чытацелйом и прыяцелйом „Нашае Нивы“ на памятку двухлетняго жыцьця яе для насеньня дабра, праўды и сьвету забытаму, цёмнаму беларускаму народу.

З-над сонных вод Нёмна, с-пад хвой Белавежы
Суседзи, суседки, витаю я вас!
Блудзила я доўга па рытвах, па межах,
Аж сьцежку-дарожку знайшла во хоць раз.

Хоць, пэўне, вы знаеце, хто я такая,
Яким правам тут перад вами стаю,
Дзе дом мой, народ мой,—з якога я краю,—
Паслухайце смутную повесьць маю.

С канца у канец, дзе загнанае слова
Звиниць беларуса, — владаньне маё;
Шмат сотняў таму лет у хаце вёсковай
Ўзяла и праводжу сваё я жыцьцё.

С-пад гэтай хацины па выдмах незнаных
Ганяли, чаго не згубила, шукаць.
Глядзице: во-руки и ноги у ранах,
А раны на сэрцы—каму-ж их паняць?!

Па грудах, каменьнях хадзила я босай
И кроўю чырвонай дабрыла зямлю.
На шаты мае пагледали з укоса
И песьню з насьмешкай витали маю!

З балотам мешали, пагардай плевали
Ўсе тые, што вырасьли нават са мной!
З маим людам згинуць на век мне казали,
И страшна было мне так жыць сиратой!...

За сошкай, за коскай, з сярпом и сякерай
Я шла-валаклася, дзе шоў мой народ,
Заплатай было, што ён часам мне верыў
И думки снаваў аба мне з году ў год.

Шли веки; магила легла пры магиле,
Вада змыла наспы, крыжы пагнили;
Гаротнасьцей зможэны, ў крыўдзе, безсильли
Там прадзедаў косьци без часу лягли.

Шли веки; хрэст брала народнай сьлязою;
Срэдзь вихраў и бураў и холаду зим
З людзкой неразлучны ўзяла шлюб бядою,
И тузаюць мной, як народам маим.

Здушыли мне голас на родных, на нивах;
Крыж цяжки упадку з народам несла,
И думаў чужынец, што ўжо я няжыва.
Ня верце! Жыву, як ад векаў жыла!

Я ўсё, кольки силы, змагала, ўставала!
Я жыва! Народ мой са мною, пры мне!
Я ўсё перанесла и вышла я с хвалай,
Я сильна, я вечна ў сваей старане!

Прашло засьляпеньне, минае трывога;
На неби ўжо новая видна зара.
Шырок прада мною гасьцинец-дарога.
Ўжо днее! ўжо днее!—к сваим мне пара!

Вильня. Янук Купала.

Cena asobnaho numeru 5 kap.

Hod treci. Wilnia, 6 (19) czerwienia 1908 r. № 12.

Cena z pieras. i dastaŭk. da chaty na 1 hod—3 r., na 6 mies.—1 r. 50 k., na 3 m.—75 k., 1 m. 25 k. Biez dast. i pieras.; na 1 hod—2 r. 40 k., na 6 m.—1 r. 20 k., na 3 m.—60 k., na 1 m.—20 k. Za hranic.: na 1 hod—4 r., na 6 m.—2 r., na 3 m.—1 r. Pieramiena adresu—20 kap.

Nasza Niwa

Pierszaja Biełaruskaja Hazeta z Rysunkami.

Wychodzić raz u tydzień polskimi i ruskimi literami.

Adres redakcii i administracii: Wilnia, Wilenskaja wulica № 20.

Padpiska prinimajecca i prad. addzielnyje numery hazety: 1) U kantory „Naszaj Niwy“ — Wilenskaja wulica № 20. — (2 U bibliotyce „Znanje“ — Georgijeŭski prosp. d. № 4. 3) Litoŭskaja knigharni M. Piaseckoj-Szłapelis — Dominikanskaja wul. № 13.

Abjaŭlennia prymajucca na pasledniaj stranicy pa 20 kap. za liniejku małymi literami. Rukapisy i korespondencii, prysłanyje u redakcju, musiać być czytelnie napisany z praŭdziwaju familjeju i adresom taho, chto jaje prysyłaje. Možna także padpisać swaje prozwiszcze razom z familjeju, kali niezachoczecie, kab była nadrukowana wasza praŭdziwaja familja. Adres i familja, tolki dla wiedama redakcii.

Woraho

(da

Czaho wam ch
Jaki was wykl
Zabić trywohu
Jakoj azwaŭsia
Czamu wa
Pawiercie,
Swajo jon
Z jakim r
Ciapier i wy z
Z apiekaj wyj
A szto-ž dahet
A dzie-ž dahetul wy byli?
Wasz brat i ciomien i hałodny;
Chacinka swoj zżywaje wiek;
I wiek nia znaŭ jon dum swabodnych,
I kryŭdziŭ swoj brat—czaławiek.
Wam straszna naszaj sloznaj pieśni,
I skarhi straszna wam hłuchoj?
Wam žutka sonce na pradwieśni?
Milej wam choład s ciemnatoj?
A szto-ž wam biełarus takoha
Paśmieŭ zrabić, paśmieŭ skazać?
Ech, treba ŭczyć jeszcze was mnoha,
Jak swajho brata uważać!
Ech, kińce kryŭdami karmicca —
Kožyn narod sam sabie pan;
I biełarus može zmiaścicca
Ŭ siamji nieliczanaj sławian!
Napaściaj, łajankaj naprasnaj
Hrudziej nia warta mazalić!
Nie pahasić wam praŭdy jasnaj:
Žyŭ biełarus—i budzie žyć!

ЛІТАРАТУРА
XX СТАГОДДЗЯ
(літаратура «нашаніўскага перыяду» і 20-х гадоў савецкага перыяду)

69-aje zasiedańnie. Razbirali sprawu deputata *Kosorotowa* (mužyk, Ufimskaj hub. stolar, sociał demokrat). Sam *Kosorotow* raskazaŭ ŭ Dumie, szto jaho wybrali rabotniki ŭ Dumu; ale ŭ tym czasi ich zawod zakrywali, i kolki tysiacz ludziej zastawalisia biez kuska chleba. Dyk wot jany prasili Kosorotowa, kab jon da ich pryjechaŭ paradzić i pamahczy ŭ biadzie, a za heta jaho sud chocze sudzić. Jaho winawaciać, bytcam jon kazaŭ, kab strelali ŭ wojska. Niepraŭda, jon hetaho nie kazaŭ. Z siemi świetkaŭ nichto nia czuŭ hetaho, tolki adzin stražnik dawodzić, szto jon czuŭ, jak Kosorotoŭ „cicha“ skazaŭ, szto treba strelać ŭ sałdatoŭ. Ŭsie raboczyje kažuć, szto heta niepraŭda.

Kali jakoha deputata chocze sudzić sud, to sama Duma pastanaŭlaje, ci pazwolić na heta, ci nie. Woś ŭsie lewyje kazali, szto Kosorotowa nia možna wydalać z Dumy, ale prawyje i akciabrysty, katorych najbolsz, pastanawili wydalić Kosorotowa, kab sud moh jaho sudzić. 177 prawych i akcabrystoŭ padali hołas za toje, kab wydalić, a 109 lewych, kab astawić deputata; da lewych pryłuczyŭsia adzin tolki prawy mužyk.

* * *

AKADEMJJA NAUK BIBLIOTEKA

Рэдакцыйны калектыў „Нашай Нівы" ў Вільні

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ЛІТАРАТУРЫ ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

На пачатку XX ст. назіраецца ўздым нацыянальна-вызваленчага руху. У 1902 г. была створана першая беларуская палітычная партыя – Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), праграмныя ідэі якой падтрымлівалі Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, Цётка, Карусь Каганец, Аляксандр Уласаў і інш. Мэтай сваёй дзейнасці БСГ ставіла абуджэнне нацыянальнай свядомасці беларускага народа, стварэнне аўтаномнай Беларускай рэспублікі з парламентам у Вільні. У рэвалюцыйных бурах 1905-1906 гг. паўставалі адраджэнскія творы Цёткі, Янкі Купалы, Яуба Коласа, Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна.

Важную ролю ў росце нацыянальнай свядомасці, актывізацыі літаратурнага працэсу, згуртаванні інтэлігенцыі адыгралі легальныя газеты «Наша доля» і «Наша ніва». У першым нумары «Нашай долі» былі надрукаваны апавяданне Цёткі *Прысяга над крывавымі разорамі* і верш Якуба Коласа *Наш родны край*. Аднак за празмерна радыкальны змест надрукаваных матэрыялаў газета была забаронена і ўсе выдадзеныя шэсць нумароў канфіскаваны.

Арганізатарамі выдання «Нашай нівы» былі лідары БСГ Іван і Антон Луцкевічы, Аляксандр Уласаў. На старонках газеты друкаваліся творы Янкі Купалы, Якуба

Коласа, Алеся Гаруна, Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага, Цішкі Гартнага, Ядвігіна Ш., Змітрака Бядулі і інш. Газета несла словы праўды і надзеі на вызваленне ў самыя аддаленыя куткі Беларусі. Дзесяцігоддзе, калі выходзіла «Наша ніва» (1906-1915), атрымала ў гісторыі назву «нашаніўскага перыяду». Гэта быў перыяд, калі выношвалася думка аб уласнай дзяржаўнасці і поўнай незалежнасці Беларусі. Газета патрабавала ўвядзення ў школы, цэрквы і касцёлы беларускай мовы, спрыяла выданню літаратурных зборнікаў і папулярнага ў тыя часы «Беларускага календара». У гэты ж перыяд пачынаюць выдавацца часопісы «Саха» (1912-1914), «Лучынка» (1914), ствараюцца выдавецкія таварыствы «Загляне сонца і ў наша аконца» (1906-1614) і «Наша хатка» (1908-1911). Друкарня Марціна Кухты ў Вільні выпусціла ў свет творы Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Цёткі, Францішка Багушэвіча. У 1907 г. узнікае першы нацыянальны беларускі тэатр, кіраўніком якога становіцца вядомы акцёр і рэжысёр Ігнат Буйніцкі. Але, што самае галоўнае, перыяд гэты быў адзначаны небывалым уздымам нацыянальнай самасвядомасці. Менавіта гэты час уваскрашаў Янка Купала ў вершы *Маладая Беларусь* (1911-1912). [...]

18 снежня 1917 г. у Мінску быў скліканы Першы Усебеларускі кангрэс палітычных сіл. Нягледзячы на яго разгон бальшавіцкім кіраўніцтвам «Западной области» (так тады называлася Беларусь), кангрэс паспеў стварыць Выканаўчы камітэт. Ён кіраваў нацыянальна-вызваленчым рухам і падрыхтаваў абвяшчэнне 25 сакавіка 1918 года вольнай і незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Да Рады БНР належалі: Пётр Крачэўскі, Васіль Захарка, Тамаш Грыб, Язэп Мамонька, Мікалай Вяршынін і інш. Стварэнне БНР было заканамерным этапам у развіцці нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі. Аднак гэта выклікала абурэнне ў германскіх улад (па Брэсцкім узгадненні цэнтральная і ўсходняя часткі Беларусі былі акупіраваны немцамі да 11 лістапада 1918 г.) і ў кіраўніцтва бальшавіцкай партыі. Пасля капітуляцыі Германіі БНР была ліквідавана войскамі Чырвонай Арміі, а беларускі ўрад эміграваў за мяжу. 30-31 снежня 1918 г. Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыяй РКП(б), якая праходзіла ў Смаленску, было абвешчана стварэнне БССР. Старшынёй Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада БССР стаў Зміцер Жылуновіч (Цішка Гартны). Але ўжо праз месяц на 1-м Усебеларускім з'ездзе Саветаў (2-3 лютага 1919 г.) Смаленская, Віцебская і Магілёўская губерні былі адарваны ад БССР і далучаны да Расіі. У складзе ж Мінскай і Віленскай губерняў 27 лютага 1919 г. была ўтворана Літоўска-Беларуская ССР, якая перастала існаваць летам 1919 г. (у сувязі з акупацыяй Мінска польскімі войскамі). У ліпені 1920 г. пасля вызвалення Мінска, Беларуская ССР была абвешчана другі раз. Межы рэспублікі канчаткова акрэсліліся пасля Рыжскага мірнага дагавора 1921 г.: у склад БССР уваходзіла ўсяго 6 паветаў Мінскай губерні з насельніцтвам 1,6 мільёна чалавек. І толькі ў 1924 і 1926 гг. Беларусі былі вернуты тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай абласцей, а таксама Гомельскага і Рэчыцкага паветаў.

паводле Васіля Старычонка

1 Што паўплывала на развіццё беларускай літаратуры ХХ ст.?

2 Якія беларускія палітычныя і культурныя арганізацыі існавалі на пачатку ХХ ст.? Раскажы пра іх значэнне ў развіцці беларускай літаратуры.

3 Што абазначае тэрмін «нашаніўскі перыяд»?

Дарафей Фіёнік

Бежанства

ХХ стагоддзе гэта небывалы ў гісторыі чалавецтва час вялікіх перамяшчэнняў насельніцтва, выкліканы ваеннымі канфліктамі і ідэалогіямі. Свае родныя мясцовасці – часова або назаўсёды – былі вымушаны пакінуць звыш 65 мільёнаў людзей. Першымі вялімі ўцёкамі была акцыя масавых высяленняў і забойстваў паўтара мільёна турэцкіх армян у 1914 годзе. Другім па чарзе было бежанства – вандроўка на ўсход шматмільённага насельніцтва заходняй часткі Расійскай Імперыі.

У ліпені 1914 года ўспыхнула Першая сусветная вайна. Пачалася вялікая мабілізацыя. З падляшскіх зямель у расійскую армію трапілі тысячы маладых мужчын. Цывільнае насельніцтва яшчэ цягам года магло цешыцца жыццём на ўласнай зямлі. І вось, 13 ліпеня 1915 года нямецкае войска парушыла лінію фронту. 9 жніўня немцы занялі Варшаву. З таго моманту падзеі на фронце пакаціліся маланкава. Да 11 жніўня IX і XII нямецкія арміі падышлі да Падляшша. Расійская армія адступала, пакідаючы за сабою спаленую зямлю. Тысячы жыхароў вёсак і гарадоў пакідалі свае сядзібы падаючыся на ўсход. Мала калі выезд быў дабравольным рашэннем. Нерашучых пужалі распаўсюджваныя слухі пра зверскія адносіны немцаў да захопленага насельніцтва. Так пачаліся вялікія ўцёкі – бежанства. Сярод бежанцаў найбольш было беларусаў.

Ва ўзніклых абставінах цывільная і ваенная адміністрацыі Гродзенскай губерні пачалі эвакуацыю. Назначаныя гарадскімі і гміннымі ўправамі знаўцы спісвалі і ацэньвалі маёмасці паасобных грамадзян. Сямейнікі атрымлівалі асабістыя дакументы дзеля аблягчэння міграцыі па тэрыторыі Расіі.

11 жніўня нямецкая армія рушыла ў напрамку Бельска і Брэста. Да 18 жніўня немцы занялі заходнюю частку Бельскага павета. Каля Бельска ішлі зацятыя баі. На ваенных могілках з 1915 года ў Ягуштове, Арэхвічах, Райску, Грыневічах, Студзіводах, Рыгароўцах, Парцаве і Орлі пакоящца тысячы расійскіх і нямецкіх жаўнераў.

Зверху: бежанцы ў слуцкім абозе, 1915 год

Знізу: вёска Багушоўка ў раёне Бабруйска. Рэгістрацыя бежанцаў і выдача квіткоў для атрымання абедаў у час побыту ў прамежным харчавальным пункце

Беларуская вёска зруйнаваная ў часе Першай сусветнай вайны

Людзі ў спешцы пакідалі родныя мясцовасці, забіраючы з сабою толькі найбольш неабходныя і каштоўныя рэчы ды харчы. Ад бежанскай трагедыі пацярпелі земляробы, рабочыя, інтэлігенцыя, у тым і праваслаўныя святары. Разам з імі эвакуіравалі і тое з царкоўнай маёмасці, што ўдалося вынесці. Бежанцы з Беласточчыны перамяшчаліся ў галоўным шляхамі Беласток – Ваўкавыск – Слонім – Баранавічы, Бельск – Пружаны – Баранавічы ды Бельск – Кобрын – Пінск. Да іх па дарозе далучаліся чарговыя тысячы бежанцаў з заходняй Беларусі.

Чым далей на ўсход, тым часцей шляхі бежанцаў пазначалі пакінутыя жывёлы, рэчы ды крыжы на магілах памерлых у выніку хвароб, голаду і бамбардзіровак з нямецкіх самалётаў. Жахлівае жніво збірала эпідэмія халеры. Сведак тых падзей Ціхан Трафімюк з Кленік успамінаў: «У нашай сям'і захварэла двое дзяцей – мой старэйшы васемнаццацігадовы брат і малодшая за яго чатырнаццацігадова сястра. Навечар захварэлі, зранку памерлі. З бацькам выкапалі мы неглыбокую магілу, маці накрыла іх целы палатном, а мы засыпалі зямлёй.» Толькі нямногім удавалася пахаваць блізкіх паводле хрысціянскага абраду. Бо расійскае камандаванне загадала, каб у выпадку смерці бежанцаў хаваць у брацкіх магілах паводле ваенных устаўных прынцыпаў.

Жахлівую сітуацыю бежанцаў паказвае тэлеграма, накіраваная мінскаму губернатару, якая інфармавала, што ў мястэчку Валожын «пражывае 1600 жыхароў, а бежанцаў там 1500. Запасы расходаваны, пагражае голад і ўспышка эпідэміі. Неабходны неадкладны прывоз хлеба, чаю, цукру, солі,

нафты...» Асабліва драматычная сітуацыя склалася ў вялікіх гарадах усходняй Беларусі, між іншым у Гомелі. Восенню 1915 года ў тым стотысячным горадзе сканцэнтравалася тройчы большая колькасць бежанцаў. Падобна было ў Мінску, Магілёве, Оршы. Яшчэ восенню 1915 года бежанцаў перавозілі цягнікамі ў глыб Расіі, у паволжскія, зауральскія і прычорнаморскія губерні. Дзяржаўныя ўстановы Гродзенскай губерні, у тым гарадское праўленне Бельска, былі эвакуіраваны ў Калугу.

З успамінаў бежанцаў вынікае, што адносіны насельніцтва расійскіх губерняў да бежанцаў былі прыязныя, часта нават сардэчныя. Насельніцтва і мясцовыя ўлады намагаліся гарантаваць ім прыстойныя ўмовы жыцця. Была магчымасць заробку, каб узбуйніць успамогу сем'ям бежанцаў вартасцю ў трыццаць рублёў у месяц. Усерасійскі земляробчы саюз ды Усерасійскі саюз гарадоў займаліся пасярэдніцтвам працы для бежанцаў, вялі харчавальна-санітарныя пункты, школы-сталовыя ды прытулкі для сірот.

У 1916 годзе акцыю дапамогі ахвярам вайны вяло каля 1300 грамадскіх устаноў і арганізацый. Сярод беларусаў, літоўцаў, латышоў, палякаў, украінцаў і жыдоў дзейнічала шмат нацыянальных дабрачынных арганізацый. Звышнацыянальнай і найбольш актыўнай дабрачыннай арганізацыяй быў Камітэт вялікай княгіні Таццяны Мікалаеўны (дачка цара Мікалая II), заснаваны яшчэ ў верасні 1914 года. Дзеянні «Таццянінскага камітэта» ахапілі сотні тысяч асоб. Камітэт вёў дакладны ўлік бежанцаў, выпускаў свой прэсавы орган.

Паводле падлікаў камітэта з 1 лютага 1917 года, агульны лік бежанцаў у імперыі склаў 3 200 215 чалавек, у тым беларусаў, расейцаў ды ўкраінцаў – 54%, палякаў – 16,3% ды латышоў і жыдоў – менш 10%. З Гродзенскай

Вяртанне бежанцаў з Расіі; каля вогнішча ў Оршы, 1918 год

губерні было 752 044 бежанцы; каля 25% з гэтага ліку складалі жыхары Падляшша.

Лютаўская рэвалюцыя, а асабліва кастрычніцкі пераварот 1917 года дэстабілізавалі жыццё бежанцаў у імперыі. Станавіліся яны сведкамі крывавых падзей, стаў падступаць да іх голад. Часта разгубленых бежанцаў стараліся выкарыстаць у сваіх мэтах бальшавікі.

У ліпені 1918 года адбыўся з'езд бежанцаў з Беларусі. У ліку 227 дэлегатаў аж 155 асоб было з Гродзенскай губерні, а з гэтага ліку прынамсі 35 асоб было з Беласточчыны. Сярод іх былі Карніл Іванюк з Плёсак ды Нестар і Феадосій Перавоі з Кнаразоў. Менавіта Нестар Перавой рашуча выказаўся там за вяртаннем бежанцаў у родныя мясцовасці.

Вяртанне на радзіму да паловы 1918 года ўскладняла адсутнасць адпаведнай дамоўленасці між Расіяй і Германіяй. Тысячы бежанцаў на галоўных чыгуначных станцыях чакалі ўезду на занятыя немцамі тэрыторыі. Узбуйненне вяртанняў наступіла толькі пасля Рыжскай дамовы з 1921 года. Вяртаючыхся чакала доўгае, часта небяспечнае падарожжа, зноў пазначанае магіламі сямейнікаў. На пагранпераходах, такіх як Баранавічы, рэпатрыянты праходзілі каранцін, пасля чаго дакладвалі пра вяртанне ў павятовых управах. У родных мясцовасцях заспявалі папялішчы або нежаданых насельнікаў уласных хат. Палі і сенажаці пазарасталі маладымі бярозкамі. Панаваў голад, не было пасяўнога зерня. Хваробы, асабліва тыф, спусташалі насельніцтва. Пацвярджаюць гэта запісы з метрыкальных кніг бельскіх праваслаўных прыходаў; у 1921 годзе запісана там 189 сконаў.

Чалавечыя страты сярод беларусаў Беласточчыны склалі 30-40% ад агульнага ліку насельніцтва напярэдадні 1915 года.

1 Якая палітычна-грамадская сітуацыя прымусіла людзей стаць бежанцамі?

Аляксандр Вярбіцкі

Усевалад Ігнатоўскі

Гісторык Усевалад Ігнатоўскі нарадзіўся ў 1881 годзе ў сям'і настаўніка, які неўзабаве стаў праваслаўным святаром, у вёсцы Такары, якая зараз рассечана дзяржаўнай польска-беларускай граніцай: заходняя яе частка знаходзіцца ў Сямятыцкім павеце Падляшскага ваяводства, усходняя – у Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці. Вучыўся ў Віленскай гімназіі, адкуль быў выключаны за ўдзел у рэвалюцыйных выступленнях моладзі. Пасля працягваў вучобу ў Магілёўскай гімназіі. У 1902 годзе паступае ў Пецярбургскі ўніверсітэт на

гісторыка-філалагічны факультэт, але за ўдзел у антыўрадавых дэманстрацыях партыі сацыял-рэвалюцыянераў (эсэраў) вымушаны быў пакінуць сталіцу і вярнуцца на радзіму. У 1906 годзе яму было дазволена вярнуцца ў Пецярбург, але неўзабаве быў сасланы на поўнач, у Карэлію. Два гады пазней удалося яму дабіцца прыёму ў Тартускі (тады Юр'еўскі) універсітэт, які закончыў у 1911 годзе. Пасля ўладкаваўся на працу ў прыватную гімназію ў Вільні. У 1915-1920 гадах працаваў выкладчыкам гісторыі ў Мінскім настаўніцкім інстытуце. У 1915 годзе перад набліжаючымся фронтам разам з інстытутам эвакуіраваўся ў Яраслаўль. Працуючы выкладчыкам ён шмат часу адводзіў вывучэнню гісторыі Беларусі. У 1918 годзе вяртаецца ў Мінск, дзе дзейнічае ў арганізацыі эсэраў „Маладая Беларусь", займаючы пазіцыі набліжаныя да бальшавікоў, да якіх прымыкае годам пазней, ствараючы Беларускую камуністычную арганізацыю. У 1920 годзе БКА была прынята ў склад Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў).

У БССР Усевалад Ігнатоўскі займаў шэраг высокіх навуковых, дзяржаўных і грамадскіх пасад. У 1920-1921 гадах быў ён народным камісарам земляробства, а ў 1921-1926 гадах займаў пасаду народнага камісара адукацыі БССР, паралельна навучаючы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Кіруючы беларускай асветай, стаў Ігнатоўскі прыцягваць да працы ў краіне раскіданую вайной беларускую інтэлігенцыю. Пад ягоным кіраўніцтвам наркамат асветы Беларусі стаўся цэнтрам абмеркавання і ажыццяўлення наспелых мерапрыемстваў у галіне нацыянальнага адраджэння. Дзеля павышэння ўзроўню адукацыі ў рэспубліцы, пры адкрыцці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1921 годзе Ігнатоўскі запрашае прафесараў з расійскіх навуковых цэнтраў, якія хутка авалодаўшы беларускай мовай, чыталі на ёй свае лекцыі. Дзякуючы захадам Ігнатоўскага ўзнаўляюць дзейнасць Віцебскі ветэрынарны інстытут і Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія ў Горках. Пачынае дзейнасць Мінскі педагагічны тэхнікум, з якога выйдзе шмат дзеячаў беларускай культуры.

У 1926 годзе Ігнатоўскі становіцца старшынёй Інстытута беларускай культуры, у 1929-1930 – прэзідэнтам Беларускай акадэміі навук.

У 1919 годзе ён напісаў адну з першых прац па агульнай гісторыі краіны, хрэстаматыйны *Кароткі нарыс гісторыі Беларусі*. У прадмове да яе ён пісаў:

Расійскае самаўладзтва змагалася з усім тым, што насіла на сабе адзнакі мясцовага ці нацыянальнага характару. Усё вялікае, агульнае, ставілася замест дробнага, мясцовага і нацыянальнага. З офіцыяльнага боку існавала палітычна і культурна толькі адзіная і непадзельная Расія, якая ведала і падтрымлівала адзіную і непадзельную гісторыю, агульна-рускую гісторыю царска-панскага кірунку. На гэтай царскай агульна-рускай гісторыі адукаваліся і мы, што вышлі з працоўных мас Беларусі. Мы ніколі ня ведалі і цяпер ня ведаем сапраўднай агульна-рускай гісторыі, бо толькі тады магчыма знаць агульнае, калі мы ведаем дробнае, з якога складаецца агульнае.

Мінск на паштоўцы з пачатку XX ст.

У іншым месцы кнігі наш гісторык пісаў:

Ніколі не перарываецца людзкое жыцьцё. Як бягучая рэчка, цячэ яно з году ў год, з сталецьця ў сталецьце. Ніколі не зьнікае творчая сіла чалавечай працы. Але год на год, сталецьце на сталецьце не падобна. У адны часы хутка, жвава йдзе праца. Арганізуюцца і ствараюцца соцыяльныя групы, пашыраецца і паглыбляецца культура сярод працоўных мас народу, здабываюцца новыя вартасьці як матэрыяльнага, так і духоўнага значэньня, вынікаюць тэорыі жыцьцёвага будаўніцтва, ідзе шпарка гістарычны паступовы рух. У другія-ж часы справа стаіць іначай: рух жыцьця прыпыняецца, сілы народу заміраюць, хаваецца кудысь у глыбіню творчасьць людзкасьці, соцыяльны і палітычны ўціск руйнуе дзяржаўны будынак і прыгнятае працоўную масу...

Усевалад Ігнатоўскі напісаў звыш сарака навуковых работ. Абвінавачаны ў нацыяналізме, пасля допытаў закончыў жыццё самагубствам у 1931 годзе.

1. Якія дзеянні Усевалада Ігнатоўскага мелі ўплыў на «беларусізацыю»?

2. Якія погляды і думкі Усевалада Ігнатоўскага з прадмовы да *Кароткага нарысу гісторыі Беларусі* лічыш самымі вартаснымі?

3. Чаму вядомы гісторык і чалавек, які стварыў асновы БССР, закончыў жыццё самагубствам?

Віцебск на паштоўцы з пачатку XX ст.

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ

Першыя крокі беларусізацыі былі зроблены на пераломе гадоў 1917-1918. Пачынаецца перавод навучання ў школах пераважна на беларускую мову, ідзе арганізацыя школ для нацыянальных меншасцей на іх роднай мове. У гэтай рабоце ўдзельнічалі і некаторыя дзеячы беларускага нацыянальна-вызваленчага руху: Усевалад Ігнатоўскі, Зміцер Жылуновіч і іншыя. Пад уплывам іх дзейнасці ажыццяўляецца беларусізацыя шэрагу рэспубліканскіх устаноў.

Выдавецтва «Савецкая Беларусь» выпускае газеты, часопісы, кнігі на беларускай мове і мовах нацыянальных меншасцей. Пачаў дзейнічаць Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр Уладзіслава Галубка. Ствараецца сістэма дашкольнага выхавання і школьнай адукацыі, прафесійных вучылішчаў і тэхнікумаў. У 1921 г. адкрыты Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Быў заснаваны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт), шэраг бібліятэк. Пачалі працаваць Дзяржаўны музей і Цэнтральны архіў.

II сесія ЦВК БССР (15 ліпеня 1924 г.) паклала пачатак беларусізацыі як афіцыйнай дзяржаўнай палітыцы. Была створана спецыяльная камісія, яна, сумесна з акруговымі камісіямі, абавязана была правесці шырокі комплекс мерапрыемстваў:

– перавод рэспубліканскіх устаноў і часцей Чырвонай Арміі на беларускую мову;

– вылучэнне беларусаў на партыйную, савецкую, прафсаюзную работу;

– арганізацыя работы навучальных устаноў на беларускай мове, развіццё беларускай літаратуры і культуры. Пераход устаноў і арганізацый на беларускую мову планавалася ажыццявіць на працягу 1-3 гадоў.

У 1924-1925 гг. праводзіцца работа па тлумачэнні сутнасці беларусізацыі. На розных мовах выдавалася спецыяльная літаратура, выступалі агітатары і прапагандысты. Ва ўстановах і арганізацыях вывучалася беларуская мова, ажыццяўляўся пераход на яе справаводства. У 1927 г. беларускай мовай валодалі 80% службоўцаў.

На адказную работу вылучаюць не толькі беларусаў, але і часткова тых, хто вывучыў беларускую мову і добра ведаў мясцовыя ўмовы. Напрыклад, да 1927 г. сярод кіраўнікоў акруг і раёнаў беларусаў было 48%.

Паспяхова праходзіла беларусізацыя навучальных устаноў. Да 1928 г. 80% школ было пераведзена на беларускую мову навучання. Вывучаюцца гісторыя, эканоміка і геаграфія БССР. Дзейнічалі курсы беларусазнаўства, якія рыхтавалі настаўнікаў і лектараў. Беларускую мову неслі ў масы беларускія пісьменнікі. Мастацкія творы 1920-х гадоў сведчаць аб зменах, якія адбываліся ў грамадстве.

Развіваецца краязнаўства. На сярэдзіну 1920-х гадоў у БССР дзейнічала 240 краязнаўчых арганізацый. Краязнаўцы выступалі з дакладамі, выдавалі рукапісныя зборнікі, збіралі фальклорныя творы.

Беларусізацыя прадугледжвала культурнае развіццё іншых нацыянальнасцей, якія жылі ў рэспубліцы. Былі створаны нацыянальныя саветы ў месцах іх кампактнага пражывання. Выкладанне ў школах вялося на 8 нацыянальных мовах.

Да 1928 г. беларусізацыя дасягнула значных поспехаў. Яна палегчыла барацьбу з непісьменнасцю, садзейнічала ажыццяўленню асветніцкай работы, стварыла перадумовы для разгортвання нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР.

1 Калі праходзіла «беларусізацыя»?

2 У якіх галінах жыцця праводзілася беларусізацыя ў краіне?

3 Чаго дасягнула «беларусізацыя»?

4 Як ацэньваеш гэты перыяд у гісторыі развіцця беларускай культуры?

Магілёў на паштоўцы з пачатку XX ст.

КУЛЬТУРА І ЛІТАРАТУРА Ў БССР У ДВАЦЦАТЫЯ І ТРЫЦЦАТЫЯ ГАДЫ XX СТАГОДДЗЯ

У 1920 г. ствараюцца выдавецтва «Беларусь» і Беларускі дзяржаўны тэатр (будучы тэатр імя Янкі Купалы). У 1921 г. адкрываецца Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, а ў 1922 г. – Дзяржаўная бібліятэка, Інстытут беларускай культуры (папярэднік Акадэміі навук), дзе працавалі выдатныя вучоныя і пісьменнікі: Усевалад Ігнатоўскі, Мікола Байкоў, Цішка Гартны, Язэп Лёсік, Янка Купала і інш. З 1924 г. пачаўся планамерны перавод справаводства на беларускую мову. У літаратуры, якой быў уласцівы пошук новых ідэй, стылявых і жанравых форм, пачынае заяўляць пра сябе новае пакаленне пісьменнікаў: Кузьма Чорны, Платон Галавач, Міхась Зарэцкі, Міхась Чарот, Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча, Паўлюк Трус, Уладзімір Хадыка, Юрка Гаўрук, Алесь Дудар, Анатоль Вольны і інш. Маладыя пісьменнікі былі акрылены пафасам рэвалюцыйных пераўтварэнняў, марылі аб стварэнні шэдэўраў новай літаратуры, узняцці беларускага мастацкага слова на небывалыя вышыні. Узнікаюць літаратурныя аб'яднанні, розныя па сваіх ідэйна-творчых праграмах, але адзіныя ў сваёй мэце – стварыць новую беларускую літаратуру.

Самым галоўным у 20-я гады было літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», утворанае ў канцы 1923 г. Да 1926 г. яно па сутнасці было адзінай масавай літаратурна-асветніцкай арганізацыяй, якая мела свае філіялы ў Віцебску, Полацку, Бабруйску, Магілёве і іншых гарадах рэспублікі, а таксама ў Маскве, Смаленску, Празе,

Рызе. Аб'яднанне мела свой друкаваны орган, часопіс «Маладняк» – дзякуючы якому вялася шырокая папулярызацыя мастацкай літаратуры і выяўляліся маладыя таленты.

Маладнякоўцамі ў розныя гады былі Кузьма Чорны, Змітрок Бядуля, Кандрат Крапіва, Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча, Міхась Чарот, Ян Скрыган, Анатоль Вольны, Уладзімір Жылка, Міхась Зарэцкі і інш. У сваіх творах члены аб'яднання ўсхвалялі рэвалюцыю. Знаходзячыся ў пошуках новых мастацкіх форм і сродкаў, ствараючы «вечнае» мастацтва, некаторая частка маладнякоўцаў у той час негатыўна ставілася да літаратурных здабыткаў мінулых часоў, адмаўляла фальклор, скептычна, а часам і варожа адносілася да творчасці Якуба Коласа, Янкі Купалы, Алеся Гаруна, Максіма Багдановіча. Гэта з'явілася адной з прычын выхаду з аб'яднання ў 1926 г. Кузьмы Чорнага, Максіма Лужаніна, Пятра Глебкі, Кандрата Крапівы, Язэпа Пушчы, Уладзіміра Дубоўкі, якія ўтварылі новую літаратурную арганізацыю «Узвышша».

У 1928 г. «Маладняк», які ператварыўся з літаратурнага ў культурна-асветніцкае аб'яднанне, быў перайменаваны ў БелАПП (Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў), якая праіснавала да 1932 г.

Творчым ядром колькасна нешматлікага літаб'яднання «Узвышша» сталі Уладзімір Дубоўка, Кузьма Чорны, Кандрат Крапіва, Язэп Пушча, Максім Лужанін, Сяргей Дарожны. Члены гэтай арганізацыі арыентаваліся на традыцыі класічнай літаратуры, вусную народную творчасць. Заклікалі да пошукаў творцамі свайго індывідуальнага стылю, да стварэння высокамастацкіх твораў. Аб'яднанне мела свой друкаваны орган – літаратурна-мастацкі часопіс «Узвышша», які вёў актыўную палеміку з «Маладняком». Члены «Узвышша» ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускай нацыянальнай прозы і паэзіі. Так, у перыяд дзейнасці «Узвышша» Кузьма Чорны напісаў раманы *Сястра*, *Зямля*, *Бацькаўшчына*, Змітрок Бядуля – аповесць *Салавей*, Андрэй Мрый – сатырычны раман *Запіскі Самсона Самасуя*, Уладзімір Дубоўка – паэмы *Штурмуйце будучыні аванпасты* і *Пурпуровых ветразей узвівы*.

У канцы 20-х гадоў з боку афіцыйных улад пачаліся абвінавачванні членаў «Узвышша» ў адыходзе ад пралетарскай культуры, «ідэалагічнай заганнасці», «паэтызацыі дробнабуржуазнага сялянства», у непрыняцці палітыкі калектывізацыі. Усё гэта з'явілася прычынай спынення дзейнасці аб'яднання ў 1931 г.

У 1927 г. старэйшыя пісьменнікі Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны, Уладзіслаў Галубок і іншыя стварылі аб'яднанне «Полымя», якое існавала да 1932 г. Члены аб'яднання выступалі за творчае супрацоўніцтва з іншымі арганізацыямі. [...] У 1932 г. пасля пастановы ЦК ВКП(б) «аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый» усе літаб'яднанні былі ліквідаваны.

Утвораны ў 1934 г. Саюз пісьменнікаў Беларусі цэнтралізаваў кіраванне ўсёй нацыянальнай літаратурай. Узмацняецца дыктатура таталітарнай улады, пачы-

наюцца масавыя рэпрэсіі. Пад выглядам барацьбы за пралетарскую культуру, выкрываюцца так званыя нацыянал-дэмакраты (нацдэмаўцы). Вядзецца планамернае вынішчэнне пісьменнікаў, паэтаў, працаўнікоў навукі, культуры, мастацтва – свядомай беларускай інтэлігенцыі. Падаўляецца ўсялякае іншадумства, ганьбуецца спадчына народа, яго нацыянальная мова. Лепшыя сыны Бацькаўшчыны становяцца «ворагамі народа», «цемрашаламі», «абаронцамі кулацтва», «феадаламі-прыгоннікамі», «буржуазнымі нацыяналістамі», «контррэвалюцыянерамі». Фальсіфікуецца «справа» антысавецкай нацдэмаўскай арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі», за прыналежнасць да якой было асуджана каля 200 выдатных дзеячаў культуры. Кіраўніцтва гэтай выдуманай арганізацыяй спрабавалі прыпісаць Янку Купалу. Ён, даведзены да адчаю цкаваннем у друку і неаднаразовымі допытамі ў ДПУ, у лістападзе 1930 г. зрабіў спробу самагубства.

У 1931 г. быў сасланы ў Кіраў, а ў 1938 г. расстраляны Максім Гарэцкі. Яго раманы *Віленскія камунары* і *Камароўская хроніка* выйшлі з друку толькі пасля рэабілітацыі пісьменніка ў 1963 г. За праўдзівае адлюстраванне працэсу калектывізацыі ў рамане *Вязьмо* яго аўтар Міхась Зарэцкі быў арыштаваны і ў 1941 г. расстраляны. Былі расстраляны акадэмікі Вацлаў Ластоўскі і Браніслаў Тарашкевіч, пісьменнікі Міхась Чарот, Уладзіслаў Галубок, Платон Галавач, Алесь Салагуб, Алесь Дудар, Тодар Кляшторны, Анатоль Вольны, Юрый Таўбін і інш. Амаль па тры дзесяцігоддзі правялі ў ссылках Уладзімір Дубоўка і Язэп Пушча. За кратамі і ў высылцы апынуліся Кузьма Чорны, Максім Лужанін, Уладзімір Жылка, Мікола Хведаровіч, Уладзімір Хадыка, Юрка Гаўрук, Янка Туміловіч. [...] Літаратару знішчалі не толькі фізічна. Творы знікалі з часопісаў, кніг, бібліятэчных фондаў. Знішчаліся рукапісы, картатэкі, дзённікі. Аднак у літаратуру вярнуліся «забытыя імёны», а іх творчасць стала прадметам даследавання. [...]

паводле Васіля Старычонка



Ядвігін Ш. (1868-1922)

Ядвігін Ш. (сапр. **Антон Лявіцкі**), нарадзіўся ў маёнтку Добасна. У 1909-1910 гг. працаваў у «Нашай ніве», у 1913 г. у рэдакцыі газеты «Беларус», з 1913 г. па 1915 г. у часопісе «Саха» і беларускім часопісе для дзяцей «Лучынка». У 1914-1918 гг. працаваў у мінскіх беларускіх арганізацыях, памагаў пацярпеўшым ад вайны. Ядвігін Ш. пачаў пісаць яшчэ ў студэнцкія гады, калі вучыўся на медыцынскім фа-

культэце Маскоўскага ўніверсітэта. У 1890 г. за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў выключаны з універсітэта і арыштаваны.

Актыўная літаратурная дзейнасць Ядвігіна Ш. прыпадае на пачатак XX ст. У 1906 г. на старонках газеты «Наша доля» з'явілася яго першае апавяданне *Суд*. Некаторыя яго празаічныя творы з'явіліся ў выніку апрацоўкі народных паданняў і казак. Найбольшую каштоўнасць маюць алегарычныя апавяданні *Павук*, *Падласенькі*, *Рабы*, *Дуб-дзядуля*, у якіх выразна раскрыўся яго сатырычны талент. У апавяданнях *Гаротная*, *Шчаслівая*, *З бальнічнага жыцця*, *Зарабляюць* паказаны трагічны лёс абяздоленых людзей. Гэтыя творы прасякнуты гуманізмам. Апавяданні Ядвігіна Ш. увайшлі ў два зборнікі прозы *Бярозка* (1912), *Васількі* (1914) і складаюць лепшую частку літаратурнай спадчыны пісьменніка. Быў ён таленавітым апавядальнікам, пісьменнікам-сатырыкам і гумарыстам.

Творчасць Ядвігіна Ш. вырастала з народнай творчасці і мела шмат агульнага з казкай, а першыя апавяданні (*Важная фіга*, *Хлеб*, *Суд* і інш.) былі літаратурнымі апрацоўкамі народных легенд, казак, анекдотаў. Моцны ўплыў народнай творчасці адчуваецца таксама ў алегарычных апавяданнях, якія па форме, стылю і сатырычнай накіраванасці нагадваюць байкі ў прозе. Апавяданні гэтыя разнастайныя не толькі па тэматыцы, але і па эмацыянальнай афарбоўцы, для іх характэрны не толькі гумар (*Пазыка*, *Заморскі звер*), але і вострая палітычная сатыра (*Павук*, *Сабачая служба*), а нават лірызм (*Дуб-дзядуля*, *Бярозка*). Амаль адначасова з алегарычнымі творамі празаік піша псіхалагічна-бытавыя апавяданні (*З бальнічнага жыцця*, *Гаротная*, *Зарабляюць*), у якіх глыбока адлюстроўвае тагачасную рэчаіснасць, багатую складанымі грамадскімі ўзаемаадносінамі, насычаную вострымі сацыяльнымі і маральнымі праблемамі.

Ядвігін Ш.

Васількі

Васількі закрасавалі. Не, не закрасавалі! Дзе ж ім цяпер красаваць? Холад. Зіма. Снег. Не закрасавалі васількі; гэта толькі перад вачамі маімі міганулі яны. Нават не перад вачамі, а так недзе: не то ў думках, не то ў душы ці сэрцы? Не ведаю дзе. Мільганулі васількі: васількі ў жыце... неба, як васількі... як васількі, вочкі... міганулі васількі і... счэзлі!...

У красе нашага жыцця мы любім, як красуюць васількі.

А калі паблекнуць васількі, паблекне неба, паблекне на душы, а на сэрцы ляжа холад; калі зямлю пакрые снег, а на тваю галаву быццам сыпне шоран; калі маеш штодзённы цёмны, горкі хлеб, – тады толькі ўспомніш, што гэта – ад васількоў, ад іх красы, бо... адкрасавалі васількі...

Абразок – малая празаічная форма, замалёўка, заснаваная на нейкай адной зрокава наглядной дэталі.



1 Звярні ўвагу на мову і стыль абразка Ядвігіна Ш. *Васількі*.

2 Знайдзі ў слоўніку значэнне тэрміна «мініяцюра». Скажы, ці можна яго ўжываць як сінанімічную форму да паняцця «абразок».

- закрасавалі – паявіліся, зацвілі
- шоран – тое, што шэрань; белыя крышталікі, формай падобныя да сняжынак, якія нарастаюць пры значным марозе і тумане на галінах дрэў і дроце

Ядвігін Ш.

Пазыка

Што пазыка не кожнаму ідзе на карысць, усякі хіба добра ведае на сваім уласным карку. Пазнаў гэта і мой карак, нават не карак, а ногі.

Было так: выбраўся я ў Вільню, а што неяк, не тут кажучы, саромеўся паказацца ў горадзе ў лапцях дык пазычыў боты ў суседа. Пайшоў у Вільню: цягнуся ў Кальварыю. Аж тут на мосце, што зроблены праз раку Вілію, бачу: нейкія два падросткі цягаюцца за чубы.

– Што вам, – кажу, – за ліха, абібокі вы гэткія, чаго вам не хапае, – гэта ж смех і грэх.

– Дзядзенька, – кажуць яны, – дзярэмся, праўда, але дзярэмся з твае прычыны.

Вось, – думаю, – ліха напала; з-за мяне – Янкі з Гаротнікаў – у Вільні чубы трашчаць?! Аж дзіва: скуль яны могуць знаць мяне? Але на сэрцы зрабілася неяк добра: як бы ні было, а ўсё ж гонар.

– Пакіньце, – кажу, – хлопчыкі, шкада мне вас, ды скажыце, у чым дзела:

– Як жа ж, дзядзенька, во гэты гіцаль кажа, што ў цябе шэсць пальцаў на назе, а я кажу, што пяць; ну, і ўзяліся за чупрыны.

– А дзеткі ж мае вы родныя, пакіньце цягацца, – кажу, – бо ў мяне і папраўдзе тыкеля па пяць пальцаў на назе!

– Не, – кажа старэйшы хлопец, – так табе, дзядзька, веры не дамо: скінь боты і пакажы.

– Добра, – кажу, – хлопчыкі, супакойцеся, я вас пераканаю. Зышлі мы на бок, сцягнуў я бот, адкруціў анучыну, пералічылі яны мае пальцы, – пяць!..

– Ага, – кажа той самы забіяка – чаму ж ты, дзядзька, паказаў нам тыкеля правую нагу? А на левай то пэўна шэсць пальцаў!

Хоць вас паляруш! Разуўся я і з левай нагі пачаў анучу адкручваць, – калі глянь – ажно ўжо няма маіх чупрыннікаў; няма каму пальцаў лічыць! Але, дасце веры, і на пальцы няма чаго нацягнуць, бо разам з імі паехалі і новыя, пазычаныя боты!

- Кальварыя – у католікаў святое месца, з каплічкай, касцёлам або кляштарам, куды сходзяцца вернікі памаліцца за здароўе, пакаяцца ў грахах; *тут*: назва святога месца каля Вільні
- тыкеля – на самай справе
- анучына – кусок палатна для абгортвання ног
- паляруш – параліч
- чупрыннікі – *тут* у значэнні: удзельнікі бойкі

Анекдот – лаканічны, сатырычна-гратэскны, з нечаканай (часам вострай) канцоўкай фальклорны твор. У аснове анекдота ляжыць нейкі адзін эпізод, падзея, учынак грамадскага або палітычнага характару.

1 Складзі план апавядання *Пазыка*, на яго аснове перадай змест твора.

2 Якое значэнне маюць прыведзеныя у тэксце прыказкі і прымаўкі?

3 Апавяданне *Пазыка* з'яўляецца літаратурным апрацаваннем фальклорнага анекдота. Скажы, у чым заключаецца яго гумар?

Цётка (1876-1916)

Цётка (сапр. **Алаіза Пашкевіч**), паэтэса, прадаўжальніца лепшых традыцый прагрэсіўнай беларускай літаратуры, нарадзілася ў фальварку Пешчына недалёка ад Ліды ў дробнай шляхецкай сям'і. Вучылася ў прыватным вучылішчы ў Вільні, дзе атрымала званне хатняй настаўніцы. Была адной з заснавальніц



партыі Беларуская сацыялістычная грамада. Прымала ўдзел у выданні газеты «Наша доля», супрацоўнічала з «Нашай нівай», была заснавальнікам і рэдактарам першага беларускага часопіса для дзяцей і моладзі «Лучынка». Удзельнічала ў адкрыцці нелегальных беларускіх школ. Склала *Першае чытанне для дзетак беларусаў*.

У 1906 г. у Жоўкве (каля Львова) выдала зборнікі паэзіі *Скрыпка беларуская* і *Хрэст на свабоду*. Свой першы зборнік назвала сугучна з загалоўкам кнігі Багушэвіча – *Скрыпка беларуская*. Самой назвай паэтэса заявіла, што далучае свой голас да голасу Багушэвіча. Як і Багушэвіч, Цётка патрабуе ад сваёй скрыпкі пякучых дзейсных песень, якія будзілі б працоўнага чалавека.

Творчасць Цёткі развівалася ў перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг., і была прасякнута пафасам і рамантыкай барацьбы. Творчая спадчына Цёткі непарыўна звязана з яе рэвалюцыйнай дзейнасцю. Яе вершы друкаваліся як пракламацыі і ўмомант разыходзіліся па гарадах і вёсках.

У вершы *Мора* паэтэса стварае яркі вобраз народнай рэвалюцыі. У алегарычным вобразе мора ўвасабляе яна рэвалюцыйны ўздым народа. Раз'юшаная стыхія на моры – гэта барацьба народа супраць самаўладства. Вера ў сілу аб'яднаных у барацьбе з царызмам братніх народаў з'яўляецца асноўнай думкай вершаў *Суседзям у няволі*, *Вера беларуса* і інш.

Асаблівым рэвалюцыйным запалам вызначаецца верш *Хрэст на свабоду*. Верш гэты напісала Цётка як водгук на падзеі Крывавай нядзелі. У творы з пафасам даказвае, што расстрэл мірнай дэманстрацыі адкрыў сапраўдны воблік самаўладства, яго злачыннасць у адносінах да народа.

Пасля паражэння рэвалюцыі 1905-1907 гг., Цётка ўсё яшчэ верыла ў новую рэвалюцыю. Сваю веру ў будучую рэвалюцыю яна выказала ў алегарычным вершы *Бура ідзе*. З часам надзея на чарговы рэвалюцыйны ўздым саступае месца едкаму пачуццю расчаравання, смутку і журбы. Паяўляюцца творы медытатыўнага і элегічнага характару (*На магіле*, *З чужыны*, *Грайка*).

У гэты перыяд асабліва прыкметнай становіцца сувязь твораў паэтэсы з вуснай народнай творчасцю (*Вясковым кабетам*, *Гаданне*, *Сірацінка*). Верш *Вясковым кабетам* нагадвае народную песню з традыцыйнымі паўторамі, выклічнікамі, параўнаннямі, звароткамі і зачынам.

У літаратурнай спадчыне Цёткі знаходзяцца таксама апавяданні, у тым ліку і для дзяцей (*Зялёнка*, *Міхаська*, *Навагодні ліст*, *Асеннія лісты*). Празаічную творчасць пачала яна ад алегарычнага абразка *Прысяга над крывавымі разорамі*, які мае характар пракламацыі з выразна акрэсленай рэвалюцыйнай ідэяй – сцвярджэння права народа на зямлю і волю.

Асобнай старонкай яе спадчыны з'яўляецца публіцыстыка: падарожныя нататкі, нарысы, артыкулы да часопіса «Лучынка».

Вясковым кабетам

Ой, сястронкі, ой, вясковы,
Ой вы, кветкі прызавяты!
Вашы твары, як васковы,
Вашы шчокі слязьмі змяты...

Як каліну град страсае,
Як пярун каменне крышыць,
Так лёс рана вас ламае,
Так жыццё красу вам нішчыць.

Сколькі болю ў вачох хмурных,
Сколькі скаргі з губ збялелых,
Сколькі срэбра ў косах густых,
Сколькі поту з рук абмлелых!..

А за гэта вам дзве дошкі
І крыж з хвоек ледзьве збіты,
І ў памяць плачуць дочкі,
Бо й яны, як вы, забіты.

Ой, кабеты, ой, вясковы,
Ой вы, кветкі прызавяты!
Ой, лілейкі вы без мовы,
Ой вы птушкі бескрылаты!..

Пісьмо – пісьмовае выказванне (тэкст), накіраванае да канкрэтнага адрасата, падаецца для паведамлення чаго-небудзь. Форма пісьма выкарыстоўвалася ў літаратурнай творчасці, як крыніца інфармацыі ці інструмент палемікі. Празаічныя творы, напісаныя ў форме перапіскі персанажаў, у тэорыі літаратуры называюцца **эпісталярнай літаратурай**.

«Стары Двор. Радзіма Цёткі», 1976. Кастусь Харашэвіч



1. Прыведзены вышэй верш адрасаваны вясковым жанчынам. Пры дапамозе якіх мастацкіх тропаў паэтэса раскрыла вобраз вясковай жанчыны?

2. Акрэслі від рыфмоўкі паводле размяшчэння канцавых рыфмаў у страфах вершаванага твора.

3. Звярні ўвагу на мову верша. Якія моўныя сродкі набліжаюць верш *Вясковым кабетам* да народнай песні?

Янка Купала, 1925

Янка Купала (1882-1942)

Янка Купала (сапр. **Іван Луцэвіч**), паэт, драматург, перакладчык, публіцыст, грамадскі дзеяч, нарадзіўся ў сям'і малазямельнага арандатара ў фальварку Вязынка, недалёка ад Мінска. Нараджэнне яго супала са старажытным народным святам Купалля, назву якога паэт узяў у якасці псеўданіма. На працягу многіх гадоў супрацоўнічаў і працаваў у газеце «Наша ніва», рэдагаваў часопісы «Рунь» і «Вольны сцяг», быў адным з ініцыятараў стварэння Беларускага дзяржаўнага тэатра, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Інстытута беларускай культуры, літаратурнага аб'яднання «Полымя». У 1930 г. Янку Купалу рэгулярна выклікалі на допыты, патрабавалі паказанняў аб «контррэвалюцыйнай» арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі», лідарам якой ён нібыта быў. Даведзены да адчаю, паэт 27 лістапада 1930 года зрабіў спробу самагубства. У час гітлераўскай акупацыі вымушаны быў пакінуць Беларусь. Трагічна загінуў у Маскве ў гасцініцы «Масква». Пакінуў багатую спадчыну, што ўвабрала ў сябе народныя паданні, казкі, песні, легенды, а таксама традыцыі дэмакратычнай літаратуры XIX ст. Яго творчасць называюць летапісам жыцця, працы і барацьбы беларускага народа.

Пісаць пачынаў Купала на польскай мове, але пад уплывам беларускамоўнай творчасці Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і Францішка Багушэвіча перайшоў на беларускую мову. Літаратурны дэбют паэта пачаўся з верша *Мужык*, надрукаванага ў 1905 г. у газеце «Северо-Западный край». Верш, напісаны ў форме маналога селяніна-працаўніка, які разважае пра сваё жыццё, занепакоіў царскую цэнзуру. Гэтым вершам Купала абуджаў селяніна, асведамляў яго бязрадаснае становішча «рабочага вала» і заахвочваў пастаяць за сябе, сям'ю, свой лёс і сваю чалавечую годнасць.

Паэзія Купалы – зборнікі *Жалейка* (Пецярбург, 1908), *Гусляр* (1910) і *Шляхам жыцця* (1913) – наскрозь сацыяльная, грамадзянская. Галоўнае месца ў ёй займаюць матывы сялянскай нядолі, цяжкага беспрасветнага жыцця.

У адрозненні ад *Жалейкі* з яе элегічнасцю, плачам над нядоляй селяніна, у *Гусляры* выразна адчуваецца рамантычнае светаадчуванне аўтара, паглыбленае выяўленне асобы паэта, дзе на першым месцы лірычнае «я» паэта-змагара за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, паэта адказнага за лёс народа і шчасце людзей. Зборнік *Шляхам жыцця* (1910-1913 гг.) вызначаўся патрыятычнай і гістарычнай праблематыкай. Паэт стараўся абудзіць у чытача пачуццё гордасці

і пашаны да продкаў, якія былі здольны бараніць сваю незалежнасць і культуру. Многія творы, дзе гучалі такія матывы, у пазнейшы час былі забаронены і не перадрукоўваліся да канца 1980-х гадоў (*Па-просту*, *Для зямлі прадзедаў маіх*, *Не шукай*). У вершах Купала апяваў набліжэнне сацыяльных перамен, надыход незалежнасці, прадвесцем якіх быў створаны паэтам вобраз Маладой Беларусі, абуджанай да гістарычнага самасцвярджэння. У вобразах *Прарока*, *Гусляра*, *Падарожнага*, *Незнаёмага* лірык прадказваў Вялікі Сход, на якім будзе вырашаны лёс беларускага народа.

У фальклорна-рамантычных паэмах: *Курган* (1910), *Бандароўна* (1913), *Магіла льва* (1913), драматычных паэмах *Адвечная песня* (1908), *Сон на кургане* (1910), паэме-ідыліі *Яна і я* (1913) паэт стварыў шыкорую карціну духоўнага жыцця народа, шукальніка справядлівасці, шчасця, свабоды. Творчасць Купалы гэтага часу вызначаецца высокім мастацкім узроўнем, кампазіцыйнай дасканаласцю. Пісьменнік узбагачае жанравы дыяпазон беларускай літаратуры драматычнымі творамі: камедыя *Паўлінка* (1912), драма *Раскіданае гняздо* (1913). У 1914-1915 гг. з'явіліся яго антываенныя, пацыфістычныя вершы (цыкл *Песні вайны*). У вершах *Званы*, *Буралом*, *Спадчына*, *Рунь*, *Першы снег*, *Паязджане* лірык разважае пра гістарычныя шляхі Бацькаўшчыны. Творы гэтыя ўвайшлі ў чацвёртую паэтычную кнігу *Спадчына* (1922). Кнігу гэтую тагачасная савецкая крытыка ацаніла адмоўна, таму што не знайшліся ў ёй творы, якія ўслаўлялі б рэвалюцыйныя перамены. Купала застаўся верны Бацькаўшчыне, палітычнае становішча якой у гэты перыяд было вельмі складаным. Паэт бачыў, як рэвалюцыйныя віхуры разбураюць краіну, як гінуць «сны аб Беларусі», як родныя людзі становяцца на розныя бакі барыкады. Горкі вобраз разбурэння, нігілізму і разгубленнасці прадставіў Купала ў камедыі *Тутэйшыя* (1922). Сатырычная камедыя, у якой увасаблялася ідэя нацыянальнай незалежнасці Беларусі, доўгі час была забаронена. Цэнтральным, сімвалічным вобразам п'есы з'яўляецца сама Беларусь, якую імкнуцца падзяліць. Драматычныя і трагічныя ноты гучалі таксама ў кнізе *Безназоўнае* (1925).

У гады, калі абмежавана была свабода творчасці, Купала стараўся асэнсаваць новую плынь жыцця і даць ёй адэкватны мастацкі вобраз. У гэтыя гады выходзяць паэтычныя зборнікі *Песня будаўніцтву* (1936), *Беларусі ардэнаноснай* (1937), *Ад сэрца* (1940).

У час акупацыі Янка Купала вымушаны быў пакінуць любімую Беларусь і адправіцца на ўсход, але пісаць не перастаў. У бежанстве паўставалі гнеўныя творы, скіраваныя супраць фашысцкіх захопнікаў. Выступаў таксама з пафаснымі артыкуламі і вершамі, у якіх заклікаў народ да абароны сваёй Радзімы.

Янка Купала, 1941

❖ Паэма Янкі Купалы *Адплата кахання* (1905-1907) надрукавана ўпершыню ў зборніку *Жалейка*. Яна блізкая да ранніх яго паэм (*Зімою*, *Нікому*, *Калека*), у аснове якіх мясцовыя паданні з часоў прыгону. Сюжэт паэмы пабудаваны на трагічным здарэнні, што адбылося ў панскім маёнтку на Лагойшчыне. У творы паказана характэрная для мінулых часоў гісторыя няроўнага кахання з трагічным зыходам. Героі твора – Янка Лявончык паходзіць з беднай сялянскай сям'і, Зося – з панскага роду. Перашкодай іх каханню становіцца брат закаханай пан Лаўчынскі.

Паэт асуджаў і сацыяльную няроўнасць, і сам лад, заснаваны на ёй. Каштоўнасць паэмы ў высокім узроўні эстэтычнага асэнсавання жыццёвай драмы Янкі і Зосі, вобразы якіх увасабляюць рамантычную чысціню і прыгажосць кахання. З дапамогай заснаваных на фальклоры вобразаў, метафар і лірычных адступленняў у творы раскрыта выключная знешняя і ўнутраная прыгажосць кожнага з закаханых. Сцвярджэнне паэта, што святасць чыстага пачуцця вышэй за ўсялякія саслоўныя перагародкі, прасякнута гуманістычнай заклапочанасцю пра адносіны паміж людзьмі.

паводле Міколы Арочкі

❖ Верш Янкі Купалы *Явар і каліна* напісаны ў 1910 г. у Пецярбургу, упершыню надрукаваны ў «Беларускім календары «Нашай нівы» на 1911 год». З'яўляецца ён класічным узорам пейзажнай лірыкі. Верш прасякнуты глыбокай філасофскай ідэяй бясконцасці жыцця прыроды, яе зменлівасці і абнаўлення, гармоніі ча-

лавечага і прыроднага. [...] Міфалагічны субстрат выяўляецца ў характары ўзаемаадносін паміж дзвюма прыроднымі сферамі – маткай-зямлёй і небам, у вобразах русалак і начніц. Купалаўскі жывапіс трымаецца не столькі на зрокавым уяўленні, колькі на псіхалагічных асацыяцыях, гэта адбітак знешніх рэалій у душы чалавека: «сумная даліна», «сонныя імшары», «тайна... месяца, зор выглядаюць». Сіла эмацыянальнага ўздзеяння твора ў незвычайнай гармоніі зместу і формы, іх узаеманеабходнасці, калі знешняя прастата выяўленчых сродкаў выступае як найважнейшы атрыбут паэтычнай змястоўнасці. У творы сапраўды «чуецца музыка дзіўная», якая вызначае вобразна-эмацыянальны лад верша, яго настрой. Музычнасць у ім – не толькі напеўнасць, але і суладнасць, суразмернасць усіх вобразна-выяўленчых кампанентаў. У творы вытрымана сіметрыя вобразаў, пачынаючы з асноўных («явар і каліна»), якія ўвасабляюць мужчынскі і жаночы пачатак жыцця. Кожная страфа мае свой вобразны план, дзе на розных семантычных узроўнях адбілася пэўная сіметрыя адчуванняў: вясна – зіма, раніца – поўдзень, «ночанька чорная» – месяц і зоры, музыка – сон. Плаўнасць гучання фразы дасягаецца эканомным выкарыстаннем слова (пры мінімальнай колькасці службовых часцін мовы).

паводле Галіны Тарасюк

Янка Купала

Явар і каліна

Песняй вясны лебядзінаю,
Скінуўшы зімнія чары,
Шэпчуцца явар з калінаю
Ў сумнай даліне над ярам.

Лісцікі зеленяй хваляцца
Небу панятлівай мовай:
Росамі мыюцца раніцай,
Песцяцца сонцам паўднёвым.

Захадам модлы пакорныя
З маткай-зямлёй адпраўляюць;
Тайна у ночаньку чорную
Месяца, зор выглядаюць.

Слухаюць смехаў русалчыных,
Лопату крылляў начніцы,
Ветру павеваў ап'янчаных,
Плюскату шклістай крыніцы.

Чуецца музыка дзіўная
Ў повесцях сонных імшараў...
Цешыцца явар з калінаю,
Скінуўшы зімнія чары.

1910

Фальварак Вязынка на Міншчыне, цяпер музей паэта

1 Які настрой выклікае верш *Явар і каліна*?

2 Якімі паэтычнымі сродкамі і тропамі карыстаўся Я. Купала пры апісанні пейзажа ў вершы *Явар і каліна*?

3 Падзялі выбраную табой страфу на склады, абазнач націск. Скажы колькі складоў змяшчаецца ў кожным радку і звярні ўвагу, на якія склады падае націск.

Курган

I

Паміж пустак, балот беларускай зямлі,
На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай
Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі, –
Ўдзірванелы курган векавечны.

Дуб галлё распусціў каранасты над ім.
Сухазелле у грудзі ўпілося;
Вецер стогне над ім уздыханнем глухім, –
Аб мінуўшчыне ў жальбах галосе.

На купалле там птушка садзіцца, пяе,
У піліпаўку воўк нема вые;
Сонца днём распускае там косы свае,
Ночкай зоры глядзяць залатыя.

Хмары неба ўсцілалі мо тысячу раз,
Перуны білі з краю да краю, –
Ён стаіць – гэта памяць людская, паказ...
Толькі гутарка ходзіць такая.

II

На гары на крутой, на абвітай ракой,
Лет назад таму сотня ці болей,
Белы хорам стаяў, недаступнай сцяной
Грозна, думна глядзеў на прыволле.

У нагах у яго рассцілаўся абшар
Хвоек гонкіх і пахані чорнай,
Сонных вёсак шары, хат амшалых, як мар,
Хат з сям'ёй душ падданых, пакорных.

Князь у хораме жыў, слаўны свету ўсяму,
Недаступны і грозны, як хорам;
Хто хацеў, не хацеў – біў паклоны яму,
Спуску, ласкі не знаў непакорам.

Зневажаў, катаваў ён з дружынай сваёй;
Стражы князевы – ў полі і дома,
Толькі модлы раслі небу ў сэрцах людзей,
І пракляцце расло пакрыёма.

III

Раз бяседа вялікая ў князя была:
На пасад дачку княжну садзілі:
За сталом він заморскіх крыніца цякла,
Бегла музыка ўкруг на паўмілі.

На вяселле-разгул наплыло, як на сход,
Госці знатных зусюль, за паўсвету,
Гэткай гучнай бяседы не помніў народ,
Гэткіх скарбаў, брыльянтаў, саетаў!..

Дзень, другі ўжо грымела у князя гульня,
І музыкі, і чаркі звінелі;
Выдумлялі забаў новых кожнага дня;
Што хацелі – ўсяго госці мелі.

Ажно трэцяга дня князь прыдумаў адну
Для дружыны пацеху-забаву:
Загадаў ён пазваць гусляра-старыну,
Гусляра з яго ведамай славай.

IV

Акалічны народ гуслі знаў гусляра;
Песня-дума за сэрца хапала;
Вакол гэтай думы дудара-званара
Казак дзіўных злажылась нямала.

Кажуць, толькі як выйдзе і ўдарыць як ён
Па струнах з неадступнаю песняй, –
Сон злятае з павек, болю цішыцца стогн,
Не шумяць ясакары, чарэсні;

Пушча-лес не шуміць, белка, лось не бяжыць,
Салавей-птушка ў той час сціхае;
Паміж вольхаў рака, як штодзень, не бурліць,
Паплаўкі рыба-плотка хавае.

Прытаіцца да моху русалка, лясун,
Каня вечнага «піць» не заводзіць:
Пад звон-песню жывучых гусляравых струн
Для ўсіх папараць-кветка ўзыходзіць.

V

Прывяла гусляра з яго ніўных сяліб
Дворня князева ў хорам багаты:
Пасадзіла на ганку, між клёнаў і ліп,
На цагляным парозе магната.

Невыдумная світка – убор на плячах,
Барада, як снег белы – такая,
Незвычайны агонь у задумных вачах,
На каленях ляглі гуслі-баі.

Водзіць пальцам худым па сталёвых струнах,
К песні-музыцы ладзіцца, строе;
Водклік б'ецца ад струн па сцюдзёных сцянах,
Заміраючы ў сховах пакояў.

Вось настроіў, навёў тон у струнах як след,
Не зірнуўшы на гулі ні разу,
І сядзіць гэты сумны, як лунь, белы дзед,
І чакае ад князя прыказу.

VI

– Што ж маўчыш ты, гусляр, ніў, лясоў песнябай,
Славай хат маіх подданых слаўны?!
Нам сягоння зайграй, нам сваіх песень дай, –
Князь умее плаціць незвычайна!

Запяеш па душы, дасі ўцехі гасцям –
Поўны гуслі насыплю дукатаў;
Не пад мысль песня будзе каму-небудзь нам –
Канапляную возьмеш заплату;

Знаеш славу маю, знаеш сілу маю...
– Многа знаю і чуў аб табе я, –
І я сам, як і ты, так табе запяю...
– Ну, пара пачынаць, дабрадзею! –

Гэтак слухае, выслухаў князя гусляр,
Заіскрыліся вочы сівыя,
Патануў у скляпеннях адзін, другі ўдар,
І заплакалі струны жывыя.

VII

«Гэй ты, князь! Гэй, праслаўны на цэлы бел свет,
Не такую задумаў ты думу, –
Не дае гуслярам сказу золата цвет,
Белых хорамаў п'яныя шумы.

Скурганіў бы душу чырванцом тваім я;
Гуслям, княжа, не пішуць законаў:
Небу справу здае сэрца, думка мая,
Сонцу, зорам, арлам толькі роўна.

Бачыш, княжа, загоны, лясы, сенажаць, –
Ім пакорны я толькі з гуслямі,
Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, –
Не скуеш толькі дум ланцугамі.

Славен, грозен і ты, і твой хорам-астрог,
Б'е ад сцен-цэгел лёдам зімовым;
Сэрца маеш, як гэты цагляны парог,
І душу – як скляпоў гэтых сховы.

VIII

Глянь ты, слаўны ўладар, па палеткі свае:
Сарачні там сох бачыш, як блудзе;
А ці чуў ты, аб чым там араты пяе,
Дзе і як жывуць гэтыя людзі?

Глянь у лёхі свае, ў падзямеллі глянь, князь,
Што настроіў пад хорамам гэтым:
Брацці корчацца там, табой кінуты ў гразь,
Чэрві точаць жывых іх, раздзетых.

Ты ўсё золатам хочаш прыцьміць, загаціць...
Ці ж прыгледзеўся, хорамны княжа?
Кроў на золаце гэтым людская блішчыць,
Кроў, якой і твая моц не змажа.

Ты брыльянтамі ўсыпаў атласы і шоўк –
Гэта цертая сталь ад кайданаў,
Гэта вісельні петляў развіты шнурок,
Гэта, княжа, твае саматканы.

IX

Стол ты ўставіў ядой, косцей шмат пад сталом, –
Гэта косці бядноты рабочай;
Пацяшаешся белым, чырвоным віном, –
Гэта слёзы нядолі сірочай.

Хорам выстраіў ты, твайму воку так міл,
Адшліфованы цэгла і камень, –
Гэта – памяткі-пліты з няўчасных магіл,
Гэта – сэрцаў скамененых пламень.

Люба чуці табе скочнай музыкі звон:
Ты, дружына п'яце асалоду, –
А ці ўслухаўся ты, як плыве з яе стогн,
Стогн пракляцця табе, твайму роду?!

Ты збялеў, ты дрыжыш, слаўны княжа-ўладар!
Госці хмурны, а дворня знямела...
Ну, што, княжа? пара даць за песню мне дар!
Выбачай, калі спеў мо няўмела».

X

Князь стаіць, князь маўчыць, жуда, помста б'е з воч;
Гулі зглухлі: ні жартаў, ні смехаў...
Думаў князь, выдумляў, грымнуў шабляй наўзбоч,
Толькі з лескатам выбегла рэха.

– Гэй ты, сонцу раўня, не на тое пазваў
На вяселле цябе сваёй княжны!..
Ты шалёны, стары! хто цябе дзе хаваў?
Ты, знаць, вырадак цемры сярмяжнай.

Ты адважыўся мне на сляпы перакор
Вызваняці сусветныя трэлі;
Платы маю шмат я для такіх непакор,
Хто сябе проці мне стаць асмеліў?

Я па-князеўску ўсім і плачу, і люблю!
Ты не хочаш дукатаў – не трэба!..
Узяці старца і гуслі жыўцом у зямлю!
Знае хай, хто тут пан: я – ці неба!

«Дарога ў Вязынку», 1972.
Антон Бархаткоў

XI

Падхапілі, ўзялі гусляра-старыка.
Гуслі разам яго самагуды:
Па-над бераг круты, дзе шумела рака,
Павялі, паняслі на загубу.

Месца выбралі здатнае, вырылі дол,
Дол тры сажні шырокі, глыбокі;
Закапалі, убілі асінавы кол,
Далі насып тры сажні высокі.

Не часалі дамоўкі яму сталяры,
Не заплакалі бліжнія вочы;
Змоўклі гуслі і ён з той пары – да пары;
Сум і сціша залеглі, як ночай.

Толькі князеўскі хорам гудзеў, не маўчаў:
Шалы, музыка ў тахт рагаталі;
Не адну віна бочку князь кончыў, пачаў:
Шлюб-вяселле ўсё княжны гулялі.

XII

Пацяклі, паплылі за гадамі гады...
На гусляравым наспе жвіровым
Палыны узышлі, вырас дуб малады,
Зашумеў непанятлівым словам.

Лет за сотню звёў час, ці і болей мо лет,
Зацвілі пераказы ў народзе;
Кажуць людзі: ў год раз ночкай з гуслямі дзед
З кургана, як снег, белы выходзе.

Гуслі строіць свае, струны звонка звіняць.
Жменяй водзіць па іх абамлелай,
І ўсё нешта пяе, што жывым не паняць,
І на месяц глядзіць, як сам, белы.

Кажуць, каб хто калі зразумеў голас той,
Не зазнаў бы ніколі ўжо гора...
Можна тут веру даць, толькі слухаць душой...
Курганы шмат чаго нам гавораць.

- у нябыт – у забыццё
- удзірванелы – пакрыты дзірваном, густа зарослы травою
- піліпаўка – час посту перад Ражджаством Хрыстовым
- думна – горда
- сонных вёсак шары – нерухомыя цені вёсак, якія паснулі
- амшалых – пакрытых мохам
- пакрыёма – употай
- бяседа – застолле
- садзіць на пасад – выдаваць замуж
- брыльянт – каштоўны камень
- саета – багатае адзенне з атласу і шоўку
- гусляр – чалавек, які іграе на гуслях, музычным інструменце
- ясакар – таполя
- каня – балотная чайка, крык якой нагадвае гукі піць-піць-піць
- магнат – памешчык, буйны землеўладальнік
- світка – вопратка, пашытая з даматканага сукна
- лунь – ястраб-мышалоў, у якога белае (светла-шэрае) апярэнне
- дукат – старажытная манета, сярэбраная, пазней залатая
- скурганіў – загубіў, умярцвіў
- сарачні – сорак саракоў – вельмі многа
- лёхі – склепы, падземныя памяшканні, сховішчы
- цемра сярмяжная – зняважлівая клічка бедных, непісьменных сялян, якія насілі даматканыя сярмягі (світкі)
- сажань – старажытная мера даўжыні, роўная прыблізна 2 м 13 см
- дамоўка – труна

1 Прачытай тэкст. Перакажы змест твора.

2 Ахарактарызуй гусляра. Звярні ўвагу на яго паводзіны ў панскім двары.

3 Прыгадай вядомыя табе літаратурныя творы, у якіх выступае постаць гусляра, дзеда-лірніка, бандурыста. Якую ролю адыгрывалі гэтыя людзі ў жыцці тагачаснага грамадства?

4 Звярні ўвагу на пачатак паэмы (ч. I і II) і яе заканчэнне. Параўнай з пачаткам і заканчэннем народных казак, легенд, паданняў.

5 У паэме паказаны ідэйны паядынак гусляра з усемагутным князем. Што прадстаўляюць абодва героі?

6 Выпішы з паэмы *Курган* эпітэты, выражаныя назоўнікам (тыпу: вяселле-разгул). Якое значэнне прыдаюць яны прадмету ці з'яве?

Янка Купала, 1913 год

Літаратурны музей Янкі Купалы ў Мінску

«Восень. Дача», 1910. Станіслаў Жукоўскі

Янка Купала

Паўлінка
Камедыя ў двух актах
(Скарочана)

Асобы
Сцяпан Крыніцкі – засцянковы шляхціц, 45 г.
Альжбета – яго жонка, 40 г.
Паўлінка – дачка Крыніцкіх, 19 г.
Пранцісь Пустарэвіч – сваяк Крыніцкіх, 50 г.
Агата – яго жонка, 43 г.
Якім Сарока – настаўнік, 25 г.
Адольф Быкоўскі, 24 г.
Госці, музыкі.

Рэч адбываецца да рэвалюцыі, у хаце Крыніцкіх.

Акт першы

Абшырная святліца. Направа ад публікі вокны ў сад, бліжэй да аркестра – стол; каля стала – лавы і табурэцікі, над сталом – вісячая недарагая лямпа, на сцяне – абразы. Налева – дзверы ў сенцы, бліжэй да аркестра – куфар. Напроці – сцяна і дзверы ў бакоўку (каморку); справа пры сцяне ад бакоўкі – ложак, засланы коўдрай, у галавах высока накладзена падушак; налева – у кутку – печ; на сцяне стрэльба, старасвецкі, з гірамі гадзіннік і некалькі тандэтных малюнкаў. Час – асенні вечар перад Пакровамі.

З'ява I

Паўлінка адна. Стройная і досыць прыгожая дзяўчынка. Адзеўшыся ў недарагую крамніну, але чысценька; без хусткі – у валасах колькі грабеньчыкаў. Сядзіць на ложку і пільна шые крамны кафтанік. Як падымаецца заслона – Паўлінка пяе.

П а ў л і н к а.

Ой, пайду я лугам, лугам,
Дзе мой мілы арэ плугам;
Ой, пайду я лугам, лугам!
Ён арэ поле валамі,
А я плачу ўсё слязамі;
Ён арэ поле валамі.

(Перастаўшы пець.) Э-э! штось не пяецца сягоння. Неяк сэрцайка трасецца, як бы хто яго знячэўку перапужаў. А мо гэта песня вінавата? Даліпантачкі, аніяк не магу сама з сабой да ладу прыйсці. Ану, на шчасце зачну другую. Якую ж бы тут? Ага!.. *(Пяе.)*

Дый чаго ж ты, дуб зялёны,
Пахінаешся?
Дый чаго ж ты, мой міленькі,
Задумляешся?

(Пеючы, падыходзіць да акна і паглядае, пасля зноў садзіцца.)

А ўсё-такі нешта нецікава на сэрцы. І чаго яму, бедненькаму, не стае? Піць і есці, дзякаваць Богу, хватае, часам татка дае грошы і на сукенкі... Чаго, чаго, здаецца, тут хацець?.. Ох, ох, як жа маркотненька! Проста хоць збірай манаткі ды йдзі ўпрочкі з хаткі. Ужо вечарэе: зараз не будзе як шыць, а трэба сягоння канешне кончыць. Заўтра Пакровы... у Міхалішках кірмаш... Эх, эх, каб хаця той прыйшоў, каго так хочацца сягоння пабачыць. *(Садзіцца пры акне і пачынае зноў, шыючы, пець.)*

Ой, ляцелі гусі дый з-пад Беларусі,
Селі яны, палі на сівым Дунаі!

Селі яны, палі, ваду замуцілі
Дый нас, маладзенькіх, з сабой разлучылі.

Бадай тыя гусі марне запрапалі,
Як мы любіліся – цяпер перасталі.

(Паглядзеўшы ў акно.)

Ну, ужо зусім няма як без агню шыць! Зараз трэба запаліць лямпу. Цямнее і цямнее, ночка набліжаецца, а яго як няма, так няма! А шчыра абяцаўся, шэльма, напэўна прыйсці. *(Шукае запалак і запальвае лямпу.)* І што гэты тата да яго мае. З таго часу як даведаўся, што ён на мяне мілым вокам паглядае, усё роўна як чорная кошка між імі перабегла. Ён-то нічога, але тата – дык жыўцом бы яго з'еў. Ну, але тата сваё, Якім сваё, а я – сваё. Паглядзім, чый верх будзе: таткаў, ці мой, ці яго? *(Падумаўшы.)* Казаў, прыйдзе сягоння, каб там і ліха гарэла. «Трэба, кажа, сякую ці такую зрабіць пастанову. Мы, кажа, не дзеці – маем свой розум і можам сабой пакіравацца. Толькі ты, кажа, Паўлінка, павінна на гэта прыстаць канешне, бо іначай, кажа, згінем, як рудыя мышы...» *(Ускочыўшы.)* Ай! нехта ідзе. Ён, ён, напэўна ён!

З'ява II

Паўлінка, Якім.

Я к і м. Вось і я – як тут быў! Добры вечар ясне-пекнай панне Паўлінцы. Што, золатца маё ненагляднае, прачакалася трохі мяне, ненавісніка? *(Глянуўшы на бакі.)* А ці нікога няма? *(Гаворачы, набліжаецца да Паўлінкі, вітаецца і хоча абняць яе.)*

П а ў л і н к а *(баронячыся)*. Ой, ой! памалу! Усе дома, усе дома. Толькі ў Якіма не ўсе дома, бо поначы ходзіць да маладых дзяўчат. Дадуць, дадуць зараз пытлю старыя. *(Тупаючы нагой.)* Пазваленне ёсць гэтак позна прыходзіць?

Я к і м *(садзячыся)*. Ёсць, ёсць, мая ты сакатушка, шчабятушка! Кажы толькі хутчэй, галубка мая бяскрылая: тата твой дома ці не? Бо ж сама ведаеш, якая ў нас з ім страшэнная любасць...

П а ў л і н к а *(садзячыся за шыццё)*. Ой, чаму ж не ведаю: як між катом і сабакам якраз. Але, але смела будзь, як у Бога пад прыпечкам. Паехалі абое на торг і, пэўна, позна вернуцца, бо маюць трохі сяго-таго да прадання і маняцца сякія-такія зрабіць пакупкі. Бачыш, заўтра мае быць трохі гасцей з кірмашу. *(Абнімае Якіма, раптам знаходзіць у кішэні кнігу.)* А гэта што? *(Чытае няўмела першыя радкі з «Песні аб Сокале» М. Горкага. Потым ён забірае ў яе кнігу і сам чытае.)*

Я к і м. Та-а-к! Значыцца, тым кшталтам, вечарынка будзе.

П а ў л і н к а. Так, так! Вечарынка быць-то будзе, але не ўсе на ёй будуць.

Я к і м. Эх, Паўлінка! Ты ўсё сваё; мне і так горка на душы, як бы хто там палын засеяў, а ты яшчэ прытычкамі сваімі соліш. Вазьму на злосць ды прыйду. Што ж яны са мною зробяць?

П а ў л і н к а. Зрабіць-то нічога не зробяць, але і ты сам нічога не зробіш, а толькі пераробіш...

Я к і м *(робячы папяросу)*. Ці ясне-панна Паўлінка пазволіць мне закурыць пры ёй?

П а ў л і н к а. Ого, скуль такая далікатнасць? Рукам каля дзяўчыны дае волю без пытання, а як папяроску закурыць, дык пазвалення просіць. Не пазваляю затое, вось і ўсё тут!

Я к і м. А я закуру.

П а ў л і н к а. А я не дам!

Кідае шыццё і хоча адабраць папяросу. Нейкі час тузаюцца, бегаюць адно за адным па хаце і няўмысля раскідаюць на ложку падушкі.

Я к і м *(бегаючы)*. Ну, ужо годзе, годзе, Паўлінка! Болей нічому без твайго пазвалення даваць волі не буду.

П а ў л і н к а. Ну, калі так, то згода!

Садзяцца. Якім курыць. Паўлінка шые.

Я к і м *(памаўчаўшы)*. Паўлінка!

П а ў л і н к а. Га! Ці пан Якім забыўся, як я завуся?

Я к і м. Ды не! Я хацеў бы, золатца, сур'ёзна з табой пагаварыць.

П а ў л і н к а. І-і!!! Ведаю я гэтыя сур'ёзнасці. Перш-наперш будзе, ці я люблю, пасля – ці вельмі моцна, а пасля – ці гатова ўсё чысценька зрабіць, што чарнабрывы Якім захоча, а там, а там... і паехала, як на непадмазаных калёсах... Ці ж не праўда?

Я к і м. Праўда-то праўда, але ўсяму мусіць быць канец.

П а ў л і н к а. Ну, дык слухаем, вашэці. А вось, можа, і новую песеньку нам спяіцё. Адно толькі за ўмовай: або надта вясёлую-вясёлую, каб аж лявоніху захацелася ісці, або такую сумна-сумненькую, што, выслухаўшы яе, – раз, два ды бухтыль у вір галавою! вось так!

Паказвае і чуць не валіцца; Якім падхоплівае і садзіць яе на лаве.

Я к і м. Гэта будзе ад цябе, маё ты сонейка, залежаць. Як захочаш – такая і песенька выйдзе: або вясёлая, радасная, як бы самое неба яснае, або сумная, гаротная, як асеннія хмары над гэтай зямелькай чорнай. (*Памаўчаўшы.*) Эх, эх! І дакуль жа ўсё гэта будзе цягнуцца? Дакуль, як сухавей, сушыць і мучыць нас будзе?

П а ў л і н к а *(жартаўліва)*. Толькі не нас, а мяне, трэба гаварыць. Мне дужа добра, весела і так лёганька, лёганька на сэрцы, што...

Я к і м *(з дакорам)*. Паўлінка!

П а ў л і н к а *(закрываючы губы рукой)*. Ну, ну, ужо маўчу... як нямая рыба.

Я к і м *(як бы сам да сябе)*. Калі, калі ўжо надойдзе тая часінка, што нас злучыць навекі, і мы ўжо ніколі не расстанемся? Калі? Калі?..

П а ў л і н к а. Ха-ха-ха! На святое ніколі. Вельмі ўжо татка мой заеўся на цябе з таго часу, як даведаўся, што мы з табой злюбіліся. Ну, а без таты гэты інтэрас наладзіць будзе вельмі трудна.

Я к і м. Трудна-то яно трудна, але няма таго злога, каб не выйшла на добрае. Хоць бы, прымерам, мы з табой так зрабілі: выбраўшы падхадзячую часіну, калі стары будзе не ў злосці, узяліся з табой за рукі, падышлі да яго, укленчылі і сказалі: так і так, наш добры бацечка, – я люблю Паўлінку, а я люблю Якімку – вельмі-вельмі моцна, так, што і жыцця нам аднаму без аднаго нямашака, ну дык супакойце нашы сэрцайкі, дайце нам пазваленне ўзяць ды пажаніціся.

П а ў л і н к а. Э-э!!! Не туды, мой дурненькі Якімка, паехаў! Уедзеш гэтак у нерат, што ні ўзад ні ўперад. Каб гэта яшчэ толькі з мамкай, то яно сяк-так, як табе не раз я і казала, але са старым дык чыстая бяда, настаяшчае гора. Хоць ты яму кол на галаве чашы, дык нічога не выдзеўбеш. «На парог, кажа, каб і не важыўся паказвацца; мазгаўню, кажа, гаду пашчапаю!» Вось і рабі з ім, што хочаш! Каб мог, дык на першай асіне павесіў быў цябе. Ну, і дзе ж у такім разе набрацца смеласці, ісці кленчыць перад ім і прасіць пазвалення?.. Задасць такога пытлю і табе і мне разам, што і жаніцьба ў галаву не палезе.

Я к і м. Так-то яно так! Але я неяк усё яшчэ надзеі не трачу – ану ж адпусціцца. Быў жа такі час, што мяне любіў ды нават у бядзе то тады, то сяды памагаў.

П а ў л і н к а. Быў час, але вадою сплыў. Памагаў, пакуль не ўбачыў, што трэба і дачкою памагчы, а як да гэтага стала даходзіць, вось у ім і адазвалася шляхоцкая фанабэрыя. Другую песню цяпер пяе. Нож точыць... востра нож точыць родны мой татка на таго, каго сам калісь любіў і каго я палюбіла... *(Устаючы, горача.)* І на векі вечныя любіць буду.

Ідзе і папраўляе падушкі, за ёй – Якім, абнімае яе, і садзяцца, абняўшыся, на ложку.

Я к і м *(памаўчаўшы, ласкава)*. Паўлінка!

П а ў л і н к а *(смеючыся)*. Ізноў забыўся, як завуся?

Я к і м. А ты ізноў сваё... Слухай, міленькая: ці ты надумалася зрабіць тое, аб што я цябе надовічы прасіў і маліў? Сама ж ты, золатца, казала мне не раз і цяпер кажаш, што татка твой ні на якія просьбы не згодзіцца. Значыцца, сама добра разумееш, што іншага выхаду для нас нямашака. А гэтак, як я казаў, будзе найлепей. Ці то мы будзем першыя або апошнія? Янка Лукашонак з сваёй Зосяй так зрабілі, Ігнась Манякоўскі з сваёй Дамінісяй, ды

і шмат хто... Бацькі спачатку пазлуюць, пазлуюць трохі і адпусцяцца, – ведама, бацькаўскае сэрца. Вось мы з табой, міленькая, такім парадкам самі сабе шчасце збудуем і нічыёй ласкі прасіць не будзем. Адно, абы твая згода – і ўсё будзе добра. Я ўжо, прызнацца табе, гаварыў з папом. Ён заўтра прыязджае ў Міхалішкі імшу адпраўляць і заначуе ў ваколіцы. Ну, а мы к яму... раз, два і – гатова.

П а ў л і н к а. Думаць-то я думала, але неяк страшна. Можа б было лепей, каб яшчэ трохі пачакаць, а то так скора, раптам... Хто спяшыць, той людзей смяшыць.

Я к і м. Якая ты нядобрая, Паўлінка! Ты зараз – страшна, страшна, пачакаць, пачакаць! Гэтак і ўсю сваю моладасць пачаканкамі перачакаем. А так гэта дачэснае жыццё можна добра наладзіць, так добра, абы толькі ахвота ў нас была ды вытрываласць.

П а ў л і н к а. А што, калі зловяць? Гэта ж я не выжыву з сораму, людзі вочы выберуць, нельга будзе на свет паказацца. Цяпер і то колькі ўсякай брыды ўслужлівыя суседзі і суседкі на нас вернуць, а што і гаварыць тады, як нам гэта «бог наш уцечка» не ўдасца.

Я к і м. Не бойся, золатца, не зловяць! Усё пойдзе гладка. Заўтра ў вас вечарынка; пасля вечарынкі ўсе будуць спаць моцна, так, што хоць з гарматаў страляй – нічога не пачуюць. Я ўсё акуратна прыгатую, ты толькі звяжаш у клумак што патрэбнейшае, а там праз момант – і ты мая на векі вечныя.

П а ў л і н к а *(нібы са злосцю)*. Не я твая, а ты мой на векі вечныя!

Я к і м. Ну, хай будзе, як Сора казала; але гэта толькі тады ў нас выйдзе, калі ты прыстанеш на тое, аб што я цябе прасіў і прашу.

П а ў л і н к а *(падумаўшы, смеючыся)*. Ну, згода да... заўтрашняга дня, а там пабачым.

Я к і м *(павесялеўшы)*. І даўно ўжо трэ было гэтак сказаць, мая ты кветачка майская. Заўтра вечарам, як толькі ўсе паўкладаюцца, – я ўжо ў садзе пад акном буду на цябе чакаць. Ты аконца адчыніш, лахі пад пахі ды скакель з хаты ў сад, як пятух!

П а ў л і н к а. Гэта ты, як пятух, а я, як...

Я к і м *(перапыняючы)*. Як курыца.

П а ў л і н к а. Не курыца, а як зязюлька.

Я к і м. Як зязюлька праз акно фырр! а пятух цап, а поп крапілам пырсь! а там...

П а ў л і н к а *(смеючыся)*. А там ізноў фырр!..

Размахвае рукамі і хоча вырвацца. Якім мацней прыціскае яе к сабе і хоча пацалаваць; яна нібы бароніцца, а пасля хватае яго за шыю, і доўга горача цалуюцца.

Я к і м. Ох, каб гэтак усё жыццё і кожную мінутку.

П а ў л і н к а. Ого! Разласаваўся!.. Аскому нагоніш, пакуль ахвоту спагоніш. *(Прыслухаўшыся.)* Ой, недзе туркоча! Ці не едуць толькі нашы з торгу!

Я к і м *(прыслухаўшыся)*. Такі ж нехта едзе!

П а ў л і н к а *(сумна)*. Значыцца, Якімка, трэба ўжо табе рабіць фырр!

Я к і м *(устаючы, з уздохам)*. Нічога не парадзіш – трэба!.. Ой, гэтыя бацькі! І чаму гэта не родзяцца на свет дочкі без бацькоў!..

П а ў л і н к а *(устаючы)*. Ах, чуць не забылася. Ці прынёс мне тое, што абяцаўся?

Я к і м. А як жа, прынёс, маё ты золатца. *(Дастае з кішэні фатаграфію і аддае Паўлінцы.)*

П а ў л і н к а *(прыглядаючыся да фатаграфіі, весела)*. Вось так добра! Заместа аднаго маю ўжо двух: аднаго, што сам ходзіць да дзяўчат і рукам волю дае, а другога, што трэба насіць за... пазухай. *(Смяецца.)*

Я к і м *(любуецца ёю, хватае і цалуе)*. Ах ты, зязюлька мая ненаглядная!

П а ў л і н к а *(баронячыся)*. Ну, ну, петушок! Не гарачыся: паспееш з козамі на торг. *(Выпіхаючы Якіма з хаты.)* Марш дадому! Раз, два, тры!..

Я к і м *(у дзвярах)*. Помні, Паўлінка, – заўтра!.. *(Выходзіць.)*

(...)

- задасць пытлю – дасць востры супраціў
- бухтыль у вір галавою – утапіцца, закончыць жыццё самагубствам

❖ Камедыя шчодра аздоблена нацыянальным каларытам, народным гумарам ды своеасаблівымі прыкметамі беларускай рэчаіснасці пачатку мінулага стагоддзя. Галоўная гераіня, Паўлінка, разумная, дасціпная, і вострая на язык. Гэтая вольналюбівая, і здольная пастаяць за сябе і за сваё каханне дзяўчына ідзе ў жыццё самастойнай дарогай. Яна закахалася ў мясцовага настаўніка Якіма Сароку, вобраз якога ўвасабляе новыя павевы ў жыцці вёскі. Яе прываблівае тое святло новых ідэй, якія ён нясе.

Падзеі ў п'есе адбываюцца ў хаце Крыніцкіх у два восеньскія вечары. У першы з іх Паўлінка, пакуль не вярнуліся з рынку яе бацькі, Сцяпан і Альжбета Крыніцкія, сустракаецца са сваім каханым, настаўнікам Якімам Сарокам. Пасля іх вяртання неўзабаве ў хату з'аяўляюцца: сваяк Пранцысь Пустарэвіч з жонкай Агатай, якія прымаюць актыўны ўдзел у падзеях. Назаўтра, пасля кірмашу, у Крыніцкіх ладзіцца вечарынка. Акрамя Пустарэвічаў, сюды прыходзіць фанабэрлівы шляхцюк Адольф Быкоўскі, што збіраецца сватацца да Паўлінкі, і іншыя госці.

У цэнтры падзей – Паўлінка. На шляху закаханых, Паўлінкі і Якіма, стаяць патрыярхальныя, кансерватыўныя сілы. І хоць нялёгка Паўлінцы процістаяць гэтым звычаям і традыцыям, тым болей, што носьбітамі іх з'яўляюцца яе бацькі, блізкія ёй людзі, дзяўчына знаходзіць у сабе сілы, каб не падпарадкавацца волі бацькоў. У фінале п'есы, які гучыць драматычна (настаўніка Якіма Сароку арыштавалі па

даносе Сцяпана Крыніцкага), Паўлінка называе бацьку і такіх, як Пустарэвіч, «звярамі сляпымі».

паводле Анатоля Сабалеўскага

❖ У камедыі Я. Купалы *Паўлінка* (1912) вырашаецца традыцыйны для тагачаснай драматургіі матыў выкрыцця шляхецкай ганарлівасці, абмежаванасці і пыхлівасці. Дзеянне разгортваецца вакол дачкі Сцяпана Крыніцкага Паўлінкі, вясковага настаўніка Якіма Сарокі і пыхлівага шляхціца Адольфа Быкоўскага. Паўлінка і Якім – прадстаўнікі маладога пакалення – увасабляюць лепшыя яго рысы і імкненні да новага ладу жыцця. Вобраз Паўлінкі некаторыя даследчыкі творчасці Янкі Купалы спалучаюць з абліччам маладой Беларусі.

1 Перакажы змест камедыі *Паўлінка*.

2 Якімі рысамі характару надзелена Паўлінка?

3 Выпішы з тэксту прыказкі, прымаўкі і параўнанні. З якой мэтай выкарыстоўвае іх аўтар камедыі?

4 Параўнай вобразы Паўлінкі і Марысі – гераіні камедыі В. Дуніна-Марцінкевіча *Пінская шляхта*.

Янка Купала

Незалежнасць

Калі гаварыць аб незалежнасці якой-небудзь новай дзяржавы, вызваленай вайной і рэвалюцыяй з-пад расійскага ярма, то гэта, здаецца, так і трэба, так і павінна быць. Незалежная Польшча, Літва, Украіна, Латвія і г.д. – усе яны маюць права на гэта, усіх іх можна прызнаць, нават можна і дапамагаць ці то фізічна, ці маральна, і незалежнасць гэтых дзяржаў не выклікае ніякіх спрэчак. Так ці іначай яны мусяць, яны будуць мець раней ці пазней сваё дзяржаўнае незалежнае існаванне.

А вось загаварыце вы аб беларускай незалежнасці… Тут вам цэлую кучу нагавораць усялякіх перашкод, недарэчнасцяў, што аж вушы вянуць слухаючы. На ўсякую іншую незалежнасць кожны з вамі згодзіцца, абы толькі не на беларускую.

Чаму ж гэта так?

Беларускі народ самабытны – гэта прызнаюць ужо нават і нашы праціўнікі з польскага і расійскага лагеру. Беларуская дзяржаўнасць таксама мае сваю гісторыю – маю тут на ўвазе Вялікае Літоўска-Беларускае княства. Геаграфічнае палажэнне Беларусі таксама не горшае, як у людзей, ну хоць бы як палажэнне Швейцарыі. Мы крыху адсунуты ад мора, але і Швейцарыя не мае мора. Дык чаму так страшна наша незалежнасць?

А гэта вось чаму.

Наша незалежнасць соллю ў вочы для незалежнасці нашых суседак – Польшчы і Расіі, бо адна і другая хацелі б нашу незалежнасць утапіць у лыжцы вады сваёй незалежнасці.

Для адбудавання вялікай Польшчы «ад мора да мора» трэба пераступіць Беларусь; для адбудавання вялікай Расіі ад Белага да Чорнага мора таксама трэба растаптаць Беларусь.

Вось і выходзе, што трэба Беларусь выкінуць з гісторыі, з геаграфіі, і наогул калі не цалкам прылучыць яе к адной з суседніх дзяржаў, то разрэзаць напалавіну, але так зрабіць, каб яе не было і звання.

А Беларусь, як і кожная іншая дзяржава, мае права і даб'ецца раней ці пазней гэтага права стаць роўнай і вольнай дзяржавай паміж сваімі суседзямі.

Што яна павінна стацца, за гэта гавораць яе мінуўшчына, яе цяпершчына.

Нікому не сакрэт, што жыць на свеце беларусам было і ёсць найцяжэй, як усім іншым народам, і ўсё дзякуючы няшчаснай залежнасці ад нашых мацнейшых суседзяў. Але разбяром па парадку.

Пасля уніі з Польшчай Вялікага Літоўска-Беларускага княства, калі беларуская культура высока трымала свой сцяг у родным краі, – гэта культура пачала выціскацца польскім панаваннем. Беларускае баярства, за польскія шляхецкія значкі і цёплыя каля трона месцы, пачало выракацца ўсяго роднага, беларускага і перакульвацца на старану чужую, польскую. Забылася баярства на звычай і абычай беларускі, на сваю гісторыю, мову, літаратуру. Дзе больш званілі золатам, там вышэйшыя станы тагачаснага грамадства і служылі, і прадавалі сябе, свой народ, сваю Бацькаўшчыну.

Так было і так ёсць заўсёды. Вышэйшыя, багацейшыя станы грамадства за бліск золата ідуць к чужым, пакідаючы сваіх брацціяў слабейшых на здзек і паняверку.

І зрабілася на Беларусі пасля уніі з Польшчай тое, чаго і трэ было чакаць.

Масы, народ земляробны, асталіся беларусамі, а іх баярства, вышэйшыя станы сталіся палякамі. Такім чынам, двор сам па сабе як бы аддзяліўся ад вёскі. Беларускі пан зрабіўся чужым для беларускага селяніна. Беларускае баярства сталася чужацкім на сваёй беларускай зямлі. Тыя самыя людзі, толькі багацейшыя і бяднейшыя, пачалі гаварыць рознымі языкамі, і сягодня яны паміж сабой нічога супольнага не маюць. Двор глядзіць на селяніна, як на «люд рускі», як на быдла, над якім можна толькі стаяць з бізуном эканомскім, а вёска глядзіць на пана, як на прыблуду з чужацкай стараны, які захапіў яго, селяніна, зямлю ды йшчэ здзекуецца над ім самім.

Пасля уніі з Польшчай прыйшла на Беларусь апека маскоўская. Цары нагналі ўсялякіх чыноў, запрудзілі край усялякай маскоўскай чорнай галатнёй, якая тут толькі аб адным дбала, каб як цяплей пагрэць рукі ды захапіць «маёнтак». Але аб беларусу-селяніне, аб беларусу-грамадзяніне ніхто і не падумаў.

Прыбыла толькі к польска-панскаму бізуну чыноўніцка-жандармская нагайка.

Залежнасць ад Польшчы змянілася залежнасцяй ад Масквы, а на лепшае нічога не змянілася. Маскоўскі чыноўнік, таксама, як польскі пан, глядзеў на беларуса, як на «скот» (той – як на «быдла»). І ніхто з гэтых апекуноў нават пальцам не кіўнуў у той бок, каб палепшыць жыццё беларуса, каб падбаць аб яго родным краі.

І адны, і другія глядзелі скоса на беларуса, глядзелі то як на «крэсы», то як на «окраіну», і больш нічога. А беларус стагнаў і стагнаў. З гэтага мы бачым, бачым з практыкі, вынесенай на сваёй скуры, што залежнасць дзяржаўная, ад каго б ні было, бокам залежнаму народу вылазіць.

І вось толькі адна поўная дзяржаўная незалежнасць можа даць і праўдзівую свабоду, і багатае існаванне, і добрую славу нашаму народу. […]

1 На аснове артыкула Янкі Купалы прадстаў свае погляды на тэму незалежнасці Беларусі. Напішы на гэтую тэму выказванне (мінімум 150 слоў).

2 Якімі жанрамі літаратурнай творчасці карыстаўся Янка Купала?

3 Чаму Янку Купалу называюць класікам беларускай літаратуры?

Фрагмент экспазіцыі ў Літаратурным музеі Янкі Купалы ў Мінску

Яхімоўшчына, адно з месцаў пражывання Янкі Купалы

4 У 1982 г. у Беларусі і па рашэнні ЮНЕСКА ва ўсім свеце ўрачыста святкавалі 100-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы. З гэтай нагоды Ніл Гілевіч выступіў з нарысам *Наш Купала*. Прачытай фрагмент гэтага тэксту. Звярні ўвагу на дадзеныя ў ім віды, жанры і формы літаратурных твораў.

Наш Купала
(Фрагмент)

[...] Мы святкуем свята паэта незвычайнай, невычэрпнай і нястомнай творчай энергіі і сілы, паэта, шматгранны талент якога знаходзіў аднолькава бліскучае выяўленне ў самых розных лірычных, эпічных і драматычных жанрах і формах, якому былі аднолькава падуладныя песня і гімн, элегія і ода, байка і эпіграма, балада і паэма, якому аднолькава паслухмяна служылі сатыра і гумар, іронія і сарказм, вобраз канкрэтна-рэалістычны і ўмоўна-сімвалічны, гіпербала і метафара і, бадай што, усе вядомыя паэзіі прыёмы і сродкі мастацкага пісьма. Мы святкуем свята паэта, які паказаў такія вобразна творчыя магчымасці роднага беларускага слова, такія рытміка-выяўленчыя магчымасці беларускага верша, якіх ніхто – ні да яго, ні пасля яго – паказаць не змог. У яго вершах і паэмах віравала, бушавала і кіпела такая магутная, падуладная яму стыхія жывой народнай мовы, якая захапляла, захапляе і будзе захапляць любога, хто да яе наблізіцца, хто паспрабуе ўвайсці ў яе магічна-чароўны, створаны сіламі ягонай душы і сэрца свет.

Мы святкуем дзень нараджэння паэта, які даў нам, сваім нашчадкам, непераўзыдзены прыклад жыватворнай сувязі з народна-паэтычнымі каранямі і вытокамі, узор у найвышэйшай ступені плённага выкарыстання фальклорных багацццяў народа. Старажытны міф і павер'е, казка і легенда, паданне і быліна, песня і прыпеўка, прымхліца і замова, прыказка і прымаўка – усё, усё гэта дзейна і ўпэўнена клалася ў падмурак яго паэтычных збудаванняў, усё давала яго творчасці форму і змест, матыў і вобраз, усё служыла яму тым зернем, з якога прарасталі на радасць людзям цудоўныя кветы паэзіі. […]

Ніл Гілевіч

Якуб Колас, 1924

Якуб Колас (1882-1956)

Якуб Колас (сапр. **Канстанцін Міцкевіч**), народны паэт Беларусі, класік літаратуры, стваральнік паэтычнага эпасу пра беларусаў. Нарадзіўся ў сям'і лесніка ў засценку Акінчыцы. З маленства разам з бацькамі пераязджаў з адной леснічоўкі ў другую. Жыццё ў маляўнічым Панямонні рана абудзіла ў яго любоў да прыроды, да роднай зямлі. Закончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Працаваў у школах Палесся і Міншчыны. За ўдзел у настаўніцкім нелегальным з'ездзе Якуба Коласа звольнілі з пасады настаўніка, а пазней асудзілі на 3 гады турэмнага зняволення (1908-1911). Пасля вызвалення з турмы настаўнічаў на Піншчыне. Супрацоўнічаў з рэдакцыяй «Нашай нівы». У 1918-1921 гады працаваў настаўнікам, школьным інспектарам. Потым выкладаў у Беларускім педагагічным тэхнікуме і Беларускім дзяржаўным універсітэце, працаваў у Навукова-тэрміналагічнай камісіі ў Народным камітэце асветы, удзельнічаў у стварэнні Інстытута беларускай культуры. Быў віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук Беларусі.

Шматлікія кнігі яго паэзіі *(Песні-жальбы*, *Водгулле*), прозы (*Апавяданні*, *Родныя з'явы*), яго паэмы (*Новая зямля*, *Сымон-музыка*), славутыя *Казкі жыцця* і палескія аповесці, якія ўвайшлі ў трылогію *На ростанях*, прадстаўляюць панараму жыцця беларускага народа на розных этапах яго гісторыі.

З самага пачатку літаратурнай дзейнасці (дэбютаваў у 1906 г. у першым нумары газеты «Наша доля» вершам *Наш родны край*) Колас абвясціў сябе песняром вёскі, бацькоўскага краю. Тэма паказу сялянства і яго жыцця была вядучай у творчасці паэта. Беднасць беларускіх вёсак, няўрадлівасць палеткаў і прыгнечанасць беларускага сялянства паказаў ён у вершах *Наш родны край*, *Вёска*. Побач з песнямі смутку і жальбы Колас пісаў закліковыя вершы (*Беларусам*, *Кіньце смутак*, *Не бядуй*, *Наша возьме*), у якіх стараўся пераканаць народ у тым, што далейшае існаванне пры такіх умовах немагчымае, што выхадам з такога становішча ёсць барацьба за змену дзяржаўнага ладу. Коласавы песні-жальбы часта мянялі танацыю і пераходзілі ў з'едлівую сатыру (*Канстытуцыя*, *Малебень*), а нават у гнеў і абурэнне (*Ворагам*, *Вобразы самаўладдзя*).

Асобнае месца ў лірыцы Якуба Коласа займаюць прыродаапісальныя вершы (*Першы гром*, *Ноч перад навальніцай*, *Хмаркі*), у якіх прадстаўляецца багацце беларускіх пейзажоў. У вершы *Родныя вобразы* лірычны герой стараецца

зразумець пачуцці, якія авалодваюць ім пры сутыкненні з навакольнай прыродай, з «мілымі вобразамі роднага краю». Яго радуюць «узгорачкі роднага поля, рэчкі, курганы, палі», але радасць гэтая зліваецца са смуткам, які паяўляецца пры ўспаміне «цягучай, пакутнай песні».

Надзвычай вобразна і поўна, прыгажосць роднага краю апісаў паэт у несмяротнай паэме *Новая зямля* (1911-1923). Беларуская прырода ў паэме прадстаўлена у самых разнастайных яе праявах ва ўсе поры года. Сам сюжэт паэмы пабудаваны ў адпаведнасці з земляробчым календаром – ад вясны да зімы. У гэтым гадавым цыкле паказана жыццё адной лесніковай сям'і, штодзённыя клопаты і мары паасобных яе членаў. На прыкладзе сям'і Міхала паэт паказаў жыццё і мары беззямельнага сялянства Беларусі.

У прозе Коласа (*Недаступны*, *Калодка пчол*, *Так і трэба ашуканцу*) «маленькі чалавек» добра ўсведамляе сваю годнасць, яго духоўны свет багаты. Ён умее разважаць, захапляцца і пакутаваць, усведамляе сваю чалавечую годнасць і актыўна пратэстуе супраць несправядлівасці (*Бунт*, *Нёманаў дар*, *Малады дубок*).

Якуб Колас цікавіўся і казачнай творчасцю народа. Жанр казкі быў цікавы яму сімвалічным сэнсам, прытчавай павучальнасцю, якую можна было прымяніць да розных сфер жыцця. У 1921 г. выйшаў зборнік *Казкі жыцця*. У алегарычнай форме казкі Колас імкнуўся перадаць свае погляды на гісторыю і жыццёвую філасофію беларусаў, ставіў пытанні адносна месца беларусаў сярод суседніх народаў.

Адным з першасных нацыянальных твораў, у якім ставілася пытанне беларускай інтэлігенцыі ў пачатку XX ст., была трылогія *На ростанях* (першая частка *У Палескай глушы* была апублікавана ў 1923 г., другая – *У глыбі Палесся* – у 1927, а трэцяя – *На ростанях* – у 1954 г.). Асноўнымі героямі трылогіі Коласа з'яўляюцца палескія сяляне і вясковая інтэлігенцыя. Ужо на першых старонках аповесці *У Палескай глушы*, чытач, разам з маладым настаўнікам Андрэем Лабановічам, знаёміцца з краявідамі і прыродай Палесся, з яго жыхарамі. Пачатковае ўражанне прыгнятае маладога настаўніка. Ён заўважае беднасць жыхароў

Якуб Колас з сынамі Юркам, Міхасём, Данілам і жонкай Марыяй Дзмітраўнай, 1928

Якуб Колас, 1953

Адзін з першых вершаў Якуба Коласа, 1898-1902



Мужикъ.

Колька муки, колька гора
Брацтъ мужикъ наша перанесъ!
Ды жыцце, жыцце! Якъ скора
Насъ даводишь ты да слезъ!
Працуваў мужикъ у пана
За той панщынай милей.
Ні зажыла ще тая рана;
Ды зажыць ще дуга ёй!
Бласнята видаць усюды:
Ўсъ адзеты ці въ грамасцъ;
Людзі ніякіе маруды;
Ня маюць видачнихъ страхъ.
Моць малитва ихъ святая
Дашла да Бога ці ўсюд,
Моць прійшла пара другая,
Святой волнасці пара,
Але все непока ціжыветъ;
Мінде ръ ліжынаю ядузъ.

вёскі Цельшына, агульны беспарадак і абыякавасць. Аднак пры бліжэйшым кантакце цёмныя, неадукаваныя палешукі (старожка Мар'я, дзед Мікодым, стары Мікіта і інш.) аказваюцца мудрымі, асцярожнымі і разважлівымі людзьмі, якія ў маральных адносінах стаяць вышэй за інтэлігенцыю.

Значнае месца ў трылогіі адвёў пісьменнік прадстаўнікам той часткі інтэлігенцыі, якая парвала ўсялякую сувязь з народам. Людзі гэтыя не цікавяцца справамі народа, жыццёвая філасофія іх заключаецца ў спакойным, сытым і ўтульным жыцці. Да ліку «мёртвых душ» залічае Колас амаль усіх прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі: выганаўскага пісара Дулебу, начальніка раз'езда Сухаварава, старшыню воласці Захара Лемеша, ляснічага Бяляўскага, а таксама настаўнікаў: Саханюка, Анцыпіка, Шырокага. Прадстаўнікам панямонскай інтэлігенцыі процістаўляе пісьменнік Андрэя Лабановіча і яго сяброў Алеся Садовіча і Янку Тукалу, якія не забылі пра свае карані, пра высокі маральны абавязак народнага настаўніка.

Родныя вобразы

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае,
Чым так прыкованы я?

К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя смутку і жальбы нядолі,
Поўныя смутнай красы?

Толькі я лягу і вочы закрыю,
Бачу я вас прад сабой.
Ціха праходзіце вы, як жывыя,
Ззяючы мілай красой.

Чуецца гоман мне спелае нівы,
Ціхая жальба палёў,
Лесу высокага шум-гул шчаслівы,
Песня магутных дубоў...

Вобразы мілыя, вобразы смутныя,
Родныя вёскі і люд,
Песні цягучыя, песні пакутныя!..
Бачу і чую вас тут.

❖ У гісторыю беларускай прозы, самабытнай з'явай увайшлі апавяданні Якуба Коласа, аб'яднаныя ў цыкл пад назвай *Казкі жыцця*, выдадзены ў 1921 годзе. Гэтыя творы сапраўды нечым нагадваюць казкі, нездарма Якуб Колас гаварыў, што вытокі іх трэба шукаць у беларускім фальклоры. Ва ўмовах жорсткіх закідаў і даносаў, Якуб Колас ў форме алегарычных казак вёў палеміку. Закранаў у іх пытанні нацыянальнай культуры, мовы, літаратуры і самога вызваленчага руху.

Кожная казка апавядае пра які-небудзь эпізод з жыцця людзей або прыроды. Аднак гэта толькі першы пласт твора. За ім ёсць другі – роздум пісьменніка пра складанасць жыцця, вытлумачэнне працэсаў, што адбываюцца ў чалавечым грамадстве. У цэнтры кожнай казкі – глыбокая думка, якая выказваецца ў алегарычнай форме. Як і ў народных казках, у творах Я. Коласа адбываюцца розныя фанта-

Дом-музей Якуба Коласа ў Мінску. Зверху салон і кабінет, знізу сталовая

стычныя здарэнні: жывёлы размаўляюць чалавечымі галасамі, дрэвы пераходзяць з месца на месца, прырода надзяляецца здольнасцю думаць і асэнсоўваць жыццё. Гэтыя казачныя ўмоўнасці пісьменнік па-майстэрску скарыстоўвае, каб раскрыць філасофскую думку. *Казкі жыцця* Якуба Коласа – гэта, па сутнасці, новы жанр у беларускай літаратуры. Яны як бы ўвабралі ў сябе фантастычнасць казкі, алегарычнасць байкі і філасофскую мудрасць прытчы. Гэта творы з паэтычнымі пейзажамі, жывымі дыялогамі, рознымі мастацкімі дэталямі, рэалістычнымі бытавымі сцэнамі.

Якуб Колас пачаў пісаць *Казкі жыцця* яшчэ да рэвалюцыі 1917 года і потым да канца свайго жыцця дадаваў да іх усё новыя і новыя творы.

паводле Васіля Старычонка

Адзінокае дрэва

Гэта было самае звычайнае Дрэва. А калі яно і зварачала на сябе ўвагу, то хіба толькі тым, што стаяла адзінока. Але той, хто праніклива чытаў кнігу прыроды і ўглыбляўся ў яе жыццё, яшчэ заўважыў бы, што гэтае Дрэва, апроч свае адзіноты, мела нешта чыста сваё асаблівае – тое, што належала толькі яму аднаму. Нават агульны выгляд яго твару – бо і дрэва мае свой воблік – меў характар цікавай асаблівасці. А як такіх шчырых і праніклівых знаўцаў або зусім не было, або было надта мала, то ніхто не зварочваў на яго ўвагі, і яно стаяла тут закіданае і крыху зняважанае людзьмі.

Спярша нават здавалася, што гэта закіданае адзінокае Дрэва стаяла з боку жыцця – больш гібела, чым жыло, а на праўду выходзіла, што яно жыло шмат паўней і глыбей пачувала жыццё нават ад тых дрэў, што раслі ў лесе. Такі ўжо характар адзіноты – гэта яе ўрода, яе істота. І хто хоча жыць паўнейшым жыццём і гастрэй пранікаць у яго тайны – глыбіні, той павінен быць адзінокім і незалежным.

Адзін толькі Вецер любіў часта варушыць лісцё гэтага Дрэва, гойдаць яго галінкі і шаптаць яму хітраслівыя напевы, толькі Вецер, – хоць і часта ён дзьме ў пустых галовах, – умее быць сталым, умее маўчаць. Праўда, крумкач-гарапашнік не адзін раз чуў тыя размовы-шэпты Ветра і Дрэва. Але крумкач залішне важны для таго, каб разносіць чужыя гутаркі па свеце, хіба так, знячэўку, прагаворыцца калі. Затое ж крумкач калі што скажа, то скажа праўду. Затым жа і вароны паважаюць яго, як біскупа.

Была тут яшчэ адна важная асоба, без якой не адбывалася ніводная тутэйшая справа. Асоба гэта – Ручаёк. І часта, бывала, ішла жывая гутарка між Ветрам, Дрэвам і Ручайком, а крумкач, начуючы тут, любіў паслухаць іх гаворку і сам нават устаўляў сваё мудрае слова.

А што было ўсяго найдзіўней, дык гэта тое, што як Вецер, так і Ручаёк крэпка палюбілі адзінокае Дрэва; па гэтай прычыне ніколі не было згоды між Ветрам і Ручайком. Кажу «палюбілі», бо іначай трудна назваць іх такую шчырую прыхільнасць.

Але трэба памятаць, што бадай не кожная рэч мае два бакі: паказны і праўдзівы. Можа гэта з паказнога боку здавалася, што Ручаёк з Ветрам моцна ўкахаліся ў Дрэва. Няхай аб гэтым судзяць мудрыя і кемныя людзі, а я толькі раскажу, як усё тут было.

Вясной і ўлетку часта-часта прылятаў Вецер да Дрэва, абымаў яго і сваімі пацалункамі асушаў роску з зялёнага лісця яго.

– Як я люблю цябе, маё ты мілае і прыгожае! – гаварыў Вецер. – Ты слухай толькі мяне і больш нікога, пакладзіся на маю свядомасць, на сілу маю, на маё моцнае каханне. Можа холадна табе? Я праганю хмары, ачышчу неба

«Цяпло зямлі», 1989. Леанід Шчамялёў

і скажу сонцу, каб грэла цябе. Люблю я дзетак тваіх, бо твае дзеткі – мае дзеткі.

І Вецер прынікаў да яго яшчэ цясней і абымаў яго моцна-моцна. Дрэва ўсё дрыжэла не то з радасці, не то ад трывогі і асыпала сваё насенне. Вецер падхопліваў яго і нёс далёка-далёка. За доўгія часы ён многа занёс у свет гэтага насення. З насення таго вырас цэлы лес, дзе і спачываў, калі было горача, гэты хітры і злы Вецер. Як толькі ён вывіхроўваўся ў свет, пачынаў балбатаць Ручаёк, цякучы каля саменькага карэння дрэва.

– Ведаеш, любачка, – журчэў Ручаёк, – мне здаецца, што гэта Вецер – фальшывы твой прыяцель. Языком ён намеле немаведама чаго: ён табе і хмары разгоніць, і сонцу прыкажа, – слухай яго толькі. А ўвосень вунь якія штукі выкідае! А зімою што робіць? Ты заміраеш на ўсю зіму, нічога не чуеш, што ён тут вытварае. А я хоць праз лёд, ды чую. Свістун! Не слухай ты яго! Дзе твае дзеткі? Усіх разагнаў ён, а ты адно стаіш тут, як сірата, і твае дзеці смяюцца з цябе, бо так панавучаў іх Вецер. Іншая справа – я. Перш-наперш мы суседзі, і ў нас многа супольнага, што трэба моцна трымацца адно другога, бо мы – дзеці зямлі.

Не скончыў Ручаёк гаварыць, бо наляцеў Вецер і сыпнуў са злосці ў Ручаёк цэлае воблака пылу.

– Высушу, як шкурат у Пятроўку, – пагразіў сярдзіты Вецер.

– Уй, шалахтун сусветны, – сказаў Ручаёк, пацямнеўшы ад пылу.

– Што?

– Шалахтун! шалахтун! шалахтун! – грымеў Ручаёк.

– Я цар усяго свету!

– Кажы гэта дурнейшым ад самога а не мне, валацуга! Ці ж можна табе верыць, калі ў цябе сем пятніц на тыдні!

Адным словам, угнявіўся Ручаёк ды цярпення не стала, і ён пацёк далей, бубнячы ўсю дарогу на Вецер: яму было крыўдна, бо Дрэва больш хілілася да Ветру, чым да яго. Чаму? Ручаёк ніяк не мог узяць гэтага на розум. Праўда, урэшце ён застанавіўся на думцы, што Вецер больш мае ўвагі ад Дрэва затым, што ён языком менціць і туды і сюды, не гаворыць праўды, а замазвае вочы рознымі байкамі.

Як бы там ні было, а гэта ніколечкі не цешыла Ручайка, і яму ад гэтага не было лягчэй.

А што думала само Дрэва?

Яно часта сумавала тут адно. Яму хацелася пабачыць сваіх дзетак, пагутарыць са сваімі роднымі, затым і выглядала яно такім задуменным і смутным.

За доўгія часы яно прывыкла да свае адзіноты і страх як любіла азіраць гэта жыццё, што кіпела ўвакол, і ўсе з'явы, якія вынікалі і на небе, і на зямлі. І бывалі ў яго такія моманты, калі нічога не думалася, было так лёгка і добра, і самі лісці яго ціха спявалі. Любіла яно паслухаць, што гаманіў непаседа-Вецер, таксама і Ручаёк любіла яно, толькі не ўмела сказаць, як яно любіць яго.

А Ручаёк палічыў гэта за пэўную няўвагу да свае асобы. Толькі ж раз паднялася навальніца. Хмары, як мухі над гаршком куцці, віліся чорным роем над зямлёю, апярэзваючы агністымі стужкамі і трасучыся магутнымі громамі. Страшна было. Але трэба было ўмяшацца тут Ветру, і цяпер ён з'явіўся такім, якім ён і ёсць па сваёй натуры: буянам і забіякам. Чуць-чуць стрывала беднае Дрэва – так ірваў і крышыў яго Вецер. Нават крумкач павінен быў моцна ўшчаміць кабдзюрамі галіну, каб не скінуцца.

– Здаецца, я табе не насенне з гэтага дрэва, што хочаш сарваць і мяне для свае забаўкі, – сярдзіта сказаў крумкач. Тут у Дрэва расчыніліся вочы; пазнала яно, які хітры і злы яго прыяцель.

Угнявіўся і Ручаёк. Ен надзьмуўся, насупіўся, пацямнеў і выліўся з берагоў, запенены ўвесь. Зняважаны Дрэвам, як здавалася яму, ён адышоўся далей.

І ўбачыла Дрэва, што сябры пакінулі яго. І яшчэ мацней зажурылася. Што рабіць?

– Пусці глыбей карэнні ў зямлю, – сказаў крумкач, мудрая галава, летучы на раздабыткі.

- жальба – смутак, туга
- цягучыя – працяглыя, запаволеныя, марудлівыя
- кабдзюр – кіпцюр, востры, загнуты рагавы прыдатак на пальцах птушак

1 Што з'яўляецца тэмай апавядання?

2 Наколькі закранутая тэма была актуальнай у час напісання твора ў 1912 г., а наколькі актуальная сёння?

3 *Адзінокае дрэва* – твор алегарычны. Якія чалавечыя якасці ўвасабляюць Дрэва, Вецер, Ручаёк?

4 У апавяданні *Адзінокае дрэва* даецца адказ, што рабіць чалавеку, якому здрадзілі сябры, як таму Дрэву, якое церпіць ад буянага Ветру і ад крыўдлівага Ручайка. Адшукай фрагмент тэксту, які пацвярджае гэтую думку.

5 Знайдзі ў тэксце элементы характэрныя для жанру казкі.

Пераказ – пісьмовая або вусная перадача сваімі словамі чаго-небудзь прачытанага або пачутага

Рэзюмэ – кароткі вывад са сказанага, пачутага

Апісанне – сачыненне, у якім што-небудзь апісваецца, паказаны падрабязнасці нейкага здарэння, дзеяння, характарыстыкі

Казка – апавядальны, народна-паэтычны твор пра выдуманых асоб і неймаверныя падзеі пераважна з удзелам чарадзейных, фантастычных сіл. Казкі з'яўляюцца алегарычнай формай выказвання. Народныя казкі паводле свайго зместу падзяляюцца на героіка-фантастычныя, сацыяльна-бытавыя і казкі пра жывёл

Прытча – твор павучальнага або сатырычнага характару, у якім у алегарычнай форме расказваецца пра чалавечае жыццё

Алегорыя – паэтычнае іншасказанне, у якім думка ці паняцце перадаецца шляхам абмалёўкі пэўных прадметаў, з'яў рэчаіснасці. Алегорыя блізкая да сімвала, які з'яўляецца ўмоўным вобразам і адрозніваецца шматзначнасцю, і ад метафары, у аснове якой тое ж перанясенне значэнняў на аснове падабенства, але ў адрозненне ад метафары ахоплівае не частку твора, а цэлы твор

Персаніфікацыя – разнавіднасць метафары, якая заключаецца ў наданні чалавечых уласцівасцей рэчам, прадметам, з'явам прыроды

Аналіз паэмы «Новая зямля» Якуба Коласа

Паэма Якуба Коласа *Новая зямля* гэта адзін з найбольш вартасных твораў у беларускай літаратуры. Аўтар пачаў працу над паэмай у 1910 г., а закончыў у 1923 г.

Можна сказаць, што ў гэтым творы прадстаўлена жыццё адной лесніковай сям'і, аднак у сапраўднасці ў паэме паказана, як жылі беларускія сяляне ў канцы XIX стагоддзя. Аўтар паказаў, як адносіліся да іх прадстаўнікі ўлады, якія былі ўмовы жыцця нябеднай усё такі сям'і. Галоўная праблема твора, гэта пошукі зямлі, якая для Міхала, галоўнага героя твора, у марах была сімвалам волі.

У сваёй аснове паэма *Новая зямля* аўтабіяграфічная. Многія героі маюць прататыпаў: Міхал – бацька паэта, Ганна – маці, Антось – дзядзька. Паэма не абмежавалася аўтабіяграфічным матэрыялам. Напісаная паэтам, які вырас у сялянскай сям'і, яна ўвабрала ў сябе ўсю мудрасць народа, яго думы і імкненні.

Галоўны герой паэмы – Міхал, які ўвасобіў у сабе спрадвечную мару ўсяго беларускага сялянства аб зямлі і волі. Паплечнікам у спраўджанні мары лесніка з'яўляецца Антось. У вобразе Антося паэт раскрыў здольнасць, працавітасць простага чалавека, сілу яго любові да роднай зямлі.

Антось, майстар на ўсе рукі, на яго плячах ляжыць увесь клопат аб гаспадарцы. Ён «рабіў за двух, на сваім карку цягнуў ярэмца хлебароба», усе свае сілы аддаваў сям'і брата. Антось, добра разбіраючыся ва ўсіх жыццёвых абставінах, разлічваў, як і Міхал, вызваліцца з «няволі цяжкай, з паланення» шляхам набыцця ўласнай зямлі.

У *Новай зямлі* нямала лірычных адступленняў, у якіх аўтар разважае аб вечных жыццёвых дарогах чалавека, яго прызначэнні на зямлі, жыцці і смерці. Мяккім сумам авеяны зварот паэта да дзён свайго маленства і юнацтва.

Асаблівай сілай пачуцця вызначаюцца лірычныя адступленні, звернутыя да роднага краю:

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай.
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю.

У паэме паказаны ранняя беларуская вясна, летняя спёка, першыя дні восені, калі з палёў звезены хлеб, скошаны лугі, калі ў чырвань апрануты лес, а ў паветры носяцца ніці белай павуціны. Чытаючы паэму, мы можам уявіць усход сонца і летнюю раніцу, пачуць бусліны клёкат і спеў жаўрука, пабываць на квітнеючым лузе і пясчаным беразе. «Прырода... з людзьмі жыве супольна, згодна», – падкрэслівае гэту думку Я. Колас. Яна з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця чалавека, сугучная з яго пачуццямі і перажываннямі.

У лірычных адступленнях раскрываецца і вобраз паэта, адданага сына народа, які верыць, што «дарожанькі людскія, пуцінкі вузкія, крывыя» злучацца ў адзін прасторны шлях.

Новая зямля – энцыклапедыя жыцця беларускага сялянства ў дарэвалюцыйны час. Энцыклапедыяй называюць навуковае даведачнае выданне ў выглядзе слоўніка, дзе звычайна даюцца асноўныя звесткі па ўсіх або па асобных галінах ведаў. *Новую зямлю* Я. Коласа справядліва называюць энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства канца XIX – пачатку XX ст. І невыпадкова.

Паэма гэта вялікі эпічны твор аб гістарычным лёсе беларускага сялянства і пошуках ім шляхоў да светлай будучыні. Паэт расказвае аб усім, чым багата і цікава жыццё сялян: аб клопатах і занятках дарослых, аб забаўках дзяцей і іх вучобе, аб святочных днях і буднях, ясных летніх днях і ціхіх зімовых вечарах, калі дарослыя пры дзецях «пачнуць казаць свае ўспамінкі, вясці размовы пра старынкі».

Успомнім, напрыклад, раздзелы «Раніца ў нядзельку», «Падгляд пчол», дзе аўтар па-майстэрску апісвае святочную раніцу працоўнага селяніна і снеданне сям'і Міхала. Яда ў сялянскай хаце – цэлы абрад са строга ўстаноўленымі правіламі і парадкам. За сталом збіраліся абавязкова ўсе члены сям'і:

Чатыры хлопцы, тры дзяўчаці
Ды бацька з дзядзькам, трэцця маці...

Кожны меў сваё пастаяннае месца. На покуць звычайна саджалі пачэснага госця. Малыя дзеці, якія яшчэ не ведалі парадку, елі асобна. Там Юзік «пальцам поркаў страву і верашчакай мазаў лаву, а сёстры дужа сердавалі і за лоб Юзіка цягалі». За сталом жа, дзе сядзелі дарослыя, панавала цішыня і парадак, адчувалася павага да ўсяго таго, што знаходзілася на стале, як да здабытага цяжкай працай.

Добра ведаючы дзіцячую псіхалогію, Якуб Колас стварае непаўторныя і незабыўныя карціны жыцця сялянскіх дзяцей. Ён апісвае, як дзеці пачынаюць знаёміцца з навакольным светам, якую ролю ў іх жыцці адыгрывалі народныя звычаі і павер'і, што для малых значылі начныя страхі, здані, дзяды, мерцвякі і інш. Нямала радкоў прысвечана апісанню навучання дзяцей кніжнай мудрасці. Расказваючы пра «дарэктара» – хлапчука з суседняй вёскі, аўтар з гумарам апісвае ўсе цяжкасці авалодання ведамі: Уладзя (старэйшы брат) ніяк не мог навучыцца рашаць задачы, Алесь «ў законе божым, як у лесе, не цяміў хлопец нічагутка», Кастусь (сам Якуб Колас) – на «Верыі» сеў макам. З тым жа майстэрствам і вялікай любоўю расказвае Я. Колас пра дзіцячыя гульні, працу.

Працай былі запоўнены будні сялян. Працавалі і дарослыя, і дзеці: Міхал выконваў абавязкі лесніка, Антось «правіў гаспадарку», усю хатнюю работу выконвала Ганна – жонка Міхала. Якуб Колас паказвае працэс ворыва, сяўбы, жніва, малацьбы. У час жніва калектыўная праца становіцца крыніцай прыгожага, напаўняе душу сялян радасцю, прыносіць ім задавальненне. Паэт можа расказаць цэлую гісторыю пра стары дзедаў човен, пра тое, як трэба ўмела выбраць касу. Апісанне касьбы – гэта цэлы гімн у гонар чалавека працы. Касцы параўноўваюцца з «ваякамі», якія ідуць, «нібы ў атаку», то «грамадою, то шнурам цягнуць, чарадою, то паасобку, то па пары».

У паэме апісваюцца і прылады працы, створаныя ўмелымі рукамі (сярпок крывенькі, граблі, навой), і сялянская хата, гумно, павець. Якуб Колас ведае,

як звіваецца пчаліны рой і як яго трэба абіраць, як трэба слаць снапы на таку, каб было зручна малаціць. Аўтар услаўляе працоўную сілу народа, цяжкую сялянскую працу паказвае як штосьці велічнае і прыгожае, паэтызуе яе.

З энцыклапедычнай шырынёй апісвае Я. Колас усе звычаі і абрады, якія бытавалі ў той час на Беларусі. Гэта каляндарныя святы (куцця, вялікдзень, каляды), звычаі ўзаемадапамогі (талака, кумаванне), кірмашы, сходы. На першы дзень каляд, напрыклад, збіралі сена са стала і кармілі ім жывёлу, шукалі ў сене зярняткі і па іх гадалі, ці ўродзіцца хлеб. Каляндарныя святы – даніна даўнім традыцыям і звычаям, што звязаны са светам сялянскіх уяўленняў і прынцыпаў.

Па-энцыклапедычнаму шырока апісвае Якуб Колас сваю родную зямлю-маці. Апяваючы знаёмыя яму з дзяцінства мясціны, ён паказвае, наколькі прыгожая наша зямля і як многа хараства і паэзіі ў яе сціплых краявідах. Чаргуюцца дні і ночы, за зімамі ідуць вёсны, птушкі прылятаюць з выраю і зноў ляцяць у цёплыя краіны, ідуць дажджы, гуляюць завірухі, разліваюцца і замярзаюць рэкі – пра ўсё гэта расказваецца ў паэме.

У вобразах роднага краю Якуб Колас заўседы чэрпаў натхненне і сілу. Ды хараство роднай прыроды выклікала ў паэта не толькі радасць і захапленне, але і смутак. Яго сэрца баліць за бяспраўнага, прыгнечанага і зняважанага селяніна. З паэмы мы ўяўляем яго знешні выгляд, у што ён быў апрануты, што еў і піў, аб чым марыў, на што спадзяваўся і ў што верыў. Працоўнаму чалавеку, які паўстае ў паэме ва ўсёй велічы, аддае Якуб Колас усе свае сілы, сваю любоў і свой талент. Яму ён прысвячае і свой лепшы твор – паэму *Новая зямля*.

паводле Васіля Старычонка

Таіса Грамчанка

Змест «Новай зямлі» Якуба Коласа

Раздзел I «Леснікова пасада». Ён пачынаецца лірычным адступленнем, у якім аўтар гаворыць пра сваю любоў да малой радзімы. Далей ідзе апісанне прыроды, што акружае леснікову пасаду, і апісанне самой пасады. Аўтар у раздзеле неаднойчы падкрэслівае, што ён вяртаецца ў мінулае:

Мой родны кут, лугі, крыніца!
Цяпер для вас я – чужаніца.

Той самы лес, палеткі тыя,
Ды людзі там жывуць другія.
Мне душу смуткам напаўняе
Што ў прошласць канулі гадочкі...

Раздзел II «Раніца ў нядзельку». Пісьменнік паказвае летні святочны ранак. Гаспадар Міхал усёроўна ішоў у лес, дзядзька Антон, заўзяты рыбак, «хадзіў на Нёман ці на тоні». Уладзя пасвіў кароў, у маці было поўна клопату на гаспадарцы. Познім ранкам уся сям'я збіралася на сняданне.

Раздзел III «За сталом». Паказваецца, як праходзіў сняданак у сям'і, які парадак панаваў за сталом, хоць сямейка была не малая:

Чатыры хлопцы, тры дзяўчаці
Ды бацька з дзядзькам, трэцця маці;
І кожны месца сваё мае.

Калі сям'я паснедала, бацька распачаў гаворку, што за зямля прадаецца каля Заблоння.

Даўно ўжо бацька жыў думою
Разжыцца ўласнаю зямлёю
І не належаць ні да кога,
Не знаць начальства ніякога.

І зямля, і месца, як апісвае Міхал, цудоўныя. Міхал згадвае сваю службу, ліхога начальніка («Ці ж чалавек ён? азіят, душа зацятая, ліхая, такіх паноў і свет не знае»). Дзядзька Антось, маці добра разумеюць, «што тут жывеш да часу», што ў любы момант лесніка могуць адправіць у іншае месца, дзе трэба абжывацца наноў.

Раздзел IV «На першай гаспадарцы». Браты Антось і Міхал мяркуюць, дзе ўзяць грошы для пакупкі зямлі. Ганна, маці, выказвае сумненні («Няпэўна ўсё і невядома, дык больш пільнуйцеся вы дому!»). Антось прапаноўвае выбраць часіну і «агледзець... як мае быць Заблонне тое»).

Аўтар знаёміць з палясоўшчыкам Міхалам, якога «ўся воласць наша знала», нават сам князь «не раз з Міхалам меў размову». За верную службу ў вёсцы лесніка любілі мала.

Стары ляснічы па-сваему
Цаніў Міхала, як служаку:
Ганяў усюды небараку,
Як бы скаціну тую нему.

Міхал, ажаніўшыся, аддзяліўся ад бацькі і пайшоў на службу. Ляснічы выдзеліў месца Міхалавай сям'і «ў страшнай дзічы... дзе рос сівец ды пырнік густа». На дапамогу брату прыйшоў Антось, які ўзваліў на сябе амаль увесь сялянскі клопат. Праз нейкі час:

У тым кутку, глухім і дзікім,
Стараннем дзядзькавым вялікім
І цяжкай працай хлебароба
... Ўсё зацвіло, загаманіла...

Але праз пяць гадоў сям'і лесніка было прапанавана іншае месца.

Раздзел V «Пярэбары». Па вясне сям'я Міхала перабіраецца ў Парэчча. Там ляснічаму спатрэбіўся добры чалавек, «а не гультай які, нязграба». Дапамагаюць перавезці рэчы сваякі:

Ўсе варушыліся, снавалі,
Як бы мурашнік раскапалі –
Такая тут была трывога.

Раздзел VI «Каля зямлянкі».

На першы погляд нецікава
Парэчча тое выглядала...
Прыгрэбнік, хата – ўсё дачыста
Казала ясна, галасіста,
Аб непарадку, запусценні,
Аб гаспадарчым нерадзенні.

Зайшоўшы ў хату, Ганна залілася слязьмі: «Было так цёмна, непрытульна, ў гразі-балоце ўсё агульна». Аднак тыдні праз тры Парэчча быццам памаладзела, Новыя жыхары пачалі наводзіць парадак. Праз год «згарэла хата з варыўнёю і ўвесь набытак, што быў ў дому». На пажарышчы з'явілася зямлянка.

Раздзел VII «Дзядзька-кухар».

Прыхілен дзядзька быў да дзетак.
Ён быў настаўнікам, суддзёю...

Аўтар расказвае пра сяброўства лесніковых дзяцей з дзядзькам Антосем.

Усе гуртам ідуць у лес за бярозавікам. Дзядзька вырашыў здзівіць пляменнікаў новымі прысмакамі – клёцкамі з бярозавым сокам. Аднак нічога добрага ў дзядзькі-кухара не атрымалася.

Раздзел VIII «Смерць ляснічага».

Ксавэры прыносіць у зямлянку навіну, што памёр стары ляснічы. Міхал і аб'ездчык памінаюць ляснічага добрым словам:

Быў чалавек ён справядлівы,
Не фанабэрысты, праўдзівы!

Гадаючы, хто стане на месца ляснічага, Міхал упершыню падумаў – «купіць зямлю, прыдбаць свой кут, каб з панскіх выпутацца пут».

Усе леснікі сабраліся на панскім двары, каб выправіць у апошнюю дарогу ляснічага. Пасля пахавання трапілі ў карчму, да «цёткі» Хрумы.

Раздзел IX «Новы ляснічы». Антось арэ запушчанае ранейшым гаспадаром поле, будзіць пляменнікаў-пастушкоў, якіх маці пашкадавала падымаць з сонцам. Браты за снеданнем абмяркоўваюць кандыдатуру на пасаду ляснічага. Зноў гаворка пераходзіць да набалелага: «Дабра ніколі не прыдбаем, пакуль свайго кутка не маем», – упэўнены Міхал. Антось і Ганна разважаюць практычна: «Тут грошай трэба поўна жменя – не наша голая кішэня».

Сям'я перабіраецца з зямлянкі ў новую хату. Становіцца вядомым, што ляснічым стаў пан Ракоўскі. Міхал пра яго чуў:

Лядачы нораў, лае цяжка,
Яшчэ і звычай такі мае,
Што з кулакамі налятае.

У час першай сустрэчы новы ляснічы выказаў незадаволенасць Міхалавай службай.

Раздзел X «На панскай службе». Новы ляснічы прысылае загад Міхалу налавіць рыбы і завезці ў Нясвіж, а Антосю «ісці да адбору».

Спакою Міхал на службе не знае, «то дуб ссякуць, бярозку зваляць... або патравяць сенажаці». Акрамя догляду за лесам у абавязак Міхала ўваходзіла многае іншае, патрэбнае непасрэдна пану («То пастуха згадзі, служанку... касцоў наймай і жней...»). Але ляснічы ўсё роўна знойдзе зачэпку, каб аблаяць. Нахабства новага ляснічага вывела з сябе нават Ганну. Яна раіць мужу «часам агрызнуцца», выгаворвае, што не спіць, не есць, у лесе днюе і начуе – так дбайна служыць.

Пан пачаў лаяць на чым свет Міхала, пагражаў выгнаць.

Міхал маўчаў, ды нечакана
Ён сам як рушыцца на пана!..
Ляснічы зразу ўзад падаўся.
– Чаго пан гэтак раскрычаўся?
Завошта пан мяне так лае?
Згарыць яна няхай такая
І служба гэта, і пасада,
І гэта крыўда, й гэта здрада,
І гэта панская адплата!..

Раздзел XI «Дзедаў човен». Жонка падтрымала мужа, але Міхал пабойваўся, каб пан не прагнаў са службы. Аднак пан пасля сутычкі быццам паспакайнеў («Нават з ім была размова, і гаварыць з сабой даваўся...»).

Дзядзьку Антосю дзед Юрка, таксама рыбак, падарыў човен. Але ў першы ж выхад на ваду човен урэзаўся ў дрэва і раскалоўся, Антось зваліўся ў рэчку.

Раздзел XII «Сесія». Прыгожы панскі дом, дзе збіраліся на нарады леснікі і аб'ездчыкі, «на Міхася глядзеў астрогам, бо тут, апроч тае знявагі...

у стражнікоўскім сваім лёсе нічога ведаць не прыйшлося». Аўтар паказвае стасункі паміж леснікамі і аб'ездчыкамі, грубыя, зняважлівыя «разносы» пана ляснічага.

Раздзел XIII «Падгляд пчол». Парэчча стала абжытым кутом. Дзядзька Антось узяўся за новую навуку – пчалярства. Запрошаны пасля Спаса сваякі на падгляд пчол.

Гудуць пакрыўджаныя пчолкі,
Бы плачуць, бедныя саколкі,
Што праца іх неспадзявана
Людскою хцівасцю забрана.

Пасля таго, як мёд падзелены паміж кумамі, усе садзяцца за стол адзначыць сустрэчу. Пачынаюцца песні і танцы.

Раздзел XIV «Дарэктар». Паэтычнае апісанне восені:

...На ніцях белай павуціны
Прывозяць восень павучкі.
Яе красёнцы, чаўначкі
У моры лесу мільгатнулі
І лісце ў багру апранулі...

Дарослыя раяцца, як быць з навучаннем дзяцей. Вырашаюць узяць дарэктара, Базылёва Яську. Праз нейкі час хлопчыка прывозяць у Парэчча:

А сам дарэктар, з вузел ростам,
У сваім уборы бедным, простым,
У зрэбных портках і кашулі,
Стаяў, як бы яго прыгнулі...

Не ведалі на пачатку і хлопцы, як з ім паводзіць сябе. Але хутка разгаварыліся і пасябравалі.

Раздзел XV «Начаткі». Бацька дае наказ хлопцам брацца за навуку, а дарэктару трымацца з імі строга. Хутка, на радасць вучням, высветлілася, што «дарэктар выдаўся мяркоўны». У Алеся не ідзе закон Божы і ён вырашыў парваць «начаткі», але так, каб падумалі на катоў. Толькі к вечару бацька прынёс новую кнігу. Алесь падбівае Костуся схаваць «начаткі» ў снег. Калі той адмовіўся, схаваў сам. На гэты раз бацька ўзяўся за папругу.

Раздзел XVI «Вечарамі». Пасля заняткаў дзеці коўзаюцца на лёдзе, ідуць гуртам у гумно да дзядзькі. Антось вучыць іх малаціць. Вечарам усе дома. Антось, Міхал, Ганна пачынаюць успамінаць розныя здарэнні, якія з цікавасцю слухаюць дзеці.

Раздзел XVII «Воўк». У будні сям'я ўставала рана. Маці садзілася за кудзелю, мужчыны «ў сваю работу запрагаліся». Гаспадарам дапамагаў у працы дарэктар.

Міхал выпраўляецца ў абход. Пільна аглядаючы лес, ён у думках – на сваёй зямлі і ў сваёй хатцы. Раптам заўважае ваўка, які бяжыць аднекуль з сяла. Міхал здымае з плеч дубальтоўку. Аднак воўк праваліўся ў палонку. Нейкі час змагаецца з плынню, хоча выбрацца на лёд, ды гэта яму не ўдаецца.

Раздзел XVIII «Зіма ў Парэччы». На пачатку – аўтарскае адступленне – разважанне пра лёс роднага краю.

Дзядзька Антось з Костусем ловяць тхара. Аднойчы ў свята дзядзька рыхтуе паляванне, загадвае хлопцам нарабіць у лесе шуму, каб зайцам задаць страху.

Прачнуўся лес ад бразгатання,
Ад таго шуму палявання:
І крык, і лямант захаплення,
Гудзе лес зверху да карэння.

Але паляўнічыя не ўбачылі ніводнага зайца.

Раздзел XIX «На рэчцы». Аўтар паказвае захапленне Костуся прыродай, адкрытасць яго душы прыгажосці свету.

Інтэр'ер хаты з пачатку XX ст. у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах каля Мінска

Раздзел XX «Каляды». Леснікова сям'я чакае галоўнага зімовага свята – Каляд. Антось з пляменнікам ходзіць на рэчку, дзе стаяць яго загарады.

Гатуецца вячэра, усе «прыбраліся і памыліся». Наступае калядны вечар. Па традыцыі на стол кладуць сена, якім пасля кормяць усю хатнюю жыўнасць. Гадаюць па зерню, «які зародзіць хлеб налета».

Раздзел XXI «Таемныя гукі». Дзяцей цікавяць таемныя гукі, якімі поўніцца прырода зімой:

Стаіш і ловіш зыкі тыя,
А луг трашчыць, гудзе і вые;
То рэзкі трэск там панясецца...
Не то сякера мерна чэша,
Не то хтось кашляе ці брэша...

Растлумачыць іх хлопчыкі не могуць, дарэктар напалоханы таемным найбольш. Урэшце меншыя здагадаліся, што так трашчыць лёд на марозе. Бацька тлумачыць, чаму ён трашчыць. Костусь задае пытанне, што гэта за зоркі, якія падаюць знічкай, куды яны дзяюцца. Антось і Міхал адказаць не могуць. Тлумачыць Ганна, звязваючы чалавечае жыццё з зоркай.

Раздзел XXII «На глушцовых токах». Пачатак вясны:

І вось у дзень адзін прыўдалы
Загаманілі перавалы.
І гоман, спеў і шум усюды...

Міхал з іншым службовым людам арганізоўвае «панам пацеху і забаву» – паляванне на глушцоў. Задача леснікоў і аб'ездчыкаў асачыць такавішчы, тады ўжо прыедуць паны.

Раздзел XXIII «Панская пацеха». Міхал з сынам у будан вязуць з хаты «стол, услон, саломы», каб паны смачна спалі і елі. Сыходзяцца леснікі. Чакаюць у размовах гаспадароў.

Паны ў калясцы пад'язджаюць...
А пан Абрыцкі з леснікамі
Скланілісь нізка прад панамі,
Паны чуць-чуць адно зірнулі,
На іх увагі не звярнулі,
Як бы не людзі то стаялі...

Назаўтра, калі ледзь разднела, леснікі вядуць паноў на таковішчы. Міхалу дастаўся пан Свіда з Нясвіжа. За ўдалае паляванне пан аддзячыў лесніка рублём.

Раздзел XXIV «Вялікдзень». Схаваны кніжкі, бо замаркоціўся дарэктар і яго завезлі да бацькоў. Хата і двор прыбіраюцца да свята, бацька, дзядзька, ста-

рэйшыя дзеці едуць у царкву на споведзь. Заязджаюць да сваякоў у вёску. У царкве поп правіць службу. Дома чакае «абрусам белым стол накрыты», святочная ўрачыстасць. Пасля малітвы, свянцонага велікоднага яйка сямейка «цешыцца ядою».

Раздзел XXV «Летнім часам». У рабоце, у клопаце праходзіць вясна і настае лета. Леснікова сям'я рыхтуецца да касавіцы. Прыходзіць дзень, калі «касцы, ваякі мірнай працы, выходзяць з коскамі на пляцы». Увачавідкі змяняецца наваколле («Эх, скошан луг, – і зніклі краскі, бы тыя чары мілай казкі»). На змену касцам выходзяць «жней чародкі». Пачынаецца пара грыбоў.

Раздзел XXVI «Агляд зямлі».

Прайшло ў Парэччы лет нямала;
Яно ж не цешыла Міхала,
Хоць тут мясцінка гожа, міла...
Ды што краса без аўладання?
...Усё гэта – скарбы чужаніцы,
Магната князя Радзівіла...

Міхал не страціў думкі-мары пра ўласную зямлю, бо яна «аснова ўсёй айчыне». Як адзначае аўтар, «ён паскупеў і нават значна», пачаў складваць капейку да капейкі.

Міхал і Антось едуць глядзець зямлю. На трэці дзень трапляюць у патрэбнае месца. Гаспадар прыветна сустракае падарожнікаў, тлумачыць, чаму вымушаны прадаваць зямлю («Няма сыноў – няма падмогі»). Хадыка расхвальвае поле, поплаў. Браты ўважліва прыглядаюцца да ўсяго, сядзіба ім падабаецца, Пасля агледзін пакупнікоў запрашаюць на сняданак. За сталом адбываецца торг, Хадыка і Міхал з Антосем прыйшлі да згоды.

Раздзел XXVII «Па дарозе ў Вільню». Дзядзька Антось выпраўляецца ў зямельны банк браць пазыку. У Стаўбцах просіць свайго знаёмага танна падвезці да Вільні. «На паравозе без білета» даехаў да Баранавіч, затым па сходнай цане – да Вільні.

Раздзел XXVIII «Дзядзька ў Вільні». У горадзе дзядзьку многае здзіўляе, яму тлумна і млосна. Распытвае ў паноў дарогу да зямельнага банка.

З цяжкай душой Антось адкрывае дзверы ўстановы: «Забіты дух яго вякамі ўжо чуе страх перад панамі». Па парадзе аднаго селяніна дзядзька афармляе прашэнне, але, каб падпісаць яго, чыноўнік загадвае прыйсці праз тры гадзіны.

Раздзел XXIX «На Замкавай гары». Дзядзька з новым знаёмым кіруюцца ў горад, каб дзе падсілкавацца. Горад дзядзьку і захапляе, і выклікае непрыязнь, страх. Яму хочацца зірнуць на горад з гары. Антось з Грышкам купляюць білет і шыбуюць на гару.

Мемарыяльная сядзіба Якуба Коласа ў Смольні

Сябры на верх гары ўзняліся,
Аж упацелі, засапліся,
І ногі іх спынілісь самі.
А слаўны від перад сябрамі
З гары высокай адчыняўся!

Раздзел XXX «Смерць Міхала». З зямлёю быў вялікі клопат. Дзядзька вяртаўся з паездак «сярдзіты, чорны, як махнуша», злосна кідаў паперы на стол. Потым адыходзіў душой, рабіўся, як заўсёды, «лагодны, добры, клапатлівы, на ўсё спагадны і руплівы». Пачынаў расказваць. Але заканчваў, што яшчэ многа трэба вандравання і цяганіны. Міхал стараўся ўсяліць веру («Адзін Міхал і грэў імкненне давесці справу да сканчэння»).

У нейкі момант Міхал адчуў, што цяжка хворы. «Хвароба гэта даўно цягнулася, не з лета, і ў тым была яе сіла, што незаметна налучыла». Ні зёлкі, ні дактары Міхалу не дапамаглі. Гаспадар адчувае блізкі канец, жонка і брат імкнуцца яго падбадзёрыць.

Перад смерцю Міхал апрытомнеў. Апошнія словы, з якімі ён пакідае свет, звернуты да брата:

– Антоська!.. родны мой! канаю...
Перагарэў, адстаў, знікаю...
Вядзі ж ты рэй, вядзі... адзін...

Бог не судзіў мне бачыць волі
І кідаць зерні ў свае ролі...
Зямля... зямля... туды, туды, брат,
Будуй яе... ты дай ёй выгляд...

На новы лад, каб жыць нанова...
Не кідай іх...

Новая зямля
(Фрагмент)

I. Леснікова пасада

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю.
О, як бы я хацеў спачатку
Дарогу жыцця па парадку
Прайсці яшчэ раз, азірнуцца,
Сабраць з дарог каменні тыя,
Што губяць сілы маладыя, –
К вясне б маёй хацеў вярнуцца.

Вясна, вясна! не для мяне ты!
Не я, табою абагрэты,
Прыход твой радасны спаткаю, –
Цябе навек, вясна, хаваю.
Назад не прыйдзе хваля тая,
Што з быстрай рэчкай уплывае.
Не раз яна, зрабіўшысь парам,
На крыллях сонца дойдзе к хмарам
Ды йзноў дажджом на рэчку сыдзе –
Ніхто з граніц сваіх не выйдзе,
З законаў, жыццем напісаных,
Або на дол спадзе ў туманах.
Але хто нам яе пакажа?
На дол вадой ці снегам ляжа?
Не вернешся, як хваля тая,
Ка мне, вясна ты маладая!..
Вось як цяпер, перада мною
Ўстае куточак той прыгожа,
Крынічкі вузенькая ложа
І елка ў пары з хваіною,
Абняўшысь цесна над вадою,
Як маладыя ў час кахання,
Ў апошні вечар расставання.
І бачу лес я каля хаты,
Дзе колісь весела дзяўчаты
Спявалі песні дружным хорам,
З работ ідучы позна борам.
Нясліся зыкі песень здольных,
Ў лясах раз-пораз адбіваліся,
І ім узгоркі адклікаліся,
І радасць біла ў песнях вольных.
А хвоі, елкі векавыя
Пад зыкі песень маладыя
Маўчком стаялі ў нейкай думе,
І ў іх ціхусенечкім шуме
Няслось вячэрняе маленне
Ўгару, святое аддаленне.

Каля пасады лесніковай
Цягнуўся гожаю падковай
Стары, высокі лес цяністы.
Тут верх асіны круглалісты
Сплятаўся з хвоямі, з дубамі,
А елкі хмурымі крыжамі
Высока ў небе выдзяляліся,
Таемна з хвоямі шапталіся.
Заўсёды смутныя, бы ўдовы,
Яны найбольш адны стаялі,
І так маркотна пазіралі
Іх задуменныя галовы!
Лес наступаў і расступаўся,
Лужком зялёным разрываўся;
А дзе прыгожыя загібы
Так міла йшлі каля сядзібы,
Што проста імі б любаваўся.

А знізу гэты лес кашлаты
Меў зелянюсенькія шаты
Лазы, чаромхі ці крушыны,
Алешын ліпкіх, верабіны.
Глядзіш, бывала, і здаецца,
Што скрозь сцяну галін жывую,
Скрозь гэту тканку маладую
Ні мыш, ні пташка не праб'ецца.
Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка,
Абодва берагі каторай
Лазняк, ракітнік абступалі;
Бруіліся ў цяньку іх хвалі
І ў луг чуць значнаю разорай
Ішлі спакойна між чаротаў,
Рабілі многа заваротаў,
Аж покі ў Нёман не ўцякалі.

Зялёны луг, як скінуць вокам,
Абрусам пышным і шырокім
Абапал Нёмна рассцілаўся –
За хатай зараз пачынаўся
Ды йшоў квяцістай раўніною
З мурожнай слаўнаю травою
І ззяў на сонцы ў пералівах
Пяшчотных тонаў. Як на нівах
Жыта збажынкі лёгка гнуцца
І людзям радасна смяюцца
Сваім прыемным, мілым спевам
Пад лёгкім ветрыку павевам, –
Так гнуцца, гойдаюцца травы,
Як пройме ветрык іх ласкавы,
І пойдуць хвалі травяныя
З прыемным спевам чарадою,
Зашэпчуць краскі між сабою,
Нібы дзяўчаткі маладыя.
Эх, луг шырокі! Як жывы, ты,
Праменнем сонейка заліты,
Увесь стаіш перад вачыма,
Ты міл і смуцен, як радзіма,
Як наша ціхая старонка,
Дзе смугі сіняя пялёнка
У летні час дымком звісае
І даль задумай спавівае.
Хоць я няволяй цяжка змучан
І з родным берагам разлучан,
Ды я душою ажываю,
Як вокам мыслі азіраю
Цябе, мой луг і бераг родны,
Дзе льецца Нёман срэбраводны,
Дубы дзе дружнай чарадою
Стаяць, як вежы, над вадою
Даўнейшых спраў вартаўнікамі
І ззяюць грозна жараламі.
І толькі тут, пад іх чародкай,
Улетку, добраю пагодкай,
Касьбой утомлены, спачынеш
І думкі клопату пакінеш,
Заснуўшы крэпка і салодка.
Тут так прахладна, так прывольна!
А пташкі голасна і здольна
Смяюцца мілым шчабятаннем
І поўняць луг сваім спяваннем.
А на дубах, як шапкі тыя,
Чарнеюць гнёзды буславыя.
Буслы клякочуць, бусляняты
Пішчаць жалобна, як шчаняты,
Насы закідваюць угору
І просяць есці ў сваю пору.
А там, дзе буслікі ўздужалі,
Іх пачынаюць вабіць далі;
Яны пачулі ў сабе сілы,
Яны разводзяць ужо крылы,
Ўгару на локаць падлятаюць,
Паветра ловяць, заграбаюць
І неуклюднымі нагамі
Танцуюць смешна над дубамі.
Там, у падсуседзях з бусламі,
І вераб'і, шпакі вядуцца;
Клапотна шчэбеты нясуцца
І моўкнуць позна вечарамі.
Ў дубах крычаць сіваваронкі,
І свіст над лугам рэзкі, звонкі
Каршун маркотна так раняе
І нейкі смутак закідае.
Эх, луг шырокі! Як жывы, ты,

Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах (злева) і скульптуры якія прадстаўляюць творчасць Якуба Коласа ў Мемарыяльнай сядзібе паэта ў Смольні каля Стоўбцаў

Травой мурожнаю закрыты,
Стаіш зялёны прада мною
І ззяеш дзіўнаю красою!
Як дзве старэнькія кабеткі,
К каторым старасць неўзаметкі
Падкраўшысь злодзеем срэдзь ночы,
Як смачны сон змыкае вочы,
Красу і крэпасць забірае
І ўсю іх жывасць выкрадае
Ды кіне іх адных, старэнькіх,
Адных, як перст, і чуць жывенькіх
І непатрэбных анікому
На цягасць жыццю маладому, –
Так каля хаты, у садочку,
Схіліўшысь ціхенька ў куточку,
Стаялі дзве вярбы старыя,
А навакола маладыя
Дзярэўцы пышна красавалі,
На свет вясёла пазіралі.
Галлё спусціўшы над парканам,
Расла тут грушка з тонкім станам;
Па-над парканам пышным валам
Стаяў вішняк густы, прыўдалы.
Садок быў, праўда, невялічкі:
Дзве верабіны ды тры дзічкі
Ды між верб ліпка маладая,
Бы іх унучка дарагая.

Але як весела і міла
Тут пчолка ў вуллях гаманіла!
І як прыемна пахла мёдам!
Пладзілісь пчолкі з кожным годам:
Штолета вулляў прыбывала –
На пчолкі вельмі шанцавала.
Гул іх стаяў і ўдзень і ўночы.
Бывала, ўлетку, ў час рабочы
Не раз там чуўся крык вясёлы:
– Го, тата! дзядзька! выйшлі пчолы!
На вішні селі каля плоту!
Мужчыны кідалі работу,
Касьбу над рэчкай за кустамі,
І беглі шыбка, каб часамі
На лес дзе пчолкі не зляцелі,
Дык іх там пільненька глядзелі.

На прыгуменні, поруч з садам,
Павець з гумном стаяла радам,
А пад паветкаю прылады:
Вазок, калёсы, панарады,
Старыя сані, восі, колы
І вулляў некалькі на пчолы,
Яшчэ някончаных; судзіна,
Стары цабэрак, паўасміна
І розны хлам і лом валяўся,
Ад сонца, дожджыку хаваўся –

Патрэбны рэчы, ёсць вядома!
Гуменца, крытае саломай,
Ад доўгіх часаў пасівела;
Салома кудламі вісела,
Яе вятры параздзімалі,
А трохі хлопцы пасцягалі,
На стрэху лазячы, бывала, –
Іх гэта забаўка займала.
А пад шчытом на павуціне
Нішчымны колас-сіраціна
Ў зацішку лёгенька гайдаўся;
З якіх ён часаў там трымаўся,
То Бог яго святы ўжо знае!
Будоўля, больш яшчэ старая,
З гнілой, вагнутаю страхою
Стаяў хлявец якраз напроці
І чуць ліпеў, як бы на плоце
Гаршчок, разбіты качаргою.
Стары, паедзены чарвямі,
Набок пахілены вятрамі,
Глядзеў хлеў гэты старычынай,
Пахілай доляй жабрачынай;
А збоку, ў полі, недалёка
Стаяў прыгрэбнік адзінока,
Пахілкам, горкім сіратою,
У дол упёршыся страхою.
Ў глыбі двара стаяла хата
І выглядала зухавата
Паміж запушчанай будовы,
Як бы шляхцянка засцянкова,
Што ў дзень святы каля касцёла,
Чуць-чуць падняўшы край падола,
Так важна ходзіць з парасонам,
Спадніцай верціць, як агонам,
З дарожак пыл, пясок зганяе
І ў вочы хлопцам заглядае.

За хатай поле пачыналась,
Дзе жыта хораша гайдалась
І рос авёс, ячмень і грэчка, –
Было прытульнае гняздзечка!..

Мой родны кут, лугі, крыніца!
Цяпер для вас я – чужаніца.
Той самы лес, палеткі тыя,
Ды людзі там жывуць другія.
Мне душу смуткам напаўняе,
Што ў прошласць канулі гадочкі,
Мае шчаслівыя дзянёчкі, –
Прайшла, вясна ты маладая!

Цяпер разгорнем часаў шаты,
Бліжэй прыгледзімся да хаты,
Да Міхася і да Антося,
Як там вялося, як жылося.

1 Чаму паэму Я. Коласа *Новая зямля* называюць энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства ў дарэвалюцыйны час?

2 Сям'я Міхала з'яўляецца прыкладам беззямельнага сялянства. Да чаго імкнуцца героі твора?

3 Параўнай апісанне *Лесніковай пасады* з пачатковай часткай паэмы *Пан Тадэвуш* Адама Міцкевіча.

Інтэр'ер школы ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах

Якуб Колас

У палескай глушы
(Скарочана)

[…] Новае месца, новыя людзі і тая работа ў школе, якую трэба было распачынаць на гэтых днях і да якой так доўга гатаваўся, – усё гэта займала яго думкі, і яму было лёгка і добра, бо так многа новага і цікавага спадзяваўся ён спаткаць на першай сваёй дарозе незалежнай грамадскай працы.

Яму па душы быў і гэты глухі куток Палесся, аб якім яшчэ дома так многа цікавага наслухаўся, ад аднаго старога аб'ездчыка, і гэты народ з яго асаблівай моваю і звычаямі, так непадобнымі да мовы і звычаяў тых беларусаў, з гушчы якіх выйшаў Лабановіч: гэты некрануты край старажытнасці, якая на кожным кроку кідалася яму ў вочы.

[…]

Ужо колькі разоў паглядаў настаўнік на гадзіннік, думаючы, ці не пара яму ў школку.

Праўда, сёння толькі пачатак, толькі збор дзятвы; ён пакуль што азнаёміцца і зробіць запіс у журнал. Усё ж такі на сэрцы будзе спакайней: будуць зроблены хоць сталыя крокі да работы.

А дзеці, крыху асвойтаўшыся, пачыналі гусці смялей і весялей. Часамі чулася іх беганка па лаўках, смех і крыкі. Некаторыя ціхенечка падыходзілі да дзвярэй кватэры настаўніка і з найвялікшаю цікавасцю заглядалі ў шчылінкі. Таксама забягалі яны і ў кухню, нібыта напіцца вады. Яны баязліва тапталіся, азіраліся, а некаторыя паціху пыталі ў бабкі:

– А што, бабка, ён сярдзіты?

І калі Лабановіч паказаўся ў кухні, яны, як мышы, згледзеўшы ката, кінуліся наўцёкі.

Старожка залілася вясёлым доўгім смехам; яе вельмі насмяшылі дзеці і іх страх перад настаўнікам. Яна пераказала Лабановічу, як распытвалі пра яго вучні, паціраючы свае вушы, як бы раней пагадзіўшыся з тым, што іх будуць круціць.

У школьнай зале вучняў было дзесяткі два. Як толькі з'явіўся там Лабановіч, яны завілі з усіх канцоў школы і цясней збіліся ў гурт, як спалоханыя авечкі, і ўжо адтуль пазіралі на свайго настаўніка, як на якое дзіва. Значна большая частка іх былі новыя. Усе вучні былі абуты ў лапці, насілі, як і старыя палешукі, суконныя світкі, чорныя або светлыя. Грудзіны, як і ў бацькоў, былі расхлістаны.

Настаўнік павітаўся, адказ на прывітанне далі колькі хлопчыкаў, якія ўжо вучыліся ў школцы.

– Што ж вас так мала? – спытаў іх Лабановіч.

– Яшчэ прыйдуць, – адказаў адзін са старэйшых.

– Заўтра будзе болей, – дадаў другі.

– А вы, дзеткі, яшчэ першы раз прыйшлі да школкі? – мякка прамовіў настаўнік да малых.

Тыя спусцілі вочы, і толькі адзін, самы храбры, прамовіў кароткае:

– Але.

[…]

XI

Работа ў школе наладзілася.

Малады настаўнік укладаў у яе сваю душу і сэрца. Кароткія зімнія дні праходзілі незаметна, іх не хапала на тое, каб як след правесці работу. Як толькі добра развіднялася і была магчымасць весці лекцыі, Лабановіч ішоў у школу, размеркаваўшы сваю работу між чатырох груп.

Многа патрабавалася ўмення на тое, каб кожная група была занята і не сядзела без работы. Многа трэба было энергіі і старання, каб кожная група была зацікаўлена ў сваёй рабоце, каб увесь час трымаць школу на вышыні таго ці іншага настрою. Удзень вучні распускаліся на паўтары гадзіны для абеду. Пасля лекцыі зноў ішлі да самага вечара, пакуль не цямнела. Часта са старэйшымі вучнямі лекцыі вяліся і вечарамі пры лямпе. Потым настаўнік яшчэ доўга сядзеў над сшыткамі і папраўляў іх. Маладых сіл было многа; здавалася, ніколі не вычарпаеш іх, і расходаваліся яны так, як расходуе з восені заможны, але маладасведчаны і непрактычны гаспадар багаты збор ад свае нівы.

Але ў сваёй рабоце чэрпаў малады настаўнік і поўную чару высокага задавальнення, назіраючы, як дзеці набіраліся знання, лёгка асільвалі тое, што яшчэ ўчора здавалася ім незразумелым і трудным. ... І нейкая ўцеха брала маладога настаўніка, гледзячы на гэтых маленькіх змыслых палешучкоў.

Скончыўшы навучанне і пераглядзеўшы работы вучняў, Лабановіч часта падводзіў падрахункі дню; пры гэтым разважаў ён і аб тым, як абысці тыя хібы і памылкі, якія так трудна бывае пазбегнуць у школе маладому, малавопытнаму настаўніку. Усе тыя спосабы, якія так гладка і проста апісаны ў методыках, часта зусім не падыходзілі і не адпавядалі ўмовам школы, трэба было тут жа выдумаць іх самому. А колькі часу прыходзілася траціць на тое, каб дастасаваць мову дзяцей да кніжнае мовы! І колькі смешных і непажаданых выпадкаў вынікала на грунце гэтага непаразумення ў школе, дзе мова мацеры зневажаецца і забіваецца! […]

Бабка падперла рукамі шчокі і пачала смяяцца.

– Смешны вы, панічок, далібог!.. Ах, няхай бы вы здаровенькі былі!

– А ведаеш, бабка, што я надумаўся?

– Бог вас ведае, панічок.

– У гэтую нядзельку, бабка, ці там нікога няма? – ціха і таемна кіўнуў настаўнік у бок кухні.

– Няма, панічыку! – ціха адказала бабка, нарыхтаваўшыся пачуць нешта вельмі цікавае.

– Дык нават, бабка, не ў нядзельку, а ў суботу нанач надумаўся я паехаць у госці да таго паніча.

– А я ж, панічок, думала, што вы скажаце пра іншае, – сказала, смеючыся, бабка. – Чаму ж, панічок, не паехаць? Вядома, збярэцеся.

Дзверы ў кухню стукнулі, і туды хтось увайшоў.

– Гэта, мусіць, бабка, да цябе хтось лячыцца прыйшоў.

Бабка борздзенька павярнулася і ў дзвярах спаткалася з Чэсем.

– Татка прасіў, каб вы зайшлі да нас, – прамовіў Чэсь Лабановічу.

– Добра, Чэсь: я зараз прыйду. У вас там, можа, хто ёсць?

– Пан Сухавараў з раз'езда.

– Ах, Чэсь! Як жа гэта ты такую штуку мне ў школе ўдраў? – прыпомніў Лабановіч, як Чэсь, седзячы на лекцыі славянскай мовы, скруціў паперку ў трубачку і засунуў яе ў вуха Кандрату Кругламу.

Чэсь апусціў галаву ў знак свае віны і стаяў панурыўшыся.

– Не рабі ты, брат, так ніколі.

Чэсь выйшаў. Крыху счакаўшы, выйшаў і Лабановіч.

За сталом у падлоўчага сядзеў памочнік начальніка раз'езда, пан Сухавараў, нежанаты, яшчэ малады хлопец, адзеты ў парадны мундзір; ён падкручваў свае чорныя вусікі. На канапе насупраць яго сядзела панна Ядвіся. Яна была ў прыгожай чырвонай кофтачцы, якая вельмі ішла да яе твару, а чорныя і пышныя валасы яе былі перахвачаны чырвонай стужкай. Панна Ядвіся выглядала вельмі цікаваю і прыгожаю. Цёмныя вочы яе з доўгімі мігаўкамі як бы рассыпалі праменні. Яна была вясёлая і ў добрым настроі. Лабановіч падышоў да яе і паздароўкаўся. Панна Ядвіся пазнаёміла яго з памочнікам і запыталася:

– Што гэта вас не відаць?

– А я, бачыце, крыху закапаўся ў школе.

– Уяўляю сабе, якая непрыемнасць сядзець увесь дзень з гэтай вясковай дзятвой. Нанясуць лапцямі гразі, дух цяжкі, – прамовіў Сухавараў.

– Пан Лабановіч закахаўся ў сваю школу, – сказала Ядвіся.

– А можа, у вас, панна Ядвіга? – запытаў памочнік і ўскінуў на яе свае алавяныя вочы.

Відаць было, што памочнік хацеў заваладаць адзін увагаю панны Ядвісі, а настаўніка адперці. Ён лічыў сябе вельмі цікавым кавалерам, з якім такому настаўніку змагацца ніякім чынам немагчыма.

– О, не! У пана Лабановіча ёсць больш шчаслівейшая ад мяне.

Адзін момант Ядвіся памаўчала, як бы вельмі засмуціўшыся, але з яе вачэй так і сыпаліся іскры смеху.

– Пан Лабановіч аддаў сэрца сваёй бабцы! – сказала і залілася самым вясёлым сардэчным смехам. Таксама смяяліся і малая Габрынька і Сухавараў. Смяяўся і пан падлоўчы, які ў гэты момант прыйшоў да гасцей. А Ядвіся яшчэ дадала:

– Сядуць з бабкаю каля стала і варкуюць да самай поўначы.

«Аднак жа ты ахвотніца смяяцца», – падумаў настаўнік і таксама адказаў жартаўліва:

– Ну, што ж? Палюбіць маладую і прыгожую кожны патрапіць, а вось закахацца ў старую – гэта ўжо рэч іншая.

– Так, так, – сказаў Сухавараў, – на гэта трэба мець асаблівы талент.

– У пана Лабановіча і ёсць гэты асаблівы талент, – прамовіла Ядвіся.

– Што гэта, паночку, яна да вас прычапілася? – спытаў пан падлоўчы.

– Не ведаю, – адказаў Лабановіч. – На свеце, пане-суседзе, бывае так, што хто каго любіць, той таго і чубіць.

– Ха-ха-ха! – засмяяўся пан падлоўчы. – Што, Ядвіська, дастала?

А Ядвіся, як і нібыта таго, спакойна, нават сур'ёзна запыталася:

– А хіба ж ужо бабка чубіла вас, пане настаўніку?

– Брава! Брава! – запляскаў у ладкі памочнік. Падлоўчы Варанкевіч громка засмяяўся.

– Дык вас, пане настаўніку, бабка чубіць? – спытаў ён, не перастаючы смяяцца.

За гэтым агульным смехам Лабановічу не ўдалося нічога адказаць, і верх застаўся за паннаю Ядвісяю.

Размова пайшла па другім кірунку, і гаварыў болей памочнік. Гаварыў ён гладка і востра і часта выклікаў вясёлы смех сваіх слухачоў і слухачак. Панна Ядвіся часта ўскідала на яго свае цёмныя выразныя вочы з-пад тонкіх дужак броваў. Лабановіч маўчаў. У яго было такое пачуццё, як бы ён быў тут зняважаны і пакрыўджаны. А пан Сухавараў вельмі зацікавіў Ядвісю Вільняю і тэатрам. Сам ён крыху спяваў, але толькі пад гітару. Другі раз абяцаўся прыйсці з гітарай, бо панна Ядвіся яго вельмі прасіла. За ўвесь гэты час яна ні разу не глянула на свайго суседа – Лабановіча.

– А ты, Ядвіська, калі ласка, заспявай, – звярнуўся пан падлоўчы да дачкі.

– Пан Сухавараў смяяцца будзе, – прамовіла Ядвіся, апусціўшы вочы, а потым ускінуўшы іх на памочніка.

– Што вы? Што вы? – усхапіўся Сухавараў, просячы яе заспяваць.

Ядвіся адышла далей у куток каля кахлянай печы і заспявала:

Ці я ў полі не калінаю была?

Голас у яе быў малады, свежы, сакавіты. Спявала яна з такім праўдзівым пачуццём, што рабіла вельмі добрае і прыемнае ўражанне.

Лабановіч слухаў гэтыя спевы, і нейкі жаль ахопліваў яго. Яму хацелася падысці да дзяўчыны і запытаць яе: «Скажыце, якое гора ў вас на сэрцы?»

Сухавараў многа і доўга хваліў панну Ядвісю, а яна стаяла, апусціўшы вочы, і, здаецца, чакала слова ад Лабановіча. Настаўнік сумыслу не сказаў нічога.

Развітваючыся пасля вячэры, панна Ядвіся была сур'ёзная і не папрасіла суседа заходзіць да іх вечарамі.

XVI

[...]

– Кожны народ мае свой гонар. Англічанін перад усім светам горда зазначае: я – англічанін! Тое самае скажа француз, немец, аўстрыец, рускі і іншыя прадстаўнікі другіх нацый. А мы, беларусы, не адважаемся прызнацца ў тым, што мы – беларусы. Бо на галаву беларускага народа, як вядома, многа выліта памыяў, годнасць яго прыніжана і мова яго асмеяна, у яго няма імя, няма твару. А з гэтага вынікае тое, што беларус-інтэлігент адмяжоўваецца не толькі ад свайго народа, але і ад бацькоў сваіх. [...]

[...] Ад бабкі-старожкі Лабановіч збольшага ведаў сямейнае жыццё пана падлоўчага.

– Добрая душа гэта паненка, – казала бабка і ўздыхала. – Уся ў матку пайшла. Не даў ёй Бог яшчэ пажыць трошкі, дзетак падгадаваць.

Кабінет настаўніка, музей у Строчыцах

– Чаго ж яна, бабка, так рана памерла? – пытаў бабку настаўнік.

– Памерла, панічок. На ўсё воля Божая.

Панізіўшы голас, як бы баючыся, каб яе хто не пачуў, бабка казала:

– Ой, панічыку, цяжка ёй жылося з панам! Біў яе пан! Ды як яшчэ біў! У нябожчыцы пані былі пышныя валасы. Як распусціць, бывала, чорныя косы, дык ледзь не да долу звісалі... Ой, была жанчына, няхай са святымі супачывае яе душачка! Сама я, панічыку, бачыла, як біў яе раз пан. Узяў за косы, яшчэ на руку накруціў і вёў праз двор у пакоі. А што ён там рабіў ужо ў пакоі, то людзі таго не бачылі.

– Завошта ж ён біў яе?

– Ой, панічыку, натура ў пана цяжкая! Ой, цяжкая натура! Калі ўжо ссунуцца бровы і вусы абвіснуць, ну тады дабра не спадзявайся. Як бы на яго што найдзе. А так чалавек ён не кепскі. І пагаварыць любіць, і пашуткуе, і пасмяецца. Папросіш чаго, ніколі не адмовіць. І ведаеце, панічок: часта бедная пані па хатах хавалася, калі ўзбурыцца пан. А дзеці прыціхнуць, бы тыя птушкі ў гняздзе, калі над імі каршун пралятае. Не даў Бог долі беднай пані. Старэйшай паненцы тады толькі дзесяты гадок пайшоў. А без маткі, панічок, самі ведаеце, цяжка жыць. Праз год ажаніўся пан другі раз. Добрая пані, што казаць, панічок, але для дзяцей – не родная матка.

[...] Але як бы там ні было, панна Ядвіся часамі бегала на колькі хвілін да старой Мар'і, не затым, каб паскардзіцца на свой смутак, а проста пагутарыць з ёю. Забягала яна ў тыя часы, калі Лабановіч быў на лекцыях, і то ўкрадкамі, з усімі перасцярогамі, каб не спаткацца з настаўнікам. Бабка была кабеціна добрая, чулая на чужое гора і ўмела знайсці тыя простыя жывыя словы, што ішлі да душы, гаілі і заспакойвалі яе. Гэтыя пабачэнні доўгі час адбываліся цішком ад настаўніка, і бабка, якая ні была яна гаваркая, ніколі не казала аб іх «панічу», хоць таксама была моцна аддана яму.

Што ж цягнула панну Ядвісю да гэтае простае кабеціны? Трэба сказаць, што старая паляшучка была бабка добрая, спагадная і сваім простым сэрцам разумела, чаго бракавала маладой дзяўчыне, так рана страціўшай родную матку. Водгук на чужое гора жыў у яе сэрцы, бо і сама яна многа зазнала гэтага гора на сваім вяку, рана застаўшыся ўдавою з малымі дзецьмі. І трэба, наогул, зазначыць, што ніхто, як простая сялянская душа, не патрапіць так знайсці

тыя добрыя словы і выразы, што гаюча ідуць да другой душы, каб уцішыць і заспакоіць яе раны. Скуль жа бяруцца гэтыя сілы, гэтыя ўласцівасці душы? Напэўна з крыніц свайго гора і цяжкага змагання з жыццём за людскія правы, з гэтай цэльнасці наіўнай веры ў справядлівасць расплаты на тым свеце за ўсе пакуты на зямлі.

З другога боку, Ядвісі было цікава паслухаць, як вёў сваю работу ў школе настаўнік, як ён часамі пакрыкваў на вучняў, сярдуючы на іх някемлівасць або праз меру падняты шум, каб потым здзівіць яго пераказамі таго, што рабіў ён у школе і як трымаўся з дзецьмі. А тонкая сцяна між кухняю і школаю дазваляла чуць усё, што рабілася ў школе. Ядвіся часта прыпыняла гутарку са старожкаю і прыслухоўвалася. Як толькі канчалася лекцыя і школа адразу ўздыхала вальней сваім шумам, Ядвіся, даўшы бабцы знак маўчаць, як спуджаная дзікая птушка, кідалася ў дзверы і знікала між будынін свайго двара, адкуль часта чуўся яе малады сакавіты голас і звонкая песня. А бабка, гледзячы ёй услед, сама сабе ківала галавою і смяялася доўгім ціхім смехам.

– Смешная, вясёлая паненка! – зазначала бабка.

Апавяданне бабкі аб доме пана падлоўчага зрабіла моцнае ўражанне на маладога настаўніка. Вобраз пані з чорнымі пышнымі валасамі жыва рысаваўся ў яго ўяўленні, а дапытлівая думка імкнулася ўнікнуць ва ўсе схованыя пружыны гэтае драмы чалавечай душы. І гэта трагедыя людскога жыцця авявала і вобраз панны Ядвісі, атуляла яго нейкай няяснай заслонай тайнасці цёмнай палескай глушы. І сама гэта глуш усё выяўней прымала своеасаблівы воблік, як нешта само сябе здавальняючае і існуючае сваім уласным жыццём, таемна пераплятаючыся і лучачыся з людскім лёсам.

Застаючыся на адзіноце з самім сабою, Лабановіч часта думаў аб Ядвісі. Ён нават размаўляў з ёю ў думках. І гэта размова была такая простая, шчырая, бо ішла ад сэрца! Ядвіся так міла і крыху хітравата пазірала на яго і смяялася. Яму самому рабілася так добра і ціха на душы ад гэтае размовы. Ён чуў, што нешта прыемнае ўліваецца ў душу і грэе яго сэрца. Але пры спатканні з Ядвісяю ён ніколі не выказваў таго, што гаварыў ёй без яе. Не то сарамяжлівасць яшчэ чыстага сэрца, не то нейкая асцярога стрымлівала сказаць ёй усё, што было на душы.

Дом пана падлоўчага глянуў на Лабановіча яшчэ раз і яшчэ; скараючыся нейкаму пачуццю і голасу, ён звярнуў з чыгункі і накіраваўся дадому, паглядаючы то на высокі крыж каля школы, то на дах пана падлоўчага. Падыходзячы бліжэй да іх, настаўнік пайшоў павольней, як злодзей, кідаючы позірк на вокны. Ступіўшы яшчэ колькі крокаў, ён спыніўся: у акне з-за вазонаў кланялася тая галоўка, якую яму так прыемна было бачыць. Настаўнік прасвятлеў і рашуча адкінуў клямку на дзверцах веснічак свае суседкі.

– З таго часу, як вы закахаліся ў панну Людмілу, ужо не хочаце да нас зайсці, – сказала панна Ядвіся, не то шуткуючы, не то сур'ёзна.

Лабановіч глянуў ёй у вочы, у гэтыя акруглыя цёмныя і такія слаўныя, выразныя вочы, на яе чорныя тонкія бровы, якіх ён не бачыў ні ў аднае дзяўчыны, ні ў кога на свеце. Здаецца, ніколі не адводзіў бы ад яе сваіх вачэй! Ён падумаў:

«Ніхто цябе не бачыць, ніхто не ведае, якая ты слаўная і мілая, – і дадаў: – Дурні яны!»

– А, – сказаў Лабановіч у парыванні нейкай радасці, а ўнутрах яго ўсё дрыжала, – ці толькі свету, што ў панны Людмілы? А вы мне вось што скажыце: калі ўжо вы перастанеце харашэць? Можна было б ужо і спыніцца.

Усе думкі аб помсце панне Ядвісі, усе тыя калючыя словы, якія ён думаў не так даўно кінуць ёй, – усё цяпер знікла, нібы гэтыя вочы і бровы адвялі іх і пахавалі навекі.

Ядвіся сказала:

– А калі вы перастанеце быць такім панурым і злосным?

– З таго самага часу, як вы аб гэтым запыталіся.

– Не люблю я панураў, – сказала Ядвіся. – Усё здаецца, што яны накінуцца і біць пачнуць.

– Што зрабіць? Часамі чалавеку так цяжка бывае, так наваліцца на яго гора, што нехаця ляжа чорны цень на твары.

– А якое ў вас было гора? – спытала Ядвіся.

– Не пытайцеся: ніякага ў мяне не было гора. Хіба вы навядзеце яго на мяне, але гэтага я вельмі не хацеў бы.

– Я? Што я для вас значу?

– Усё! – адказаў настаўнік.

– Праўда? – ціха спытала Ядвіся.

– Гатоў пабажыцца, аб заклад пабіцца, – пачаў сыпаць Лабановіч словамі, узяўшы жартлівы тон, каб жартамі прыкрыць тое, што ішло ад самага сэрца.

Панна Ядвіся, як сарна, скокнула да печкі, дзе стаяў пусты кошык. Схапіўшы кош, яна падбегла з ім да Лабановіча і прамовіла:

– Сыпце ў кош сваё красамоўства!

Яны смяяліся, шчаслівыя, як дзеці. Ядвіся раптоўна стала сур'ёзнаю.

– Скажыце, – прамовіла яна. – Каб я вас аб чымсі папрасіла, ці зрабілі б гэта для мяне?

– Усё, што можна зрабіць, зраблю.

– Зробіце?

– Зраблю.

Панна Ядвіся апусціла вочы, потым паволі ўзняла іх на настаўніка.

– У Гарадзеншчыне ў мяне ёсць адна дзяўчына, – ну, вам усё роўна, хто яна. Ёй трэба выйсці замуж. Разумееце? Ёй проста трэба павянчацца, каб у дакументах мець іншае прозвішча. Нашто, – гэта таксама вам нецікава. Дык ці згадзіліся б вы павянчацца з ёю?

Ядвіся гаварыла самым сур'ёзным чынам. Лабановіч і верыў, і не верыў. Калі гэта ўсё праўда, то, значыць, для Ядвісі ён зусім непатрэбны чалавек. І яму стала так горка і непрыемна. Ён апусціў вочы і, памаўчаўшы, прамовіў з прыметнаю ноткаю нездавалення:

– Аб жаніцьбе, якая б яна ні была, я думаю столькі, колькі думаеце і вы аб леташнім снезе.

У гэты час у пакой увайшла Габрынька, і размова наконт жаніцьбы на тым і скончылася.

– Ну, кажыце, як вам гасцілася? – звярнуўся да яе настаўнік.

Габрынька з жарам і ажыўлена апавядала, як ім было там добра і як не хацелася ехаць сюды. Ядвіся маўчала. Лабановіч слухаў Габрыньку і стараўся не пазіраць на Ядвісю. А яна ўвесь час не зводзіла з яго вачэй. А потым ціхенька выйшла, нічога не сказаўшы. Яна доўга не прыходзіла і вярнулася тады, калі Лабановіч ужо выйшаў і накіраваўся да сябе на кватэру.

Настрой у яго быў самы паганы. Ён проста не мог знайсці сабе прыпынку, не ведаў за што ўзяцца. Прайшоўшыся колькі разоў па пакоіку, ён узяў паперу і пяро і сеў пісаць ліст свайму семінарскаму сябру Янку Тукалу. [...]

– Ці ты, бабка, не ведаеш, хто гэта прынёс сюды красак?

Бабка перш прыкінулася, што нічога не ведае, а каб пераканаць у гэтым настаўніка, узяла краскі і стала разглядаць іх. Але, як ні хітрыла бабка, настаўнік прачытаў на яе твары, што яна прыкідваецца.

– Ой, бабка! Грэх табе, старэнькай, хлусіць і падманваць. Не любіш ты мяне і не шкадуеш. Я ўжо і па той прычыне не паверу табе, што ты – знахарка. Ты павінна ведаць.

– Ой, панічыку! Ну, хто ж вам можа прынесці красачак, як не паненка?

– Якая паненка і чаму паненка, а не якая-небудзь маладзіца?

– Хто ж іх, панічыку, ведае, хто да вас лепей горнецца: ці паненкі, ці маладзіцы, – усё яшчэ хітрыла бабка. Але ёй самой неўтрыванне было, каб не сказаць, і яна пачала смяяцца. – Паненка, панічыку, сама сюды забягала і палажыла іх вам. Толькі яна, панічыку, прасіла, каб я вам не казала.

– Злаўлю яе калі-небудзь.

– Злавіце, панічок, злавіце! – прамовіла бабка, гатовая нават памагаць свайму панічу злавіць паненку.

– Чаму ты, бабка, не ідзеш на вуліцу песні спяваць?

Бабка паглядзела на настаўніка, ці ён праўду кажа, ці жартуе.

– Няма, панічыку!.. Адспявала я ўжо сваё.

– А ці шкада табе свае маладосці?

– А што яе, панічыку, шкадаваць? Ці шкадуй, ці не шкадуй – не вернецца назад.

– А ці хацела б ты вярнуць яе?

– Э, панічок! Ніколі я пра гэта і не думаю. Нікому яна не варочаецца.

– Дык трэба, бабка, карыстацца ёю і ўзяць ад яе ўсё, чым яна міла і люба!

– Так, панічок, што цяпер страціш, таго потым не знойдзеш.

Гэта размова зусім не цікавіла бабку, і яна колькі разоў пазяхнула. А ўрэшце сказала:

– Ужо ж, панічок, і позна. Заставайцеся здаровы!

Бабка паволі пасунулася ў кухню на сваю печ, адкуль хутка пачуліся нейкія мармытанні, не то яна сама з сабою размаўляла, не то малілася Богу. [...]

XXX

Прымкнуўшы дзверы кухні з двара, Лабановіч борздзенька пабег да сябе на кватэру праз другі ход, што вёў у школу. Ціхенька ступаючы, падышоў ён да дзвярэй і толькі дакрануўся да іх рукою, як у той жа час панна Ядвіся кулём кінулася ў кухню, каб выскачыць на двор. Але дзверы не адчыняліся. Азірнулася – на парозе стаяў настаўнік.

– Ах, попалась, пташка, стой! Не уйдёшь из сети! Не расстанемся с тобой ни за что на свете! – спакойна дэкламаваў Лабановіч, не зводзячы з яе вачэй, любуючыся ёю, шчасліва ўсміхаючыся. [...]

Ён выйшаў на двор, абышоў пасаджаныя дрэвы, над некаторымі затрымліваўся даўжэй. Ён часта паглядаў на двор пана падлоўчага. Вельмі хацелася пабачыць Ядвісю і паказаць ёй гэту слаўную грушку, якую пасадзіў ён на памяць аб ёй. Але Ядвіся доўга не паказвалася на двары. Ён падкаравульваў яе з гадзіну. І калі заўважыў, аклікнуў і папрасіў яе падысці.

Яна, радасная і вясёлая, падбегла.

– Я хачу паказаць вам грушку.

– А вы не будзеце лавіць мяне? – з мілаю і хітраю ўсмешкаю спытала яна. Ён памог ёй пералезці цераз плот і павёў да грушы.

– Гэту грушку я пасадзіў на памяць аб вас.

Яна доўга разглядала яе. Потым засмяялася і сказала:

– Я вырву яе і выкіну.

– Чаму?

– Бо яна такая ж калючая і дзікая, як я.

– Пойдзем гуляць сёння? – спытаў ён.

– А вы памятаеце, што я вам учора на гэта сказала?

– Зрабіце вы тое самае, што зрабілі ўчора, і тады скажыце мне хоць дзесяць разоў тое, што сказалі адзін раз.

Яна паглядзела на яго строга і прамовіла:

– Больш ніколі! Чуеце? Ніко-о-лі! [...]

– Калі ж вы паедзеце? – запыталася Ядвіся і ўскінула на яго свае цёмныя вочы.

– Умовіліся з хлопцамі ехаць у суботу вечарам.

Панна Ядвіся прыпыніла сваю работу і задуменна кудысь пазірала.

– Люблю я гэту станцыю, – прамовіла яна.

Пані падлоўчая выйшла – яе паклікалі.

Лабановіч сядзеў моўчкі і думаў.

Вечар быў ціхі, ясны і цёплы. Цень ад хаты пана падлоўчага паволі закрываў палісаднічак і свежыя клумбачкі з краскамі, нядаўна пасаджанымі, і пасоўваўся па вуліцы. Бойкія вераб'і чылікалі на хаце і снаваліся па палісаднічку.

– Што вы сёння нешта не ў гуморы? – запыталася Ядвіся і глянула на настаўніка.

– Скажыце вы мне, праўда ці не: я чуў – вы збіраецеся кудысь паехаць адгэтуль надоўга?

Панна Ядвіся ніжэй нахіліла галаву. Лабановіч пачуў, што адказ для яго будзе невясёлым. Не падымаючы вачэй, яна ціха сказала:

– Так, збіраюся паехаць.

Яна ўздыхнула ледзь прыкметна, падняла галаву і паглядзела доўга-доўга на настаўніка.

– А вы б хацелі, каб я не ехала?

– Я ведаю, вам тут цяжка, – сказаў настаўнік, – і пэўна там, дзе думаеце вы жыць, вам будзе лепей. І тут ужо не прыходзіцца лічыцца з тым, як бы я хацеў. Але калі вы выедзеце адгэтуль, то я тут болей не застануся.

Ледзь прыметная радасць прабегла па яе твары.

– А покі што бывайце здаровы.

Лабановіч затрымаў яе руку і з нейкаю просьбаю ў голасе сказаў ёй:

– Вы не выедзеце, покі я не вярнуся?

– Калі я паеду, я і сама яшчэ не ведаю. А можа, і зусім не паеду.

– А вы пад машыну не будзеце кідацца? – ціха спытаў ён яе, усміхаючыся.

– Не буду, – яшчэ цішэй прамовіла яна, азірнулася і апусціла вочы.

Ён у момант нахіліўся да яе і пацалаваў крэпка-крэпка. І, п'яны ад гэтага пацалунка, борзда выйшаў з палісаднічка. А панна Ядвіся сядзела, нахіліўшы галаву, і аб чымсьці моцна-моцна задумалася.

XXXV

– Гэта мой апошні тут вечар, – казала сама сабе Ядвіся. – І я не ўбачу яго!

Яна задумалася, прыслухоўваючыся да голасу свае думкі. Няўжо ж і не ўбачыць яго? Ніколі не ўбачыць? І нашто яна зманіла яго? Яна ж і тады ўжо ведала аб тым, што заўтра, у панядзелак, паедзе, а яму сказала, што не ведае, калі будзе выязджаць. Ядвіся зірнула на вокны кватэры настаўніка. Там цёмна і страшна, бо пуста. Дом толькі тады жывы, калі ў ім жыве гаспадар, бо гаспадар – душа свайго дома. Як смутна і тужліва пазіраюць гэтыя шкляныя вочы пустой і мёртвай кватэры! І дарэмна гэты малады бліскучы месячык стараецца ажывіць пагаслыя вочы: яны свецяцца, а жыцця няма.

Ёй нават страшна. Яна нізавошта цяпер не падыдзе да іх, як падыходзіла калісь, калі гэтыя вокны жылі і так прыветна пазіралі на іх двор светла-зялёным святлом. О, тады ёй было весела, і яна так ціхенька падыходзіла, як начны матылёк, да гэтых вокан, яшчэ цішэй падымалася на плот перад вокнамі і доўга пазірала туды. [...]

– Паехала, панічок, паехала! Учора і паехала. Яшчэ сюды забягала. «Кланяйся, кажа, бабка, свайму панічу!» Паехала, панічок, – у засмучэнні кажа бабка.

– Ну, што ж, – стараючыся быць спакойным, гаворыць Лабановіч. – Можа, ёй там лепш будзе. [...]

Ён выйшаў на двор.

Бабка, пазіраючы на яго, паківала галавою. «Па паненцы нудзіцца», – зазначыла яна сабе.

Зірнуўшы на маладую грушку, Лабановіч заўважыў, што вяршок яе быў зломан і гаротна нахілен да зямлі.

– Гэта яна зламала, – прамовіў сам сабе настаўнік, – нашто яна зрабіла так? Няўжо яна хоча, каб я выкінуў яе з сэрца?

Яшчэ большы жаль ахапіў яго. Ён хацеў зрэзаць адломаны вяршок.

– Э, усё роўна! – сказаў ён і адышоўся.

Спаць у гэты дзень ён не лажыўся. Ён пачаў перабіраць кнігі, складваць паперы, прыводзіць іх у парадак. У адной кнізе знайшоў невялічкі лісцік паперы, напісаны рукою Ядвісі. Яна пісала «Бывайце здаровы. Я сумыслу пастаралася, каб вы мяне тут не засталі, хоць мне і хацелася яшчэ хоць раз, апошні раз, пабачыцца з вамі. Але я падумала сабе: усё роўна, ехаць мне трэба; ехаць жа тады, калі вы былі б тут, мне было б яшчэ цяжэй. Панна Людміла чакае вас – зайдзіце да яе». І больш нічога не напісала.

Лабановіч доўга пазіраў на гэту паперку. Нават не напісала, куды едзе, і сама не падпісалася. [...]

Назаўтра напісаў Лабановіч прашэнне аб перамяшчэнні і стаў збірацца ў дарогу. Бабка часта ўваходзіла ў пакойчык і, як родная матка, падбірала за ім розныя рэчы.

– Разлятаюцца мае галубкі, – тужліва прамовіла бабка, – не вернецеся вы, панічыку, сюды! – І яна ў вялікім засмучэнні падперла рукою шчаку.

Вечарам, праводзячы настаўніка, бабка заплакала.

Садзячыся на фурманку з двума чамаданчыкамі, настаўнік сказаў у сваіх думках: «Адзін раздзел кнігі прачытан і загортваецца!. Ну, што ж? Гайда далей!»

1 Ахарактарызуй галоўнага героя твора, Андрэя Лабановіча.

2 Якую функцыю ў творы выконвае вобраз паляшучкі Мар'і?

3 Як у рамане паказаны пачуцці Ядвісі і Андрэя? Што стала прычынай расстання закаханых?

4 Знайдзі ў тэксце выказванні пра гонар, свядомасць і становішча беларускага народа. Назаві прозвішчы пісьменнікаў, якія закраналі гэтую тэму ў сваіх творах.

5 Прыдумай уласнае заканчэнне твора.

Максім Багдановіч (1891-1917)

Паэт, даследчык, крытык, эсэіст, перакладчык. Нарадзіўся ён у Мінску, у сям'і настаўніка, фалькларыста і этнографа Адама Багдановіча. У ліпені 1892 г. сям'я Багдановічаў пераехала ў Гродна, дзе і прайшлі раннія дзіцячыя гады паэта. Калі Максіму было пяць гадоў, памерла ад сухотаў яго маці, і ў лістападзе 1896 года бацька з дзецьмі пераехалі ў Ніжні Ноўгарад. У 1902 г. Максім паступіў у Ніжагародскую мужчынскую гімназію. У сувязі з пераездам бацькі на новае месца працы, Багдановічы пераехалі ў Яраслаўль. Летам 1911 г. па запрашэнні братоў Луцкевічаў прыязджаў у Беларусь. Наведаў тады Вільню і рэдакцыю «Нашай нівы».

У гэтым жа годзе паступіў у Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй у Яраслаўлі. Пасля яго заканчэння (1916) паэт прыехаў у Мінск і стаў працаваць сакратаром губернскай харчовай камісіі. У лютым 1917 года цяжка хворы на сухоты, выехаў на лячэнне ў Ялту, дзе і памёр.

Першы твор – алегарычнае апавяданне *Музыка* – апублікаваў у 1907 г. (газета «Наша ніва»). У 1913 г. у Вільні выйшаў зборнік вершаў і паэм *Вянок*.

Практычна ўсё сваё кароткае жыццё ён правёў па-за межамі роднай Беларусі.

Па ўспамінах сучаснікаў геній беларускага слова слабавата валодаў гутарковай мовай, Максім-кніжнік – як празвалі яго сябры – прасіў папраўляць ягонае вымаўленне. Апантаны любоўю да роднага краю Максім Багдановіч стварыў шматлікія творы (****Досі ўжо, братцы, чужынцам мы служылі*, *Беларусь, твой народ дачакаецца, Пагоня, Песня пра князя Ізяслава Полацкага* і інш.) і цэлыя цыклы, прысвечаныя Беларусі, яе гісторыі, культуры (*Згукі бацькаўшчыны, Старая Беларусь*), традыцыі і адметнасці народнай творчасці (вершы беларускага складу: ****Бяседная*, ****У Максіма на кашулі*, ****Як Базыль у паходзе канаў*, *Страцім-лебядзь*, *Лявоніха*) і міфалогіі (цыкл *У зачараваным царстве*). У вершы *Народ, Беларускі Народ!* паэт адразу, з першага радка ўступае ў палеміку з усімі нігілістамі, якія адмаўлялі беларусам у праве называцца народам, а Беларусь, якая мае сваю старажытную дзяржаўнасць і культуру, бачылі толькі як «Северо-Западный край».

Максім Багдановіч выступаў з навуковымі і публіцыстычнымі артыкуламі на тэму стану беларускай мовы і культуры, звяртаўся з патрабаваннем адраджэння і ўзнясення беларускай літаратуры, беларускага мастацтва на еўрапейскі ўзровень (*Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XV сталецця*, *Белорусское возрождение*, *Забыты шлях*). У артыкуле *Забыты шлях* паэт сцвярджаў: „Беларускіх вершаў яшчэ не было, але яны павінны быць, і будуць! Як кожны народ мае сваю нацыянальную душу, так ён мае і свой асабісты склад (стыль) творчасці, найбольш прыдатны да гэтай душы. Ёсць ён і ў нас, беларусаў, і мы

мусіма звярнуцца да яго...”». І Багдановіч стварыў твор сапраўды беларускі па духу, і па форме. Гэта – *Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык*. І для дзяцей, і для дарослых.

Ён умеў прысвоіць беларускай мове чужыя словы і лепшыя здабыткі чужой культуры. У апавяданні *Апокрыф* святы Пётр і святы Юр’я разам з Хрыстом вандравалі па ўсім Забраным Краі, прыглядаліся, як людзі працуюць у час жніў. Адзін музыка адчуваў сябе няёмка, сорамна яму было, што не працуе. Хрыстос стаў навучаць музыку і асведамляць яму значэнне песні ў жыцці і працы народа.

З поглядам Хрыста не згаджаўся святы Пётр і Ісусу трэба было выясніць ролю красы на прыкладзе сіняй кветачкі, якая расце ў жыце і хаця ёсць пустазеллем, але цешыць вока жнеек. Назву гэтай кветкі Багдановіч «прышчапіў» беларускай мове і з той пары «цвяток радзімы васілька» стаў «сапернікам» спрадвечна беларускай «валошкі». Максім Багдановіч увёў у беларускую паэзію такія жанры: акраверш, санет, трыялет, гекзаметр, пентаметр, рандо, тэрцына, актава. Ён першы ўвёў у беларускае вершаскладанне форму верлібра. Яшчэ ў 1915 годзе Багдановіч сказаў, што няма ні жанраў, ні памераў, якія б не магла засвоіць беларуская мова.

❖ У вершы ****Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...* М. Багдановіч паказаў сябе майстрам санета. У першых васьмі радках расказваеца пра зярняткі, якія праляжалі ў магіле на беразе Ніла некалькі тысяч гадоў, але іх жыццядайная сіла не загінула. Трапіўшы ў вільготную глебу, зярняткі ўскаласіліся. У другой частцы санета паэт параўноўвае зерне да беларускага народа, які пакуль спіць, але прыдзе час і абудзіцца.

Максім Багдановіч

Санет

Un sonnet sans défaut
vaut seul un long poème.

Boileau*

Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі,
Над хвалямі сінеючаго Ніла,
Ўжо колькі тысяч год стаіць магіла:
Ў гаршку насення жменю там знайшлі,

* Словы Буало ў перакладзе на беларускую мову гучаць: «Беззаганны санет варты адзін цэлай паэмы»

Хоць зернейкі засохшымі былі,
Усё ж такі жыцьцёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясеньняй збожжа на раллі.

Вось сімбал твой, забыты краю родны!
Зварушаны нарэшце дух народны,
Я верую, бясплодна не засне,

А ўперад рынецца, маўляў крыніца,
Каторая магутна, гучна мкне,
Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца.

1911 г.

1 Прачытай тэкст. Што, на тваю думку, сімвалізуе, знойдзенае ў Егіпецкай зямлі, зерне?

2 Чаму санет называем адной з цвёрдых формаў верша?

3 Выясні суадносіны, вынесенай у эпіграф думкі Буало з творам Максіма Багдановіча.

4 Правер, ці верш ***Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі..., напісаны згодна з дэфініцыяй санета?

«Санет на беларускай мове гэтак жа лёгка і зграбна выражае і даносіць думкі і пачуцці, як санеты славутых італьянскіх і французскіх майстроў» – сцвярджаў М. Багдановіч.

«Восеньскі матыў», 1990. Алег Скавародка

❖ Верш *Слуцкія ткачыхі* ўключыў Багдановіч у цыкл *Старая Беларусь*. Творы гэтага цыкла паўставалі ў час побыту паэта ў фальварку Ракуцёўшчына (1911), дзе ён адчуў багацце беларускай мовы, пазнаў душу народа. У вершах гэтага цыкла (*Летапісец*, *Перапісчык*, *Кніга*, *Слуцкія ткачыхі*, *Безнадзейнасць*, ****Ціхі вечар...*,****Па ляду, у глухім бары...*) М. Багдановіч паэтычна ўвекавечыў мінуўшчыну беларускага народа, засцерагаючы такім спосабам ад забыцця каштоўныя здабыткі нацыянальнай культуры.

Максім Багдановіч

Слуцкія ткачыхі

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.
І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.
А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна, –
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрам ззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага узора,
Цвяток радзімы васілька.

1912

1 У творы сутыкаюцца два вобразы: родныя нівы і панскі двор. У чым заключаецца канфлікт між імі?

2 Галоўная тэма верша – любоў да Радзімы. У чым яна праяўляецца? Што ў вершы сімвалізуе васілёк? Знайдзі ў тэксце стылістычныя тропы. Якая іх роля?

3 Якія канкрэтныя гістарычныя факты сталі стымулам да напісання верша *Слуцкія ткачыхі*? Што ў вершы не адпавядае гістарычнай праўдзе?

Максім Багдановіч

Кніга

Псалтыр, пакрытую няжорсткай, бурай кожай,
Я ўзяў і срэбныя засцёжкі адамкнуў,
Перачытаў радкі кірыліцы прыгожай
І воску з ладанам прыемны пах пачуў.

Вось псальма слічная. «Як той алень шукае
Крыніцы чыстай, так шукаю Бога я».
Як вее свежасцю яе краса жывая!
Як радасна далей спяшыць душа мая!

І бачу я ў канцы няхітрую прыпіску,
Што «кнігу гэтую раб Божы, дзяк Гапон,
Дзеля душы спісаў у месце Ваўкавыску
У рок сем тысяч сто васьмы з пачатку дзён».

1912

• ладан – пахучая смала некаторых трапічных дрэў, выкарыстоўваецца для абкурвання ў час рэлігійных абрадаў

1 Чаму, на тваю думку, верш Максіма Багдановіча *Кніга* ўвайшоў у цыкл *Старая Беларусь*?

2 Якое значэнне мае мінуўшчына для сучаснасці і ці, ўвогуле, патрэбнае веданне гісторыі?

Максім Багдановіч

* * *

De la musique avant toute chose.
P. Verlaine*

Па-над белым пухам вішняў,
Быццам сіні аганёк,
Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі
Сінякрылы матылёк.

Навакол усё паветра
Ў струнах сонца залатых, –
Ён дрыжачымі крыламі
Звоніць ледзьве чутна ў іх.

---

* «Музыка перш за ўсё.» П. Вэрлен (фр.)

І ліецца хваляй песня, –
Ціхі, ясны гімн вясне.
Ці ня сэрца напявае,
Навявае яго мне?

Ці ня вецер гэта звонкі
Ў тонкіх зёлках шапаціць?
Або мо сухі, высокі
Ля ракі чарот шуміць?

Не паняць таго ніколі,
Не разведаць, не спазнаць:
Не даюць мне думаць зыкі,
Што ляцяць, дрыжаць, звіняць.

Песня рвецца і ліецца
На раздольны, вольны свет.
Але хто яе пачуе?
Можа, толькі сам паэт.

1910

1 Якімі сродкамі выяўлена ў вершы гармонія формы і зместу?

2 Верш ****Па-над белым пухам вішняў...* прысвечаны абуджэнню прыроды да жыцця, яе красе і непаўторнасці. Пры дапамозе якіх сродкаў аўтар выявіў гэты малюнак?

3 Якую ролю ў творы адыгрывае музыка?

4 У чым праяўляецца імпрэсіяністычны характар верша Максіма Багдановіча?

Сімвалізм – напрамак у літаратуры і мастацтве канца XIX і пачатку XX ст., прасякнуты індывідуалізмам і містыцызмам, які адлюстроўваў рэчаіснасць як ідэальную сутнасць свету ва ўмоўных і абстрактных формах. На месца мастацкага вобраза імкнуўся ён паставіць сімвал.

Імпрэсіянізм – плынь у мастацтве і літаратуры канца XIX і пачатку XX ст., прадстаўнікі якой імкнуліся да непасрэднай перадачы суб'ектыўных адчуванняў, мімалётных уражанняў і настрояў. Адлюстроўвалі не столькі навакольны свет, колькі ўласныя пачуцці, суб'ектыўны вобраз убачанага і адчутага. Выступаў у некаторых творах Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Змітрака Бядулі.

❖ Верш *Завіруха* ўпершыню быў надрукаваны ў зборніку *Вянок* (цыкл *Места*). Вершы гэтага цыкла напісаны на аснове матэрыялаў і ўражанняў, звязаных з першай паездкай М. Багдановіча ў Вільню летам 1911 года. Паэт з захапленнем апісваў у ім разнаколернасць гарадскога краявіду і жыцця.

Максім Багдановіч

Завіруха

У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе,
І спеў ліецца ўсё мацней, –
Гулянку справіў пан Падвей.
У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.
Ўскіпела снежнае віно,
І белай пенай мкне яно.
У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.
Па вулках вее дзікі хмель,
Гудзіць сп'янелая мяцель.
У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.

1911

1 Вызнач, пры дапамозе якіх моўных сродкаў перадаюцца ў вершы водгукі завірухі.

2 Вызнач ролю паўтораў у вершы.

3 Верш Максіма Багдановіча *Завіруха* з'яўляецца ўзорам урбаністычнай лірыкі. Прывядзі прыклады, якія пацвердзяць гэтую думку.

Максім Багдановіч

Пагоня

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, –
Ўспомню Вострую Браму святую
І ваякаў на грозных канях.

Ў белай пене праносяцца коні, –
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

У бязмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі – гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі уздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?

Бійце ў сэрцы іх – бійце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...

Маці родная, Маці-Краіна!
Не усцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, ты прыймі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!

Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

1916

Герб Пагоня на траяку Жыгімонта II Аўгуста

1 Апішы значэнне слова «пагоня».

2 Параўнай значэнне слова з выявай конніка з мячом над галавой на гербе БНР. Што сімвалізуе гэтая выява?

3 Аб якой будучыні марыць лірычны герой? Якія ў яго адносіны да роднай зямлі?

4 На што мае надзею лірычнае «я», гаворачы аб «дзецях» Беларусі?

❖ Верш Максіма Багдановіча *Пагоня*, дзякуючы выкарыстанню ў ім старажытнага гербу Пагоні злучае ўсе мінулыя эпохі з сучаснасцю. Прадстаўленне рыцара з узнятым мячом стала сімвалам патрыятызму, веры ў лепшую будучыню Беларусі і беларусаў. Спосаб прадстаўлення гербу ў вершы з'яўляецца доказам вялікай пашаны паэта для гісторыі Беларусі. У паэтычным уяўленні старадаўнія воіны Пагоні, гэта змагары супраць нацыянальнай здрады беларусаў, якія забылі хто яны.

У невялікім вершы паэт акумуляваў усё мінулае, паказаў, якім шляхам павінна ісці Беларусь да сваёй светлай будучыні. Лірычны герой заклікае быць вернымі сынамі і дочкамі свайго народа, захоўваць тую спадчыну, якую пакінулі продкі.

паводле Васіля Старычонка

❖ Паходжанне герба «Пагоня» сягае ўглыб стагоддзяў і семантычна звязана са старажытнаславянскай ваеннай традыцыяй народнай пагоні – найважнейшай функцыяй арганізацыі жыцця і побыту ўсходнеславянскіх плямёнаў, калі кожны чалавек быў у адказе за жыццё супляменніка. У выпадку раптоўнага нападу праціўніка і захопу ў палон членаў абшчыны кожны мужчына, які меў права насіць зброю, быў абавязаны пешкі або конна кідацца ў пагоню за ворагам, каб адбіць палонных. Ва ўмовах ваеннай дэмакратыі традыцыя народнай пагоні выконвалася безумоўна і захоўвалася стагоддзямі таксама ў часы ВКЛ. Пад уплывам еўрапейскай геральдыкі і рыцарскіх традыцый ідэя абароны Бацькаўшчыны, сфарміраваная ў традыцыі народнай пагоні, увасобілася ў графічны сімвал – герб «Пагоня».

паводле Міхаіла Ткачова

Максім Багдановіч

* * *

Больш за ўсё на свеце жадаю я,
Каб у мяне быў свой дзіцёнак –
Маленькая дачушка-немаўляшка,
Аня Максімаўна,
Такая прыгожанькая,
Цёпленькая, мокранькая,
З чорнымі валосікамі і броўкамі,
З цёмна-карымі вочкамі,
А ручкі, як перацягнутыя ніткамі.
Зусім такая, як Вы,
Калі Вы былі маленькай дзяўчынкай.
Немаўляшка – немаўля, малое дзіця

1912

1 Паэт, калі пісаў гэты верш, быў ужо цяжка хворы. Як думаеш, чаму лірычнага героя так моцна захапляе нованароджанае дзіця?

2 Гэты твор нагадвае вершы з цыкла *Каханне і смерць*. Раскрый на яго аснове тэму кахання.

3 М. Багдановіч увёў у беларускую літаратуру прыгожы вобраз жанчыны-Мадонны. Наколькі гэты матыў характэрны вершу ****Больш за ўсё на свеце жадаю я...*?

Максім Багдановіч

* * *

Даўно ўжо целам я хварэю,
І хвор душой, –
І толькі на цябе надзея,
Край родны мой!
У родным краю ёсць крыніца
Жывой вады.
Там толькі я змагу пазбыцца
Сваей нуды.
Калі ж у ім умру-загіну, –
Не жалюсь я!
Не будзеш цяжкая ты сыну
Свайму, зямля.
Там хоць у гліне, хоць у брудзе,
Там, пад зямлёй,
Найдуць мае слабыя грудзі
Сабе спакой.

1912

Прыхадскія могілкі ў Дубічах-Царкоўных

• нуда – туга

1 У сваёй творчасці Максім Багдановіч закранаў філасофскія тэмы – жыцця і смерці. У некалькіх сказах дапоўні гэтую думку.

2 Якое значэнне для хворага паэта мае Беларусь?

3 Ці, паводле цябе, лірычнага героя можам атаясамліваць з аўтарам верша? У чым бачыш падабенства?

4 Вершы Максіма Багдановіча знаходзяцца ў зборніку *Вянок. Вершы, паэмы*, Мінск 1994. Прачытай іншыя вершы паэта.

❖ Асобнай старонкай творчасці Максіма Багдановіча былі апавяданні *Апокрыф* (1913) і *Апавяданне аб іконніку і залатару...* (1914). Абодва прысвечаныя тэме мастацтва, абодва стылізаваныя на ўзор скарынаўскіх прадмоў і пасляслоўяў да Бібліі.

Апокрыф

1. Ад Максіма Кніжніка пачатак...

2. І калі скончылася сем тысяч год ад стварэння свету, Хрыстос ізноў зышоў на зямлю і хадзіў па ёй, каб споўнілася тое, аб чым сведчылі прарокі.

3. І хадзіў Ён па ўсім Забраным Краі і па Занёманшчыне, і па Задзвіншчыне, і па Бярэзінскай зямлі.

4. І разам з ім святы Пётра і святы Юр'я. Але ніхто з людзей не пазнаваў Яго.

5. Бо ішлі яны босымі нагамі з непакрытымі галовамі і былі адзетыя ў белы кужаль ды суконныя світкі, а не таго спадзяваліся людзі.

6. Таму ніхто не ўзяў увагі на іх, калі ў часе жніва праходзілі між працуючых людзей.

7. Толькі музыка, катораму цяпер не было чаго рабіць, падыйшоў да іх і сказаў: сорамна мне, бо сягоння дзень працы і ўсе клапоцяцца каля зямлі; адзін я нікчэмны чалавек.

8. І сказаў яму Хрыстос: не смуціся ў сэрцы сваім. Ці ж не твае песні спяваюць яны цяпер, у часе жніва! Таму не схіляй нізка галавы твае, і не хавай аблічча ад вачэй людскіх.

9. Бо няма праўды ў тым, каторы кажа, што ты – лішні на зямлі. Запраўды кажу я табе: надыйдзе яму гадзіна горычы – і чым ён разважыць тугу сваю, апроч песні твае? Як у дзень смутку, таксама ў дзень радасці ён прызавець цябе.

10. І навучаючы яго, казаў: пад песні кладуць чалавека ў калыску, і з спевамі ж апушчаюць у магілу яго.

11. Штодзённымі клопатамі поўніцца жыццё людское. Але калі зварухнецца душа чалавека, – толькі песня здолее спатоліць яе. Шануйце ж песні свае.

12. Бо спяваюць навет і жабы ў багне, а ці ж не лепшымі будзеце вы за іх?

13. Так навучаў Хрыстос музыку. Але Пётра, пачуўшы словы яго, сказаў: Вучыцелю, у гэтай краіне ёсць людзі, каторым няма чаго есці. Ці ж не сціснецца ад сораму сэрца таго чалавека, каторы, шукаючы скарынкі хлеба, прыйдзе з песняй да іх?

14. У адпаведнасці яму, сказаў Хрыстос: так, жыццё гэтых людзей цяжкое, беднае і прыгнечанае. Чаму ж ты хочаш яшчэ пазбавіць іх красы! Мала дадзена ім – няўжо ж трэба, каб было яшчэ менш?

15. І, абярнуўшы аблічча сваё да музыкі, папытаўся: калі пяюць песні ў вас?

16. Музыка адказаў: пяюць на Каляды, на Запускі, на Вялікдзень, на Тройцу, на Яна Купалу, у Пятроўку, на зажынках і дажынках.

17. Пяюць на радзінах і хрэсьбінах, пяюць дзіцё калыхаючы, і самі дзеці пяюць гуляючы; пяюць на ігрышчах і вяселлях, і на хаўтурах, і ў бяседзе, і пры працы, і на вайну ідучы, і ўва ўсякай іншай прыгодзе. Увесь круглы год пяюць.

18. І мовіў Хрыстос Пятру: ты, шкадуючы галодных людзей, асудзіў песню, але самі галодныя не асудзілі яе. Жывая яшчэ душа ў народзе гэтым.

19. Тады ізноў сказаў Пётра: але няхай жа ў песнях будзе страва для душы, няхай будуць думкі добрыя і навучаючыя, каб апроч красы, быў у іх і спажытак чалавеку.

20. І адказаў яму Хрыстос: няма красы без спажытку, бо сама краса і ёсць той спажытак для душы.

21. І навучаючы іх, мовіў: агляніцеся навокал! Ці ж не ніва калыхаецца каля нас?

22. Цяжка каля яе працаваў гаспадар і, вось бачыць: паміж збожжа ўзраслі васількі.

23. І сказаў ён у сэрцы сваім: хлеб адбіраюць у мяне гэтыя сінія кветкі, бо поўнаважкія каласы маглі б узрасці тут заміж васількоў.

24. Але, яшчэ з маляцця краса іх прыйшлася мне да душы. І таму я не вырву з каранём іх і не выпляню, як усякае благое зелле. Няхай растуць і радуюць, як у маленстве, сэрца маё.

25. Так казаў сабе гаспадар у сэрцы сваім! І не падняў ён рукі на васількі.

26. Я ж кажу вам: добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?

27. І, кажучы так, пачуў Ён песню жнеек, і прамовіў: слухайце што кажуць словы гэтай песні. Яе складалі людзі, якія ведаюць, чаго варты хлеб.

28. Яны ж пачулі, што словы тэй песні кажуць: няма лепш цвяточка над васілёчка. І далей ужо моўчкі ішлі яны.

29. І босыя ногі Хрыста пакідалі на цёплым, мяккім пылу дарогі сляды.

30. Але гора вам, людзі, бо даўно ўжо затапталі вы іх.

Амін.

Рукапіс гэты адшукаў Максім Багдановіч

1 Звярні ўвагу на словы Хрыста пра значэнне мастацтва.

2 У якой ступені праблематыка *Апокрыфа* адносіцца да пытання аб значэнні мастацтва ў чалавечым жыцці?

3 Выкажы свой погляд на тэму прыгажосці ў мастацтве.

4 Што абазначае сімвал васілька ў *Апокрыфе*?

Апокрыф – старажытны твор з біблейскім сюжэтам, у якім дапушчаны адступленні ад афіцыйнага веравучэння і таму адхілены Царквой. Вызначаўся паэтычнасцю, багаццем вымыслу, ён блізкі да фантастычных казак і народных легенд.

❖ М. Багдановіч вядомы таксама як крытык і даследчык беларускай нацыянальнай культуры. Сярод лепшых публіцыстычных твораў знаходзяцца артыкулы *Белорусское возрождение* (1915), *Глыбы і слаі* (1911), *За тры гады* (1913), *Забыты шлях* (1915) і інш.

Максім Багдановіч

Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI стагоддзя
(Фрагмент)

§ 1. [...]

Беларускі ж народ, цалкам увайшоўшы ў Літоўскае гасударства, развіваўся, як і раней, на старым корані, вытвараючы такім парадкам культуру незалежную ад культуры велікарускай і з самага ж пачатку адражняўшуюся ад яе. Адным з бакоў гэтага развіцця быў узрост беларускай пісьменнасці, каторая з таго часу патроху становіцца на пэўны грунт.

§ 2. Спачатку на Беларусі, як і ў іншых расійскіх краях, пісалі толькі так званай «царкоўнаславянскай» мовай. [...]

Такім парадкам фарміраванне нашай пісьменнасці было марудным, [...] але з яго і пачынаецца гісторыя беларускай пісьменнасці.

[...]

§ 5. [...] Будучы больш развітай ад культуры літоўскай, яна пераважыла гэтую апошнюю на вагах гісторыі, так што ўсё гасударственнае жыццё Вялікага княжаства адбывалася ў беларускіх нацыянальных формах, – літоўскім было

тут адно толькі названне, адзін толькі этыкет; на беларускай гаворцы ішоў суд, пісаліся акты і граматы, вяліся перагаворы з чужаземнымі гасударствамі; па-беларуску размаўлялі і вялікія князі і баяры, нават літоўцы родам, бо абеларушыванне іх ішло тады поўным ходам; звычайна, што свае духоўныя патрэбнасці яны задавальнялі з кніг у беларускай мове [...]

1 Якое значэнне ў Вялікім Княстве Літоўскім мела беларуская мова? Якія літаратурныя творы паўсталі у той жа перыяд на старабеларускай мове? Як развівалася пад уладаннем літоўскіх князёў беларуская культура і літаратура?

Максім Багдановіч

Хто мы такія?
Ліст да простых людзей

«Зіма ў Ракаве», 1982. Леанід Шчамялёў

– Хто вы такія? Што вы за народ?

Так пытаюцца ў нас, простых людзей. Але мы і самі не ведаем.

Вакол усе кажуць: я – паляк, я – літвін, я – жыд. А мы нават імя свайго народа забыліся. Вось і адмаўляем: я – праваслаўны, я – каталік. Але ж гэта названне нашай веры, а не нашага народа.

Каталікі часам прабуюць звацца палякамі, бо вера ў іх тая ж. Але варт толькі пачуць польскую гаворку, каб праканацца, што гэта не такі народ, як мы.

Другія, а надта праваслаўныя, называюць сябе рускімі. Але калі глянуць на рускіх з-пад Масквы або з-пад Кіева, дык шмат у чым пабачым рожніцу між намі ды імі.

Гэта таму, што рускіх народаў тры. Усе яны аднаго кораню, але шмат часу жылі паасобку, і так сталася з іх тры розных рускіх народы; у кожнага – сваё найменне, свая гаворка, свае звычаі, свае песні, свая вопратка.

Адзін рускі народ жыве пад Масквою і далі; завецца ён в е л і к а р у с к і м. Другі жыве пад Кіевам і завецца ў к р а і н с к і м.

Мы – трэці народ рускага кораню, завёмся б е л а р у с а м і, і старонка наша завецца Б е л а р у с ь. Ёсць паміж нас праваслаўныя, ёсць і каталікі, але народ з нас адзін, бо ўва ўсіх адна гаворка, адны звычаі, адны песні, адна вопратка, адзін лад жыцця.

Беларусы! Мы – вялікі народ, нас дванаццаць мільёнаў, шырока раскінуліся мы і спрадвеку жывём тут. Гэта наш край, наша старонка. Калісьці ў нас было сваё гасударства, скрозь чутно было нашу беларускую гаворку. У ёй пісалі законы, разбіралі справы па судах, вучылі ў школах, друкавалі кнігі, спраўлялі набажэнствы ў царквах ды касцёлах. І ўсе размаўлялі па-нашаму: і чыноўнікі, і папы, і паны над панамі, і вялікія князі, што правілі гасударствам.

Праз соткі год жылі мы так, не даючыся нікому; але, урэшце, перамаглі нас палякі і запанавалі ў нашай беларускай старонцы. А калі знішчылі Польшчу, дасталіся мы Расіі.

Жывём мы паміж палякаў і велікарусаў, народаў моцных, і маем шмат крыўды ад іх. Бо ёсць велікарусы, што намагаюцца, каб мы забыліся на ўсё сваё, беларускае, выракліся яго ды звярнуліся ў велікарусаў, гаварылі б і жылі па-іхняму. Ёсць і палякі, каторыя таксама хочуць змяніць нас на свой капыл, каб і мы сталіся палякамі.

Агляніцеся: усё наша роднае, беларускае, марнуецца, нішчыцца, знікае, бо яго забіваюць, яго прыглушаюць, ім пагарджаюць, а чужое пануе, пышаецца, мае сабе пашану і павагу. І – хто ведае? – быць можа, пройдзе колькі часу, і не пазнаем мы ані нашага краю, ані нашых дзяцей. І будзе скрозь усё чужое, нязвычнае, а свайго роднага – нічога.

Дык няхай жа не станецца так! Не пакінем свае гаворкі, сваіх песняў, сваіх звычаяў – свайго кроўнага, спрадвечнага, беларускага. Не адракомся, не забудзем, не кінем на глум; будзема шанаваць, бараніць, дзецям сваім аб тое запаведаць.

Нялёгка нам вытрываць. Мы людзі цёмныя, людзі бедныя. Цяжкае наша жыццё, горкі наш хлеб, вялікую крыўду маем мы. Ёсць шляхі да лепшай долі, ды не бачым мы іх праз сваю цемнату. Але не ўсягды будзе так! Чытайма, браткі, кніжкі і газеты, пісаныя ў нашай беларускай гаворцы. Тады прыйдзе канец нашай цемнаце, праясняцца нашыя вочы, і кожны крок, што мы ступім па зямлі, будзе крокам да блізкага шчасця, да светлага жыцця.

1 Чаму артыкул атрымаў падзагаловак *Ліст да простых людзей*?

2 Максім Багдановіч пісаў у артыкуле: «А мы нават імя свайго народа забыліся. Вось і адмаўляем: я – праваслаўны, я – каталік. Але ж гэта названне нашай веры, а не нашага народа». Як разумееш гэтыя словы? Ці выказванне пісьменніка сёння актуальнае? Абгрунтуй свой адказ.

3 «Калісьці ў нас было сваё гасударства, скрозь чутно было нашу беларускую гаворку. У ёй пісаліся законы, разбіралі справы на судах, вучылі ў школах, друкавалі кнігі, спраўлялі набажэнствы ў царквах ды касцёлах» – пісаў М. Багдановіч. Да якога перыяду ў жыцці беларускага народа адклікаецца паэт? Якое стагоддзе называюць «залатым» для беларускай культуры?

4 Знайдзі ў тэксце адказ на пытанне *Хто мы такія?*

Максім Багдановіч

За сто лет

Нарыс гісторыі беларускай пісьменнасці ля істокаў

Адраджэнне беларускай пісьменнасці належыць да першых гадоў XIX-га сталецця, калі паміж нашай краёвай шляхты патроху пачала вырабляцца інтэлігенцыя. Гэтым іменем мы адзначаем свядомых людзей, нясушчых сваю свядомасць на карысць простага народа нават і проці ўласнага інтарэсу. Такім чалавекам у тую пару быў, напрыклад, маршалак Завіша, каторы ў 1818 г. на Вільненскім шляхоцкім сейме сказаў шчырую прамову аб скасаванні прыгону, і п. Храптовіч, звольніўшы сваіх мужыкоў ад яго, і п. Бжастоўскі, што зрабіў тое ж самае, і інш. Не шмат было гэткіх людзей, але лік іх увесь час узрастаў, чаму асабліва памагала праца Вільненскага універсітэта, адчыненага ў 1803 г.

Патроху паміж нашай шляхты пачалі варушыцца новыя думкі, нараджаліся новыя паняцці, з'яўлялася ўвага да простага народа, народа беларускага. Вялізнае значэнне для ўмацавання ўсяго гэтага мела пракаціўшаеся тады па Еўропе рэха ад французскай рэвалюцыі. Нязлічанымі, нявідзімымі пуцінамі прасачываўся яе дух у тагачаснае жыццё, усюды спараджаючы і гуртуючы інтэлігенцыю. Гэтая апошняя з'явілася нават у многіх даўно ўжо замёршых народаў і пачала жывую працу над развіццём іх культур, ці, іншымі словамі, над іх нацыянальным адраджэннем. Але ў нас пры надзвычайнай слабасці інтэлігенцыі і пры поўнай неразвітасці яе беларускіх нацыянальных пачуванняў, у нас, кажу я, усё абмежылася некалькімі крокамі, ды і тыя былі зроблены толькі дзякуючы дзе-якім асаблівым умовам тагачаснага жыцця. У тую пару якраз ішло гарачае змаганне маскалёў з палякамі [і абое яны] мусілі згадаць аб даўно ўжо забытым беларускім народзе, апрыч таго, гэтая завіруха збудзіла ў многіх людзей, найбольш са спольшчанай шляхты, пачуццё грамадзяніна, пачуццё любві да роднай старонкі; старонкай жа гэтай для іх была не Варшаўшчына, не Кракаўшчына, а наша беларуская зямля, беларускія казкі і песні, што чулі яны змалку, пушчы, азёры і рэкі нашага краю, народ беларускі, паміж каторага яны ўзгадаваліся, нават беларуская мова, да като-

рай была прыхільна ў хатніх гутарках старасвецкая шляхта – усё гэтае зраслося з іх душою, і, згадаўшы аб роднай старонцы, Беларусь бачылі яны.

Гэты краёвы патрыятызм выказаў сябе паміж іншым у вучоных працах, датыкаючых нашай зямлі, за што трэба сказаць дзякуй перш за ўсё Вільненскаму універсітэту, меўшаму бліскучых сіл. З людзей, працаваўшых па беларускай археалогіі, трэба адзначыць брацціяў Тышкевічаў, Пржэздзецкага, Кіркора; з гісторыкаў – Бандтке, Лукашэвіча, Балінскага, Ліпінскага, Нарбута, Ярашэвіча, Даніловіча і інш., з этнографаў – Ліндэ [Хадакоўскага], Чарноўскую, Шыдлоўскага, Фалютынскага, Мухлінскага, Галэмбёўскага, Рыпінскага, а асабліва Чачота і Зянькевіча; праўда, гэтыя вучоныя, як і ўся тагачасная польская інтэлігенцыя, лічылі Беларусь польскім краем, дый думалі, што развіваючыся, беларусы мусяць прыстаць да польскай культуры, і рана ці позна, а саллюцца-такі з польскім народам; але ўсё ж такі яны, гаворачы аб нашым краі, так ці сяк, а памагалі выраблению пачаткаў нацыянальна-беларускага самапачуцця між краёвай інтэлігенцыяй, а такжа і лепшаму пазнанню беларускай мовы.

У краснай пісьменнасці гэты ж самы рух выліўся ў розных творах, маляваўшых польскай мовай жыццё беларускіх сялян і дробнай шляхты, чаму з саракавых гадоў вельмі спрыяў апанаваўшы ў той час рамантычны кірунак, прадстаўнікі каторага цікавіліся народнымі творамі і народным жыццём. На страніцах журналаў пачалі з'яўляцца беларускія казкі і песні, у апавяданнях з краёвага жыцця ўвесь час спатыкаліся беларускія выразы іншы раз гутаркі дзе-якіх асоб пераказываліся нават цаліком па-беларуску; а адсюль ужо недалёка і да чыста беларускіх твораў. Але яны не маглі мець колькі-небудзь паважнага значэння, бо караніліся не ў шырокіх грамадзянскіх патрэбнасцях, а ў прыхільным душэўным настроі гуртка асоб, зросшыхся з польскай ці іншы раз расійскай культурай, да народа ж гэтыя творы бадай што не даходзілі […]

- «Нашая краёвая шляхта» – гэта шляхта, якая жыла на тэрыторыі сённяшняй Беларусі, у Вялікім Княстве Літоўскім
- журнал – часопіс
- караніцца – мець сваю аснову

1 Пра якія важныя для беларускага народа факты ўспамінае ў сваім артыкуле Максім Багдановіч?

2 Якое значэнне для развіцця беларускай культуры мела адкрыццё ў 1803 годзе Віленскага ўніверсітэта?

3 На аснове артыкула вызнач значэнне дзейнасці Яна Чачота для беларускай культуры.

Змітрок Бядуля (1886-1941)

Змітрок Бядуля (сапр. **Самуіл Плаўнік**) нарадзіўся ў вёсцы Пасадзец на Лагойшчыне ў сям'і арандатара. Вучыўся ў пачатковай яўрэйскай школе – хедары, у школе рабінаў – ешыбоце. У 1912 г. пераехаў у Вільню. Быў сакратаром газеты «Наша ніва», прымаў удзел у працы беларускіх культурных арганізацый.

Дэбютаваў паэт на старонках «Нашай нівы» лірычнай імпрэсіяй *Пяюць начлежнікі* (1910). Мініяцюры Змітрака Бядулі часцей друкаваліся на старонках газеты. Лірычныя імпрэсіі-мініяцюры састаўлялі таксама змест першага зборніка *Абразкі* (Пецярбург, 1913). У жанравых адносінах набліжаюцца да вершаў у прозе, у якіх беларуская вёска, селянін і прырода паказаны ў рамантычным асвятленні. Характэрным для зборніка *Абразкі* было: вострае адчуванне прыроды, захапленне яе прыгажосцю, паэтызацыя вясковага побыту, спачуванне цяжкаму жыццю і асуджэнне сацыяльнай несправядлівасці (*Пастушка, За тканінай*, *Удосвітку*).

Другі этап у творчасці Бядулі адзначаецца паяўленнем сацыяльна-бытавых апавяданняў (*Пяць лыжак заціркі*, *Малыя дрывасекі*, *На каляды к сыну*, *Велікодныя яйкі* і інш.). У апавяданнях пісьменнік-рэаліст паказвае цёмную, забітую вёску і яе невыносную галечу. Большасць з іх заснавана на драматычным сюжэце з паэтызацыяй незвычайных абставін і незвычайных герояў, з трагічным фіналам (*Малыя дрывасекі*). У некаторых навелах трагічнае спалучаецца з камічным (*Гора удавы Сымоніхі*). З гумарам паказана празаікам галоднае жыццё мнагадзетнай сялянскай сям'і ў апавяданні *Пяць лыжак заціркі*. Камічныя ноты, пра якія можна сказаць, што гэта «смех праз слёзы», падкрэслівае аўтар дзвюма рэмаркамі на тэму вымярэння шчасця і няшчасця. Сціплае выказванне аб шчасці абвастрае паказ сялянскай беднаты. Не менш глыбока ўражваюць бытавыя гісторыі, прадстаўленыя ў апавяданнях *Сымон*, *Летапісец*, *Вялікодныя яйкі*. У час І сусветнай вайны Бядуля жыў і працаваў у Мінску. Дзейнічаў у Камітэце дапамогі ахвярам вайны. У публіцыстычных і літаратурных творах гэтай пары паэт рэзка асуджаў вайну (апавяданне *Велікодныя яйкі*, верш *Арліхі*). Працаваў у газеце «Савецкая Беларусь», рэдагаваў часопіс для дзяцей «Зорка». Выдаў шматлікія зборнікі: паэзіі (*Пад родным небам*, *Буралом*), прозы (*Дэлегатка*, *Тры крыжыкі*), аўтабіяграфічныя аповесці (*Набліжэнне*, *У дрымучых лясах*), раман *Язэп Крушынскі*.

На каляды к сыну

Хмаркі насіліся над лесам.

Розныя па колеру і фасону, яны часта ахаплялі вялікую частку неба і тварылі багатыя малюнкі к таемным казкам сталетняга лесу.

Удзень былі яны светла-пурпурныя, а ўночы залаціліся месяцам.

Чаго-чаго ў іх ні было!

Цэлыя гарады з дзіўнымі замчышчамі, горы, выспы, азёры, агнёвыя звяры, працэсіі святых у белых вопратках, незлічоныя легіёны ваякаў на конях.

Унізе лес гаварыў свае адвечныя гутаркі. Часам ён маліўся ціха-ціха, і толькі нейкі гук, нібы вокліч далёкага звону, даносіўся з чорнай глыбіні лясной далі.

Часам бываў ён немы, гэтак мёртва немы і спакойны, як бы прыслухоўваўся да нейкіх таемных падземных спеваў.

На хмаркі і на лес часта любіла пазіраць старая ўдава Тэкля, жонка нябожчыка Цыпрука, палясоўшчыка пана Шчубальскага.

Жыла Тэкля адна ў старой хатцы, на пагорку ля лесу, хадзіла на падзённую, бокам-скокам, туды-сюды і неяк гадавалася.

Пан не выгнаў яе з гэтай разваленай хаты, хаця пасля смерці Цыпрука наняў новага палясоўшчыка, але таму пабудаваў і новую хату.

Тэкля любіла хадзіць па суседзях – вельмі гутарлівая баба была, але і любіла сядзець адна на прызбе і думаць сваю думку. Яна любіла пазіраць на стары лес і на сівыя хмаркі доўга-доўга, і старыя вочы прыкрываў смутак: успаміны старадаўнія, як цені, лезлі ў яе душу, праляцеўшыя гады маляваліся ёй ясна, жыва, быццам перад вачыма бачыць яна ўсё... Надта шкадаваць пройдзены час няма чаго – помніць яшчэ і цяпер пабоі і лаянкі п'янага Цыпрука.

Затое адну пацеху мае яна, якая гоіць раны, адна надзея, – гэта ядыны сын яе, Лаўручок. Во хто сядзіць у яе грудзях, як верабей у цёплым гняздзе...

Любіла яна сядзець на прызбе, пазіраць старымі вачыма на цёмны лес, на адвечныя хмаркі.

Усё жыццё яна была загнана ўсімі, і калі нават бывалі хвілі радасці, то вочы не пакідалі выразу вечнага смутку.

Думала яна аб сыне сваім, які жыве ў вялікім горадзе, думала і цешылася...

Жыве ён сабе там панам, як людзі кажуць.

Лаўручок яе, быўшы яшчэ хлопчыкам гадоў дзесяці, спадабаўся вельмі пану Шчубальскаму за прыгожы від і спрытны розум. Бяздзетны пан забраў яго к сабе, адзяваў па-панску і, падвучыўшы крыху, аддаў пасля ў горад вучыцца.

У лістах да пана часамі ўспамінаў ён сваіх бацькоў. З радасці і ўцехі яны проста не ведалі, што рабіць.

«Суботні дзень. Лазенька», 1974. Віталь Цвірка

Жартачкі – гэткага ўдалага сына маюць! Першы раз як ён на каляды прыехаў з горада да пана, дык яго бацькі зараз жа прыляцелі на панскі двор і доўга адстойвалі ў кухні, пакуль сынок з'явіўся к ім. Шчасцю іх канца не было, як угледзелі яго ў чорных суконных вопратках з бліскучымі гузікамі, – якраз асэсар! Праўда, калі маці кінулася да яго абдымаць і цалаваць, дык ён засаромеўся крыху і адсунуўся ўбок. Апанеў! – казала потым маці, – і далікатным зрабіўся і гаворыць па-панску!..

„Эт! – гаварыў бацька, – думаеш што, ды і ён панам будзе!.. Глядзі, як ён ужо смяецца з нашай гутаркі ды з нас. Гэта мне не надта падабаецца..."

Маці не звяртала ўвагі на гэта. Слепа радавалася, фанабэрылася перад суседзямі. Скора паны зусім выехалі адгэтуль. З таго часу яны ўжо болей не бачылі свайго Лаўручка.

Тым часам Лаўрук вучыўся далей, як скончыў гімназію, пан выправіў яго на адукацыю ва універсітэт.

Бацькам сваім ён ніколі нічога не пісаў, але пан, аддаўшы ў арэнду двор, усё ж такі сам прыязджаў штогод даведацца і расказваў ім, што Лаўрук вучыцца ў адвакаты.

Цешылася маці:

– Во будзе падмога на старасць!

Цыпрук на гэта ёй часта гаварыў:

– Эт, дурная ты авечка. Яго падмогу сарока хвастом замяце. Чакай ад яго пад старасць пацехі, як ад рабой сучкі яек!

– Замаўчы ўжо! Стары, як малы!

– А ты, брат, баба, зусім дурная авечка! Ці ты не бачыш, што твой Лаўручок зусім чужым зрабіўся для нас з таго часу, як папаў пад панскую апеку. Нешта не цешыць ён мяне.

Цыпрук памёр.

Старая Тэкля асталася адна, і тады яшчэ болей запанавала ў душы яе цяга да сына. Гэта быў увесь яе скарб. Матчына сэрца адкрыла ўсе таемнікі свайго кахання.

Заўсёды, калі была яна адна, думала аб сыне. Суседкам гаварыла, што сынок такі і гэткі, хваліла яго.

Смачна ёй была сухая скарынка хлеба, а без хлеба таксама было добра.

„Эт, – думала яна, – дык што ж там. абы толькі хацела, дык у Лаўручка свайго вунь як зажыла б! Абы толькі захацела!"

– Эх, Тэкля, Тэкля! – гаварылі ёй часта суседкі, – паехала б да сына ў горад! Ці табе гэтак і век свой дажываць? Ты ж адна, як корч той на пасецы!

– Не бяда! – адказвала яна, – абы толькі захацела! Мой Лаўручок гэткі багаты, як людзі кажуць, што бадай багацей за самога пана Шчубальскага! Абы толькі захацела!

Прайшло яшчэ пару гадоў. Зрабілася Тэкля сухой, нізенькай, згорбленай бабулькай, зморшчанай, як той грыб.

– Вось дурная! – казалі людзі, – мае гэткага багатага сына, а сама бадзяецца невядома як і дзе!

Падышлі каляды.

Увесь абшар быў пакрыты снегам. Вёскі занесены гурбамі, быццам казачныя замчышчы. А лес зрабіўся сівым і паважным.

Апошнія каляды: зусім ужо я слабенькая.

Не хацелася ёй адной астацца ў пустцы каля лесу і пад выццё ваўкоў куццю ладзіць.

І давай, быццам гарачыя вуголлі, закрытыя попелам, выгартаць з сэрца наверх свае захаваныя жаданні, сваю глыбокую веру ў даражэнькага сына.

„Давай, – думае, – дабяруся ўжо да яго. Бадай, ці дацягну да вясны. Шмат дакучаць яму не буду, бо дзе яму там клапаціцца аба мне, і шкада ж яго."

– Пайду да сына! – разнясла яна назаўтра па ўсёй аколіцы і гэтак намалола ім рознай гутаркі, што проста ўсіх суседзяў зайздрасць прабрала: жартачкі, гэткага сына мае! Ён там у судах цэлы асэсар, паперы піша і ўвесь свет проста дагары нагамі круціць.

Ускінула Тэкля хатулачку на плечы, пару лапцей на запас узяла, развіталася з бабамі і пусцілася ў дарогу. Да горада было міль шэсць.

Выбралася раніцай на снежнае поле.

Кажуць, ён там ажаніўся з багатай паненкай. Напэўна, унукі-жэўжыкі ёсць.

На зморшчаным твары ззяла шчаслівая ўсмешка.

Яна адвярнула таўстую хустку ад вачэй, каб разглядзець, ці шмат ужо дарогі прайшла.

Уга! і не думала. Ногі самі нясуць мяне, як бы трыццаць гадоў таму назад, і марозу не баюся!

І яшчэ з большым імпэтам няслі яе старыя ногі да роднага сына на каляды.

І шчасце яе расло. Вось дзе жаданне сэрца яе споўніцца! Вось калі зажыве яна, як сыр у смятане!

Глупства, што часамі нябожчык Цыпрук гаварыў. Як гэта ён мяне не прыме? Я ж – яго матка!.. Я ж яго гадавала і карміла. Ён жа – уся пацеха мая.

Кончыўся дзень. Тэкля начавала ў незнаёмай вёсцы. Добрыя людзі накармілі яе і абагрэлі. Яна ўсім расказвала, што ідзе на каляды да сына, і гэткім тонам, гэткай шчаслівай гутаркай, ажно сяляне з нейкай асобнай павагай пазіралі на яе ды пачалі прасіць, каб яна там у сына за іх заступы прасіла ў судах.

Ранюсенька яна зноў кранулася ў дарогу. Скрыпеў снег пад нагамі. Белыя абшары палёў драмалі пад супакоем нямой цішы.

Рэдка-рэдка калі дзе на хвоі закаркае варона ды, падымаючыся ўверх, страсяне з галін вялікія ком'і снегу.

Рэдка-рэдка калі фурманка пакажацца з лесу. Сярмяжнік занукае на кабылку на розныя лады, упрэцца ў аглоблю, натужыцца – і ні з месца. Воз з бярвеннем цяжкі.

Рэдка-рэдка калі званочак зазвоніць, і панскія санкі віхрам панясуцца па нямым белым гасцінцу.

Тэкля ідзе ды ідзе.

Млеюць старыя ногі. Атопкі, як калоды, зрабіліся цяжкія і цвёрдыя. Нічога – горад блізка.

Ужо здалёку відаць вежы цэркваў і касцёлаў, якія золатам у небе адліваюцца. Вось і муры рознафасонныя... Вось і гоман горада даходзіць да яе вушэй. Скора ўжо спраўдзіцца яе апошняе жаданне. У старых вачах бліснуў радасны аганёк.

Нічога, у сына адпачну. Старыя косці выпрастаю!...

Вось пачаліся цёмныя вуліцы шумнага горада. Тут ужо Тэкля збілася з толку. Не ведала, куды павярнуцца, у каго дапытвацца. Людзі спяшаюць, піргаюць. Рамізнік ледзь не пераехаў яе. Страшна.

Адважылася яна папытацца аднаго, другога, дзе тут яе сын жыве. – Ён тут аблакатам. Лаўруком завецца.

Хто пажартаваў ды паглядзеў на яе, як на дурную. Хто адвярнуўся ды пайшоў сваёй дарогай, а хто з жалю торкаў ёй у руку капеечку... Гэткім чынам нехта давёў яе да гарадавога.

Той пачаў распытвацца і, ніякага толку не дабіўшыся, павёў яе ва ўчастак. Там яна пераначавала, галодная і змерзлая. Назаўтра, даведаўшыся, хто гэта яе сын, адвялі да яго. Стукалася, стукалася яна ў дзверы, пакуль нехта адчыніў, высунуўся напалову, паглядзеў на яе і крыкнуў:

– Ідзі, ідзі! Канца няма жабракам гэтым!

– Пусціце. Я да сына свайго іду, да Лаўрука!

– Да Лаўрука?! Да сына?! Да Лаўрэнція Кіпрыянавіча?!

– Ага! Ага! Я маці яго.

Той змераў яе з ног да галавы, пакуль яна расказвала, што яна з вёскі да Лаўрука на каляды прыйшла, і з усмешкай пусціў у кухню.

Тут сабраліся слугі і давай шушукацца і распытвацца.

Тым часам адчыніліся дзверы з другой стараны ды ўвайшоў малады пан у чорным сурдуце.

– Лаўручок мой! Сынок! – як непрытомная, кінулася да яго Тэкля. – Роднен...

Ён раптам пачырванеў, паглядзеў на слуг ды хрыпла крыкнуў:

– Чаму вы пускаеце ў пакой розных жабрачак шалёных?!

– Ідзі! ідзі! – звярнуўся ён да яе глуха, адрывіста, – ідзі, старушка! Я цябе. не знаю.

– А сынок мой, а Лаўручок ты мой! Маткі сваёй не пазнаеш?!

Гэта ж. Ён бразнуў дзвярыма і пайшоў у пакоі.

Той самы лёкай выправадзіў яе за дзверы.

Як зышла з маляваных усходаў, як апынулася на шумным тратуары каля варот, яна сама не памятала. Ачухалася толькі тады, калі той самы лёкай яшчэ раз выйшаў да яе і торкнуў ёй у скурчаныя ад холаду пальцы нейкія бумажкі.

– Ад пана!..

Яна нават не чула, як з яе акалелых пальцаў выпаў гасцінец роднага, доўга-жаданага сына. Некалькі трохрублёвых прыліплі да макраватага тратуара.

- атопкі – від абутку, які насілі бедныя людзі
- рамізнік – фурман наёмнага экіпажа
- шушукацца – шаптаць

1 Як у творы прадстаўлена праблема інтэлігентаў – выхадцаў вёскі, якія пасля заканчэння навукі выракаюцца сваіх блізкіх.

2 Дакажы, што твор Змітрака Бядулі можа быць заўсёды актуальным. Прывядзі прыклады іншых твораў, у якіх закранаецца гэтая тэма.

3 Асудзіце Лаўрука (падзяліцеся на групы, падбярыце пракурора, адваката, суддзю, вынесіце справядлівы прыгавор).

Пяць лыжак заціркі

– Агата! Агата!

– Ну чаго глотку дзярэш?

– Скора заціркa згатуецца?

– Маеш часу пачакаць трохі, не панясу прадаваць на кірмаш!

Яшчэ не паспела яна адказаць свайму Антосю, які ляжаў на пяколку і стагнаў, – не то ад болю, не то ад голаду, – як з усіх бакоў апанавалі яе дзеці – нямаведама, хлопчыкі ці дзяўчынкі, бо яны былі адзеты ўсе ў доўгія да пят кашулькі... Запішчалі яны ўсе ў адзін голас:

– Мамка заціль ку гатуе!

І давай скакаць вакол маці і цягнуць за фартух і спадніцу, як галодныя ваўчаняты.

– Мамка, мне дасі!

– Мамка, мне дасі!

І блішчалі іх галодныя вочы ад радасці...

– Ці-і-ха, каб вы скіслі! – крыкнула Агата. – Згатаваць не даюць, хоць ты тут на кавалкі рассыпайся! – і адагнала іх вілачнікам ад прыпечка...

Гэта было вясной, якраз у тую пару, калі галадуха пануе па вёсках, калі няма чым і муху накарміць. Апошні запас выйшаў, хоць зубамі ляпай; шчаўя яшчэ нямашака... Горкае цяпер жыццё ў хворага Антося. Ён сам рабіць не можа. Адна толькі жонка працуе на яго і дзяцей.

Учора ёй, Агаце, пашанцавала. Яна выенчыла ў суседа фунт мукі на заціркy.

Вось і гатуе яна для сямейкі снеданне... У цёмнай малой хатцы вялікае свята...

Пазіраў Антось на прыпечак і ціха бурчаў. Ён ведаў, што цяпер Агата валадарніца.

Пазіралі дзеткі з-пад цёмнага тапчана на вясёлы аганёк у печы і шушукаліся.

Агата ўсё падлівала вады і мяшала заціркy вялікай лыжкай. Нарэшце паставіла на стол.

– Гатова! – крыкнуў весела Антось і давай карабкацца з пяколка.

– Гатова! Гатова! – запішчалі дзеткі і скакалі, як зайчыкі, да стала, дзе ўжо стаяла вялікая паліўная міска, у якую Агата пераліла заціркy з гаршка. Густы пахучы пар клубіўся над міскай і павялічваў галодны апетыт шчаслівай у гэты момант сям'і.

Шчасце не мае сваёй асобнай меркі для ўсіх людзей на свеце, але кожны чалавек мае сваю асобную мерку да шчасця і свой асобны погляд на самое шчасце...

І шчаслівая сямейка хваталася за лыжкі.

– Ай! Ай! – запішчалі дзеткі.

Антось вылупіў вочы і моўчкі давіўся гарачай заціркай.

– А каб вас ліханька не ўзяло. Я ж вам казала – не хапайце, бо гарачая! – лаяла іх Агата.

Пазіралі, пазіралі яны на гарачую заціркy і не вытрывалі – зноў давай есці... Ажно слёзы каціліся з вачэй. Не з'елі яшчэ і трэцяй часткі, як у хату ўвайшла суседка Сцёпчыха.

– Дзень добры!

– Дзень добры!

– Хлеб ды соль!

– Дзе тут хлеб, – заціркy ядзім, просім на снеданне! – кажа Агата.

– Ого! На заціркy і я ахвотніца! – адказала Сцёпчыха, і яе галодныя вочы заблішчалі. Узяла лыжку і спрытна падсела да міскі...

Спахмурнеў Антось і толькі ніжэй апусціў галаву.

„Нам і самім мала", – падумаў ён.

З'ела Сцёпчыха адну лыжку і ўзялася за другую.

„О, каб цябе!" – хацеў сказаць Антось і ледзь стрымаўся. Дзеткі таксама пачулі небяспеку і, скоса пазіраючы на Сцёпчыху, спрытна запрацавалі лыжкамі...

„Тры!" – чуць не крыкнуў Антось, як Сцёпчыха зачэрпнула лыжкай у трэці раз.

„Ратуйце! Ратуйце!" – ледзь не плакаў ён, як яна апусціла лыжку ў міску ў чацвёрты раз. А як з'ела пятую, то ўжо міска была пустая...

– Разбойніца! – крыкнуў Антось на сваю Агатку, як ужо Сцёпчыха падзякавала і пайшла. – Разбойніца!..

– Ці я вінавата, што яна гэткая свіння! – лямантавала Агата.

І папсулася свята беднай сямейкі. Спахмурнелі твары.

Кожны думаў: „О-го! Каб лепей я з'еў гэтыя пяць лыжак заціркі..."

Няшчасце не мае сваёй асобнай меркі для ўсіх людзей на свеце, але кожны чалавек мае сваю асобную мерку да няшчасця і свой асобны погляд на самое няшчасце.

1912

1 Ахарактарызуй асабістыя перажыванні герояў твора.

2 Якія эмоцыі выклікаў прыход суседкі?

3 Як разумееш словы аўтара ў апошнім абзацы?

Алесь Гарун (1887-1920)

Алесь Гарун (сапр. **Аляксандр Прушынскі**), пісьменнік, публіцыст, дзеяч беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Нарадзіўся ў фальварку Новы Двор (цяпер у межах Мінска) у сям'і рабочага. За ўдзел у падпольным друку быў сасланы ў Сібір (1907), на радзіму вярнуўся ў 1917 годзе. Рэдагаваў газету «Беларускі шлях», выступаў у друку з публіцыстычнымі артыкуламі, пісаў п'есы для дзяцей. У 1919 годзе ўзначаліў Часовы беларускі нацыянальны камітэт. Стаў членам Беларускай вайсковай камісіі.

Ажыццявіць многія задумы Алесю Гаруну перашкаджала хвароба. Паэт памёр у 1920 годзе ў Кракаве і пахаваны там на вайсковых Ракавіцкіх могілках.

Пісаць пачаў на рускай мове, затым – на беларускай. 1903 годам датуецца яго паэма *Мае каляды*, апублікаваная ў Вільні ў 1920 г. пад псеўданімам А. Сумны. У друку дэбютаваў вершам *Маці-Беларусі* ў 1907 г. (газета «Наша ніва»). Творы яго друкаваліся ў газетах «Наша ніва», «Беларус», «Вольная Беларусь», у калектыўных зборніках і календарах.

Паэтычная спадчына Алеся Гаруна складаецца са зборніка *Матчын дар* (1918), у які ўвайшлі творы, напісаныя ў турме або ў выгнанні і вершаў, апублікаваных раней і пазней пад псеўданімамі А. Гарун, А. Сумны, а таксама Сальвэсь.

Алесь Гарун

Матчын дар

Як радзіла маці мяне ў цёмну ночку,
Дык дала скрыпіцу: «На, іграй, сыночку!
Грай сабе на шчасце, грай на добру долю,
Грай на век даўгуткі, грай на вольну волю»
Помню, дзіцянёткам з тугой я не знаўся,
Жыў, як тая птушка, граў і забаўляўся;
Дзень мне быў спакойны, ўночы сон бязгрэшны
А цяпер застаўся я навек няўцешны.
Ой, чаму ж, матуля, жыццё-скрыпку дала,
Як іх шанаваці дый не навучала?
Гэта ж падзівіся – я адкрыцца мушу,
Што сапсуў скрыпіцу, што згубіў я душу.
Здаўна, сівакрыла, шчасця я не маю,
Долі я не бачу, радасці не знаю.
Граю, праўда! граю. А на сэрцы важка,
А у сэрцы больна, аж трываці цяжка.

Тыя не прыходзяць песні-весялушкі
Як пяе зямліца, як шчабечуць птушкі.
Жаль з нудой заплачуць, глуха як зайграю.
Маю я скрыпіцу, а душы – не маю!

1 Ахарактарызуй асабістыя перажыванні лірычнага героя.

2 Як разумееш словы-сімвалы: матчын дар, жыццё-скрыпка?

РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА ТЭАТРУ

Беларускі народны тэатр узнік з каляндарных і сямейна-бытавых абрадаў і свят, карагодаў, гульняў і ігрышчаў. На іх аснове склалася і мастацтва народных акцёраў скамарохаў. З XVI ст. шырока бытаваў народны лялечны тэатр – батлейка. У XVI-XVIII стст. у калегіумах і брацкіх школах існаваў школьны тэатр з характэрнымі для яго паказаў інтэрмедыямі. У гэты час ствараліся прыгонныя прыватныя тэатры, напр. Нясвіжскі тэатр Радзівілаў, Шклоўскі тэатр Зорычаў і інш. З другой палавіны XIX ст. пачала развівацца прафесійная беларуская драматургія. У 1840-1850-я гг. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч у арганізаваным ім калектыве ставіў свае п’есы. У 1845-1847 гг. у Віцебску працавала балетная трупа. У пачатку XX ст. былі спробы стварыць нацыянальны тэатр у Радашковічах і Пятроўшчыне пад Мінскам, пашырыліся ў гэты час т. зв. беларускія вечарынкі, якія садзейнічалі арганізацыі пастаянных аматарскіх гурткоў у Вільні, Гродне, Мінску, Полацку і іншых гарадах. Дзейнасць з 1907 г. Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага паклала пачатак развіццю прафесійнага беларускага тэатра. У яе рэпертуары былі песні, танцы, пастаноўкі п’ес, дэкламацыя твораў польскіх, рускіх і перш за ўсё беларускіх пісьменнікаў (Каруся Каганца, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі, Старога Уласа і інш). Рэпертуар быў разлічаны на масавага гледача, улічваў яго інтарэсы і патрабаванні. Ігнат Буйніцкі першы звярнуў увагу на прыгажосць і невычэрпныя эстэтычныя магчымасці народнага танца. У 1910-1911 гг. гэты тэатр шырока гастраліраваў на Беларусі. У 1917 г. у Мінску было створана Першае беларускае таварыства драмы і камедыі. У 1920 г. арганізаваны вя-

БѢЛОРУССЫ.

ВЪ СЛУЦКУ.

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ТРУПА ТУРНЕ ПА БЕЛАРУСІ

ІГНАТА БУЙНІЦКАГО

ВЫСТУПАУШАГО У С.-ПЕЦЯРБУРЗІ, ВІЛЬНІ МІНСКУ ДР. ГОРОДАХ

БУДЗЕ БЕЛАРУСКАЕ ІГРЫЩЧЭ

ПАШЫЛІСЯ У ДУРНІ

камедыя у 3 дзеях М. Кропіўніцкаго.

У ЗИМОВЫ ВЕЧЭР

Сцена з селянскаго жыцьця у 2 да. О. Э. Оржешко.

СВАТАНІЕ

въ 1 да. А. Чехова.

Граючыя особы: Андреева, Лейченко, Крапівіна, Карнаровіч, Міленко, Поліха, Алексеенко, Буйніцкі, Войпоу, Забель, Карскій, Несьвяцкіко, Неленко, Прахаповіч и іншіе.

У прагрыму (частка другая) ДЭКЛЯМАЦІЯ і ХОР ПРАЦЕЙ БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ СПЕВЫ.

За гарамі за лесамі. Доля ня доля. Пазушочка. Дуда весна-пуха. У гародзі рачка и іншіе.

БЕЛОРУСКІЕ НАЦІОНАЛЬНЫЕ СКОКИ (ТАНЦЫ)

У БЕЛАРУСКІХ АПРАТКАХ, ПАД НАРОДНУЮ МУЗЫКУ-ДУДУ И Т. П.

ЮРКА, МЕЛЬНІК, ЧАБАТ, ЛЯВОНІХА, АНТОШКА І ІНШ.

У часе антракту будзе іграць музыка.

На основаніи ВЫСОЧАЙШЕ утвержденнаго 15 Мая 1897 г. и мнѣнія Государственнаго Совѣта утвержденнаго 5 Марта 1908 г. принять взиманіе сбора съ публичныхъ зрѣлищъ и увеселеній, со всѣхъ бедетъ взимается дополнительный сборъ въ пользу общества учрежденія ПЯТИСКРАТНЫЙ МАРТИ, надлежащимъ корешкомъ книги, безъ коего билеты недѣйствительны.

БИЛЕТЫ ОТЪ 1 Р. 50 К. ДО 22 К.

Пачатак спектакля а 9-уй гадз. вечэра.

Гаспадар Ігнат Буйніцкій.

Дозволено разрѣшенно Августъ 9 дня 1911 г.—Вильнюсъ Губернскій Корреспонтъ ВЕШЕЛЕВСКІЙ. Вильнюсъ, Типографія Л. К. ЗИЛЬБЕРБЕРГА.

Афіша Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага, 1911 г.

Будынак гарадскога тэатра, які быў пабудаваны па праекце архітэктараў Караля Казлоўскага і Канстанціна Увядзенскага для мінскага гарадскога тэатра. Цяпер у ім змяшчаецца Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Паштоўка з пачатку XX ст.

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы ў Мінску

дучыя тэатры Беларусі: Беларускі тэатр імя Янкі Купалы, на сцэне якога ў той час ставіліся і першыя балетныя спектаклі, Беларускі трэці дзяржаўны тэатр, Беларускі тэатр імя Якуба Коласа, яны перш за ўсё вызначалі тэатральнае жыццё на Беларусі. У 1920-30-я гг. узнікалі самадзейныя тэатры, якія сродкамі мастацтва вялі культурна-асветніцкую работу. У першай палове 1920-х гадоў у тэатры пераважалі пастаноўкі на фальклорныя і гістарычныя тэмы, пазней датычылі актуальнай сучаснай праблематыкі. З 1930 г. у Мінску пачала дзейнічаць Беларуская студыя оперы і балета, якая пазней стала Тэатрам оперы і балета.

паводле артыкулаў з Энцыклапедыі гісторыі Беларусі

1 Прыгадай драматычныя творы, якія прыводзяцца ў дадзеным падручніку. Падрыхтуй інсцэніроўку фрагмента аднаго з іх.

2 З чым звязана буйнае развіццё тэатральнага жыцця ў Беларусі у 20-30 гг. XX ст.?

ЛІТАРАТУРА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

❖ **Заходняя Беларусь** – неафіцыйная назва беларускіх зямель, якія ў выніку польска-савецкай вайны, Рыжскай дамовы 1921 года і далучэння ў 1922 годзе Сярэдняй Літвы апынуліся ў складзе Польшчы. Назва ўжывалася ў процівагу названня ўсходняй часткі беларускага абшару – Савецкай Беларусі (БССР). Паводле пагаднення паміж СССР і Нямеччынай і ў выніку аперацыі савецкіх войск праз 17 дзён пасля пачатку Другой сусветнай вайны, 12 лістапада 1939 года Заходняя Беларусь увайшла ў склад БССР.

ЛІТАРАТУРА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Пачатак заходнебеларускай літаратуры, як і ўзнікненне самога палітычнага паняцця «Заходняя Беларусь», адносіцца да пачатку 1920-х гадоў. Згодна з рыжскім дагаворам, польска-савецкая мяжа падзяліла этнічныя беларускія землі на дзве адносна роўнавялікія часткі. Насельніцтва заходнебеларускіх зямель налічвала 4,6 мільёна чалавек. Дзяржаўная граніца, розныя палітычныя сістэмы дзяржаў, у межах якіх давялося жыць раз'яднанаму беларускаму народу, па-рознаму адбіліся на духоўным жыцці, гістарычным лёсе ўсходніх і заходніх беларусаў. Амаль дваццаць год беларуская літаратура, што ўзнікла на захад ад польска-савецкай мяжы, развівалася сваім адметным шляхам і ў агульнанацыянальнай спадчыне складае асобны раздзел.

Духоўна-кансалідуючым беларускім цэнтрам на захадзе стала Вільня, з яе даўнімі культурна-гістарычнымі традыцыямі. Невыпадкова здарылася, што тут сканцэнтраваліся значныя беларускія інтэлектуальныя сілы, у тым ліку літаратурныя. Адны з беларускіх пісьменнікаў жылі там стала яшчэ да першай сусветнай вайны, іншыя трапілі ў Вільню ў час вайны і рэвалюцыі. У гэты час асабліва праявілі сябе крытык, публіцыст і грамадскі дзеяч Антон Луцкевіч, драматург Францішак Аляхновіч, празаікі Антон Лявіцкі (Ядвігін Ш.), Францішак Умястоўскі, паэт Казімір Сваяк, філосаф і крытык Уладзімір Самойла, Максім Гарэцкі, Леапольд Родзевіч, філосаф і паэт Ігнат Канчэўскі.

Заходнебеларуская літаратура першай паловы 1920-х гадоў характарызавалася інтэнсіфікацыяй грамадскай думкі, што знайшло выяўленне ў актуальнай публіцыстыцы і філасофска-літаратурнай эсэістыцы, угрунтаваных на беларускай ідэі. Значнымі былі на пачатку 1920-х гадоў і дасягненні драматургіі. Другая палова 1920-х гадоў звязана з легальнымі формамі беларускага руху, перад усім з БСР Грамадой, што паклікала да жыцця масавую паэзію. На грамадскай хвалі ўздыму вызваленчага руху ўвайшло ў літаратуру ўжо ўласна заходнебеларускае пакаленне паэтаў: Міхась Машара, Хведар Ільяшэвіч, Наталля Арсеннева. З сярэдзіны 1920-х гадоў літаратура крыху памножыла свае мастацкія здабыткі за кошт малых жанраў эпікі.

Гродна на паштоўцы з пачатку XX ст.

У 1930-я гады грамадскае жыццё і літаратурны працэс у Заходняй Беларусі не зазналі такіх радыкальных перамен, як у Савецкім Саюзе ў год «вялікага пералому» і пачатку наступнага дзесяцігоддзя, хоць палітычныя абставіны ў Польшчы таксама мяняліся не да лепшага. Літаратура таго часу не мела такога ўнутранага падзелу, як у папярэднім дзесяцігоддзі. Яна характарызавалася дамінаваннем паэзіі, паглыбленнем у ёй сацыяльных матываў, уздымам літаратуры ў цэлым на вышэйшы ідэйна-мастацкі ўзровень – прыходам у літаратуру Заходняй Беларусі Максіма Танка. Паколькі літаратура ў 1930-я гады ў Савецкай Беларусі трапіла пад жорсткі ідэалагічны кантроль і падуладная была інстытутам таталітарызму, не магла ў поўнай меры выконваць сваёй натуральнай грамадскай функцыі, публіцыстыка, крытыка і культуралогія Заходняй Беларусі засталіся захавальнікамі нацыянальнага духу. Нягледзячы на дзяржаўную мяжу, што раздзяляла, як афарыстычна гаварылася ў той час, два светы, сувязь больш-менш інтэнсіўная паміж літаратурамі Заходняй і Усходняй Беларусі існавала на працягу ўсяго міжваеннага дваццацігоддзя. Яна грунтавалася на этнічным адзінстве і была адной з праяў нацыянальнай кансалідацыі, што адбывалася на два бакі. Літаратура Заходняй Беларусі на працягу дваццацігадовага свайго існавання як самастойнай інтэгральнай часткі нацыянальнай мастацкай літаратуры беларускага народа была выразніцай свядомасці заходніх беларусаў, іх спадзяванняў, спадарожніцай у вызваленчым змаганні. У час між дзвюма войнамі яна прайшла некалькі этапаў развіцця, суадносных з рознымі перыядамі нацыянальна-вызваленчага руху.

Сёння, у сувязі з актуалізацыяй такіх фундаментальных пытанняў, як незалежнасць, ментальнасць нацыі, духоўнасць народа, істотнае значэнне набываюць здабыткі думкі заходнебеларускіх аўтараў літаратурна-філасофскай эсэістыкі і публіцыстыкі. Арыентацыя паэтаў Заходняй Беларусі на высокія гуманістычныя ідэалы свабоднай працы, свабоды чалавечай асобы, свабоды народа спрыялі ўзлёту духу, стварэнню імі вечных эстэтычных каштоўнасцей.

паводле Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя

1 Пра якіх заходнебеларускіх пісьменнікаў даведаліся вы, калі чыталі прыведзены тэкст.

2 Прадстаў у пісьмовай форме найважнейшыя фактары ў развіцці беларускай літаратуры ў Заходняй і Савецкай Беларусі.

Казімір Сваяк (1890-1926)

Казімір Сваяк (сапр. **Канстанцін Стаповіч**), заходнебеларускі паэт, рэлігійны і грамадскі дзеяч, а таксама заснавальнік клерыкальна-каталіцкага руху ў беларускай літаратуры. Нарадзіўся ў вёсцы Барані Гродзенскай вобласці ў сям'і лесніка. Скончыў Віленскую духоўную каталіцкую семінарыю (1914). Быў вікарыем у парафіі ў Камаях і Клюшчанах. Набажэнства вёў па-беларуску. Абавязкі ксяндза спалучаў з грамадскай дзейнасцю: арганізаваў кароткія настаўніцкія курсы, беларускія школы. Заснаваў гурток беларускай моладзі «Хаўрус сваякоў», драматычны гурток і касцёльны хор, у рэпертуары якога былі беларускія народныя песні. За нацыянальную дзейнасць Стаповіча часта пераводзілі з месца на месца. У 1916 г. быў пераведзены ў в. Карыцін на Беласточчыне. З 1920 г. працаваў зноў у Клюшчанах, затым ў Засвіры.

Першы верш *На імяніны майго пробашча* на беларускай мове апублікаваў Сваяк у 1913 г. у газеце «Беларус». Выдаў зборнік паэзіі *Мая ліра* (Вільня, 1924), апавяданне вершам *Чарку дай, браце* (Вільня, 1926). З'яўляецца аўтарам п'есы *Янка Канцавы* (1920), драматычнай паэмы *Купалле* (1930), малітоўніка для беларусаў-католікаў *Голас душы* (1926). У 1932 г. былі апублікаваны своеасаблівыя філасофскія запісы *Дзея маёй мыслі, сэрца і волі*, якія рабіў Сваяк з розных нагод. У цэлым запісы гэтыя ствараюць духоўны партрэт аўтара як чалавека, святара і беларуса. Галоўнымі матывамі паэзіі Сваяка ёсць Бог і Бацькаўшчына. У сваёй творчасці духоўнасць і боскасць спалучае ён з гуманістычнымі і патрыятычнымі ідэямі.

Казімір Сваяк

Гімн роднай зямлі

Зямліца прошласьці ціхой,
Крывавай спісана рукой,
Айчызна – Маці – Беларусь,
Цяжкі лёс Твой.

Паклон з трудом Тваёй дружбе,
Паклон за волю барацьбе,
Айчызна – Маці – Беларусь,
Паклон Табе.

Жалосна плача песьнь Твая
І Бога моліць, сьлёзная,
Айчызна – Маці – Беларусь,
Ты родная.

Ідзе вось ясная пара,
Правіду сьвеціць нам зара,
Айчызна – Маці – Беларусь,
Гарой, Жыва!

1 Гімн – гэта твор пісаны ў гонар каму-небудзь ці чаму-небудзь. Якія пачуцці выказвае лірычнае «я» да Бацькаўшчыны?

2 Вядучая тэма верша – свабодная і годная будучыня Айчыны. У некалькіх сказах папоўні гэтае выказванне.

3 У што верыць лірычнае «я»? Адкажы поўным сказам.

Наталля Арсеннева (1903-1997)

Нарадзілася ў Баку ў сям'і рускага служачага. Потым бацькі пераехалі ў Вільню. У час першай сусветнай вайны сям'я Арсенневых выехала ўглыб Расіі. Вярнуліся ў Вільню ў 1920 г. Наталля паступіла ў толькі што заснаваную Першую Віленскую беларускую гімназію, у якой вучылі такія настаўнікі, як Максім Гарэцкі, Антон Луцкевіч, Браніслаў Тарашкевіч, Аркадзь Смоліч. Гімназія, яе атмасфера і настаўнікі дапамаглі Арсенневай далучыцца да беларускай культуры, стаць удзельнікам беларускага адраджэнскага руху. У 1921 г. Арсеннева скончыла гімназію і пасля падрыхтоўчых педагагічных курсаў атрымала пасаду настаўніцы ў пачатковай беларускай школе ў Вільні. У гадах 1922-1939 жыла ў Польшчы. У 1939 г. апынулася ў СССР, дзе працавала ў рэдакцыі «Віленскай праўды».

У 1940 г. была выслана ў Казахстан. Дзякуючы стараням Янкі Купалы, Пятра Глебкі і іншых беларускіх пісьменнікаў, якія займалі тады высокія пасады, у маі 1941 г. паэтэса вяртаецца ў Беларусь.

У час II сусветнай вайны жыла яна ў Мінску і працавала ў «Мінскай газеце». У 1944 г. выехала з сям'ёй у Нямеччыну, а ў 1950 г. пераехала ў ЗША. У эміграцыі Арсеннева працавала ў беларускамоўнай газеце «Беларус» і на радыё «Свабода», у Беларускім інстытуце літаратуры і мастацтва ў Нью-Йорку.

Першы верш у беларускім друку апублікавала Наталля Арсеннева ў 1920 г. у газеце «Наша думка». Яе талент заўважыў і падтрымаў Максім Гарэцкі. Ранняя лірыка, якую яна замяшчала ў перыядычных выданнях Заходняй Беларусі, засяроджаная на прыродзе і на асабістых перажываннях. Арсеннева стварыла паэзію, у якой перадае імгненныя ўражанні, зменлівыя станы душы лірычнай гераіні. Паэзія «польскага» (1922-1939) перыяду тэматычна звужаецца да сферы прыватнасці, да індывідуальных перажыванняў багатай духоўным жыццём лірычнай гераіні (*Родны край*, *Пытанне*, *Вячорная часіна*, *Прывіды*, *Незгаданае* і інш.). У 1927 г. у Вільні выйшаў лірычны зборнік Арсенневай *Пад сінім небам*, другі зборнік *Жоўтая восень* не паспеў выйсці з-за вайны. Ваенныя падзеі ў значнай ступені змянілі характар паэзіі Арсенневай. Талент яе развіўся ў бок філасофскага, гуманістычнага асэнсавання гістарычных падзей, узмацніліся грамадскія трагічна афарбаваныя ноты. У акупіраваным Мінску па працягу трох гадоў паэтэсай было створана каля дзевяноста лірычных вершаў, якія склалі зборнік *Сягоння* (1944), напісаны лібрэта для трох беларускіх опер (*Лясное возера*, *Усяслаў Чарадзей*, *З выраю*). Вайна ўспрымаецца ёю як вялікая трагедыя еўрапейскіх народаў, хвалюе яе пытанне пра сваё месца ў свеце, пра сваю адказнасць перад светам за народ і Айчыну. Трэці і апошні, эміграцыйны перыяд творчасці Арсенневай, у параўнанні з папярэднімі аказаўся найменш плённым. У эміграцыйны перыяд паэтэса так і не выдала асобнага зборніка. Вершы, што паўсталі на чужыне, паэтэса ўключыла ў кнігу *Між берагамі*, якая з'яўляецца выбарам паэзіі 1920-1970 гг. Кніга была выдадзена ў 1979 г. Беларускім інстытутам навукі і мастацтва ў Нью-Йорку. Эміграцыйныя вершы Арсенневай прасякнуты роспаччу, болем з прычыны расстання з Беларуссю, якую яна любіла да самазабыцця, горача, адчайна, якая сніцца ёй па начах (*Чаго тужыць*, *А мне сніцца*, *Тваё імя* і інш.).

У творчай спадчыне Наталлі Арсенневай знаходзяцца таксама шматлікія пераклады паэзіі Гётэ, Гаўптмана, Кляйста, Шэкспіра, Міцкевіча, а таксама тэкстаў лібрэт да опер Моцарта, Вебера, Бізэ, Чайкоўскага, Штраўса.

❖ Асноўнымі крыніцамі інспірацыі Наталлі Арсенневай былі прырода і космас. У яе лірыцы выступае перш за ўсё апаэтызаваная прырода і звязаныя з ёю перажыванні інтымнага характару, любоў да бацькаўшчыны і роднага народа. Прыведзеныя вершы паходзяць са зборніка *Пад сінім небам*.

Наталля Арсеннева

Восень у Вільні

Клёны апалі, і золата й фарбы
крыюць зямлю дарагім дыванам.
Поўныя жмені лістоў тых узяў бы,
восеньскім сплёў бы іх, пышным вянком.
Таюць аблокі у небе высокім,
хвалі туману над Вільняй стаяць.
Места мярэсціцца ўнізе, далёка,
вежы касцёлаў у неба глядзяць,
цэркваў блішчаць залатыя галовы,
цёмнымі плямамі дрэвы ляглі,
сіняй палоскаю бор той хваёвы
ледзьве відаць за істужкай Вяллі.

Чуюцца, чуюцца восені чары
ў фарбах, у тонах лісця і нябёс,
лёгкім дрыжэнні кляноў у пагары,
свежасці йльдзістай, што вецер прынёс...

1 Пры дапамозе якіх мастацкіх сродкаў прадстаўлена восень у Вільні?

2 У творчасці якога беларускага паэта можна знайсці ўрбаністычныя матывы? Параўнай вобраз Вільні ў выбраных творах паэтаў.

Наталля Арсеннева

Завея

У нясмелай, замлелай цішы
ўстаў туманны, няветлы ранак,
ціха вецер галлё калыша,
недзе плачуць званочкі санак,
нізка, нізка сівыя хмары
над зямлёю ціхой клубяцца
Ціша...
раптам – віхор ударыў,

стаў заводзіць, гусці, смяяцца.
А з віхурай прыйшла завея,
ўсё змяшала,
змяла,
парвала,
разгайдала галлё ў алеях,
паблытала...
Месца, месца,
волі, волі!
Мкне у месце,
мкне у полі,
беліць вочы белай беляй
гнеўна-спеўная завея,
б'ецца,
ўецца,
скача,
плача,
сыпкім снегам сее, вее,
не лякаецца няўдачаў
гнеўна-спеўная завея!

«Зіма. (Серэнада зімы)», 1971. Віталь Цвірка

1 Параўнай твор Наталлі Арсенневай з *Завірухай* Максіма Багдановіча. Пры дапамозе якіх паэтычна-вобразных сродкаў ствараецца ў абодвух вершах уражанне завеі?

2 Запішы ў пунктах характэрныя рысы ранняй паэзіі Наталлі Арсенневай.

Максім Танк (1912-1995)

Максім Танк (сапр. **Яўген Скурко**), беларускі паэт, грамадскі дзеяч. Нарадзіўся ў вёсцы Пількаўшчына Мінскай вобласці, у сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую польскую школу, вучыўся ў рускай і беларускай гімназіях. Удзельнічаў у рэвалюцыйна-вызваленчым руху ў Заходняй Беларусі, за што неаднаразова быў арыштаваны. У віленскай турме Лукішкі выдаваў рукапісны літаратурны часопіс «Краты», у якім змяшчаліся творы паэтаў-вязняў. Удзельнічаў у выданні падпольнай і легальнай перыёдыкі («Пралом», «Часопіс для ўсіх», «Крыгалом», «Poprostu», «Наша воля», «Беларускі летапіс»), супрацоўнічаў з газетай «Віленская праўда». Працаваў у часопісах «Вожык» і «Полымя», дзейнічаў у Саюзе пісьменнікаў Беларусі, супрацоўнічаў з АН Беларусі.

Друкавацца пачаў у 1932 г. у часопісах «Пралом», «Часопісе для ўсіх» і інш. У газеце-аднадзёнцы «Беларускае жыццё» апублікаваў пад псеўданімам Максім Танк свой першы верш *Заштрайкавалі гіганты-коміны*. Гэта быў пачатак яго паэтычнай творчасці. У другой палове 30-ых гадоў выйшлі зборнікі *На этапах*, *Жураўліны цвет*, *Пад мачтай*, *Нарач*. Лірычны герой даверасняўскай паэзіі Танка з'яўляецца рэвалюцыянерам, змагаром за вызваленне свайго народа і за ўз'яднанне Беларусі. Сам паэт творчасць гэтага перыяду называў «паэзіяй народнага гора і барацьбы». Характэрна ёй асацыятыўнасць, псіхалагізм і спалучэнне народнай песеннай традыцыі з публіцыстычнымі прыёмамі. Можна сказаць, што паэт адразу адгукаецца на ўсе падзеі, якія датычаць беларускага народа, яго правоў і становішча ў даваеннай Польшчы. У журботна-лірычных формах верша паэт расказвае пра пакутную гісторыю народа, хараство родных палёў, лясоў, пра беларускую мову, з пафасам прадстаўляе вобразы беларускіх патрыётаў (*Паслухайце, вясна ідзе*, *Спатканні*, *Песня кулікоў*, ****Калі няма на свеце маёй мовы...*, ****Ураклі, матуля, сына твайго людзі...* і інш.)

У ваеннай лірыцы Максім Танк (зборнікі *Вастрыце зброю*, *Праз вогненны небасхіл*) паэтызуе патрыятычны абавязак, услаўляе веліч і сілу народа, яго гісторыю, заклікае шанаваць сваю Айчыну, сваю мову.

У пасляваенных творах (зборнікі *Каб ведалі*, *На камні, жалезе і золаце*, *У дарозе*) паэт прадстаўляе гордасць народа-пераможца, сум па цяжкіх стратах вайны і радасць працы пры адбудове гаспадаркі. Сэнс сваёй паэзіі Максім Танк бачыць у цеснай еднасці з жыццём людзей працы, з трывожным і неспакойным жыццём сённяшняй пары.

паводле Васіля Старычонка

Максім Танк

* * *

Няма ніякіх беларусаў і іх мовы

З рэакцыйнай газеты

Калі няма на свеце маёй мовы,
Майго народа і мяне самога, –
Дык для каго будуеце, панове,
Канцлагеры, катоўні і астрогі?
Супроць каго рыхтуеце расправы
І шыбеніцы ўзносіце пад хмары,
Штодня арганізуеце аблавы
І ўсіх мабілізуеце жандараў?
Супроць каго рыхтуеце вы змовы
З прадажнымі іюдамі, і з Богам, –

Максім Танк, 1962

Калі няма на свеце маёй мовы,
Майго народа і мяне самога!

1 Аб чым гаворыць лірычны герой? Якія праблемы закранае?

2 Падзялі верш на склады. Пастаў націскі. Звярні ўвагу, на якія склады падае націск. Да якой сістэмы вершаскладання аднясеш верш Максіма Танка?

Максім Танк

* * *

Ураклі, матуля, сына твайго людзі,
Ураклі загоны і палі,
Як у шоўк вясновы прыбіралі грудзі
Шэрыя бярозы, тапалі.

Ураклі і вочы сінія краіны,
І зялёнай руні дываны –
Нехта ў маё сэрца, сеючы, закінуў
Залатыя шолахі вясны.

Сёння не памогуць лекі ад урокаў,
Ні твае малітвы да зары,
Не засну, як даўна, поўначчу глыбокай
З сінякрылым рэхам у бары...

Нават пад курганам чуў бы звон далёкі,
Як напевы песняў каласяць тугой,
Як скрыпяць калёсы ў полі адзінока,
Пад цяжкой сялянскаю бядой.

Вось спачну мо трохі ў туманах вішнёвых,
Затапіўшы вочы ў дальнюю зару,
І далей пайду я праз лясы, дубровы
Па тваіх дарогах, Беларусь.

1 Прачытай прыведзены верш, раскрый сэнс першай страфы.

2 Які характар мае твор ***Ураклі, матуля, сына твайго людзі...?

3 Каго ўвасабляе лірычны герой верша?

Гродна на паштоўцы з пачатку XX ст.

Яўген Мірановіч

Чаму ўзнікла Грамада?

24 чэрвеня 1925 года паслы польскага Сейма Браніслаў Тарашкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Пётр Мятла, Павел Валошын і Юры Сабалеўскі выступілі з Беларускага пасольскага клуба і заснавалі новы клуб Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ). Дало гэта пачатак руху, які прывёў насельніцтва Заходняй Беларусі да такой палітычнай актыўнасці, якой ніколі раней ні пазней не бывала.

Брэст на паштоўцы з пачатку XX ст.

Паслы, якія стваралі Грамаду, былі вядомымі ў беларускім асяроддзі прыхільнікамі лаяльнасці і пошукаў паразумення з уладамі польскай дзяржавы. Калі на пачатку дваццатых гадоў арганізавалася беларускае антыпольскае падполле, а эміграцыйны ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі Вацлава Ластоўскага рыхтаваўся да вайны, Тарашкевіч усіх канспіратараў называў рамантыкамі, якія патрацілі кантакт з рэчаіснасцю. На парламенцкіх выбарах у лістападзе 1922 г. беларускія партыі і арганізацыі, аб'яднаныя ў Беларускім цэнтральным выбарчым камітэце, атрымалі 11 месц у Сейме і 3 у Сенаце. Гэта быў вялікі поспех тых дзеячаў, якія заклікалі да супрацоўніцтва з польскай дзяржавай і верылі, што ва ўмовах дэмакратыі беларусы атрымаюць магчымасць развіваць сваю асвету, культуру, а таксама ўсе правы належныя грамадзянам.

Тарашкевіч і іншыя беларускія паслы рабілі шмат намаганняў, каб пераканаць польскіх дэпутатаў і палітыкаў, што інтарэс Польшчы заключаецца ў тым, каб двухмільённая беларуская меншасць адчувала яе сваёй бацькаўшчынай.

З другога боку аднак не было найменшага зацікаўлення такім вырашэннем беларускай праблемы ў II Рэчы Паспалітай. Беларускія палітыкі не

Гродна на паштоўцы з пачатку XX ст.

знаходзілі суразмоўцаў для сваіх канцэпцый. Палякі, якія перад I сусветнай вайной заклікалі да супольнай барацьбы супраць расійскага панавання, не разумелі людзей, якія ад іх пачалі дамагацца мінімуму свабоды. На пачатку дваццатых гадоў было ліквідавана беларускае школьніцтва, створанае ў час нямецкай акупацыі. Беларускай інтэлігенцыі практычна немагчыма было ўладкавацца на працу ў адміністрацыі і іншых дзяржаўных установах. Большасць насельніцтва так па палітычных, як і эканамічных прычынах стала грамадзянамі трэцяй катэгорыі. Паліцыянт, настаўнік і чыноўнік атрымалі місію пераўтварыць беларускіх сялян у патрыятычна думаючы польскі люд. Асіміляцыя славянскіх меншасцей ад пачатку II Рэчы Паспалітай стала дзяржаўнай дактрынай.

У гэты самы час бальшавікі ў Савецкай Беларусі з вялікім размахам праводзілі палітыку беларусізацыі рэспублікі. На ўсходнім баку рыжскай мяжы пачынала стварацца амаль нацыянальная дзяржаўнасць. Адзінай дзяржаўнай мовай стала там беларуская. Эканамічнае развіццё рэспублікі ў дваццатыя гады прывяло да хуткай ліквідацыі страт, нанесеных краіне за час амаль сямігадовай вайны. Беларускія дзеячы і палітыкі ў Польшчы пабачылі



Гродна на паштоўцы з пачатку XX ст.

ўсходнюю Беларусь як краіну сваіх мараў. Ніхто з іх не мог тады спадзявацца, што саветы праводзяць толькі палітычны эксперымент і пару гадоў пазней з Беларускай Рэспублікі астанецца толькі геаграфічная назва. Аднак тады, калі Тарашкевіч дарэмна шукаў зразумення ў палякаў, саветы ахвяравалі беларусам нацыянальную дзяржаву. Для большасці беларускіх дзеячаў, так на эміграцыі, як і ў Польшчы, зразумелым стала тады, што няма лепшага вырашэння нацыянальнага пытання як уз'яднанне зямель, заселеных беларусамі ў межах Савецкай Беларусі.

Тарашкевіч, які рашыўся на такую радыкальную змену арыентацыі, раней праводзіў размовы з палітыкамі, якія ўваходзілі ў структуры БНР. Размовы з Аляксандрам Цвікевічам у Гданьску прывялі яго да пераканання, што ў існуючых умовах толькі Савецкая Беларусь можа даць перспектывы нацыя-

нальнага праіснавання. Яго сябры з клуба Сымон Рак-Міхайлоўскі, Пётр Мятла і Васіль Рагуля ўжо раней патрацілі ілюзіі наконт магчымасці паразумення з палякамі. Восенню 1923 г. стварылі асобнае дэпутацкае кола Беларускіх незалежных сацыялістаў і парламенцкую трыбуну пачалі выкарыстоўваць для апісання таго, што дзеялася на беларускіх землях. Гаварылі яны пра пародыю судовых працэсаў на г. зв. «крэсах», зверствы ў турмах у адносінах да арыштаваных беларусаў, пагардлівыя адносіны лакальнай адміністрацыі, праследаванне праваслаўя.

У 1925 г. Тарашкевіч канчаткова пераканаўся ў памылковасці свайго выбару. Далучыўся да «незалежных сацыялістаў» і разам стварылі новы клуб – Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Ніколі яны адкрыта не заявілі, што хочуць далучыць Заходнюю Беларусь да БССР, але ў праграме партыі запісалі як мэту сваёй дзейнасці – «незалежнасць Белай Русі ў цеснай сувязі з народамі, якія рашыліся на новую грамадскую структуру». А «новая грамадская структура» была толькі ў народаў Савецкага Саюза. Напрыканцы 1926 г. Грамада была адной з найбольшых партый у Еўропе. Налічвала каля 120 тысяч членаў і рашуча паўплывала на настроі грамадства паўночна-ўсходняй Польшчы. Улады вырашылі ліквідаваць гэты рух паліцыйнымі метадамі. Лідары партыі, паслы апынуліся ў турмах. Такім чынам закончыліся ўсе перспектывы польска-беларускага дыялогу. Палітыка ўлад у трыццатыя гады была беларусам пастаянным доказам, што не павінны яны разлічваць на тое, што калі-небудзь нехта ў польскай палітыцы будзе ўлічваць іх нацыянальны інтарэс. Паралельна, у гэты самы час, толькі больш радыкальнымі метадамі, ілюзіяў наконт нацыянальнага развіцця пазбавілі беларусаў маскоўскія бальшавікі, якія акупавалі ўсходнюю частку краіны.

Грамада ўзнікла як вынік надзеі на існаванне альтэрнатыўнага вырашэння. Яго аднак на практыцы не было.

1 Калі і кім была заснавана БСРГ?

2 Уважліва прачытай тэкст. Адкажы на пытанне, якое з'яўляецца загалоўкам артыкула.

3 Якія былі адносіны польскай дзяржавы да беларускіх нацыянальных дзеячаў і арганізацый?

4 Выкажы свае погляды на тэму: Ці беларуская нацыянальнасць магла развівацца ў рамках II Рэчы Паспалітай і СССР?

5 Да чаго імкнуліся абедзве дзяржавы? Пацвердзі свой адказ фрагментамі тэксту.

ГОЛАС СТРАЧАНАГА ПАКАЛЕННЯ

І прыйдзе

І прыйдзе новых пакаленняў
На наша месца грамада
Судзіці суд, ці мы сумленна
Жыццё прайшлі, ці чарада

Зняваг мінулых нас не з'ела,
Пакінуўшы свой дым і чад,
І мы па-даўняму нясмела
Жылі не ў лад і неўпапад?

Ці аб свой гонар дбайна дбалі,
І дабравольна, без прынук,
Самі сабой не гандлявалі,
Не неслі ў петлі дум і рук?

І ці пакінуці на памяць
Мы песень гэтакіх змаглі,
З якіх бы можна было ўцяміць,
Што мы свабоднымі былі?..

А ўжо свой выдасць непадкупны
Аб нас гісторыя прысуд,
Калі аглядам гляне рупным
І разбярэ, ў чым справа тут.

У сведкі запісы пакліча,
Паданні клікне ў час такі
І ўсё паліча, пераліча...
А суд гісторыі цяжкі!..

І засумуецца патомак,
Калі дазнаецца ад нас,
Што нейкі з нас хоць быў не зломак,
А плечы гнуў у крук не раз;

Не йшоў з адкрытымі вачыма
У свет і сцежкі не прастаў,
А ўсёй магчымасці магчымай
Таптаў сляды, сябе таптаў.

1926

1 Што выклікае хваляванне лірычнага «я»?

2 Растлумач, як разумееш наступныя словы:
«У сведкі запісы пакліча,
Паданні клікне ў час такі
І ўсё паліча, пераліча...
А суд гісторыі цяжкі!..»

3 Чаму «засумуецца патомак»? Раскрый сэнс слоў паэта.

МАСАВАЕ ВЫНІШЧЭННЕ БЕЛАРУСКАЕ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

У жніўні 1937 года, калі ад перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі мінала 20 гадоў, энкавудысты пачалі таталітарнае вынішчэнне інтэлектуальнай беларускай эліты. Толькі за тры восеньскія месяцы было рэпрэсавана больш за 600 грамадскіх і культурных дзеячаў Беларусі. За перыяд так званага крывавага тунэля смерці (жнівень 1937 – снежань 1938) расстраляна не менш за дзесяць тысяч чалавек.

Першага жніўня 1937 года, на вялікім вогнішчы ў Мінскай унутранай турме НКВД намеснік начальніка турмы і двух яго падначаленых спалілі некалькі дзесяткаў тысяч (!) рукапісаў беларускіх літаратараў. Гарэлі творы, якія не перайшлі сталінскай цэнзуры, або пісаліся да шуфляды, для нашчадкаў. Гарэла амаль уся спадчына пісьменнікаў «першага прызыву», народжаных перад Кастрычніцкай рэвалюцыяй, але выхаваных ужо камуністычнай уладай.

Няма чалавека – няма праблемы. Няма рукапісаў – няма паэтаў, няма гісторыі, няма народа так лічыла тагачасная улада.

Беларуская літаратура ў 30-я гады, існавала ва ўмовах таталітарнага ўціску. Мала хто з беларускіх пісьменнікаў адчуваў сябе спакойна і незалежна. Многія жылі прадчуваннем арышту, рэпрэсій.

У сваёй кнізе «Сняцца сны аб Беларусі» вядомы пісьменнік, Барыс Сачанка прыводзіць страшэнную лічбу: калі ў сярэдзіне 20-х гадоў у адным толькі «Маладняку» – самай масавай літаратурнай арганізацыі на Беларусі – было каля пяцісот чалавек, дык перад вайной іх засталося менш пяцідзесяці. З гэтых пяцідзесяці толькі палавіна займалася пісаннем. Астатнія ці надоўга замаўчалі, ці прыстасаваліся да суровых абставінаў і пісалі творы пра «пераможнае шэсце сацыялізму» па краіне, ці (такіх была абсалютная большасць) былі высланы ў Сібір, Казахстан, на Далёкую Поўнач, кінуты за калючы дрот сталінскіх гулагаў.

Многіх у той страшны час расстралялі. У ліку расстраляных быў і Міхась Зарэцкі (Міхаіл Касянкоў). Трагедыя адбылася 29 кастрычніка 1937 года.

У ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года ў падвалах Мінскай унутранай турмы НКВД было расстраляна 132 прадстаўнікі беларускай інтэлектуальнай эліты – людзей з кругу культуры, мастацтва і навукі, а таксама грамадскіх дзеячаў тагачаснай БССР.

У ліку расстраляных былі 22 беларускія пісьменнікі. Спіс асуджаных, прысланы з Масквы, па першай катэгорыі (расстрэлу) налічваў 103 асобы, па другой катэгорыі (прыгавораны да 10 і болей гадоў зняволення ў канцлагерах) – 6 чалавек.

У дадатак да першапачатковага спісу, які прыслалі з Масквы, мясцовымі супрацоўнікамі НКВД БССР было дапісана яшчэ 29 прозвішчаў.

За што ж пакаралі іх смерцю? Што яны зрабілі, у чым была іх віна?

Варта задумацца над лёсам тых людзей – ахвяраў сталіншчыны.

паводле Леаніда Маракова

- Народный комиссариат внутренних дел СССР (НКВД) – Народны камісарыят унутраных спраў СССР (НКУС) – цэнтральны орган дзяржаўнага кіравання СССР у 1934-1946 гадах. Пасля быў перайменаваны ў Міністэрства ўнутраных спраў СССР.
- Гулаг – Галоўнае ўпраўленне папраўча-працоўных лагераў

1 Што адбывалася ў БССР у трыццатыя гады, а асабліва ў 1937 годзе? Падрыхтуй кароткае вуснае выказванне.

2 Дай пашыраны адказ, у пісьмовай форме, на пытанне, якое знаходзіцца ў тэксце «Ці можна забіць чалавека за тое, што ён думае, за тое што ён сапраўдны чалавек з душою, розумам і сэрцам?»

3 Як разумееш слова «сталіншчына»?

Сяргей Дубінскі (1884-1937)

Археолаг Сяргей Дубінскі нарадзіўся ў 1884 годзе ў Наройках каля Драгічына ў сям'і праваслаўнага святара. Вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце, які закончыў у 1914 годзе. У міжчасе, з 1910 года, займаўся раскопкамі курганных старажытнасцей у наваколлі Драгічына. Пасля вайны нейкі час працуе настаўнікам а з 1925 года становіцца сябрам гісторыка-археалагічнай камісіі

Інстытута беларускай культуры, з 1927 года сябрам Археалагічнай камісіі аддзела гуманітарных навук Інбелкульта. Задачай камісіі стала складанне археалагічнай карты БССР і Смаленшчыны ды стварэнне каталога ўсіх вядомых археалагічных помнікаў. Вялікая ўвага ўдзялялася навуковай апрацоўцы здабытых у выніку разведак і раскопак прадметаў матэрыяльнай культуры, падрыхтоўцы дакладаў і публікацый аб выніках палявых сезонаў. Была вылучана асобная задача па складанню бібліяграфіі па археалогіі Беларусі і гэтая задача была ўскладзена на Сяргея Дубінскага. У 1928 годзе камісія была пераўтворана ў кафедру археалогіі Інбелкульта, а пазней у Інстытут гісторыі Акадэміі навук БССР.

Сяргей Дубінскі ўнёс істотны ўклад у вывучэнне помнікаў жалезнага веку цэнтральнай Беларусі. Найбольш значныя даследаванні правёў ён на Банцараўскім гарадзішчы каля Мінска. У ніжнім гарызонце былі знойдзены жалезныя прылады працы, жалезныя і бронзавыя ўпрыгожанні, ляпная кераміка I-V стагоддзяў н.э. У верхнім гарызонце выяўлены рэшткі наземных драўляных пабудоў і падобныя жалезныя прадметы, што і ніжэй, якія паходзілі з VI-VIII стагоддзяў н.э. Ад верхняга пласта і прынялася назва банцараўскай культуры, якую характарызуюць адкрытыя селішчы, наземныя і паўзямлянкавыя жыллёвыя памяшканні, размешчаныя пераважна на ўзбярэжжах рэк і азёр. Унутры жытлаў размяшчаліся печы-каменкі. Пахавальныя помнікі банцараўскіх плямён характарызуюцца грунтовымі могільнікамі з трупаспаленнем. Крэмацыя нябожчыкаў адбывалася за межамі некраполій, пасля чаго ачышчаныя ад нагару косці змяшчаліся ў гліняныя пасудзіны або ссыпаліся на дно магільных ям. Лічыцца, што гэтая культура з'яўлялася яшчэ балцкай, але не выключаецца ў ёй удзелу і раннеславянскага ладу жыцця. Складаныя гістарычныя пытанні Беларусі пачалі паступова асвятляцца археалагічнымі крыніцамі, стала больш вядома пра жыццёвы лад нашых продкаў.

У 1928 годзе Сяргей Дубінскі знайшоў на Банцараўскім гарадзішчы доўгі ў амаль два метры рог аднарога – вымерлай траваяднай непарнакапытнай жывёлы. Савецкая навука таго часу адмаўляла існавання аднарогаў і Сяргея Дубінскага зараз арыштавалі, а знойдзены рог стаў рэчавым доказам у яго абвінавачанні...

Неўзабаве, аднак, супраць Сяргея Дубінскага былі вынесены больш сур'ёзныя абвінавачанні.

У 1929 годзе пачынаецца разгром беларускай культуры і навукі. Былі звольнены з работы і арыштаваны перадавыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. Лідарам гэтай уяўнай групоўкі быў палічаны Янка Купала, а ў ліку абвінавачаных былі, м.інш. Усевалад Ігнатоўскі і Сяргей Дубінскі. Паклёпнікі пісалі тады: «У сучасны момант беларускі нацдэмакратызм прадстаўляе сабою баявую контррэвалюцыйную ідэалогію кулака, буржуазнага і дробнабуржуазнага інтэлігента, якія змагаюцца за звяржэнне ўлады Саветаў і замену яе дыктатурай эксплуататараў». Сяргея Дубінскага тады адпусцілі, але ненадоўга. У 1933 годзе яму загадалі пакінуць Беларусь і ён пераехаў у Ленінград, дзе ўладкаваўся на працу ў тамашняй Акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры. Неўзабаве, аднак, паставілі яму чарговыя абвінавачанні і ў 1937 годзе расстралялі.

Сяргей Дубінскі ўнёс важны ўклад у беларускую навуку. У 1927 годзе склаў ён археалагічную карту Магілёўскай вобласці. Публікаваў таксама матэрыялы аб праведзеных у Беларусі актуальных палявых работах. У 1933 годзе выйшла ў свет напісаная ім «Бібліяграфія па археалогіі Беларусі і сумежных краін», якая ўключала звыш чатырох тысяч назваў асобных кніг, газетных і часопісных артыкулаў, заўваг па археалогіі Беларусі, надрукаваных з пачатку XIX стагоддзя да 1932 года на беларускай, рускай і іншых мовах.

Аляксандр Вярбіцкі

1 Чым займаўся Сяргей Дубінскі ў час маладосці і што яго цікавіла?

2 Дапоўні выказванне: «Сяргей Дубінскі ўнёс істотны ўклад у вывучэнне помнікаў жалезнага веку цэнтральнай Беларусі». Адказ павінен налічваць не менш як 5 сказаў.

3 Якія маем доказы на тое, што выдатны вучоны з'яўляеца ахвярай сталінскай сістэмы? Прадстаў чатыры чарговыя факты з яго жыцця.

Уладзіслаў Галубок (1882-1937)

У 1908 г. пачаў літаратурную дзейнасць, з 1917 г. выступаў як драматург. Напісаў каля 40 п'ес з мінулага і сучаснага жыцця беларускага народа (пераважна меладрамы, камедыі, вадэвілі, фарсы). Працаваў як акцёр, драматург, рэжысёр, мастак. Выхаваў вялікую групу беларускіх акцёраў. У канцы 20-х гадоў XX ст. абвінавачаны ў нацыяналізме. Арыштавалі Галубка ў 1937 г. «традыцыйным» спосабам, на досвітку. Хутка ў мінскай кватэры драматурга адбыўся вобыск. Забралі не толькі ўсе рукапісы.

Вельмі пацярпела сям'я: старэйшаму сыну Эдуарду, навуковаму супрацоўніку, не дазволілі абараніць дысертацыю па беларускай драматургіі, дачку Багуславу прымусілі ехаць на вёску – «перавыхоўвацца» ў калгасе, малодшых сыноў выключылі з камсамола, як дзяцей ворага народа. Жонка ў адчаі спрабавала скончыць жыццё самагубствам – яе ледзь выратавалі.

Уладзіслаў Галубок успамінаў: *«Памятаю, у 1896 годзе за грошы, заробленыя ад выгрузкі дроў, я купіў білет на галёрку ў мінскі гарадскі тэатр… Мяне не цікавіла зала, увага мая была накіравана на занавес, за якім хавалася нешта новае, невядомае. Трэці сігнал. Занавес пайшоў угору. Перада мной артыст. Слова. Дзея. І тут у мяне ўзнікла думка стаць артыстам»*

паводле Уладзіміра Замкаўца

Францішак Аляхновіч (1883-1944)

Беларускі драматург, тэатральны дзеяч, публіцыст. Яго аповесць «У капцюрох ГПУ» з'яўляецца першым творам сусветнай літаратуры, які апісвае жыццё ў сталінскім канцэнтрацыйным лагеры непасрэдна з погляду арыштанта.

П'есы Францішка Аляхновіча актыўна ставіліся аматарскімі і паўпрафесійнымі калектывамі Заходняй Беларусі, Латвіі, Чэхіі і найбольш трупай Уладзіслава Галубка. За плённую працу Францішка Аляхновіча на ніве тэатра яшчэ пры жыцці яму прысвоілі званне «бацькі навейшай беларускай драматургіі».

паводле Леаніда Маракова

Францішак Аляхновіч

У кіпцюрах ГПУ. Абмен

Надвор'е агіднае. Віхор гудзе ў недалёкім лесе і гоніць хмары, якія лятуць хутка-хутка і грамаздзяцца адна на адну, як быццам хочуць хутчэй праляцець над савецкай прымежнай брамай, што дзеліць два светы.

Углядаюся ў надпіс: «Коммунизм сметет все границы», які бачыў гэтак даўно – у лістападзе 1926 г., калі ехаў у Савецкае гаспадарства з вераю ў магчымасць беларускае культурнае працы там – у БССР. Тады гэтак сама была восень, але я ехаў з надзеяй на вясну ў сэрцы. Сёння варочаюся, бадзяка, у астрожным бушлаце, працверазіўшыся на Салоўках, шчаслівы, што праз мамэнт нага мая пераступіць мяжу краіны «будаўніцтва сацыялізму» – у адваротным кірунку. І сёння восень, але ў маёй душы цяпер светла, сонечна, радасна...

Прыглядаюся да паходу, які набліжаецца да нас – з таго боку.

Мой гэпісты гэтак сама ўтаропіўся ў гэтую групу і ад часу да часу рэгулюе наш крок:

– Павальней!.. Хутчэй!..

Відаць, ідзе аб тое, каб прыйсці на ўмоўленае месца на мяжы ў дакладна азначаным часе. Бо было б недалікатна прымушаць чакаць на сябе, а лішняя паспешнасць абніжала б прэстыж гаспадарства.

Гэтак я разумеў ягоную каманду.

Я ўжо вырозніваў твары людзей, якія да нас падыходзілі. Наперадзе ішоў нейкі высокі мужчына ў цывільнай вопратцы. З ім – з двума паліцыянтамі па бакох – той, каго польскі ўрад абменьваў на мяне: Браніслаў Тарашкевіч. У гэты мамэнт я адчуў не толькі духовы, але і фізычны кантраст паміж намі. Вязень «капіталістычнага гаспадарства» меў на сабе прызваіты фільцовы капялюш, добра скроенае восеньскае паліто, беззаганна вычышчаныя боты... Савецкі вязень ішоў у старэцкім падзёртым кажуху на салавецкім бушлаце...

«Восень», 1962. Віталь Цвірка

Тарашкевіч ішоў, гледзячы на мяне з невыразнай усмешкай на твары.

Гэтулькі гадоў не бачыўшы, з зацікаўленнем углядаўся я на гэтага чалавека, які, хоць у добрай веры, усё ж гэтулькі зламаў чалавечых жыццяў, кіруючы вочы сваіх землякоў на міраж за межавымі слупамі...

Цырымонія абмену. Адданне чэсці, паклон капялюшом, сціскание рук, падпісанне акту абмену. І мы, колішнія прыяцелі, а цяпер – чужыя сабе людзі, шляхі якіх разыходзяцца ў процілежныя бакі, падалі сабе рукі. Звычайныя астрожныя кампліменты: «Добра выглядаеш».

– «Ты таксама». – «Дзякуй, але сумляваюся»...

Пасля – некалькі горкіх словаў за манлівыя міражы, але тут спыніў нашую гутарку старшыня польскае рэпатрыяцыйнае камісіі:

– Panowie mieli mówić o sprawach prywatnych, a panowie mówią o polityce...

Урэшце – апошняе халоднае паціскание рук.

– Бывай здароў!..

Ён з астрогу пойдзе туды, дзе ўвесь вялізарны край – гэта адзін вялікі вастрог, дзе думка чалавечая сцісненая ў абцугах савецкага абсурду, дзе не толькі дзейнічаць і гаварыць, але і думаць і дыхаць трэба паводле аднаго, для ўсіх абавязковага шаблёну. Ён пойдзе ў край белага нявольніцтва, голаду, нэндзы, людаедзтва, а я – кіруюся на Захад, да «капіталістычных» гаспадарстваў, дзе буду прынамсі спаць спакойна, ведаючы, што ўначы госці з ГПУ не пастукаюцца да мае гасподы.

Каб жа толькі ня бачыць больш кашмарных сноў. Каб забыцца на пяцігодкі, ударніцтва, людаедзтва!..

Я ап'янеў ад шчасця. Нешта гавару, шмат гавару... Ідзём у святліцу (...). Штось апавядаю... А, бо ж сапраўды можна быць п'яным ад шчасця! Якое ж гэта дзіўнае пачуццё! Пяро маё не патрапіць апісаць гэтага стану.

Апавядаюць, што Мігуэль Сэрвантэс, вярнуўшыся з няволі ў алжырскіх піратаў, сказаў, што найвялікшым шчасцем, якое можа спазнаць чалавек, ёсць радасць ад верненай волі. Гэткае шчасце спазнаў я 6 верасня 1933 года. Гавару аб сваёй радасці. Дзякую... Даўлюся словам!... Нешта сціснула мне горла ад узварушання...

Хто ведае, можа, варта сем гадоў цярпець мукі ў савецкіх астрогах, каб пасля перажыць такую часіну – часіну гэтага найвялікшага шчасця.

Гэта часіна ўжо больш не паўторыцца. Яе можна перажыць у жыцці толькі адзін раз. […]

Вільня. 1942 г.

• ГПУ – Государственное политическое управление; палітычная паліцыя, якая таксама апекавалася разведкай і контррразведкай – дзейнічала ў СССР у 1922-1934 гг.
• «Коммунизм сметет все границы» – Камунізм змяце ўсе граніцы.

1 Апішы, ў якой сітуацыі сустрэўся Ф. Аляхновіч з Б. Тарашкевічам.

Браніслаў Тарашкевіч (1892-1938)

Браніслаў Тарашкевіч скончыў Петраградскі ўніверсітэт у 1916 годзе (з 1912-га быў адным з кіраўнікоў знакамітага Беларускага навукова-літаратурнага гуртка), пасля два гады працаваў на кафедры рускай мовы і славеснасці. У 1921-1922 гадах Браніслаў Тарашкевіч быў дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі, стаў адным з заснавальнікаў Таварыства беларускай школы.

У 1925-м стаў адным з заснавальнікаў Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ), уступіў у Камуністычную партыю Заходняй Беларусі (КПЗБ). Некалькі разоў арыштоўваўся польскімі ўладамі, прыгаворваўся да турэмнага зняволення, да катаржнай турмы.

З верасня 1933 года, па абмене палітвязнямі, жыў у Савецкім Саюзе. У 1937-м быў арыштаваны, асуджаны да вышэйшай меры пакарання (расстрэлу) па справе так званага «Беларускага нацыянальнага цэнтра». Рэабілітаваны ў студзені 1957 года «ў сувязі з адсутнасцю саставу злачынства».

У друку ён выступаў з 1914 года, у часопісах «Раніца», «Лучынка» (Тарашкевіч публікаваўся пад псеўданімам Т. Язычнік).

У 1918 годзе выдаў «Беларускую граматыку для школ», якая адыграла значную ролю ў станаўленні беларускай літаратурнай мовы.

У заходнебеларускім друку выступаў з публіцыстычнымі артыкуламі, прысвечанымі нацыянальна-вызваленчаму руху, публікаваў свае пераклады з «Іліяды» Гамера.

У час зняволення ў польскай турме працаваў над удасканаленнем «Беларускай граматыкі», пераклаў на беларускую мову *Пана Тадэвуша* Адама Міцкевіча.

У 1936-м Дзяржаўнае выдавецтва БССР рыхтавала да выдання зроблены Браніславам Тарашкевічам поўны пераклад на беларускую мову «Іліяды» Гамера. Калі б не арышт 6 мая 1937 года.

Пераклады Браніслава Тарашкевіча маюць высокі прафесіянальны ўзровень, яны дакладныя ў перадачы арыгінала.

паводле Аляксандры Бергман

Адам Міцкевіч

Пан Тадэвуш

Быліца першая

ГАСПАДАРКА

«У летні час», 1976. Анатоль Шыбнёў

Змест

Паніч варочаецца дамоў. – Першае спатканне ў святліцы, другое пры стале. – Важная навука Суддзі аб ветласці. – Падкаморага палітычныя ўвагі аб модах. – Пачатак споркі пра Курту і Сакала. – Жальбы Войскага. – Апошні Возны трыбунала. – Узгляд на тагачасны палітычны стан Літвы і Еўропы.

Радзіма Літва! Як здароўе, так ты дарагая;
як шмат цябе трэба цаніць, толькі той і спазнае,
хто страціў цябе. Усю красу тваю бачу дзіўную
й сягоння апісваю, бо па табе сумую.

Паненка што Ясну бароніш гару Чанстаховы
і свеціш у Вострай у Браме, што горад замковы
бароніш Навагрудскі з верным ягоным жа людам!
Вось так, як мяне да здароўя вярнула ты цудам
(тады як ад плакаўшай маці табе пад апеку
я ахвяраваны, падняў амярцвелу павеку
і зараз жа мог да святыняў тваіх да парогу
йсці пешкі, за вернута жыцце падзякаваць богу
так нас ты цудоўна павернеш пад родны блакіты...
Тым часам душу маю стужану перанясі ты
да ўзгоркаў лясных, да зялёных лугоў травяністых,
шырокіх пры сіняга Нёмана водах бруістых,
да гэтых палёў самым розным збожжам маляваных,
пшаніцай залочаных, жытам найбольш пасрабраных;
туды, дзе, як бурштын, свірэпка, дзе грэчка бяленька,
як снег, дзе ружовіцца дзятліна, моў бы паненка,
а ўсё спавівюць зялёныя межаў істужкі
ды зрэдку на межах сядзяць там іхнія ігрушкі.

Пераклаў Браніслаў Тарашкевіч

Бронюсь, куды ты ідзеш?

5 верасня 1933 г. у выніку абмену палітвязнямі паміж Польшчай і СССР Браніслаў Тарашкевіч пераступіў польска-савецкую дзяржаўную граніцу ў раёне чыгуначнай станцыі Коласава, непадалёку ад першага пагранічнага пункта Савецкага Саюза – чыгуначнай станцыі Негарэлае.

З савецкага боку насустрач яму ў Польшчу ішоў беларускі драматург і тэатральны дзеяч Францішак Аляхновіч. «Бронюсь, куды ты ідзеш?» – гэта словы, кінутыя Францішкам Аляхновічам Браніславу Тарашкевічу ў час іх абмену на савецка-польскай дзяржаўнай граніцы.

Пазней у сваіх мемуарах «У кіпцюрах ДПУ» Францішак Аляхновіч апіша іх кароткую, пры ўзброеных сведках – пагранічніках, сустрэчу на граніцы. Францішак Аляхновіч папракне Браніслава Тарашкевіча ў тым, што ён захапіў моладзь сваімі словамі і ўцягнуў яе ў Грамаду і тым самым асудзіў яе частку на незаслужаныя пакуты. Францішак Аляхновіч ужо сустракаў некаторых з іх на сумна вядомых Салаўках.[…]

У снежні 1933 г. супрацоўнікі НКВД прапанавалі Тарашкевічу напісаць аўтабіяграфію. У той час яго сябрам і паплечнікам – былым беларускім паслам у польскім сейме аб'явілі абвінаваўчае заключэнне па сфабрыкаванай так званай справе «Беларускі нацыянальны цэнтр», на падставе якога праз месяц ім усім быў вынесены смяротны прыгавор з заменай на 10 гадоў канцлагераў. З моманту перасячэння польска-савецкай дзяржаўнай граніцы НКВД узяло Браніслава Тарашкевіча пад пільны нагляд свайго нядрэмнага вока. Браніслаў Тарашкевіч, прыняўшы прапанову органаў НКВД напісаць аўтабіяграфію і будучы абсалютна чэсным, інтэлігентным, высокаадукаваным і далікатным чалавекам, пачаў старанна і акуратна выконваць тую задачу, якую перад ім паставілі адпаведныя органы. У ёй вельмі падрабязна і максімальна старанна даў характарыстыкі сваім сябрам па БСРГ, паслам (дэпутатам) польскага сейма, паплечнікам па рэвалюцыйнай дзейнасці, лідарам іншых грамадскіх арганізацый, што дзейнічалі на тэрыторыі буржуазнай Польшчы. Усяго ім было ўпамянута да 250 прозвішчаў. Тарашкевіч падрабязна распавядаў пра іх узаемаадносіны, знаёмствы з іншымі дзеячамі, па так званым «ланцужку» – адзін за адным. Апісаў характары, чалавечыя слабасці і многія іншыя бакі іх адносін.

Такім чынам, хацеў Тарашкевіч ці не, але сваёй аўтабіяграфіяй ён адкрыў кола сваіх знаёмых, сваіх з імі адносін, чаго не прамінулі скарыстаць супрацоўнікі НКВД. Ён даў ім дзесяткі прозвішчаў, з якімі яны пачалі актыўна працаваць. Тарашкевіч не ведаў, што ў рукі НКВД ён дае вялікую картатэку новых персаналій – цвету беларускай інтэлігенцыі. Гэта пісьменнікі, дзеячы культуры, вучоныя, грамадскія дзеячы, вядомыя людзі таго часу. Аўтабіяграфія давала магчымасць НКВД арыентавацца ў жыцці Браніслава Тарашкевіча, яго асабістых сувязях з рознымі палітычнымі дзеячамі.

паводле А. Валахановіч і У. Міхнюк

• Салаўкі – Салавецкія астравы, архіпелаг у Белым моры на ўваходзе ў Анежскую губу. Плошча – 347 км². Гэта самы буйны па плошчы архіпелаг Белага мора. Салавецкія астравы складаюцца з шасці вялікіх астравоў. У першай палове мінулага стагоддзя савецкая ўлада арганізавала на беламорскім архіпелагу сістэму савецкіх лагераў смерці – ГУЛаг.
• ДПУ – Дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне

Закатаваны, але не прыніжаны...

26 студзеня 1957 г. Ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР рэабілітавала (пасмяротна) Браніслава Тарашкевіча, арыштаванага ў 1937 годзе па сфабрыкаванай справе «Беларускага нацыянальнага цэнтра» і прыгаворанага «двойкай» НКУС да расстрэлу.

29 лістапада 1938 года ў мінскай турме перастала біцца сэрца аўтара першай беларускай граматыкі, мовазнаўцы, энцыклапедыста, перакладчыка, грамадска-палітычнага дзеяча – чалавека, які ўсё жыццё прысвяціў служэнню Бацькаўшчыне.

Па афіцыйнай версіі, яго нібыта расстралялі згодна з прысудам. Але ж маем вялікія сумненні, паколькі дакладна вядома, як мардавалі, калечылі, катавалі так званых «нацдэмаў» падчас следства. Многія сканалі да прысуду, іншыя пасля вынясення прыгавору.

Вытрымлівалі, не скараліся адзінкі. Астатнія змушаны былі падпісаць любую паперчыну, абы толькі перасталі катаваць.

Энкавэдысты-садысты здзекаваліся з Браніслава Адамавіча дзевяць месяцаў.

У якасці абвінавачаных (па справе «Беларускага нацыянальнага цэнтра») былі прыцягнуты да адказнасці 97 чалавек. Паводле рашэння судовай калегіі АДПУ БССР, 26 з іх прыгаворваліся да вышэйшай меры пакарання, 16 – да вышэйшай меры з заменай на 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Прысуд быў вынесены 9 студзеня 1934 года, аднак праз тры гады – у 1937-м – і тыя 16 чалавек пасля паўторнага разгляду «справы» таксама былі прыгавораны да расстрэлу. Сярод іх – Браніслаў Тарашкевіч.

Цяжка зразумець логіку сталінскіх халопаў, якія «выкошвалі нават ворагаў сваіх ворагаў», але факт застаецца фактам: былы распальшчык «Вогнішча беларушчыны» – Браніслаў Тарашкевіч стаўся раптам ледзь не польскім шпіёнам. Але гэткае абвінавачанне – толькі зачэпка, на самай жа справе Браніслаў Тарашкевіч, Язэп Лёсік, Вацлаў Ластоўскі, Сцяпан Некрашэвіч ды іншыя проста заміналі крамлёўскім «браткам» і іхным мясцовым «памагатым» камуністычную імперыю, у якой бы ўсё было аднолькавае, стандартнае і падпарадкоўвалася ўсясветнаму правадыру. Рэпрэсіі польскіх улад (арышты беларускіх настаўнікаў і дзеячаў культуры, канфіскацыя газет і часопісаў, закрыццё беларускіх гімназій у Барунах, Навагрудку, Клецку, Радашковічах,

публічныя палітычныя працэсы над нашымі патрыётамі, катаванні беларускіх актывістаў у турмах у Лукішках, Вронках, Картуз-Бярозе ды іншых) мала чым адрозніваліся ад бальшавіцкіх рэпрэсій.

У той час як Браніслаў Тарашкевіч разам з Ластоўскім ды іншымі беларускімі адраджэнцамі складалі граматыкі, слоўнікі, узнаўлялі сапраўдную гісторыю сваёй Бацькаўшчыны, у СССР пачаўся пераход усіх народаў на расійскую мову. «Варожымі» былі абвешчаны і працы «нацдэмаў», у тым ліку пастановы Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе правапісу 1926 года, праект рэформы правапісу 1930 года. Мэта была адна – «ліквідаваць штучны бар'ер паміж беларускай і рускай мовамі». Іншымі словамі – спыніць натуральнае развіццё нашай мовы, пазбавіць яе непаўторнасці. Русіфікацыя перайначыла ўсе слоўнікі.

Нават калі не браць пад увагу дзейнасці Браніслава Тарашкевіча як палітыка і грамадскага дзеяча, а толькі тое, што ён пакінуў нашчадкам, можна быць упэўненым: падрыхтаваная і выдадзеная ім у 1918 годзе ў Вільні першая «Беларуская граматыка для школ» доўгі час з'яўлялася галоўным падручнікам па беларускай мове, асабліва ў часы беларусізацыі 1920-х гадоў.

Ён – колішні сярэбраны медаліст 2-й Віленскай гімназіі, выпускнік Петраградскага ўніверсітэта, прыват-дацэнт старажытнагрэчаскай і лацінскай моў – мог з лёгкасцю абмінуць палітыку, змаганне, турмы. Паколькі быў запатрабаваным выкладчыкам, літаратарам, перакладчыкам, вучоным-лінгвістам. Але выбраў іншы шлях.

паводле Георгія Чыгіра

- АДПУ БССР – найвышэйшая судовая ўлада Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

1 Што адбылося з Браніславам Тарашкевічам у гадах 1933-1937? Апішы яго асабістую і палітычную сітуацыю.

Максім Гарэцкі (1893-1938)

Выдатны беларускі пісьменнік, публіцыст і перакладчык, адзін з пачынальнікаў сучаснай нацыянальнай прозы, вядомы літаратуразнавец і крытык.

Нарадзіўся ў вёсцы Малая Багацькаўка на Магілёўшчыне ў небагатай сялянскай сям'і.

Гарэцкі займаўся выкладчыцкай, навуковай і выдавецкай дзейнасцю ў Заходняй Беларусі. У 1923 г. пераехаў у Мінск. Тут працаваў выкладчыкам у Беларускім дзяржаўным універсітэце, займаўся літаратурнымі даследаваннямі

ў Інстытуце беларускай культуры, а потым у Акадэміі навук Беларусі. У 1930 быў арыштаваны на падставе сфабрыкаванага абвінавачання ў прыналежнасці да т. зв. «Саюза вызвалення Беларусі» і асуджаны на 5 гадоў высылкі ў Вятку. У ссылцы ён пісаў раман *Віленскія камунары* (выд. пасля рэабілітацыі ў 1965 г.), апрацоўваў матэрыялы да Камароўскай хронікі – вялікага дакументальна-мастацкага твора аб жыцці некалькіх пакаленняў адной сям'і ад часоў прыгонніцтва да сучаснасці. У 1937 г., калі распачалася новая хваля рэпрэсій, пісьменніка зноў арыштавалі. Быў расстраляны ў 1938 г. у Вязьме. Рэабілітаваны ў 1957 годзе.

Літаратурным дэбютам Гарэцкага стала апавяданне *У лазні* (1912), апублікаванае ў 1913 г. на старонках «Нашай нівы» пад псеўданімам Максім Беларус. Неўзабаве пачалі паяўляцца новыя апавяданні (*Стогны душы*, *Роднае карэнне*, *У панскім лесе*, *Красаваў язмін*), большасць якіх увайшла ў зборнік *Рунь* (1914). Малады пісьменнік пашырыў тэматычныя і жанрава-стылявыя межы беларускай прозы, замацаваў у ёй тып сюжэтнага сацыяльна-псіхалагічнага апавядання і ўвёў новага героя – вясковага інтэлігента, які ўсведамляе сваю адказнасць за лёс народа і будучыню роднага краю.

Раннія апавяданні Гарэцкага напісаныя з пазіцыі асветніцкага рэалізму. Канфлікт у гэтых творах заснаваны на сутыкненні маладога інтэлігента з вясковым асяроддзем, дзе пануе цемната, забабоннасць, абыякавасць да ўласнага лёсу.

Пісьменнік стварыў новы вобраз інтэлігента – чалавека, які ўсведамляе дваістасць уласнага становішча як «прымака ў панстве» і «пасынка вёскі».

Адным з праяваў наватарства прозы Гарэцкага быў цыкл *Што яно?*. Герой цыкла ставіць перад сабой складаную задачу – разгадаць таямніцу жыцця і смерці. Да зместу і стылістыкі гэтага цыкла набліжаюцца лірычныя эскізы, экспрэсіі, абразкі (*Патаёмнае*, *Цёмны лес*, *Стогны душы*, *Буйніцы і драбніцы*). Сюжэт гэтых твораў пабудаваны не на дзеяннях, а на роздумах героя адносна складанасці жыцця, у якім многа неразгаданага, таемнага, неспазнанага.

Далейшае ўдасканаленне стылявой своеасаблівасці прозы Гарэцкага спалучаецца з падзеямі Першай сусветнай вайны, удзельнікам якой ён быў. Праз усе гады ваенных блуканняў, нават у самых неспрыяльных умовах, пісьменнік рабіў нататкі да будучай дакументальна-мастацкай кнігі *На імперыялістычнай вайне*. У ваенны час паявіліся такія шэдэўры беларускага малога эпасу, як *Літоўскі хутарок*, *Рускі*, *Маці*, *Хадзяка*, *Генерал*, *Амерыканец*, *Прысяга*, *Дзве сястры* і інш. Творы гэтыя маюць выразна антываенную скіраванасць, а іх сюжэт – трагічную развязку. Пячаткай трагізму пазначаны таксама лёс дзейных асоб у гэтых творах – гаспадара хутара і яго дзяцей (*Літоўскі хутарок*); салдата-беларуса, што пакутуе ад нервовай хваробы пасля забойства аўстрыйца (*Рускі*); вясковай дзяўчыны, якая ў страху перад бацькамі загубіла пазашлюбнае дзіцё (*Маці*); старога падарожнага, якога аднавяскоўцы не прызналі за тутэйшага жыхара (*Хадзяка*). У прыгаданых апавяданнях герой аказваецца непасрэднай ці ўскоснай ахвярай вайны. Вайна паказана ў іх такой, якой яна была ў сапраўднасці. У абмалёўцы чалавека на вайне аўтар імкнецца перадаць складанае перапляценне супярэчных пачуццяў, іх дыялектыку.

Тэматычна з вайной звязаны многія творы Гарэцкага, у іх ліку і аповесць *Ціхая плынь*. У творы гэтым з гуманістычным пафасам прадстаўлены жыццёвы шлях вясковага хлопца ад нараджэння да бяссэнснай гібелі на вайне.

Максім Гарэцкі з'яўляецца аўтарам многіх апавяданняў (зб. *Досвіткі*, цыклы *Сібірскія абразкі*, *Люстрадзён*), аповесцей (*Дзве душы*, *У чым яго крыўда?*, *Меланхолія*, *Антон*), драматычных абразкаў (*Жартаўлівы Пісарэвіч*, *Мутэрка* і інш.). У творчай спадчыне празаіка знаходзяцца таксама навукова-даследчыя працы *Гісторыя беларускай літаратуры* (Вільня, 1920).

Творы пісьменніка адметныя глыбокім псіхалагізмам і гістарычнай панарамнасцю, адлюстроўваюць шырокі аб'ём сацыяльных, палітычных, духоўных праблем беларускага народа.

У сваёй творчасці Максім Гарэцкі абапіраўся на здабыткі нацыянальнага фальклору і літаратуры, лепшыя традыцыі рускіх класікаў і дасягненні еўрапейскай культуры. Дзякуючы яго мастацкаму таленту, беларуская літаратура ўзбагацілася многімі эпічнымі жанрамі, інтэлектуальна-філасофскай, лірычнай, дакументальнай прозай.

паводле Міхася Мушынскага

Максім Гэрэцкі

Рускі

А таму хвораму на грудзі салдату-беларусу, што прывезлі з аўстрыйскага фронту, болей выпадае ляжаць у бальніцы для нервова хворых, чым тут, у нас. Ён ляжыць на Саксанавым месцы.

Наша палата празвала яго Рускім, бо ён, калі яго забірае хвароба, крычыць шмат разоў бесперастанку:

Я рускі! Я рускі! Рускі, рускі!..

На выгляд гэта ёсць даволі здаровы мужчына. Ён сярэдняга росту, добрага складу, шыракаплечы, і грудзі ў яго звычайныя. На твары ніякай хваравітасці не відаць, – пэўна ж, калі ўважаць на тое, што чалавек прыехаў не з гасцей, а з акопаў. І толькі ў вачах гаротніка ё штосьці такое, што выдае цяжкую хваробу, і муку, і безнадзейнасць. Вочы ў яго праваліліся, зрабіліся маленькімі. Галоўнае ж, яны страшэнна змарнаваныя, нейкія змятыя, сцёртыя. Трэба прыгледзецца да іх, і тады відаць у іх боль.

Дзіўная гісторыя выйшла з гэтым нешчаслівым чалавекам.

З пэўнасцю можна сказаць, што да вайны ці, лепей кажучы, да мабілізацыі – Рускі быў звычайным земляробам Магілёўскай губерні: быў здаровы, але крышку павольны; здольны ад прыроды, але цёмны, грубы.

Апрануты па-салдацку, ён нічым не змяніўся, толькі прытарнаваўся да свайго новага жыцця.

І на пазіцыі, у часе доўгага і спакойнага стаяння ў зацішку малаважнага фронту, болей за другіх сваіх таварышаў любіў Рускі туляцца па пустых, кінутых сялянскіх дварах і поркацца там, шукаючы пажытку.

Увечары, першым змрокам, ішоў ён цягацца па зрытых акопамі палях, знаходзіў пустое бульбянішча, капаўся там сваёю маленькаю пехацінскаю лапатачкаю дзеля якога дзесятку непадабраных гаспадаром і свіннямі бульбін. Хаця яму за гэта дакаралі, не кідаў свайго блукання ў цёмным полі, і тая памаўзлівасць згубіла яго.

Аднойчы Рускі, няўпрыцям для самога сябе, забрыў лішне далёка ў бок аўстрыяцкіх пазіцый, за сваю перадавую старожу, і так забавіўся, шукаючы пажытку, што было ўжо зусім цёмна.

Троху спалоханы, асцярожна плёўся ён назад, заткнуўшы лапатачку за пояс і маючы ў аднэй руцэ кацялок з накапанаю бульбаю, а ў другой – стрэльбу на ўсякую неспадзяванку. Толькі ўзняўся ён на нейкі невялічкі ўзгорачак, як знянацку ашаламеў: перад ім стаяў аўстрыяк. Абодва разам прыселі да зямлі: Рускі прысеў ад страху, а той, мусіць, таксама. Дзеелася адзін момант, а здалося дужа доўга. Аўстрыяк тады першы кажа:

– Руськый! Я маю горілку.

– Я табе нічога не зраблю! – адказаў Рускі зусім лагодна і смела ўстаў і пайшоў да яго бліжэй.

Аўстрыяка таксама падняўся, разы два ступіў і падаў руку. Ворагі прывіталіся, як даўныя сябры. Потым ізноў селі, толькі ўжо побач – і стрэльбы паклалі, кожны пры сваім баку.

Хаця блізу што зусім не гаманілі, бо языкі варочаліся туга, дый мала чаго яны разумелі ў словах той таго, але так выйшла неўзабаве, што выпілі аўстрыякаву гарэлку, заелі яго падсітным хлебцам і закурылі па кручонцы з махоркі Рускага. Гарэлкі было – адно толькі званне: па чарцы, можа, ці па дзве на брата. Пілі нагбом – спярша аўстрыяк, а тады Рускі. Калі зрабілі ўсё і трэба было расхадзіцца, пачулі нейкую прыкрасць. Ды аўстрыяк падбодрыўся і сказаў:

– Чы веды менэ до Русіі, чы разойдэмся.

Рускі паскроб ля вуха, як бы й запраўды разважаў, што тут рабіць. Паглядзеў, задраўшы галаву, і адказаў:

– Не, братка, ідзі сабе да сваіх.

Аўстрыяк быццам трохі, нябачна, замаркоціўся. Але падаў руку. Рускі пацiснуў яе. І завярнуліся ў свае бакі.

Аўстрыяк адыходзіў шпарчэй. Рускі павалюхаў марудна і няскладна, як

Салдаты на перадавой пішуць пісьмы. Галіччына, 1915 год

мядзведзь. Яго прыціснула тое, што не меў часу падумаць, як гэта што было. Ён хапаўся ўцяміць, ці ўсё добра ён рабіў. І калі раптам бліснула яму ў галаве, і ён, каб не спазніцца і каб пасля не шкадаваць, што быў варонаю, ён, ужо ступіўшы разоў дзесяць, сказаў сам сабе: «Э, што ж я за ваяка». І не сказаў, толькі бліснула яму так у галаве. Павярнуўся, злажыўся стрэльбаю і без дум пацiснуў пальцам:

– Так!

Гул быў глухі і невялікі. Аўстрыяк спачатку зарыўся носам і бразнуў бляшанаю пляшкаю, з якой пілі гарэлку, аб сваю стрэльбу. Потым перавярнуўся дагары тварам – і вельмі жалосна і з працягам застагнаў.

Калі Рускі падбег і нахіліўся над яго чубатаю шапачкаю і даўна падстрыганымі вусамі, дык у цямноце мала чаго ўбачыў, але пачуў, як ён яшчэ дадаў, гаворачы быццам аб нейкім трэцім:

– Што ж цій москаль наробыв. Зостанэцця моя жынка і діты.

Безнадзейная крыўда чулася ад яго; апошнія словы ледзь выдыхнуў, бо ўжо канаў. Раскінуў рукі і ногі. Рускаму здалося, што смяротная пялёнка, як у той курыцы, засцілае яго жаўтаватыя бялкі.

– А колькі ж іх маеш? – з апалым сэрцам спытаўся Рускі і мімаволі, выглядаючы сабе падмацаванне, агледзеўся наўкол, у ночным змроку.

– Ді-ты.

Забіты яшчэ раз пацягнуўся, замкнуў паволі вочы і быў гатоў.

Рускі перахрысціўся над мёртвым і палез у яго кішэню ў штанах. Выцягнуў адтуль пакамечаны ад доўгага часу і замаслены ліст у канверце. Болей нічога не было, і ён расчаравана ці нездаволена падраў яго на колькі частак. Абдумаўшыся, падняў іх з зямлі, каб пасля скурыць. І зноў кінуў. Аж рукі трохі дрыжэлі, і было брыдка, што так блазнуе, быццам не ворага забіў, а якога свайго. Смялей памацаў у яго за пазухаю, ува ўсіх кішэнях і ў шапцы і ізноў нічога добрага не знайшоў. Аглядаючы яго боты, ці варта здзіраць, глянуў незнарок у цямноту ночы, спалохаўся... Схапіў кацялок з бульбаю ў адну руку, дзве стрэльбы за раменне – у другую і пусціўся бегчы што ёсць духу да сваіх.

У роце яму не далі веры, што забіў аўстрыяка, і думалі, што прост у полі дзе знайшоў гэтую аўстрыяцкую стрэльбу. Але, праўда, была яна нядаўна ношаная, «цёплая» і пачышчаная. Можа, і забіў.

Толькі чалавек з гэтага часу перамяніўся. Быў дужа маркотны, кінуў брадзіць па дварах і бульбоўніках, упадабаў ляжаць на зямлі з раскінутымі нагамі і рукамі... Урэшце зазябіў сабе грудзі, і яго адправілі з пазіцый і прывезлі спярша ў нейкі паўднёвы горад, а потым у наш шпіталь, глыбей у тыл.

Тут не ведаюць, як яго разумець. Доктар Гэрмэер, немец з Дзвінску, якога мы ўсе не любім, лічыць Рускага за прыкідаку, іначай не заве, як «сімулянтам», і нават у вочы яму кажа:

– Ты, прахвост, прыкідаешся! Ты ўсё гэта выдумаў! Падлечым табе грудзі і ўсё роўна паедзеш ізноў на фронт.

Другі доктар, старшы, на прозвішча Квяткоўскі, а родам, як кажуць, з-пад Баранавіч, старанна лечыць яму грудзі рознымі ўдыханнямі і паветранымі ваннамі, а на яго нервы зважае мала і быццам не чуе, калі таго пачынае забіраць хвароба:

– Я рускі! Я рускі! Рускі, рускі!

– Ну-ну-ну, гэта не столь важна, – гаворыць старшы доктар Рускаму, пераходзячы за другіх хворых і раненых.

«Не столь важна! Не вельмі важна, гм!» – думаю сабе я.

Я на свае вушы чуў ад Рускага аб тым, як ён забіў беднага аўстрыяка, і спярша таксама не паверыў: ці мала хітрых бестый бывае паміж салдат. Аднак, я на свае вочы бачыў, у першую ж яго ноч у нашым шпіталі, як ён горка плакаў і жаліўся, што яму ўсё нешта здаецца. Няшчасны, нягледзячы на бром і падскурнае ўпырсківанне, заліваўся слязьмі так шчыра і жалосна і так доўга, што ніяк не можна было яму не верыць.

- палата – асобны пакой, дзе ляжаць хворыя ў лячэбных установах
- гаротнік – ад слова «гаротны», той які церпіць, перажывае гора, няшчасны чалавек
- грубы – няветлівы, некультурны, непрыемны
- прытарнавацца – дастасавацца
- памаўзлівасць – ад слова памаўзлівы – ласы
- нагбом – проста з бутэлькі

1 Ахарактарызуй галоўнага героя апавядання *Рускі*.

2 Якія супярэчлівыя пачуцці давялі галоўнага героя да псіхічнай хваробы?

3 Рускі з'яўляецца непасрэднай ахвярай вайны. Як вайны прадстаўлена ў тэксце?

4 У апавяданні Максім Гарэцкі раскрывае тэму адказнасці за свае ўчынкі, справы і паводзіны – адказнасці перад жыццём, нашчадкамі, будучыняй. Скажы, ці гэтыя рысы характару з'яўляюцца актуальныя сёння? Абгрунтуй свой адказ.

Максім Гарэцкі

Фантазія

Клубок Зямлі, агорнуты крывавым туманом і згараючы ў ім, рабіў свой вечны шлях у сістэме Сонца.

Найгусцей прыпаў туман на прасторы Беларусі.

Пад гулкі грукат гармат, траскатанне стрэльбаў і кулямётаў, пры водбліску страшных пажарышчаў раздаваліся дзікія воплі і балючыя стагнанні забіваных, рэзаных, паміраючых з голаду людзей.

Могілкі і турмы перапоўнілісь. Грэх спавіў кожнае сэрца. Крывёю і слязьмі пазаплывалі вочы.

Сцені памёршых продкаў у смяротнай нудзе стаялі над распятай краінай і адварачываліся ад сваіх затопленых смуроднаю запечанай крывёй могілак.

З расцерзаным да краю сэрцам вялікага гуманіста вылез у поцемках з няведамай патомкам ямы панураны Францыск Скарына і падаўся ў начавым паветры да свайго радзімага Полацка.

Даўгія, шырокія полы мантыі доктара лекарскіх і вызваленых навук развяваліся ад ветру, а яркі арэол наўкола сумнай галавы то разгараўся, то змяркаў.

Пралятаючы над слаба асвятлёным дзеля боязні аэрапланаў Менскам, сцень доктара шукаў вачмі таго шпіталя, дзе ляжаў пры смерці хворы з галадухі Янка Купала.

Пабачыўшы над цёмным домам ззячую кружэлку арэолу песняра, сцень спусціўся ў ціхую палату і стаў над сваім нядужым сябрам.

– Як маешся, мой браце? – без слоў спытаўся доктар у стагнаўшага паэта.

Хворы з трудом заварушыўся і сумна паглядзеў на гуманіста.

– Не мукі цела страшны, – прачытаў Францыск Скарына ў кроткіх галубых вачах, – баліць душа.

– Лячу ў Полацак, хачу даведацца, што цяпер там, – сказаў цераз невялікае маўчанне доктар.

– Скрозь адно... Што тут, што ў Вільні, што ў Смаленску і скрозь на Бацькаўшчыне мілай... – пакратаў перасохшымі ад смагі вустамі паэт.

Доктар засмучона схіліўся галавою да грудзей і доўга так стаяў.

– На сход! – сказаў у непрытомнасці Купала і збудзіў ад чорных дум паніклы сцень.

– Каму і на які? – азваўся рэхам сцень. Памаўчаў і прамовіў горка: – Магутны кліч твой раздаецца ўжо даўно – і скрозь, ад краю ў край, па Беларусі... А шмат з'явілася? Народ за доўгія вякі няволі аглох і зрабіўся нячулым.

– Што рабіць? – ізноў, як у гарачцы, застагнаў Купала.

– Што рабіць? – перапытаўся доктар, – тое, што ты і робіш. Але каб зразумеў народ наш паспаліты патрэбу сходу, ці не сабрацца спачатку толькі нам, будзіўшым яго на дабро ўсе вякі і кожны час?

– Добра... – прашаптаў паэт і сціх.

Сцень вылецеў з палаты і не падаўся далей к Полацку, а павярнуў назад к Ашмяншчыне.

Здалёку ўвідзеў ён на могілцы ў Жупранах вялікі яркі арэол народнага баяна.

Францыск Скарына спусціўся ля касцёла і чыркнуўся няўмысля палою мантыі аб спячага п'янога легіянера.

– Пся крэў! Холера! Быдло бялоруске! – закрычаў патурбаваны доктарам жандар, а яму рэхам адазваўся з-пад зямлі жудасна-балючы стогн бацькі адраджэння.

– Не стагні, мой браце любы! Барзджэй бяры ты сваю «Дудку» й «Смык», пойдзем на сход склікаць! – сказаў яму заместа прывітання доктар.

З магілы ўзняўся сцень вусатай постаці.

– Засіпла мая дудка, а смык не маець скрыпкі... – безнадзейна пажаліўся Багушэвіч і дадаў, падумаўшы аб сваёй музе:

Каб ты так іграла,
Каб немарасць брала!..

– Твая «Дудка» грыміць, мой браце, на ўвесь край, а да «Смыка» дарабіла ж «Скрыпку» Цётка. Пойдзем зараз у Лідчыну на той вясковы могільнік, пабудзім на сход найперш яе, бо гэтая руплівая сяброўка склікаць умее найлепш за ўсіх.

І два сцені паляцелі побач у Лідчыну.

Поўная запалу і энергіі, хаця худзенькая і бледная, ляцела ўжо сама да іх пяснярка і паэтычна, ціханька пяяла ў адказ на свае думкі:

Можа, хто з дзетак скруце жалейку,
Унучку паломанай ліры.
І так заіграе, што ўсенька зямелька
Пачуе мой водгалас шчыры...

– Ах, браточкі-галубочкі! – загаманіла яна без дальніх слоў. – Трэба так: адзін на ўсход, другі на захад, а я з тым-сім паклічу тых, што спачываюць на чужыне, – і зараз паняслася.

Неўзабаве сцені памёршых і духі жывых сцякаліся на свой Парнас з усіх бакоў.

Пакашліваючы, брыў з далёкай Ялты калматабровы Максім Багдановіч. Спяшаўся, як заўсёды, з Галіцыі, з сваей магілы ў Закапаным, запыханы Іван Луцкевіч. Глабаўся з-пад груду трупаў брацкай магілы ў Коўне Лявон Гмырак. Шыбка йшоў у хутры і ў зімовай сібірскай шапцы з Кракава даўгі Алесь Гарун. Важна і спакойна пасуваўся з Меншчыны пан Вінцук Дунін-Марцінкевіч. Як непрытомны прыбліжаўся з Кіева празрыста-белы Сяргей Палуян з сінім шнурам на шыі... Прысадзіста калдыбаў разважны каранасты Карусь Каганец. Там ішлі яшчэ й другія.

А клубок Зямлі, згараючы ў крывавым тумане, ляцеў а ляцеў сваім вечным шляхам, як бы нічога не было.

- глабацца – вылазіць

1 Якія паэты, пісьменнікі і прадстаўнікі культуры прадстаўлены ў апавяданні?

2 Вызнач час падзей у творы на аснове аўтарскай падказкі.

3 У чым праяўляецца нерэалістычнасць прозы Максіма Гарэцкага?

Максім Гарэцкі

Стары прафесар

Дзеялася тое дужа даўно.

Прыязджаў некалісь да пані ў госці стары прафесар з маладою жонкаю, панінай пляменніцай.

Прыехалі яны аднаго разу з Пецярбурга на папраўку позняю вясною, калі ўжо адпяялі салавейкі і адцвілі акацыі.

Ды яшчэ прыгожа было ў панскім садзе, і кожны вечар, ідучы з работы міма сіняга плота, можна было бачыць там на сцежцы беленькую сукеначку ў пары з вялікаю чорнаю постаццю прафесара.

Надта ж любіў гэты пажылы вучоны чалавек сваю невялічкую рухавенькую жонку. Ён высокі, маўклівы, а яна ўчэпіцца за яго локаць, шчабеча яму, як тая птушачка, заглядае знізу ў вочы, як дачушка да старога бацькі.

Відаць, што ён не можа на яе налюбавацца, як бы дзеля таго і маўчыць. Пазірае з вялікаю пяшчотаю і толькі носам усміхнецца да яе з радасці, як дзіця.

Затое і ўсіх людзей любіў. Да сялян быў ласкавы, даступны, сам падыходзіў і пытаўся пра іхнае жыццё. І любіў слухаць усё, што яму кажуць. Песні і казкі любіў, як немаведама што. Пачуе цікаўную казку ад пастуха Якіма і ходзіць за ім, пільнуе, каб яшчэ пачуць. Пачне той плясці свае плёткі, а прафесар слухае так, як бы Богу моліцца, слоўца не прапусціць. Як той скончыць, ён задумаецца, засмуціцца, а потым і ўсміхнецца па-свойму, як тое дзіця. Пачуе дзявочыя песні, і зноў яму вялікая радасць.

Палюбіў народ і яго жонку. Нават да старой пані ў тым леце ўсе ласкавейшыя з-за іх зрабіліся.

Дык не дзіва, што надта ўсім было жалосна, калі захварэла маладзенькая паня на якуюсь цяжкую і цягучую хваробу.

Як прыйшло жніво, не бялелася ўвечары сукеначка між дрэў у садзе, затое бесперач стаяла ля сіняга плота карэта пад доктара. То завазіла, то прывазіла, а палёгкі ніякае няма. Перабывалі з горада ўсе дактары, то ездзіў адзін, то потым другі, а ўрэшце і ўсе разам, тры ці чатыры сабраліся, а рады не могуць даць ніякай.

Схудзеў прафесар, аблахмаціўся, вочы ў яго ўваліліся, гаруе бедны, як не плача пры людзях. Лячыў, лячыў дактарамі і прыждаў таго, што ўсе дактары ў адзін голас зусім яго абезнадзеілі. Хоць нічога яму страшнага не казалі, але відаць па іх, што чакаюць канца і як бы дзівяцца, чаму хворая так доўга не даецца смерці.

Хадзілі да яго і нашы бабы-шаптухі са сваімі радамі, ды ён і слухаць іх не хацеў, нават з старою паняю за іх пасварыўся. Няўцям гэта было людзям: казкі ж простыя слухаць любіў, чаму ж, думалі, не хоча спрабаваць простыя рады? Бывае ж – памагае.

Тым часам адбіў ён тэлеграму ў Пецярбург найлепшаму доктару. Прыехаў якраз на самага Спаса. Пастукаў, паслухаў, паківаў галавою, як пераказвала пакаёўка, ды і развёў рукамі таксама, як і тутэйшыя дактары: няма надзеі. Купіў у Хаіма-рандатара пяць пудоў ранніх медунічак з панскага саду і паехаў назад у Пецярбург.

Хворая ссохла, збялела, знядужала ў канец: адны косці, абцягнутыя тоненькаю скураю. І што ёй такое было, хто ведае: то гарачка паліць, як агнём, за сорак градусаў даходзіць, то асцюдзянее ўся, аслабне і так самлее, што восьвось сканае нешчаслівая. Разоў колькі думалі, што і памірае. Старая паня ламае з гора рукі, лямантуе, хапае ў пакаёўкі смяротную свечку, прыступаецца да пляменніцы на вечнае развітанне, пакаёўка і кухарка равуць ад жаласці, а прафесар, забыўшыся на сваю вучонасць, крычыць на іх усіх, гоніць вон, потым абхопіць хворую, сашчэпіць у сваіх абоймах, прытуліць да яе пасохшых грудзей сваю сівую галаву і шэпча, як здурнеўшы: «Не, не, не! Гэтага быць не можа! Ты не памрэш! Ты не памрэш! Я хачу, каб ты жыла. Мы ізноў будзем гуляць вечарамі ў садзе... Мы ізноў будзем гаманіць... А то не, мы кінем гэтае гіблае месца! Мы паедзем у Пецярбург! Паедзем, паедзем... Чуеш, рыбка мая, я не хачу, каб ты памерла, ты не памрэш, не! не!! не!!!» А ў самога вочы гараць, барада

«Браслаўскі пейзаж», 1965. Віктар Сахненка

трасецца. І хворая, быццам паслухаўшы яго, патроху кране вачыма, пачне дыхаць. І так гэта ўсё жаласна, што глядзець, – сэрца кожнаму сціскаецца болем.

Пакаёўка Аўгення была сірата і мела толькі аднаго дзядзьку, таго самага пастуха Якіма, што, бывала, пану казкі плёў і так складаў розныя небыліцы. Яна часам бегала да дзядзькі пагаманіць і, вядома, пераказвала, што дзеецца ў панскім будынку. Жаль было Якіму добрага прафесара і яго маладой жонкі. І параіў ён, каб сказала панам зрабіць так: абвязаць хворую сырою ніткаю і кінуць тую нітку на раздарожжы, каб зняла хваробу. Аўгення, вядома, дзяўчына, не сказала старой пані з вока на вока, а бухнула ў сталовай за абедам, калі быў і прафесар. Старая пані і абедаць кінула, хоць якое там з гора і абеданне было! Пасядзяць моўчкі за сталом, цяжка ўздыхаючы, паглядзяць са смуткам на стравы і пойдуць, нічога не з'еўшы.

Зрабіце так, зрабіце, пан прафесар! – кажа старая. – Зрабіце, калі вам дорага мая Вольгачка.

А Вольгаю звалі хворую.

Прафесар за час хваробы жонкі зрабіўся апрысклівы, гняўлівы...

І тут загневаўся:

– Я чалавек навучны, а вы мне дурніну такую кажаце.

– Пабойцеся вы Бога, пане прафесар, з сваёю навукаю, – аж дрыжыць і слёзы абцірае старая пані. – Што вам даражэй: ваша навука ці... ці... жыццё, жыццё Вольгачкі?

І вось прафесар паказаў сваё каменнае навучнае сэрца. Гаворыць так:

– Навука сказала сваё слова, і я веру ёй, а не вашым забабонам.

Паня і Аўгення аж вочы ў страху на яго вытрашчылі. І ён, мабыць, сам спалохаўся таго, што сказаў. Затросся ўвесь, застукаў кулаком па стале, закрычаў, як не ў памяці:

– Веру, веру, веру! Але не хачу гэтага, не хачу, не хачу, ой не хачу! – Потым схапіўся рукою за горла, завыў і бразнуўся на стул. Адлілі яго вадою, валяр'янавых капак выпіць далі, пагразілі, што хворая пачуе яго крык. На тым размова скончылася. Тую ноч была радоўка пільнаваць хворую прафеса-

ру з Аўгенняю, бо так хворая настоіла, каб адну ноч старая паня з кухаркаю, а другую ноч яны былі б пры ёй. Толькі ўсё роўна прафесар штоночы амаль не адхадзіў ад яе ложка, адно што не ў сваю радоўку стараўся не быць на ваччу ў хворай і сядзеў у сумежным пакоі.

К гэтай ночы хворая зусім струхнела. Гарачка адпусціла бедную, дык ляжала выцягнуўшыся, як доўгі шкілет, сіняя, непарушная.

Цеміць прафесар, што смерць у пакой увайшла.

Цеміць і з галавы сходзіць. Сатне зубы, абхопіць галаву рукамі і сядзіць, пахінуўшыся да кален, у крэсле.

Калі хворая задрамала трошкі, выйшаў ён на мысічках у другі пакой і давай штосьці шаптаць.

Прыслухаецца Аўгення і чуе, што ён спамінае ўсё то жонку, то навуку.

Расчыніў акно, глядзіць у сад і ўсё шэпча сам з сабою.

Жніўныя ночы ў нас дужа прыгожыя, асабліва, як дзе дрэвы лісточкамі ў цемні варушаць. Цёпла, ціха, там-сям зорачка блісне, з поля, дзе жыта пажатае, прыемна супакой так і плыве ў душу. І антонаўкамі прыемна пахне.

– Спіць? – шэптам спытаўся прафесар у Аўгенні і, убачыўшы, як кіўнула галавою, выйшаў у сад – прахаладзіцца ці хто ж яго ведае чаго. «Каб яшчэ не зрабіў сабе ад гора чаго ліхога», – памысліла Аўгення і прыхінулася ля акна, каб ад хворай далёка не адхадзіць і дасачыць, ці ходзіць ён па дарожцы ў садзе.

Ціша панавала ўва ўсім будынку і садзе, потым гадзіннік празваніў адзінаццаць ці дванаццаць, дзяўчына добра не злічыла, і ізноў усё чыста сціхла, толькі пясочак скрыпае пад нагамі ў прафесара – чуваць у акно.

Слухае Аўгення і пачала патроху разбіраць, што там шэпча з гора чалавек.

– Вольгачка, Вольгачка, ты і навука – усё жыццё маё. Ты, – кажа, – ахарашыла для мяне навуку, а без цябе і навука ні ўва што.

Потым раздумаўся, памаўчаў дый кажа, быццам няўмысля лютуючы сябе.

– Не, – кажа, – навука вышэй за цябе, навука вышэй за ўсё, і без навукі мне было б нудна нават з табою, хоць ты адна і найлепшая для мяне ўва ўсім свеце. І ты памрэш, і я памру, а навука не павінна памерці і здрады не павінна цярпець.

«Божухна-бацюхна! – памысліла дзяўчына. – Не любіць ён жонкі, усе мужчыны такія: то халяруе ад кахання, то гатоў за якуюсьці навуку на смерць жонку аддаць».

– Памрэш ты, Вольгачка, – шэпча ён далей, – і застанецца мне адна пацеха – навука мая. Дык ці ж магу абразіць яе забабонамі? Гэтая нітка – знявага для навукі і для майго імя.

І шмат чаго яшчэ казаў здурнелы ад гора прафесар, што і зразумець не магла Аўгення. Адно ўцяміла, што яму хочацца зрабіць так, як казаў яе дзядзька Якім, але чамусь сорамна яму рабіць тое.

– Тут, – кажа, – справа не ў нітцы і не ў забабонах, а ў здрадзе навуцы, якую любіў, калі яшчэ і Вольгачкі не любіў. – Няўжо ж, – кажа, – магу я напляваць на сваю веру?

«І якая тут вера ў яго, – мысліць дзяўчына, – калі нават папа прывезці спавядаць жонку перад смерцю і то не дазволіў старой пані, – антыхрыст стары!»

Аж раптам чуе яна: затупаў пан нагамі па зямлі, як няўдалы дзіцёнак, потым кінуўся за дрэва і давай калаціць яго на ўсю сілу, давай трэсці.

Хацела бегчы дзяўчына па старую пані, ды ад страху прыліпла к сценцы, думае сабе: «А што, як сапраўды здурнеў і паляціць сюды біцца? Вялікі, здаровы – задавіць насмерць». А ён калаціў, калаціў дрэва, адпусціўся і ціха, але жудасна, аж скура стыгне, зарагатаў:

– Пляваць мне на цябе, навука, калі ты бяссільная!

Сціх і ідзе ў пакоі, а тым часам Аўгення шмыгнула да хворай і млее там: што гэта будзе? Хворая ж ляжала, як мярцвяк. «Можа, і памерла ўжо?» – паглядае на яе дзяўчына і баіцца падысці.

Тым часам прыблізіўся на мысічках прафесар, прыхіліў да жончыных грудзей галаву, паслухаў.

– Дыхае, – шэпча Аўгенні і ківае да сябе пальцам, гукае Аўгенню за сабою. Як выйшлі, пытаецца: – Ці няма ў цябе, Аўгінка, пад рукою якой нітачкі? Буду паперы разбіраць у кабінеце, трэба звязаць у пачкі.

Зразумела яна, на якую патрэбу просіць нітку і зараз збегала ў сваю каморку, прынесла.

– Ну, галубка, ідзі троху паспі, – сказаў ёй прафесар, – я пакуль што адзін пабуду, а як трэба, дык узбуджу.

Пайшла Аўгення, а троху пачакаўшы, дасачыла з-за вушака: абвязвае наўчоны прафесар хворую жонку ніткаю. Абвязаў, асцярожненька прапусціўшы пад ногі і пацягнуўшы вышэй пад тулава, потым пацалаваў жонку ў лоб, пераксціў (чаго ніколі, ніколі раней не рабіў) і з ніткаю ў руцэ паціхеньку выйшаў у сад.

Аўгення сцяміла, што ён пабрыў за сіні плот на раздарожжа, і была дужа рада.

Калі ён вярнуўся, дзяўчына паіла хворую пані вадою з узбітым бялком і віном.

– А я трошкі прагуляўся, – вінавата, але спакойна і радасна казаў прафесар, – ах, якая прыгожая ноч, дрэвы спяць і скрозь сон варушаць лісцейкам. Ну як ты сябе чуеш, рыбка мая?

– Як бы лепей, – усміхнулася яму хворая цянюсенькімі вуснамі і раскрыла вочы.

– Чамусь мне верыцца, рыбка мая, што ты з гэтае начы пачнеш папраўляцца. У цябе сягоння быў крызіс. Вось пабачыш, рыбка!

– Мне лепей... чую, што лепей! – парадавала мужа хворая і пацягнула худзенькую, васковую ручку, каб пацалаваў: – Цяпер ідзі спаць, мойлюбы.

Назаўтра Аўгення збегала да дзядзькі і сказала, што пан такі даўся з сваёю навукаю. Усе людзі з надзеяй чакалі паляпшэння хворай. Але не магла памагчы навука, – не памаглі і забабоны. На трэці дзень хворая сканала.

- пляменніца – дачка брата або сястры
- стул – табурэтка
- гадоўка – чарга
- струхнёла – тут: выглядаць на безнадзейна хворую
- на мысічках – на пальцах

1 У апавяданні Стары прафесар прадстаўлены канфлікт між вернасцю сваім ідэалам, а забабонамі. Уяві сябе на месцы старога прафесара. Які шлях ты выбраў бы? Чаму?

2 Як паводзіў сябе галоўны герой твора?



Уладзімір Дубоўка (1900-1976)

Беларускі паэт, празаік, перакладчык, літаратурны крытык. У лютым 1918 завяршыў семінарскую вучобу і пераехаў у Маскву, куды яшчэ ў 1915 перабралася яго сям'я. У 1920-я гады ён быў адным з вядучых беларускіх паэтаў незалежніцкай арыентацыі. Нягледзячы на тое, што пастаянна жыў у Маскве, браў актыўны ўдзел у беларускім літаратурным руху – сябар літаратурных аб'яднаньняў «Маладняк», «Узвышша». Каб пазбегнуць цэнзуры, некаторыя вершы друкаваў у заходнебеларускім часопісе «Беларуская культура».

За верш *За ўсе краі, за ўсе народы свету* 20 ліпеня 1930 арыштаваны НКВД у Крамлі па справе «Саюза вызвалення Беларусі». У 1931 знаходзіцца ў зняволенні ў мінскай турме; 10 красавіка асуджаны на пяць гадоў высылкі ў Сібір, куды прыязджае з малалетнім Альгердам і жонка Марыя. Працуе ў раённым спажывецкім саюзе на пасадзе сакратара. У ліпені 1935 тэрмін высылкі падоўжаны на 2 гады. У 1937 паўторна арыштаваны і асуджаны на 10 гадоў пазбаўленьня волі, пасля чаго жонка з сынам вяртаецца ў Маскву. Тут у 1941 гіне трынаццацігадовы сын Альгерд. У 1947 па заканчэнні тэрміну зняволення паэт апынаецца ў Грузіі. Туды ж пераяжджае і жонка, 16 лютага 1949 арыштоўваецца ў трэці раз. У красавіку 1949 асуджаны на 25 гадоў зняволення. Канчаткова рэабілітаваны 15 лістапада 1957. Сябар Саюза пісьменнікаў БССР з 1958. Памёр 20 сакавіка 1976 у Маскве.

паводле Дзімітра Бугаёва

Уладзімір Дубоўка

За ўсе краі, за ўсе народы свету*

За ўсе краі, за ўсе народы свету,
І што былі, і прыдуць што пасля:
Аздобленае горкім цьмяным цветам
Зазнаць нам гора лёс благі паслаў.

Скараліся і моўчкі ўсё прымалі:
Самохаць можа прыйдзе лепшы час.
Як лісцінку на поплаве качалі
І зневажалі чужаніцы нас.

Калонія праз некалькі сталеццяў,
Наедак ненажорным груганом...
Я прысягаю – праклянуць нас дзеці...
За апяшаласць нашу нам праклён.

На плечы ганьбы мы прынялі многа:
Нявольніцтва, жабрацтва навакол.
Слязьмі сясцёр чужынцам мыем ногі,
Заместа песень стогны бедакоў.

Прыціх наш край: ад гутарак аскома...
Прыціх наш край: маўчаць, усе маўчаць.
Свабодай карыстаюцца сачкомы,
Каб тых, хто мысліць, у астрог саджаць.

Дакуль чакаць і варажыць павінны?
Пакуль раса не выесць вочы нам...
З усіх бакоў над нашаю краінай
Сплялася несусветная мана.

На нашым карку торг спраўляе смела
Масква з Варшавай, з Рыгай і Літвой,
І наша змучанае катам цела
Штогодна новай кроіцца мяжой.

---

* Тэкст падаецца з захаваннем аўтарскага правапісу.

«Веснавая паводка», 1957.
Іван Рудчык

Масква сусвету вушы прашумела
Пра самавызначэнне аж да зор.
Смаленск дзе? Невель? Гомель дзе падзела?
Стварыла гомельскі ганебны калідор.

Мы цацкай нейкай для чужынцаў сталі,
Пасмешышчам для свету усяго,
Як быццам мала ў нашай волі сталі,
Як быццам ў сэрцах нашых згас агонь.

Браты мае! Даволі ашуканства!
Гасцей да хаты выправіць пара.
З лазы заплаканай спляцём ім кайстры
Для нарабаванага у нас дабра.

Сляды іх гідкія пяском пасыпем,
Пясочкам светленькім пасыпем іх,
Каб гэтай шумы, акупантаў-злыдняў
Апошні водгук прагучэў і сціх.

А не, дык надармо усё, жыццё надарма,
Лажыся ў яму Сам, Народзе мой, –
Пакуль ты сам не будзеш гаспадарыць,
Не развітаешся з жабрацкай калітой.

Янка Крывічанін, 29 верасня 1926 г.
горад Менск

1 Якія пачуцці выклікаў у вас верш Дубоўкі?

2 Як Уладзімір Дубоўка ўспрымаў змены межаў БССР?

3 Што выклікала хваляванне паэта? Пацвердзі свой адказ радкамі тэксту.

Кузьма Чорны (1900-1944)

Сапраўднае імя і прозвішча – **Мікалай Раманоўскі**. Псеўданімы: *Максім Алешнік*; *М.Біруля*; *Ігнат Булава з-пад Турава*; *Вясёлы*; *М.Сідарэўскі*; *Сусед-вясёлы*; *Раман Талапіла*; *Арцём Чамярыца*; *Сымон Чарпакевіч*; *А.Чорны*). Беларускі празаік, драматург, публіцыст.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў Цімкавіцкае народнае вучылішча, у 1916 г. паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Скончыць семінарыю не ўдалося, бо ў 1919 г. польскія ўлады яе зачынілі. Першыя артыкулы і вершы апублікаваў у 1920 г. У 1923 г. паступіў на літаратурнае аддзяленне педагагічнага факультэта БДУ, дзе правучыўся два курсы. З 1923 года член літаб'яднання «Маладняк». Яшчэ студэнтам у 1924 г. пачаў працаваць у газеце «Беларуская вёска». У 1925 г. выйшлі першыя кнігі – *Апавяданні* і *Срэбра жыцця*. У 1926-1931 гг. быў старшынёй літаб'яднання «Узвышша». У 1932-1937 гг. – галоўны літкансультант кабінета маладога аўтара пры СП БССР. Член СП Беларусі з 1934. Арыштаваны 14.10.1938. Прасядзеў у Мінскай турме 8 месяцаў, з іх 6 – у камеры-адзіночцы. Быў катаваны. Вызвалены 8.06.1939. Тры новыя раманы, аб'ёмнае літаратуразнаўчае даследаванне паэмы Якуба Коласа *Новая зямля* згарэлі ў першыя дні вайны. З напісанага ў гэты час захавалася толькі п'еса *Ірынка* (1940). У 1941-1944 знаходзіўся ў эвакуацыі (пераважна ў Маскве). Удзельнічаў у выданні газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». Працаваў над раманамі *Вялікі дзень* (1941-1944), *Пошукі будучыні* (1943), *Млечны Шлях* (1944), аповесцямі (засталіся незакончанымі) *Скіп'ёўскі лес*, *Сумліцкая хроніка*, *Смага*. Апошнія творы пісьменніка доўгія гады заставаліся ў рукапісах. У гады Вялікай Айчыннай вайны выйшлі зборнікі фельетонаў *Кат у белай манішцы* (1942) і апавяданняў *Вялікае сэрца* (1945). У верасні 1944 г. вярнуўся ў Мінск, працаваў у рэдакцыі часопіса «Беларусь». Пахаваны ў Мінску.

паводле Леаніда Маракова

Макаркавых Волька

Кааператар Сафрон Дзядзюля вельмі заўзята расказваў, што прыцемкам, спускаючыся з высокага сельсавецкага ганка, ён убачыў такі малюнак: нейкая незнаёмая жанчына шпарка выйшла з-за дубовага паркана, які абгароджваў царкву і могільнік навакол яе, і ўпэўнена пайшла да таго месца, дзе калісьці была брама. Не знайшоўшы іншага спосабу ўвайсці ў могільнік, жанчына пералезла цераз жэрдкі, якія на месцы брамы былі наглуха папрыбіваны канцамі да слупоў. Паркан быў высокі, і Сафрон Дзядзюля не мог бачыць, што жанчына рабіла на могільніку. Ён толькі заўважыў, што яна адразу накіравалася кудысьці за царкву, дзе чатыры вязы густа ўсцілалі зямлю жоўтым лісцем. Ужо зусім было цёмна, калі жанчына выйшла з могільніка. Стоячы за рогам паркана, Дзядзюля бачыў, як яна некалькі разоў азірнулася на царкву і цяпер ужо зусім паволі пайшла ў вуліцу. Неўзабаве жанчына зайшла, мусіць, у адну з канцавых хат, бо раптам яе нідзе не відаць стала.

Постаць і хада гэтай жанчыны непрыемна нагадалі Сафрону Дзядзюлю адну асобу, раптоўная думка пра якую разварушыла даўнюю прошласць. Успаміны гэтыя былі прыкрыя. Але з-пад гэтай прыкрасці даволі ўпарта высоўвала галаву ганарыстае задаваленне.

Гэта было таму назад год дзесяць. Сафрон Дзядзюля сватаўся да Макаркавых Волькі. Вольцы тады было яшчэ не больш васемнаццаці год, і гэта была самая лепшая танцорка і заўзятая весялуха на ўсю вёску. Сям'я Макаркавых была бежанская. Яшчэ ў імперыялістычную вайну тут з'явіўся высокі чалавек з жонкай і малою дачкою. Прыехаў ён на сытым маладым кані. Сафрон Дзядзюля быў тады яшчэ падростак і разам з іншымі, такімі як ён, падшывальцамі, цёрся каля бежанскай фурманкі, пакуль высокі гаспадар яе хадзіў па хатах і апытваў прытулку. Бачачы на возе толькі адну бабу з малой дзяўчынкай, Сафрон так асмялеў каля чужога каня, што надумаўся навырываць з яго хваста валасні сабе на вуду. Конь хоць быў у аглоблях, але ўхітрыўся так зачапіць нагой Сафрона, што той адразу адцураўся валасні. Дзяўчынка на возе зарагатала. Сафрон адбегся, хапіў сукаваты пошвырак і смальнуў каню ў бок.

Бежанец астаўся ў вёсцы, і праз пэўныя гады Сафрон Дзядзюля пачаў ныць па чорнавалосай Вольцы. Ён хадзіў за ёю доўга, але ў яе і ў думках не было ісці замуж, і не толькі за яго, але за каго б там ні было. Яна хацела ехаць вучыцца, і от аднойчы, не ведаючы, як ад яго адчапіцца, яна сказала яму ні то стала, ні то жартам:

– Я за цябе не пайду, бо ты такі...

– Які? Ну які?

– Ты такі, што абы дзе сеў, то пасля цябе заўсёды астаецца куча смецця, попелу з папяросы, пяску і гразі з-пад ног.

«Каложа», 1969. Віталь Цвірка

– Ну, а больш? – перабіў ён, увесь чырвоны ад злосці.

– Калі ты возьмеш у рукі якую-небудзь рэч, то адразу пачнеш на ёй цвіком, шклом ці хоць запалкай вырысоўваць сваё прозвішча і зглуміш тое, што трымаеш у руках.

– А яшчэ?

– Стол, за якім ты сядзіш, заўсёды астаецца пасля цябе зрэзаны нажом і сколаны. А на кожным лісце паперы, які трапіцца табе пад руку, ты сто разоў распішашся...

– Ну, кажы далей!

– Што ж далей?.. Ну, ты пусты ганарлівец... і яшчэ – кожнага любіш абсмяяць... От зімой, я памятаю, мая маці несла ваду і, пакаўзнуўшыся, упала, а ты пасля рагатаў, што, пакуль яна ўставала, у яе голыя калені відны былі.

Апошнія словы Волька сказала гнеўна, гнеў гэты явіўся ў яе нечакана, пры ўспаміне аб гэтым выпадку.

Усё гэта было праўда, і тым больш зняважыла высокія Дзядзюлевы пачуцці. Праз паўгода Волька паехала вучыцца на рабфак, а яшчэ праз паўгода ёй наўздагон пайшла заява аб тым, што яна «лісіца ў воўчай скуры» і не проста пайшла вучыцца на рабфак, а «пралезла» туды, і калі яна «працягвае» там вучыцца, то «гэта няправільна», бо бацька яе заўсёды трымаў сытыя коні. «Пад гэтага каня страшна было падысці», – такія гэта былі кулацкія стаеннікі. Усім было вядома, што ў тыя часы Вольчын бацька меў толькі і занятку, што з ранку да вечара вісець крукам у сельсавеце, дамагаючыся даведкі, што ён ніякі не кулак. Ён гаварыў, што ў часы бежанства сыты конь у яго быў таму, што ён, каб уцячы ад гарматнага агню, прадаў, што меў, да апошняй ніткі і купіў каня.

Але Дзядзюля быў вялікім актывістам. Хоць работа ў яго дома і стаяла, але затое ён быў практыкам у тым, каб лезці ў цэнтр «вялікіх» спраў. Ён пакрысе лез у кааперацыю, у малочную арцель, а пасля і ў сельсавет. Нейк так выходзіла, што ён заўсёды трапляўся пад рукой, заўсёды ўсё ведаў, заўсёды пра ўсё мог тонка здагадацца, і нават самыя лепшыя працаўнікі так да яго прывыкалі, што трацілі патрэбу падумаць пра яго, а што гэта за чалавек такі? У гэтай справе Сафрон Дзядзюля быў сапраўдны талент, можна сказаць, глыбокі і тонкі. З некаторага часу ён пачаў нават дабірацца да раённага цэнтра, каб прымасціцца там, калі не на службу, то на годнасць раённага актывіста. Але райвыканком быў ад яго дома далёка, і Дзядзюля задаволіўся тым, што пакінуў за сабой агульнапрызнаную годнасць то «душы ўсіх спраў»,

то «цэнтра ўсіх спраў» у сельсавецкім маштабе. Вядома, з такога чалавека кпілі ў кожнай хаце, але за вочы. У вочы ж ніхто не хацеў з ім звязвацца, кіруючыся прыказкай, што «воўк сабакі не баіцца, але звягі не любіць». Скончылася тым, што словы «душа» і «цэнтр» з'ядналі разам і пачалі зваць Дзядзюлю «цэнтральнай душой». І от гэтая «цэнтральная душа» здолела так усадзіць свой нос у сельсавецкія справы, што Вольчын бацька ніякай даведкі не дабіўся. Злосны на ўвесь свет, ён напісаў дачцэ горкую праўду, што не мае больш сіл і цярплівасці.

Даходзілі чуткі, што Вольку з рабфака звольнілі.

Але дадому яна, аднак, не прыехала. Яна нібыта недзе асталася на працу, а вечарамі хадзіла ў вячэрнюю школу. Як бы там ні было, яна аднойчы ўлетку прыехала дадому на два тыдні з прычыны хваробы маці. Маці памерла і была пахавана ў тым далёкім кутку могільніка пад вязамі, куды цяпер хадзіла прыцемкамі незнаёмая жанчына. Пасля смерці маці Волька была яшчэ дома дзён чатыры. Яна крыху змянілася – пасталела, выраўнялася з паставы і стала яшчэ прыгажэйшая, як была.

Дзядзюля бачыў яе здалёку, і, як толькі яна паехала ў свой горад, следам за ёю пайшла заява, што яна ў свой час была звольнена з рабфака як кулацкая дачка. Здарылася так, што бацька яе тыдняў за пяць да яе прыезду і купіў быў на гадоўлю цяля. Пасля пахавання жонкі, выпраўляючы Вольку ў горад, ён цяля прадаў і грошы аддаў ёй. Яна не хацела браць, але ён упрасіў яе: яму было прыемна хоць так выказаць сваю сардэчнасць да сваёй дачкі, якая толькі адна і асталася цяпер у яго. Такім парадкам, у Дзядзюлеву заяву было ўпісана, што апошнім часам Вольчын бацька займаецца спекуляцыяй цялятамі.

Зноў пачалі даходзіць у вёску чуткі пра Вольку. Гаварылі, што начальнік той установы, дзе яна працуе, прыслаў сюды ў сельсавет запытанне. Але ніхто не ведаў, што Дзядзюля зноў уцёрся ў гэтую справу. Поўны задавалення, ён слухаў гаворкі, што Волька нібы без працы. Але праз нейкі час Волька пачала раптам прысылаць бацьку грошы. Устрывожаны Дзядзюля пачаў збіраць весткі пра Вольку, але бацька яе раптоўна памёр, і пахавалі яго суседзі: Волька не прыехала. Больш таго, яна нават не адказала на тэлеграму, якую ёй далі. У тым, значыцца, горадзе яе ўжо не было. Рад-няволя, а Дзядзюлю прыйшлося забыцца на ўсю гэтую справу. Праз некаторы час Волька прыслала бацьку грошы, але іх ніхто з пошты не забіраў, і яны пайшлі назад. Узнепакоеная Волька напісала бацькаваму суседу, і той адказаў, што бацька памёр і пахаван побач магілы маці. Пра Вольку больш нічога не было чуваць.

Жывая карціна ўсяго гэтага і паўстала перад Дзядзюлем, калі незнаёмая жанчына нагадала яму Вольку. З задаваленнем думаючы аб тым, што ён сваімі заявамі адпомсціўся Вольцы за колішнюю знявагу, Дзядзюля спакойна клаўся спаць, акругліўшы свае думкі фразай: «Цяпер мы з ёю квіты».

Назаўтра быў ясны дзень. Стаяла восень. Высока ўзнімалася неба, і сонца залівала зямлю. Прыемны лёгкі холад адчуваўся ў подыху ветру.

Сафрон Дзядзюля зранку ішоў на сваю працу. Цяпер ён быў начальнік усёй кааперацыйнай сеткі па сельсавеце. З таго часу ён пастарэў, і дробная хада яго набыла большую выразнасць: цяпер ужо кожны мог заўважыць, што ступае ён дробна і ціха. Апрануты ў бобрыкавае паліто, ён нёс свой партфель, мінаючы шырокія завулкі новага калгаснага пасёлка. За апошнія гады на ранейшай вуліцы асталося не больш палавіны хат: хто будаваўся, хто выходзіў на шырэйшую разлегласць. Стаяла многа новых дамоў. Сафрон Дзядзюля таксама жыў ужо ў новым сваім доме, з чорным і чыстым ходам. З поўдня ад пасёлка, як вокам акінуць, цягнуўся нядаўна засаджаны калгасны сад. З другога боку ішлі калгасныя гаспадарчыя пабудовы. Маладыя таполі, клёны і каштаны стаялі жоўтыя паабапал дарогі. Каб Волька Макаркавых з'явілася сюды, тут яна ўжо зусім не пазнала б роднай сваёй мясцовасці.

Кааперацыйнае праўленне было ў новым доме, за калгасным садам. Пешаходная сцежка вілася паўз самы могільнік. Падыходзячы да паркана, Сафрон Дзядзюля заўважыў раптам, што на царкоўнай сцяне вісіць нейкае паліто. Зацікаўлены, ён пералез цераз жэрдкі і падышоў. Царква была зусім трухлявая. Гнілая шалёўка не трымалася на цвіках і сыпалася ўніз спарахнелымі кавалкамі. Доўгія цвікі скрозь тырчалі па сцяне. На адным з гэтых цвікоў і вісела паліто.

Паліто было жаночае, на ваце, з прышытым поясам і коцікавым каўняром. Шустры верабей шарганўўся аб гэты мяккі каўнер, улятаючы з заўзятым шчэбетам у акно, якое ўжо было без рамы і шкла. Сафрон Дзядзюля стаяў, задзёршы галаву, здзіўлена разглядаючы паліто. Раптам ён пачуў шоргат рыдлёўкі аб жвір. Азірнуўшыся, ён убачыў жанчыну. Пазнаў ці здагадаўся, але ён з першага моманту быў упэўнен, што гэта тая самая, учарашняя. Каб бліжэй яе разгледзець, ён інстынктыўна падаўся ў той бок і раптам спыніўся як ашаламонены: перад ім была Макаркавых Волька.

Гэта была маладая жанчына. Прывабнай сталасцю поўніліся ўся яе паставa, рухі і рысы. Яна працавала. Рыдлёўкай капала яна зямлю і даводзіла да парадку дзве магілы пад жоўтымі вязамі. Постаць яе была мажная, і хараство, здаецца, яшчэ большае, як тады, калі яна была маладой дзяўчынай.

Ахоплены незразумелай трывогай, Сафрон Дзядзюля ціхом павярнуўся і шмыгануў за рог царкоўнай сцяны, поўны радасці, што яна яго не заўважыла. Выглядаючы паловай твару з-за сцяны, ён бачыў, як Волька некалькі разоў разгіналася, каб адпачыць, а пасля зноў бралася за працу.

Штосьці новае было ў ёй. Гэта не была тая ранейшая простая і вясёлая Волька. Наіўнасці тут ужо не было. Хоць Дзядзюля і не разбіраўся лішне ў тонкасцях тых адлюстраванняў, якія кладзе душа на твар, усё ж ён, стоячы тут за сцяной, падумаў, што гэтая жанчына ўжо, мусіць, глыбока ведае цану з'явам свету і людскім учынкам. У гэтую хвіліну ў яго з'явілася такое пачуццё, быццам яго асарамацілі перад усім светам. Сціснуўшы зубы, ён шпарка выскачыў з могільніка і рушыў да сваёй канцылярыі.

Да самага вечара ён быў неспакойны. За паўгадзіны да канца сваёй работы ён сядзеў у самым цёмным кутку канцылярыі і нехаця корпаўся ў паперах. Сонца спускалася за стагі саломы, і, увайшоўшы ў гэты пакой знадворку, адразу здавалася, што тут зусім змрочна.

Ціхом адчыніліся дзверы і хтосьці ўвайшоў. Дзядзюля не падняў галавы. Ён толькі ўздрыгануўся, калі пачуў проста перад сабою пявучы голас:

– Выбачайце, мне параілі зайсці да вас. Справа такая, што я прыехала сюды пабыць на магілах сваіх бацькоў. Я хацела прывесці магілы ў парадак. Чалавек, у якога я начавала, зробіць балясы, каб агарадзіць магілы, але ў яго няма цвікоў. Ён гаворыць, што ў краме цвікоў так мала, што іх не кожнаму прадаюць. Я і прашу вас, каб вы адпусцілі цвікоў, іх трэба не многа.

Змяніўшы голас так, каб яго не пазналі, і заціскаючыся глыбей у цёмны кут, Дзядзюля абазваўся:

– Можна падумаць, што вы вельмі шануеце памяць сваіх бацькоў! Аднак жа на пахаванне бацькі не прыехалі.

– Я тады толькі што скончыла медыцынскі інстытут і адбывала ў раёне першую практыку. Тэлеграма да мяне не дайшла.

– Няма цвікоў, – хрыпла раўнуў Дзядзюля. – Ніводнага цвіка няма. І не будзе!

Маладая жанчына шпарка выйшла. Сафрон Дзядзюля, сцяўшы зубы, падняўся. Ён аж счарнеў ад злосці і гневу. Як! Нягледзячы на ўсе заявы, яна скончыла інстытут і цяпер ужо доктар? Гэта жывы здзек з яго! Можна сказаць, што ніколі яшчэ раней ён не ненавідзеў Макаркавых Волькі так, як цяпер. Пануры, як кавалак хмары, ён дацягнуўся дадому і, каб асвяжыць гарачую галаву, перад сном выйшаў у адной бялізне на двор. Неба схмурнела, ужо ішоў халодны асенні дождж. Сумысля ён прайшоў пад дажджом па садзе. Ірвануўся вецер, дождж лінуў густа і, пакуль Дзядзюля дабег да сянец, ён увесь быў мокры. Падлазячы ў сенцах пад коўдру, ён адчуваў холад. К канцу ночы ў яго пачало балець горла, зранку яму зусім нездаровілася, а пад вечар высока паднялася тэмпература. Ён пачаў гаварыць з гарачкі, і сям'ю яго апанавала трывога.

Быў вечар. Волька сядзела ў свайго колішняга суседа за сталом. Ёй было прыемна слухаць успаміны гэтай сям'і аб бацьках яе. У хату ўвайшла жанчына і пачала расказваць, што Дзядзюля вельмі хворы, а па доктара далёка ў такое надвор'е ехаць, і ў Дзядзюлі ў хаце аж рукі ломяць з адчаю. Маладая жанчына адразу ўстала і папрасіла правесці яе да Дзядзюлі.

Трэба сказаць, што Дзядзюля быў смелы і храбры толькі там, дзе ўсё добра і лёгка ішлося. Цяпер ім апанавала няшчасце, і ён размяк, як гнілая салома. Аслабелы, ён ляжаў і думаў пра тое, што нічога лепшага няма, як жыць на свеце. Хвароба напалохала яго, ён баяўся.

– Слухай, – замагільным голасам прагаварыў ён да жонкі. – Гэтая Волька, што прыехала – доктар. Ідзі пакліч яе.

У гэты момант адчыніліся дзверы, і на парозе з'явілася Волька. Дзядзюля затрапятаўся.

– Дзе хворы? – сказала яна сваім шырокім пявучым голасам.

– Я, я хворы, – прашаптаў Сафрон Дзядзюля. – Калі ласка, ратуйце, век буду дзякаваць. Так дрэнна мне прыйшлося...

Маладая жанчына пачала яго аглядаць. Будучы паслухмяным, як ягня, Дзядзюля бесперапынна выказваў просьбы – клапаціцца аб яго здароўі.

– У вас пачынаецца запаленне лёгкіх, – сказала маладая жанчына. – Як гэта вы маглі так захаладзіцца?

– Мяне прамачыў дождж, – прахрыпеў Дзядзюля.

– Тут ёсць дзе дастаць банькі? – запытала Волька.

– Ёсць тут у адной хаце.

– Дастаньце іх, я пастаўлю. А зранку трэба будзе лякарства. Рэцэпт я напішу.

– Вы мяне выбачайце, – ныў Дзядзюля. – Я вам цвікоў не даў. Прызнацца вам, то я забыўся, што яны ёсць. Я гэтую памылку выпраўлю, абы толькі паправіцца. Лячыце мяне, як мага, прашу вас.

– Дык гэта я ў вас прасіла цвікоў? А я і не пазнала. Нічога, хвароба не страшная, паправіцеся.

Волька пайшла. Праз гадзіны дзве Дзядзюлева жонка прыйшла сказаць, што банькі прыгатаваны. Ліў дождж. Волька ішла лячыць Дзядзюлю. Яму было горш, хрып ішоў з яго горла.

– Аптэка ад вас далёка?

– На станцыі, шэсць кіламетраў.

– Я напішу рэцэпт, а вы ідзіце зараз жа запрагаць каня. Трэба адразу дастаць лякарства. Дайце на чым напісаць рэцэпт.

Дзядзюлева жонка пачала шукаць паперы і вінавата сказала:

– Ні кавалка паперы ў хаце няма, у яго ўсе справы ляжаць у канцылярыі. Хіба можа ў шуфлядзе каля вас, там нейкі звязак старых яго папераў, можа там знойдзецца.

Заплакала дзіця, і жанчына пабегла ў бакоўку. Волька адчыніла шуфляду і дастала адтуль жмут папераў. Гэта былі ўсялякія старыя рахункі і пратаколы, было некалькі пісьмаў. Волька шукала, адкуль бы адарваць кавалак няспісанай паперы. Нарэшце асобна яна ўбачыла некалькі паперын, перавязаных ніткай, і разгарнула іх. Глянуўшы ў іх, яна жахнулася, яна чытала чарнавікі Дзядзюлевых заяваў на яе. «Вось чаму я гэтулькі пакутавала, цярпела ганьбу і не меншы здзек!» Дрыжачай рукой яна адарвала ад аднаго чарнавіка палоску паперы і пачала пісаць рэцэпт. Увайшла Дзядзюлева жонка і ўбачыла, што Волька ставіць Дзядзюлю банькі.

Назаўтра Дзядзюлю стала лепш. А яшчэ цераз дзень ён ужо зусім бадзёра глядзеў са сваёй пасцелі на акно. Неба было зноў яснае, заходзіла сонца, і ў яго праменнях стаялі дрэвы за акном. Насупроць аконнай шыбы, на тонкай галінцы вісела яшчэ некалькі апошніх лісткоў. Дзядзюля глядзеў на іх, але не заўважаў іх. Як цвік з-пад малатка, яго мазгі прабівала думка, што на яго накладзена пячаць ганьбы: у цяжкую для яго хвіліну Волька прыйшла ратаваць

яго. Нягледзячы на ўсе яго заявы, яна стала доктарам. Так, як ніколі, яна цяпер сталая, разумная, упэўненая ў сабе.

– Чартоўка паршывая! – замармытаў Дзядзюля. – Доктар называецца. Паставіла банькі, напісала рэцэпт і ўсё. Ні разу не прыйшла паглядзець, толькі два разы нейкую бабу прысылала запытацца, як мне. Толькі назва, што дактары, а сваіх абавязкаў не разумеюць. А можа не хочуць разумець!

У той жа самы вечар, падцягнуўшы да падушкі табурэт з лямпаю, Сафрон Дзядзюля пісаў карандашом на лісце паперы, вырваным з вучнёўскага сшытка. «Заява... Гэтая гора-ўрач дэталёва нават не азнаёмілася з хваробай. Ёй, безумоўна, трэба было дастаткова ўвайсці ў лячэнне, а яна абмежавалася толькі тым, што паставіла банькі і напісала рэцэпт. І ні разу не зайшла праверыць змагаючагася з захворваннем арганізма... І яшчэ трэба дадаць, што гэтая асоба рэлігійная, што не можа быць у адпаведнасці са званнем савецкага ўрача, як то: гэтая асоба, нягледзячы, што ў свой час выключалася з рабфака як дачка кулака і спекулянта цялятамі, павінна была ізулеч для сябе ўрокі, якіх не ізулекла, паколькі гаварыла чалавеку, у якога спынілася, што ёй прыемна было пабываць на могільніку каля трухлявай царкоўнай сцяны. Гэта яна матывавала тым, што на яе ўсплывалі ўспаміны маленства, калі яна каля гэтай сцяны гуляла ў малыя гады з дзецьмі. Але тут падаплёка ўпаўне ачавідна...»

Дзядзюля раптам задумаўся: куды ж паслаць гэтую заяву? Невядома, адкуль яна сюды прыехала?

Зусім паправіўшыся, Дзядзюля ішоў на працу. Зазірнуўшы на могільнік, ён убачыў дзве акуратна абкладзеныя дзярном магілы Вольчыных бацькоў. Магілы былі абгароджаны новымі балясамі. «Недзе ж такі дастала цвікоў», – падумаў Дзядзюля. Удзень зайшоў у кааперацыю былы сусед Вольчыных бацькоў.– Паехала? – запытаў Дзядзюля.

– Паехала, – адказаў чалавек. – Але ненадоўга. Ёй тут вельмі спадабалася, а ў раёне якраз не хапае аднаго доктара. Казала, што будзе прасіць, каб яе сюды назначылі.

«Вось цяпер і вядома, куды пасылаць заяву, – падумаў Дзядзюля. – Раённым органам».

У тыя самыя дні Волька пісала сваёй сяброўцы:

«...Тысячы момантаў з майго маленства паўсталі перада мной як жывыя. Я пазнавала дрэвы, каменні, узгоркі... Я прывяла да парадку магілы бацькоў і доўга хадзіла па родных дарогах. Тут усё так блізка і знаёма майму сэрцу. Я шаную тое, што было ў маёй душы з маленства і люблю сучаснае. Тут мне будзе весела і радасна працаваць. Сярод тых людзей, якіх я ведала заўсёды, і тым цікавей мне цяпер бачыць іх у сапраўдным чалавечым жыцці...

Не абышлося і без непрыемных успамінаў. Я дазналася, праз каго я тады гэтулькі перацярпела знявагі і крыўды. Але гэты прыкры эпізод увесь у мінулым: не перашкодзіў жа ён мне скончыць інстытут. Я гэтага чалавека лячыла. Як мне было агідна дакранацца да яго рукамі. Я хацела толькі аднаго:



«У далінах Нёмана», 1973. Іван Пушкоў

каб ён хутчэй паправіўся і каб больш не лячыць мне яго. Прыйшоўшы дадому, я доўга мыла рукі і думала: зусім можа быць, што ён зноў пачне займацца падобным шальмоўствам. Нашто? Так сабе, з ласкі на пацеху... Адным словам – чорт з ім...

Пасля сапраўднага асенняга дажджу зноў стаіць яснае надвор'е і яшчэ цвітуць познія кветкі...»

- пошвырак – сукаваты кій
- рабфак – (рабочы факультэт); у 1919-1940 гг. курсы для падрыхтоўкі рабочай і сялянскай моладзі для навучання ў вышэйшай школе
- райвыканкам – раённы выканаўчы камітэт
- Друкуецца па часопісе «Полымя рэвалюцыі», 1938, кніга 5-я, дзе апублікавана ўпершыню. Дата напісання пад тэкстам адсутнічае. Крыніца: Кузьма Чорны. *Выбраныя творы*. Менск, «Беллітфонд», 2000.

1 Ахарактарызуй постаць Волькі.

2 Чаму Дзядзюля так крыўдзіў Вольку і яе бацькоў? Што ім кіравала?

3 Дзякуючы чаму, ці каму Сафрон Дзядзюля стаў начальнікам?

❖ «Вялікая беларуская моўная стыхія не толькі не загінула за час шматвяковага нацыянальнага падняволення Беларусі, не толькі не была праглынута моцнымі культурамі суседніх народаў, а захавала сваю чыстату, скрышталявалася ў надзвычайнае багацце арыгінальных формаў, служачы нават багатым матэрыялам для суседніх моўных культур. Беларуская мова – мова беларускіх казак і песень, фразеалогія народнае гутаркі, – гэта найглыбейшая самабытнасць і хараство».

Кузьма Чорны

Кузьма Чорны

Дзённік

9 ліпеня 1944 г.

(…)

Думаю аб той горкай праўдзе, што ніколі не меў магчымасці пісаць тое, што самае важнае беларускай літаратуры і дзе б я сапраўды павярнуў бы горы. А то ўсё пішу на ўсялякія прамежныя тэмкі, пасля якіх думаў, што пазатыкаю горлы дурням і брахуном і тады ўжо вазьмуся за тое вялікае, што хачу і магу напісаць. Дай божа па-сапраўднаму ачуняць. Пасля вайны буду пісаць як хачу і магу.

3 кастрычніка 1944

(…)

У яжоўскай турме ў Менску ўвосень 1938 г. мяне саджалі на кол, білі вялікім жалезным ключом па галаве і палівалі збітае месца халоднай вадой, паднімалі і кідалі на рэйку, білі паленам па голым жываце, устаўлялі ў вушы папяровыя трубы і раўлі ў іх на ўсё горла, уганялі ў камеру з пацукамі, але рук у кайданы не замыкалі.

22 лістапада

Бадай што ўжо месяц, як у «кватэры», дадзенай мне Саўнаркомам. Але ж якраз як тая камера ў турме, дзе я сядзеў у 1938 годзе. Можна сказаць, што я ўжо дайшоў да апошняй мяжы. Бруд, цемень – вокны глядзяць у чорны трохкутнік з высозных мароў. Пісаць няма як і жыць няма як. А тут жа, па адным карыдоры, рамантуюць кватэру Рыжыкаву. Там светла і добра. Там Рыжыкаву можна будзе круціць патэфон і гуляць у «пульку». У нас няма ўласнага жыцця, мы ўсё аддаём дзяржаве. Мы аддалі дзяржаве свае душы і таленты, але мы не Рыжыкавы. Я жыву як апошняе пакідзішча. І не таму, што мне хто зла хоча, а таму, што ў нас не эўрапейская дзяржава, дзе інтэлектуальныя асаблівасці чалавека робяць яго жыццё арганізаваным. А ў нас азіятчына. Падхалімства, хабарніцтва, чыноўніцтва, паклёпніцтва – за апошнія годы пад-

нялося на вялікую вышыню. Колькі нашай інтэлігенцыі без дай прычыны гніе ў турмах і на высылцы! У мяне ўжо няма 70% здароўя. Я гіну і не магу выкарыстаць як бы трэба было свой талент. Сілы мае трацяцца і марнуюцца без карысці. Доўгія годы мяне мучыла ГПУ-НКВД. А цяпер замест таго, каб рабіць тое, што мне трэба рабіць, я палю ў печы, цягаю ваду, змываю гаўно ў прыбіральні, краду дровы, дастаю з дошчак цвікі, мыю сваю парваную і вываленую адзежу. Тут вайна не да канца вінавата. Тут многа ад хамства. Апарат НКГБ і тысячы чыноўнікаў займаюць увесь горад – яны ўмеюць і любяць рваць адзін аднаго і ўсіх за горла, а я гэтага не ўмею рабіць, дык не магу нават дастаць хоць тоненькі праменьчык дзённага святла ў вакно і мучуся ў пограбе. Божа, напішы за мяне мае раманы, хіба так маліцца, ці што?

- У яжоўскай турме ў Менску ў 1938 г. – беспадстаўна арыштаваны пісьменнік праседзеў у мінскай турме амаль 8 месяцаў (з іх шэсць – у камеры-адзіночцы).
- Саўнарком – адносіцца да гісторыі, Савет Народных Камісараў.
- Аўтограф дзённіка ўяўляе сабой малы агульны сшытак памерам 13 х 17,5 см у шэрай вокладцы, дзе захавалася больш як сто старонак. На 77 старонцы зроблены апошні легендарны запіс «Божа, напішы за мяне мае раманы...»
- Запісы К. Чорнага зроблены пераважна сінім атрамантам (хоць пісьменнік найбольш любіў чорны атрамант), почырк выразны, буйнаваты (часам, напрыканцы старонкі, запісы рабіліся дробнымі літарамі, аднак па-ранейшаму выразна).

1. Якія факты са свайго жыцця падае Кузьма Чорны?
2. Хто прычыніўся да хваробы пісьменніка?
3. Ці можна назваць словы з дзённіка развітальнымі? Чаму?

Тодар Кляшторны (1903-1937)

Беларускі паэт. У 1931 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў на радыё, у рэспубліканскіх газетах і часопісах. Быў сябрам літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша». У апошні раз сваю родную вёску Парэчча Тодар Кляшторны наведаў улетку 1936 г. Арыштаваны 3 лістапада 1936 г. у Менску. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 29 кастрычніка 1937 г. як «член антысавецкай арганізацыі» да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 8 чэрвеня 1957 г.

Быў жанаты з Янінай Германовіч (1909-1959), арыштаванай і асуджанай 28 лістапада 1937 г. асобай нарадай пры НКВД як «чалец сям'і здрадніка радзімы» на 8 гадоў. Меў тры дачкі.

Друкавацца пачаў у 1925 г. у часопісе «Аршанскі маладняк». Выйшлі зборнікі паэзіі *Кляновыя завеі* (1927), *Светацені* (1928), *Ветразі* (1929), *Праз шторм – на штурм* (1934).

Аўтар паэмаў *Калі асядае муць* (1927), *Беларусь* (1928), *Палі загаманілі* (1930), *Сляды дарог* (1932), *Наш кірунак дарог – на Маскву* (1933) і *Радзіма* (1934). Аўтар апавяданняў (*Праз куламесіцу часу*, 1926) і нарысаў (*Нашы межы непарушныя*, 1933; *Уся справа ў людзях*, 1934 і іншыя).

Многія творы Тодара Кляшторнага пры яго жыцці станавіліся аб'ектамі нападаў з боку абаронцаў партыйна-класавага падыходу да мастацтва: крытыка ўшчувала аўтара за неадпаведнасць ідэалагічным запатрабаванням эпохі. Крытык Лукаш Бэндэ пісаў пра Кляшторнага як пра «пілікаючага лірніка», чые «мінорныя гукі пілікання, нікому непатрэбны». Сяргей Грахоўскі прыгадваў: «У 1931 годзе ўпершыню ўбачыў яго ў Доме пісьменнікаў. Высокі, танклявы, з рудаватымі хвалістымі валасамі, а выраз вачэй па-дзіцячаму збянтэжаны і разгублены. Ён быў неверагодна сціплы і далікатны. Амаль у кожным сказе самой па сабе праскоквала «прабачце» і «калі ласка». Ён кожнаму саступаў дарогу, асабліва губляўся перад жанчынамі, чырванеў, міргаў калматымі, як чмялі, вейкамі і гаварыў заўсёды толькі самае прыемнае». Тодар Кляшторны выявіўся найперш паэтам авангарднага мыслення, творцам імажынісцкай школы з яркімі і непаўторнымі перажываннямі, настроямі, пачуццямі, якія ім нібыта і не пісаліся, а выспеўваліся:

Дзе месяц з зорнае званніцы
Вартуе золата кляноў,
Хачу спяваць,
Хачу маліцца
Над чаркай выпітых гадоў...

Аднак такія спевы і маленні не лашчылі вуха бальшавіцкім ідэолагам, якія сілай вучылі іншай рэлігіі і іншым багам прымушалі пакланяцца. Эстэтычна вытанчаныя вершы Тодара Кляшторнага, у якіх апяваліся адвечныя чалавечыя пачуцці, гучалі экзістэнцыяльныя роздумы аб жыцці і смерці, выяўляліся традыцыйныя ў паэзіі матывы смутку ад усведамлення непазбежнай несуладнасці паміж светам ідэальным і дадзеным, паміж духоўным і рэальным, – такія вершы тагачаснай вульгарызатарскай крытыкай успрымаліся варожа: як упадніцкія, бездапаможныя, шкодныя.

Атмасфера таталітаршчыны нявечыла і спусташала. Як жыць верніку паэзіі ў часе ашуканства і бяздушша? У лірыцы ўзмацняюцца ноты песімізму, суму, лёсавай бязвыхаднасці, усё часцей вершаваныя радкі заканчваюць трывожныя пытальнікі:

Я усхвалёваны чагосьці,
Чамусьці сэрца гэтак ные.
Ці па далёкай маладосці?
Ці над памылкамі сваімі?

Свой апошні верш з сімвалічнай назвай *Песня пра вясну* паэт змог апублікаваць 27 сакавіка 1936 года. У пачуццях і паэзіі яшчэ жыла непакорная вясна, а ў жыццё надыходзіла восень нябыту. Восенню таго ж года Тодара Кляшторнага беспадстаўна арыштоўваюць і пасля доўгіх месяцаў допытаў і катаванняў у менскай «амэрыканцы» выракаюць да вышэйшай меры пакарання. Паэтава жонка з малодшай дачкой была выслана ў Акмолінскі карлагер, а старэйшых дзяцей выхоўваў сталінскі дзіцячы дом. 30 кастрычніка 1937 года паэта «свабоднай і шчаслівай» краіны расстралялі. Яго спакутаванае цела верагодней за ўсё знайшло свой вечны супакой ці ў менскім парку Чалюскінцаў, ці ў Курапатах.

Тодар Кляшторны напісаў:

...пад шляхамі ў сонечнае ранне,
Дзе шапаціць бярозавы абрус,
Аддаў душу за вечнае змаганне,
Распяў душу за маці-Беларусь...

І гэтыя словы з'яўляюцца пасланнем з таго свету да сучасных беларусаў.

паводле Алеся Пашкевіча

Тодар Кляшторны

Восень

I

Слаўны вечар... Пагода ліпнёвая,
А у садзе красуецца верасень...
Колькі яблыкаў восень ружовая,
Залацістая восень развесіла.

II

Блудзяць хмаркі – вандроўнікі дальнія,
Месяц косіць абмежкі ліловыя,
Загарэлі затоны крыштальныя,
Засмуцілася сінь вераснёвая.

«Восеньскія далі», 1978.
Дзмітрый Алейнік

III

Плачуць гусі – асеннія здраднікі,
Плачуць гусі, як сэрца дзяўчыны...
Заглядзеліся ў даль канаплянікі
Над бялявым вянком павучыння.

IV

Эх вы, сцежкі, – дарожанькі вузкія,
Эх ты, просінь, тыняная просінь...
Хоць прыгожа вясна беларуская, –
Прыгажэй беларуская восень.

V

Як прыгожы сады вераснёвыя...
Закахаўся я ў казачны верасень...
Колькі яблыкаў восень ружовая,
Беларуская восень развесіла.

1 Як прадстаўляе паэт беларускую восень?

2 Чаму ён захапляецца гэтай парой года?

Алесь Дудар (1904-1937)

Сапрраўднае імя і прозвішча **Аляксандр Дайлідовіч**. Псеўданімы і крыптанімы: *Т. Глыбоцкі*; *Тодар Глыбоцкі*; *Ал. Д.*; *Т. Г.*; *Т. Г-кі*; *Арцём Яроцкі*). Беларускі паэт, крытык, перакладчык. Нарадзіўся ў сям'і беззямельнага селяніна. Падчас Першай сусветнай вайны Дайлідовічы знаходзіліся ў бежанстве. Выязджалі ў Тамбоўскую губ. (Казлоў, цяпер Мічурынск). Вясной 1917 г. сям'я вярнулася ў Беларусь. Пасля сканчэння (1921) сярэдняй школы (па іншых звестках – 7-годкі) Алесь Дудар уступіў у тэатральную трупу Уладзіміра Галубка. У 1923 г. адзін з заснавальнікаў мінскай, віцебскай і полацкай філій «Маладняка». У 1927-1928 гг. вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультета БДУ. У выніку кампаніі супраць беларускіх пісьменнікаў-студэнтаў быў вымушаны пакінуць універсітэт. У снежні 1927 выйшаў з «Маладняка» і далучыўся да новага аб'яднання «Полымя». За верш *Пасеклі наш край папалам...* арыштаваны органамі НКВД 20.03.1929 г. Высланы на тры гады ў Смаленск. Зноў арыштаваны ў Смаленску 22.07.1930 г. і прывезены ў Мінск на допыты па справе «Саюза вызвалення Беларусі». У 1931 г. зноў у Смаленску. Пасля сканчэння тэрміну высылкі вярнуўся ў Мінск. Член СП БССР (з 1934 г.). У 1935-1936 гг. у асноўным займаўся перакладамі. Трэці раз арыштаваны 31.10.1936 г. у Мінску. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 28.10.1937 г. як «член антысавецкай аб'яднанай шпіёнска-тэрарыстычнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі» з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 21.09.1957 г.

Дэбютаваў вершам у 1921 (газета «Савецкая Беларусь»). Аўтар зборнікаў паэзіі *Беларусь бунтарская* (1925), *Сонечнымі сцежкамі* (1925), *І залацісцей, і сталёвей* (1926), *Вежа* (1928), паэмы *Шанхайскі шоўк* (1926), *Слуцак* (1935), зборнік апавяданняў *Марсельеза* (1927). У 1959 г. выйшлі *Выбраныя творы*, у 1984 г. зборнік вершаў і паэм *Вежа*.

Выступаў і як крытык. Пад псеўданімам Т. Глыбоцкі выдаў зборнік артыкулаў *Пра літаратурныя справы* (1928). Перакладаў з рускай, нямецкай, французскай моў.

паводле Леаніда Маракова

Алесь Дудар

Пасеклі Край наш

Пасеклі Край наш папалам,
Каб панскай вытаргаваць ласкі.
Вось гэта – вам, а гэта – нам,
Няма сумлення ў душах рабскіх.

І цягнем мы на новы строй
Старую песню і чужую:
Цыгане шумнаю талпой
Па Бесарабіі качуюць...

За ўсходнім дэспатам-царком
Мы бегаем на задніх лапах,
Нью-Ёрку грозім кулаком
І Чэмберлена лаем трапна.

Засыплем шапкамі яго,
Ура, ура – патопім ў соплях.
А нас тым часам з году ў год
Тут прадаюць ўраздроб і оптам.

Мы не шкадуем мазалёў.
Мы за чужых праклёны роім,
Але без торгу і без слоў
Мы аддаем сваіх герояў.

Не смеем нават гаварыць
І думаць без крамлёўскай візы,
Без нас ўсё робяць махляры
Ды міжнародныя падлізы.

Распаўся б камень ад жальбы
Калі б ён знаў, як торг над намі
Вядуць маскоўскія рабы
З велікапольскімі панамі.

О, ганьба, ганьба! Ў нашы дні
Такі разлом, туга такая!
І баюць байкі баюны
Северо-Западного края...

Плююць на сонца і на дзень.
О, дух наш вольны, дзе ты, дзе ты?
Ім мураўёўскі б гальштук ўздзець,
Нашчадкам мураўёўскім гэтым...

Але яшчэ глушыце кроў.
Гарыць душа і час настане,
Калі з-за поля, з-за бароў
Па-беларуску сонца гляне.

Тады мы ў шэрагах сваіх,
Быць можа, шмат каго не ўбачым.
З тугою ў сэрцы ўспомнім іх,
Але ніколі не заплачам.

А дзень чырвоны зацвіце,
І мы гукнем яму: «Дабрыдзень».
І са шчытом ці на шчыце
Ў краіну нашу зноў мы прыйдзем.

1 Што хвалюе паэта і на што мае надзею?

2 Як прадстаўлена сітуацыя Беларусі ў вершы Алеся Дудара?

Сяргей Грахоўскі (1913-2002)

Псеўданімы: *М. Асіповіч*; *Сяргей Івановіч*; *С. Каршун*; *Парамон Паромскі*. Беларускі паэт, празаік і перакладчык. Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1914 г. разам з бацькамі пераехаў у мястэчка Глуск на Магілёўшчыне. У 1930 г. пачаў працаваць рабочым на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. У 1931-1932 гг. працаваў карэктарам у Дзяржвыдавецтве БССР, у газеце «Чырвоная змена». Скончыў газетна-выдавецкае аддзяленне літаратурнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута (1935), працаваў рэдактарам на Беларускім радыё, выкладчыкам літаратуры на рабфаку пры БДУ. Асуджаны пазасудовым органам НКВД 2.10.1937 г. як «член

контррэвалюцыйнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі» і за «антысавецкую дзейнасць» на 10 гадоў. Вызвалены 19.10.1946 г. Пасля вызвалення выкладаў рускую мову і літаратуру ва Урэцкай сярэдняй школе Слуцкага р-на (1946-1949). У 1947 г. з Сяргея Грахоўскага знята судзімасць, але 19.05.1949 г. ён быў паўторна арыштаваны. Асуджаны на пасяленне ў Новасібірскай вобласці, дзе працаваў настаўнікам. Рэабілітаваны 21.10.1955 г. З 1956 г. у Мінску. У 1957-1973 гг. працаваў у часопісах «Бярозка» як загадчык аддзела рэдакцыі (1957-1959), «Вясёлка» (1960-1973); літкансультантам СП БССР (1959-1960). У 1973-1974 гг. адказны сакратар Камітэта па дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1956 года.

Дэбютаваў вершам у 1926 г. Аўтар зборнікаў паэзіі *Дзень нараджэння* (1958), *Чаканне* (1960), *Табе зайздросціць сонца* (1963), *Памяць* (1965), *Тры вымярэнні* (1967), *Вершы* (1968), *Паэма дарог* (1970), *Зазімак* (1976), *Лірыка* (1978), *Зачараванасць* (1978), *Асеннія гнёзды* (1982), *Кругі надзеі* (1985), *Верую* (1987), *І радасць і боль* (1988). Выйшлі кнігі вершаў для дзяцей *Ад вясны да вясны* (1959), *Сёння і заўтра* (1961), *Гарыць касцёр* (1966), *Сонечная сцежка* (1980), *Знаходка* (1985), апавяданняў *Агеньчык у акне* (1972).

Аўтар нарысу *Горад маладосці* (1960), зборніка апавяданняў *Які вялікі дзень* (1966), дакументальных аповесцяў *Рудабельская рэспубліка* (пастаўлены тэатрамі



Не чулі мы пра шлюбны палаац,
Не бачылі ні кветак, ні фаты,
Ты да мяне забегла пасля працы
І стала необходнай назаўжды.

Я мітусіцца та трэцім такой,
Пакуль стаю імгнечнае зацяе,
Абвешчанай канчаткова шчасцю
Жанчыну далоні адарвуць тваё.

Казалі мы не тое, што хацелі
Сказаць у вечаровай цішыні.
А ліставаў дарогі замяцелі,
І не было ні бліз'ні, ні радні.

Як Афрадыта, з моцнай чалавечнасці
Ты да мяне нячутна падышла,
І сэнсам завязаць вечні
Здавалісь праменнасці святла.

Скацілась та небасіле зорна,
Трэшчала замаготанае цяло,

Сяргей Грахоўскі, Мінск 1973 г.

Старонка з рабочага блакнота Сяргея Грахоўскага, 1977-1978 гг.

імя Я. Купалы і Гомельскім абласным драматычным у 1968 г.; у 1972 г. створаны аднайменны кінафільм), *Суровая дабрата* (1977), аповесцяў *Ранні снег* (1975), *Гарачае лета* (1974), *Сустрэча з самім сабою* (1988), *Споведзь*: (вершы, аўтабіяграфічныя аповесці, 1990), кнігі ўспамінаў *Так і было* (1986).

Выступае і як публіцыст. Выдаў кнігу *Мінск* (1971) і нарыс на маральна-этычную тэму *Бацькі і дзеці* (1972). Аўтар успамінаў пра перыяд рэпрэсій (аўтабіяграфічная трылогія Т*акія сінія снягі*, 1988; *Зона маўчання*, 1990; *З воўчым білетам*, 1991).

паводле Леаніда Маракова



❖ Прарваўшы «зону маўчання»

Лепшыя гады жыцця многіх беларускіх пісьменнікаў, якія толькі ўваходзілі ў літаратуру, адабрала бязлітасная сталінская дыктатура, малох нечуванага вынішчэння і прыдушэння чалавечай асобы, пад які без ніякай віны трапіў і дваццацітрохгадовы Сяргей Грахоўскі. Але моцны духам і любоўю да бацькоўскай зямлі, якая заўсёды заставалася ў сэрцы, Сяргей Іванавіч выжыў, выстаяў, з годнасцю вярнуўся ў літаратуру (…)

Нягледзячы на тое, што судзімасць з яго была знятая, Сяргей Грахоўскі, як і іншыя так званыя «ворагі народа», паводле сталінскага ўказа 1949 г., быў паўторна арыштаваны і высланы ў сяло Біяза Новасібірскай вобласці.

Туды да яго прыехала жонка, якую ён ласкава называў «мая дзекабрыстка», – Валянціна Міхайлаўна (Аля) з пяцігадоваю дачкою Таццянай. Пачалі абжывацца, бо высланы былі на «вечнае пасяленне». На шчасце, абставіны са смерцю дыктатара змяніліся, і Сяргей Іванавіч, рэабілітаваны 19 кастрычніка 1955 г. («за отсутствием состава преступления»), вярнуўся з сям'ёю на радзіму, у Мінск. (…)

Ён першы з беларускіх пісьменнікаў пачаў публікаваць творы пра сталінскія рэпрэсіі. (…) Вершы, прысвечаныя памяці сяброў маладосці, маюць яскрава выяўлены спавядальны характар. Іх унутраная тэма – адчуванне абавязку паэта перад тымі, хто загінуў у гады сталіншчыны, навекі застаўся ў глухой тайзе, у балоце, на лесапавале. Хто, пытаецца паэт, адкажа за тое, што «з нас мала хто

прыйшоў дадому з бясконцай лютае зімы, і не адзін паэт вядомы замоўк на трасах Калымы...». (…)

«Зона маўчання» – кніга, на якую не можа не адгукнуцца сэрца і памяць усіх, хто прачытае яе, бо тут пісьменнік сапраўды выступае сведкам на Судзе Гісторыі. Ён знайшоў у сабе сілы зноў перапакутаваць дзень за днём лагернае дзесяцігоддзе, паўторны арышт і высылку ў Сібір, што сведчыць пра яго нястрыманае жаданне расказаць «дзеля шчасця ўнукаў і сыноў» пра перажытае і тым самым заклікаць нас рабіць усё, каб не вярнулася дыктатура. І не толькі пра свой шлях на Галгофу паведаў Сяргей Грахоўскі, але найперш пра пакутніцкі лёс сваіх сяброў, таленавітых беларускіх пісьменнікаў, якія разам з ім ішлі па сталінскіх этапах, працавалі ў катаржных умовах і гінулі жахлівай смерцю.

Лідзія Савік

Сяргей Грахоўскі

Слова да споведзі

...Я пасціў дваццаць гадоў перад споведдзю. І вось настала пара маёй позняй восені, пара шчырай споведзі, бо зазімак стукае ў дзверы, а халодная кароткая вясна маіх няспраўджаных летуценняў прамільгнула даўно і незваротна.

На пачатку майго лета ўдарыў страшэнны гром, і лютая навальніца пагнала далёка ад дому на пакутніцкіх шляхах дзяліць горкі лёс з мільёнамі нявольнікаў (...).

Я двойчы прайшоў усе кругі пекла і не зламаўся, не знік на таежных скрываўленых трасах. Смерць з дня ў дзень цікавала кожнага з нас, глядзела ў ашклелыя вочы і збірала шчодрую даніну. А я не паддаўся ёй.

У самай страшнай бядзе толькі чалавек ратуе чалавека, толькі дабро і спагада вядуць з цемры безнадзейнасці да жыцця і збавення. Нас з тысяч вярталіся адзінкі, з мільёнаў – сотні. Усё меней і меней застаецца сведак тае страшнае пары, калі кожны баяўся ўласнага ценю, не адважваўся прызнацца да закатаванага бацькі, а бацька – да сына, калі па праведнай крыві з рыпам ступалі катавы боты.

Усё наваколле ад небасхілу да небасхілу патанала ў змроку хлусні і казённай патэтыкі; бравурныя маршы і гучныя рапарты заглушалі людскі стогн, плач і зладзейскія стрэлы ў патыліцы сумленнейшых сыноў народа.

Асірочаныя дзеці пад гул бубнаў і горнаў, глытаючы слёзы, па камандзе дзякавалі «любімаму бацьку народаў за сваё шчаслівае...» сіроцтва. Колькі іх не ведала сваіх бацькоў і мацярок?! Колькі іх шукала родныя магілы, не знайшло і не знойдзе ніколі?! Злачынцы ўмелі замятаць крывавыя сляды.

Я бачыў усё і ўсё перажыў. Лёс злітаваўся і наканаваў мне жывым выйсці з пекла і стаць Сведкам на Судзе Гісторыі. Я памятаю сотні прозвішчаў, імёнаў і абліччаў сваіх пабрацімаў па няволі, што не выйшлі з пекла і засталіся ў вечнай мерзлаце. Я памятаю садыстаў-следчых, злачынцаў – «суддзяў», наглядчыкаў, лагерных начальнікаў і канваіраў. Памятаю ўсё да драбніц і клянуся кожным словам, кожным радком гаварыць толькі праўду, каб ведалі людзі і ніколі не далі сябе ашукаць прыгожай хлуснёй і д'ябальскім каварствам. Сведчу, каб нашы нашчадкі спазналі сапраўдную волю, роўнасць і шчасце на роднай акрыялай і расквітнелай зямлі.

Клянуся і сведчу.

1 Як Сяргей Грахоўскі апісвае сталінскі час? Падрыхтуй вусны адказ.

Тодар Лебяда (1917-1970)

Тодар Лебяда (сапр. **Пётар Шырокаў**) – беларускі драматург, паэт, празаік. Аўтар першага антыбальшавіцкага твору ў беларускай драматургіі. Нарадзіўся ў Віцебску ў сям'і рабочых. Скончыў віцебскую сямі- гадовую школу і чыгуначнае рамеснае вучылішча. У 1933 г. паступіў у Мінскі педагагічны інстытут.

31 кастрычніка 1936 г. разам з іншымі адзінаццаццю студэнтамі інстытута быў беспадстаўна абвінавачаны ў буржуазным нацыяналізме і арыштаваны. Асуджаны на 5 гадоў зняволення. Быў накіраваны у Сібір.

У 1940 па хадайніцтве жонкі быў перавезены ў Мінск, «для перагляду справы», а з Мінска адпраўлены ў Ігумен, дзе знаходзіўся да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. У час акупацыі жыў з сям'ёй у Віцебску. У 1943-1944 гг. рэдактар газеты «Беларускае слова». У гэтыя гады напісаў асноўныя свае творы. У 1944 г. выехаў у Нямеччыну. У 1945 г. вярнуўся на радзіму. У траўні 1947 г. паўторна арыштаваны і асуджаны ваенным трыбуналам на 25 гадоў пазбаўлення волі. Пакаранне адбываў у сібірскіх канцлагерах.

30 жніўня 1956 г. быў вызвалены з-пад варты, а ў 1960 г. прыехаў у Слонім, дзе працаваў рэзчыкам паперы на картоннай фабрыцы «Альбэртын». Тут напісаў п'есу ў трох актах «У нас, на Гродзеншчыне» і некалькі аднаактовых п'ес: адна з іх – «Людзі ва Хрысце» – была надрукавана ў слонімскай раёнцы «Вольная праца». 1 студзеня 1962 г. звольніўся з працы і пераехаў у Ігумен, дзе ўладкаваўся на працу сакратар-машыністам у рэдакцыю раённай газеты «Уперад». У канцы

1962 г. выехаў з Беларусі на Разаншчыну. Хварэў на сэрца, перанёс два інфаркты. Памёр у пачатку 1970 г. Рэабілітаваны 12 ліпеня 1989 г.

Пісаў вершы, апавяданні, драматычныя творы. У 1933-1936 гг. свае нарысы і вершы публікаваў у газетах «Віцебскі рабочы», «Савецкая Беларусь», «Піянер Беларусі».

У часе акупацыі напісаў свае асноўныя творы, у тым ліку п'есу «Загубленае жыццё» – першы антыбальшавіцкі твор у беларускай драматургіі. П'еса была пастаўленая ў 1943 годзе В. Селях-Качанскім у Мінскім гарадскім тэатры (паводле М. Сяднёва, у Віцебскім драматычным тэатры). У 1952 выйшла асобным выданнем у Канадзе.

У 1944 г. апублікаваў свой першы паэтычны зборнік «Песні выгнання», у які ўвайшлі вершы, напісаныя паэтам у сталінскіх лагерах.

Пісаў гумарыстычныя апавяданні і абразкі на маральна-этычныя тэмы.

паводле Леаніда Маракова

Тодар Лебяда

Ліст першы

З усходу дзікага –
Людское дамавіны,
Пішу мой ліст,
Бо гэтыя снягі
Трывожаць часта
Доўгія ўспаміны
Аб вельмі блізкім,
Вельмі дарагім.

Успомніш Беларусь,
І кроў у жылах стыне...
Куды ні ідзеш –
З табой адна туга.
О, дружа, любы мой,
Як горка апастыліў
Мне край чужы
І дзікая тайга.

О, родны край!..
Каго ён не галубіў,
Каго ў роспачы
І горы ня ўцішаў!..
Куды ні ідзеш –
Усё так сэрцу люба,
Куды ні глянеш –
Цешыцца душа.

Ідзеш загонамі,
А там на ніве – жнеі,
І льюцца песні
Жніўныя здалёк...
Вакол сядзібаў
Вішні ружавеюць,
Прыветна кланяецца
Кожны васілёк.

«Ты – наш і мы – твае» –
Шасцяць калоссем нівы.
«І мы – твае» –
Гамоняць гушчары.
Усё так хораша,
І дзіўным пералівам
Спяваюць птушкі
Рана на зары.

Я ўсёй душой
Любіў загонаў мову.
Я ўсёй душой
Любіў мой родны край...
І вось мяне,
Як злодзея, сурова
Зладзейскі суд
Без жалю пакараў.

Зладзейскі суд!..
То ж ён чырвонай зграі
Душу сваю
За медзякі прадаў!..
...Мой дружа, любы мой,
Цяпер ты ў родным краі...
Дык вось паклон мой
Нівам перадай.

1 Чаму пакутуе лірычнае «я»?

2 Да каго звяртаецца лірычны герой?

3 Растлумач, як разумееш словы верша:

І вось мяне,
Як злодзея, сурова
Зладзейскі суд
Без жалю пакараў.

Тодар Лебяда

* * *

Калі стомленае сонца па-над дахам
Шпарка хіліцца за горныя вярхі,
Я выходжу на ружовы захад
Паглядзець, на дзіўны небасхіл.

І дзіўлюся доўга сумным вокам
У пурпурова-дзіўны пераліў;
Там дзе захад сонечны – далёка
Засталіся родныя палі.

«Захад», 1945. Міхаіл Філіповіч

І ў ваччу мне мружацца прасторы
Любых ніў над ціхаю ракой,
Над прысадамі пакінуты прыгорак
У блакітным моры васількоў.

Між загонамі квітнеюць сенажаці,
Над ракой – крутыя берагі,
Пад вакном – заплаканая маці
Па адзіным сыне дарагім.

Пакідай, матуля, горка плакаць,
Ня губляй пакутлівых надзей!
Веру я, што прыйдзе смерць сабакам,
Іх яна чакае кажны дзень.

Я тады ізноў к табе здаровым
Заяўлюся ў хату, ў родны кут.
За сталом за ўласным, за дубовым
Адпачнем ад гора і пакут.

Сонца стомленае села ўжо за дахам,
Зніклі ў цемені горныя вярхі,
А я ўсё дзіўлюся шчэ на захад,
На далёкі, дзіўны небасхіл.

Сібір

1 На чым тужыць лірычны герой?

2 Якія пачуцці ў адносінах да маці паяўляюцца ў лірычнага героя?

3 У што верыць лірычнае «я»? На што мае надзею?

4 Ахарактарызуй лірычнага героя.

Літаратура

Багдановіч М., *Выбраныя творы*, Мінск 1996.

Багдановіч М., *Вянок. Вершы, паэмы*, Мінск 1994.

Багушэвіч Ф., *Творы*, Мінск 1991.

Беларуская літаратура. Матэрыялы да экзамену. Дапаможнік для навучэнцаў і абітурыентаў, склад. Т. Я. Алейчык, А. У Нікалаенка, Мінск 2001.

Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Хрэстаматыя. Вучэбны дапаможнік для студэнтаў філал. спец. ВНУ, склад. і аўт. камент. А. А. Лойка, В. П. Рагойша, Мінск 1988.

Беларуска-польскі слоўнік, пад рэд. Т. Хыляк-Шрэдар, Я. Глушкоўскай-Бабіцкай, Т. Ясіньскай-Сохі, Варшава 2012.

Беларускія пісьменнікі (1917-1990). Даведнік, склад. А. К. Гардзіцкі, Мінск 1994.

Богданович А., *Пережитки древнего миросозерцания у белорусов*, Гродно, 1885

Васючэнка П., *Драматургічная спадчына Янкі Купалы. Вопыт сучаснага прачытання*, Мінск 1994.

Валахановіч А.І., Міхнюк У.М. *Споведзь у надзеі застацца жывым: Аўтабіяграфіа Б. Тарашкевіча*. / Рэд. А.С. Ліс. Мінск 1999.

Дубоўка, У. *Выбраныя творы*: у 2 т. / У. Дубоўка. – Мінск 1965.

Дунін-Марцінкевіч В., *Творы*., Мінск 1984.

Гарадко Г. і інш. *Беларуская літаратура: дапам. для абітурыентаў і выпускнікоў школ, гімназій, ліцэяў*. Мінск 2005.

Гарэцкі М., *Гісторыя беларускай літаратуры*, Мінск 1992.

Галубок У., *Творы: Драматургія, Паэзія, Проза, Публіцыстыка*, Мінск 1983.

Гісторыя беларускай літаратуры: XIX – пачатак XX ст., пад рэд. М. А. Лазарука, А. А.Семяновіча, Мінск 1998.

Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. (20-50-я гады), пад рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча, Мінск 2000.

Гісторыя беларускай літаратуры XX ст., рэдкал. У В. Гніламёдаў і інш., Мінск 1999-2001, Т. 1-2.

Грамадчанка Т.К., *Беларуская літаратура. Школьныя творы. Кароткі змест і аналіз*, Мінск 2008.

Грахоўскі С., *Споведзь*, Мінск 1990.

Грахоўскі С., *Выбраныя творы*, Мінск 2007.

Кісялёў Г., *Пошукі імя*, Мінск 1978.

Краса і сіла: *Анталогія беларускай паэзіі XX ст*., укл. М. Скобла. Мінск 2003.

Крук І., *Следам за сонцам*, Мінск 1994.

Лазарук М. А., Ленсу А. Я., *Уводзіны ў літаратуразнаўства*, Мінск 1982.

Літаратура Беларусі. Першая палова XIX ст. Хрэстаматыя, Мінск 2000.

Лойка А. А., *Гісторыя беларускай літаратуры ў 2-х часцях. Дакастрычніцкі перыяд*, Мінск 1989.

Лебяда Т., *Песьні выгнаньня*. Мінск 1944 (факсім. выд.: Мінск 1991)
Лучына Я., *Творы. Вершы, нарысы, пераклады, лісты*, Мінск 2001.
Малецкі Я., *Пад знакам Пагоні. Успаміны*, Таронта 1976.
Маракоў Л., *Толькі адна ноч*, Мінск 2007.
Міцкевіч А., *Пан Тадэвуш*, [Пераклад з польскай Б. Тарашкевіча], Мінск 1981.
Мірановіч Я., *Навейшая гісторыя Беларусі*, Беласток 1999.
Мірановіч Я., *Чаму ўзнікла Грамада?*, «Ніва», 2000, № 22.
Навуменка І. Я., *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч*, Мінск 1992.
Навуменка І. Я., *Янка Купала. Духоўны воблік героя*, Мінск 1980.
Пашкевіч А. *Вернік паэзіі. Кляшторны Т. Сляды дарог. Выбранае*. Мінск 2003
Пушча Я., *Збор твораў*. У 2 т., Мінск 1994
Пятроўская Г. А., *Мікалай Янчук. Беларуская фалькларыстыка*, (1859-1921), Мінск 1989.
Рагойша В. П., *Паэтычны слоўнік*, Мінск 1987.
Рагойша В. П., *Тэорыя літаратуры ў тэрмінах*, Мінск 2001.
Сваяк К., *Спадчына* (рэпрынтнае выд.), Мінск 1993.
Старычонак В. Дз., *Беларуская літаратура: ад А да Я. Для абітурыентаў*, Мінск 2000.
Старычонак В. Дз., *155 сачыненняў па беларускай літаратуры. У дапамогу абітурыентам і школьнікам*, Мінск 2001.
Сысоў У., *З крыніц спрадвечных*, Мінск 1997.
Танк М., *Лірыка*, Мінск 1987.
Туга па Радзіме. Паэзія беларускай эміграцыі, уклад. Б. Сачанка, Мінск 1992.
Цётка, *Вершы*, Мінск 1996.
Чачот Я., *Выбраныя творы*, Мінск 1996.
Чыгір Г., *Закатаваны, але не прыніжаны...*, «Народная Воля», 2012.02.08.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, рэдкал. М. В. Біч і інш., Мінск, 1993-2001, Т. 1-6.
Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва, Мінск 1984-1987, Т. 1-5.
Юрэвіч У., *Янка Купала. Нарыс жыцця і творчасці*, Мінск 1983.
Янка Купала, *Энцыклапедычны даведнік*, Мінск 1986.
Янушкевіч Я. Я., *Беларускі дудар. Праблема славянскіх традыцый і ўплываў у творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча*, Мінск 1991.

Fotografie

Archiwa:

Doroteusz Fionik: 12, 13, 15, 18, 20, 21, 23 (u dołu), 30, 32, 35, 37, 38, 41, 48, 49, 50, 52, 53, 54

Narodowe Muzeum Sztuki Republiki Białoruś w Mińsku: 61, 77 (u dołu), 100, 102, 126, 137, 140, 157, 189, 200, 206, 224, 240, 242, 255, 260, 263, 269, 274, 283

Narodowe Muzeum Historyczne Republiki Białoruś w Mińsku: 44, 77 (u góry), 97, 108 (z prawej), 111, 116, 117, 119, 214, 219, 227, 228, 229, 230

Muzeum Historii Literatury Republiki Białoruśw Mińsku: 78, 121, 124, 125, 193, 204, 213, 220, 221, 225, 226, 245, 247, 277, 278

Państwowe Muzeum Literatury Janki Kupały w Mińsku: 106-107, 127, 128, 129, 139, 150

Muzeum Historyczno-Artystyczne w Kaliningradzie: 112, 113, 123, 249

Muzeum Jakuba Kołasa w Mińsku: 151, 152, 153

Andrzej Karpowicz: 9-11, 26-27, 29, 35, 47, 80, 108 (z lewej), 131, 139, 149, 155, 167, 170, 173, 175, 180

Anna Radziukiewicz: 23 (u góry), 30, 45, 46, 55, 56-57, 73, 82, 196, 215, 216-217, 232-233